4

4.94



СПАДЧЫНА

СПАДЧЫНА



4 (106) 1994

СПАДЧЫНА

ЧАСОПІС БЕЛАРУСКАГА ФОНДУ КУЛЬТУРЫ
І МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ДРУКУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДА 1989 Г. ЧАСОПІС ВЫХОДЗІЎ ПАД НАЗВАЙ «ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ»

Галоўны рэдактар Іван ЧЫГРЫНАЎ

Рэдкалегія:

Нам. галоўнага рэдактара К. ТАРАСАЎ
Адказны сакратар З. МІКІШЧАНКА
Рэдактар аддзела В. ВЯЧОРКА
Рэдактар аддзела В. РАКІЦКІ

А. БУТЭВІЧ,
А. ВАНІЦКІ,
М. ЕРМАЛОВІЧ,
В. ІПАТАВА,
М. КАСЦЮК,
А. ЛІС,
А. ЛОЙКА,
А. МАРАЧКІН,
Б. САЧАНКА,
В. ЧАМЯРЫЦКІ.

Мастацкі рэдактар У. КРУКОЎСКІ.

Адрас рэдакцыі: 220029, Мінск, Старажоўская, 5. Тэл. 34-24-54, 34-26-50.

Здадзена ў набор 28.06.94. Падпісана да друку 11.08.94. Фармат 70×100[1]/16. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,93. Ум. фарб.-адб. 24,52. Ул.-выд. арк. 16,78. Тыраж 7538 экз. Зак. 651.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013, Мінск, праспект Францішка Скарыны, 79.

Выходзіць 6 разоў на год.
Выдавецтва «Полымя»
Мінск

© «Спадчына», 1994 г.

У НУМАРЫ

АДЛЮСТРАВАННІ

Ігар Кузняцоў. Ёсць у Сібіры свой Беласток... 2
Марат Батвіннік. Годнасць прафесара 5
Валеры Шаблюк. Няздзейснены зарок 10

ПОМНІКІ ПАЭЗІІ

Вінцук Адважны. Князь і лапаць 12

МЕМУАРЫ

Дыярыюш князя Міхала Казімера Радзівіла. Прадмова Вацлава Арэшкі 18

ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

Анатоль Грыцкевіч. Гісторыя геапалітыкі Беларусі 48
Беларускі ўніверсітэт: з гісторыі стварэння. Прадмова і падрыхтоўка публікацыі Уладзіміра Ляхоўскага 61

ГАРТАЮЧЫ СТАРЫЯ ВЫДАННІ

Беларускі падручнік паліталёгіі 1931 г. 69

МІЖМОР'Е

Сымон Пятлюра. Публіцыстыка. Прадмова і пераклад Сяргея Сматрычэнкі 82

СЕМІНАР

Віктар Дольнік. Эталагічныя экскурсіі па забароненых садах гуманітарыяў 95
Ларыса Чарнышова. Мова культуры 103

ДАКУМЕНТЫ І ЛЮДЗІ

Васіль Рагуля. Успаміны 107

МІШЭНЬ

Алесь Карлюкевіч. Лірычная палеская энцыкляпэдыя 127

ВАЧЫМА КАЛАБАРАНТА

Язэп Малецкі. Пад знакам Пагоні 129
Summary 143

На першай старонцы вокладкі: майстар з Забалацця (Гарадзенская вобл.). Капліпка. Дрэва, паліхромія. Пачатак XX ст.

ЁСЦЬ У СІБІРЫ СВОЙ БЕЛАСТОК...

Слова «Сібір» амаль заўсёды ў нашай свядомасці асацыюецца з такімі паняццямі, як «катарга», «ссылка», «дэпартацыя» і да іх падобнымі. І дзеля гэтага ёсць падставы, бо з усіх шляхоў, што вядуць у Сібір, дарога катаржнікаў, ссыльных, дэпартаваных — самая пратаптаная за некалькі стагоддзяў пры розных урадах і рэжымах. І ў той жа час былі і тыя, хто ехаў у гэтыя суровыя краі па ўласным жаданні ў пошуках асабістага шчасця і лепшай долі.

На беразе колісь паўнаводнай, а цяпер зусім парослай травой, кустамі рачулкі Броўкі, што ў ста пяцідзесяці кіламетрах на поўнач ад Томска, ёсць невялікая вёсачка Беласток. Паўстала яна ў сібірскай глушы на самым пачатку нашага стагоддзя, заснавалі яе беларускія і польскія перасяленцы з малазямельных заходніх губерняў Расейскай імперыі — Горадзенскай, Віленскай, Віцебскай.

Зразумела, не ад добрага жыцця рушылі нашыя суайчыннікі, адвечныя земляробы, у далёкую Сібір. Беззямелле, неўрадлівасць пясчаных глебаў не давалі магчымасці пракарміць вялікія сялянскія сем'і. Да Томска ехалі чыгункай у таварных вагонах разам з быдлам і правіянтам для яго, начыннем і сялянскімі прыладамі працы. Дарэчы, у 1907 г. для сям'і выдзяляўся адзін вагонтаварняк. Ад Томска да сяла Малчанава, дзе быў адзін з перасяленчых пунктаў, плылі на параплаве па вялікай рацэ Об, своеасаблівай сібірскай «Місісіпі», а далей, хто як мог, праз тайгу, балоты аж да месца пасялення. Такім чынам на мапе Томскай губерні на пачатку стагоддзя з'явілася вёска Беласток.

Цяжка абжываліся на новым месцы першапраходцы: пужала неміласэрная сібірская прырода, не ратавалі летам самаробныя накамарнікі, а суровай зімой спехам выкапаныя напаўзямлянкі. Здаралася, што гінула быдла ці з голаду ці ад нападу дзікіх жывёлаў. А яшчэ — пякельная праца ад відна да цёмнага: выкарчоўвалі дрэвы пад пашу. Не, гэта не была праца прыгоннага ці нявольніка: кожны рабіў на сваёй зямлі і ведаў, што дабрабыт сям'і з гэтага часу і надалей будзе залежаць толькі ад яго, а не ад дзяржаўных чыноўнікаў.

Прыгожая вырасла вёска. На пачатку першай сусветнай вайны ў ёй было ўжо больш за 200 двароў. Па суседству паўставалі вёскі перасяленцаў з цэнтральных раёнаў Расеі. У Сібіры памешчыкаў не было: кожны працаваў на сябе. Дабрабыт залежаў ад працавітасці і колькасці працоўных рук у сям'і. Але грамадзянская вайна, калчакаўшчына, «прадразвёрстка» істотна паўплывалі на жыццё вяскоўцаў. Шмат якія сем'і засталіся тады без кармільцаў. Але жыццё працягвалася, і трэба было жыць...

На пачатку 30-х гг. і ў Беластоку пайшлі чуткі пра калектывізацыю ды калгасы. Людзей, якія ўжо прызвычаіліся працаваць на сябе, самастойна гаспадарыць, гэта палохала. І вось у 1935 г. у вёсцы быў арганізаваны калгас. Назвалі яго па-свойму — «Чырвоны штандарт». Начальства, вядома ж, супраціўлялася, але нашыя землякі зрабілі так, як хацелі. Улады ж, імкнучыся як мага хутчэй адрапартаваць пра завяршэнне поўнай калектывізацыі, пачалі раскулачваць упартых, шантажаваць тых, хто сумняваўся,— адбіралі надзелы зямлі, прысядзібныя ўчасткі і агароды абразалі да самага ганку, павялічвалі да немагчымага планы здачы зер-

ня. А калі былі «незадаволеныя», тады «дапамагала» міліцыя. Пайшлі першыя арышты і за «доўгі язык», і за нежаданне ўступаць у калгас.

У 1937 г. пачалі ў вёсцы браць людзей паводле гэтак званай «лініі НКУС». Першымі ахвярамі сталі дырэктар школы П. Чэрвоны, настаўнік П. Барысавец і загадчык гаспадаркі школы М. Карэлін. Разам з імі арыштавалі і групу калгаснікаў. У кастрычніку 1937 г. узялі яшчэ некалькі чалавек, сярод іх — старшыню сельсавета І. Назарука. Але самай жахлівай была ноч з 11 на 12 лютага 1938 г., калі арыштавалі амаль усіх мужчынаў ад 17 да 70 гадоў. На тым рэпрэсіі ў вёсцы Беласток спыняюцца ў сувязі з поўным выкарыстаннем «зыходнага матэрыялу» — мужчынаў. Дзеля справядлівасці адзначым, што жанчынаў не рэпрэсавалі. Ніхто з іх не быў асуджаны паводле 58 артыкула. Але доўгія гады яны неслі на сабе кляймо «жонак ворагаў народу».

Вывучэнне архіўна-следчых справаў 30-х гг., заведзеных на сібірскіх беластаччанаў, паказала, што з 30 жніўня 1937 г. да 12 лютага 1938 г. органамі НКУС было арыштавана 88 асобаў. Лічба ўражвае, бо паводле звестак пераліку насельніцтва 1937 г. у вёсцы пражывала ўсяго 127 мужчынаў ад васемнаццаці гадоў да старых. 68 чалавек з арыштаваных тады былі рэпрэсаваныя неабгрунтавана. Пашчасціла выжыць толькі двум.

Дакументы паказваюць, што арыштаваных у жніўні 1937 г. расстралялі 5 лістапада таго ж года. Тых, каго ўзялі 11—12 лютага 1938 г., асудзілі на вышэйшую меру пакарання. Асобым сходам пры НКУС СССР 9—10 красавіка 1938 г. «судзіла» беластаччанаў не «тройка» НКУС Захсібкраю, а Асобы сход. Усе паперы-прысуды падпісвала высокае начальства ў Маскве, напэўна, дзеля большай пераканаўчасці і значнасці сфабрыкаваных справаў. Вядома, што рэпрэсаваныя ў 1937—1938 гг. жыхары Беластока былі пасмяротна рэабілітаваныя ў 1955—1957 гг.

Сёння мы не можам пайменна назваць усіх ахвяраў генацыду гэтае вёскі. Не ведаем мы і прозвішчаў іхных катаў. Дзесьці на паліцах Цэнтральнага архіва былога КДБ у Маскве ёсць крымінальная справа № 830458 у трох тамах. Там абвінавачанні, падрабязнасці, лёсы людзей. Магчыма, калі-небудзь мы іх прачытаем. Але сёння ведаем іншае, бадай, самае істотнае — бальшыня арыштаваных абвінавачвалася як удзельнікі нацыянальнай контррэвалюцыйна-дыверсійнай паўстанцкай арганізацыі пад назвай «Польская арганізацыя вайсковая».

«Следствием по делу вскрытой и ликвидированной контрреволюционной шпионско-диверсионной повстанческой организации «Польской организации войсковой» установлено, что в деятельности повстанческой принимали участие...» — такія словы з пастановаў на арышт былі ўпісаныя ў справы тысячаў беларусаў і палякаў, якіх рэпрэсавалі ў 1937—1938 гг. не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў Маскве, Пяцігорску, Растове, у Казахстане, Сібіры, іншых рэгіёнах былога СССР. Практычна ўсіх іх абвінавачвалі тады ў змове супраць савецкай улады. Арганізацыйнай формай гэтае змены, як меркавалі супрацоўнікі НКУС, мусела быць нейкая падпольная арганізацыя, якая накіроўвала дзеянні «ворагаў народу» з польскімі і беларускімі прозвішчамі, імёнамі. Не мела значэння, што нічога падобнага ў прыродзе не існавала,— трэба было яе стварыць, вось і «стваралі» ў нетрах НКУС.

Далі і назву — «Польская арганізацыя вайсковая». Прадумалі і выдумалі ейную структуру: цэнтр быў нібыта ў Маскве, а ва ўсіх рэгіёнах СССР — «камітэты» і «цэнтры». Усе яны, паводле задумы чэкістаў, павінны былі на месцах займацца фармаваннем паўстанцкіх легіёнаў, збіраць шпіёнскія звесткі праз сваіх падначаленых і перадаваць іх «заказчыку» — другому польскаму генштабу, а таксама непасрэдна весці падрыхтоўку да ўсеагульнага выступу супраць савецкай дыктатуры ў вызначаныя дзень і гадзіну...

Справа «ПАВ» — адна з найбольш масавых знішчальных аперацый НКУС. Гэта яскравы прыклад «лінейных» арыштаў — паводле нацыянальнай прыкметы. Філіялы арганізацыі «ствараліся» органамі НКУС не толькі ў большасці цэнтральных раёнаў краіны, але і ў Заходне-Сібірскім краі, Усходняй Сібіры, на Урале. Складанасцяў тут не мелі: сярод насельніцтва быў высокі працэнт беларусаў і палякаў, якія перасяліліся туды на мяжы XIX і XX ст. Найперш іх уключалі ў спісы, каб правесці па справе «ПАВ».

Прэамбула абвінавачання была нязменная, мяняліся толькі прозвішчы ды назвы населеных пунктаў, «факты» і «прыклады» «варожай дзейнасці». Рабілася так: на допытах высвятлялі, дзе да арышту працаваў абвінавачаны, чым займаўся, ці былі выпадкі пажараў, атруты быдла на месцы ягонага жыхарства і да т. п. Пасля высвятлення гэтых пытанняў у паказанні арыштаваных дапісвалі здзяйсненне тых або іншых актаў шкодніцкай ці дыверсійнай дзейнасці. Як правіла, усе справы былі групавыя.

Паводле разлікаў чэкістаў, контррэвалюцыйнай дзейнасцю ў Сібіры мусеў кіраваць гэтак званы «Сібірскі польскі камітэт» арганізацыі «ПАВ», які складаўся б з аўтарытэтных і добра вядомых між палякамі і белару-

самі людзей. Такіх знайшлі. У «камітэт» увялі знанага ў Нарымскім краі паляка-камуніста яшчэ з дарэвалюцыйным стажам Філіповіча-Кяншчынскага і былога кадравага афіцэра калчакаўскай арміі Сасенку, кіраўніка польскага таварыства ў Новасібірску, палітэмігранта Плябанека, ксяндзоў Томскага і Іркуцкага касцёлаў Гронскага і Жукоўскага, былога камандзіра падраздзялення войскаў ЧК на чыгунцы Лукашука, загадчыка аддзела нацыянальных меншасцяў Сібкрайвыканкама Зжміеўскага. Для супрацоўнікаў УНКУС па Запсібкраі нічога не азначала, што «члены» гэтага «камітэту» не тое што былі незнаёмыя між сабою, але з'яўляліся нават людзьмі супрацьлеглых светапоглядаў, ідэйнымі ворагамі.

Надалей іхныя лёсы зблізіліся і завяршыліся аднолькава. Вось жыццёвы шлях аднаго з «камітэтчыкаў-контррэвалюцыянераў».

Аляксандр Сасенка — сын патомнага дваравіна з Гарадзенскай губерні. Лёс наканаваў яму кар'еру вайскоўца. Афіцэрам быў ягоны дзед. Бацька на службе ў цара дайшоў аж да чына палкоўніка. Пайшоўшы ў адстаўку, жыў у горадзе Замосце Люблінскай губерні. Калі пачалася першая сусветная вайна, Аляксандру споўнілася васемнаццаць, і ён ужо марыў пра войска, лічыў, што найвялікшы гонар — гэта памерці смерцю храбрых за айчыну. Атрымаўшы блаславенне бацькоў, паступіў у дзевяноста дзевяты Івангародскі пяхотны полк, быў накіраваны на фронт ва Ўсходнюю Прусію. Раненне, шпіталь, вяртанне на фронт. Потым рэвалюцыя, грамадзянская вайна. На пачатку 20-х гг. Сасенка пачынае службу ў польскай арміі ў Баранавічах і Берасці. Раны, кантузія вымусілі ў 1923 г. дэмабілізавацца. Жонка Лідзія ўгаварыла яго вярнуцца ў Расею, да ейнае радні.

Пры пераходзе мяжы А. Сасенку арыштавалі, і за гэты нелегальны пераход камітэтам АГПУ ён быў асуджаны паводле артыкула 66 КК РСФСР да трох гадоў канцлагераў. Адседзеў іх у Салаўках, а затым у 1927 г. быў сасланы ў Нарымскую акругу Заходне-Сібірскага краю. Жыў у пасёлку Каргасок, а з 1932 г.— у горадзе Колпашава. Працаваў механікам-матарыстам на электрастанцыі гарадской педвучэльні.

Арыштавалі яго 11 жніўня 1937 г. Пасля папярэдніх допытаў у Колпашава накіравалі ў Новасібірск. Там спецыялісты сваёй справы яго так «апрацавалі», што на допыце ў начальніка УНКУС па Захсібкраі Горбача ён «прызнаўся»: нібыта ў 1924 г. быў нелегальна закінуты ў СССР са спецзаданнем польскіх разведорганаў аб'яднаць усе паасобныя групы «ПАВ», якія існавалі ў Сібіры, у адну магутную цэнтралізаваную арганізацыю, што яму і ўдалося. Даў паказанні і пра тое, што пад ягоным кіраўніцтвам былі аб'яднаныя групы «ПАВ» практычна ва ўсіх сібірскіх гарадах, пералічыў прозвішчы кіраўнікоў гэтых групаў, назваў і людзей з ліку былых вайскоўцаў расейскай арміі, якіх нібыта асабіста завербаваў у арганізацыю на пасады камандзіраў штурмавых паўстанцкіх атрадаў.

Шмат «прызнанняў» Сасенкі можна прачытаць у пратаколах ягоных допытаў, якія налічваюць не менш за дваццаць старонак друкаванага тэксту. Вось толькі подпісу арыштаванага пад імі няма, а без гэтага, як вядома, пратакол не з'яўляецца дакументам. І тым не менш копіі пратаколаў допыту Аляксандра Сасенкі былі далучаныя да справаў многіх рэпрэсаваных у Сібіры беларусаў і палякаў, у тым ліку і жыхароў Беластока, хоць у гэтых паперах няма нават згадкі пра вёску ці ейных жыхароў.

Пастановай Асобага сходу НКУС СССР ад 20 кастрычніка 1937 г. Аляксандр Сасенка быў прыгавораны да расстрэлу, і 5 лістапада яго не стала...

Ігар КУЗНЯЦОЎ

ГОДНАСЦЬ ПРАФЕСАРА

Жыццё прафесара Г. Ліўшыца прайшло ў творчых навуковых пошуках, сярод студэнцкай моладзі. Ён шмат разоў пісаў сваю аўтабіяграфію, але, на жаль, не пра ўсё можна было падрабязна расказаць.

Нарадзіўся Гілер Ліўшыц 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1909 г. у Бабруйскім павеце Новадарожскай воласці Менскай губерні, у чыгуначным пасёлку Дараганава (зараз цэнтр сельсавета ў Асіповіцкім раёне Магілеўскай вобласці). Ягоны бацька Мордух Ліўшыц быў дробным гандляром, у якога падчас НЭПа бандыты разрабавалі лаўку і нават паранілі гаспадара. Пасля гэтага ён уладкаваўся на працу вагаўшчыком на броварным заводзе. Маці Неха Ґрынграс была заўсёды хатняй гаспадыняй.

Вучыўся ён у хедары і пачатковай школе ў Дараганаве, потым у Старых Дарогах, у 1927 г. скончыў сямігодку. Хлопчык меў здольнасці, вельмі любіў гісторыю, аднак працягваць вучобу перашкаджалі былое сацыяльнае становішча бацькі і, самае галоўнае, адсутнасць матэрыяльных сродкаў у сям'і. Гілер ідзе працаваць. Прафесію сталяра спасцігаў перш у Дараганаве, а потым пераехаў у Менск, дзе да 1931 г. працаваў на заводзе па вырабе стандартных дамоў.

Пайсці вучыцца ў інстытут вырашыў не адразу, але, як з'явілася магчымасць, ён ажыццяўляе сваю мару. Г. Ліўшыц спачатку быў залічаны на курсы па падрыхтоўцы да паступлення ў пединстытут, а ўвосень 1931 г. становіцца студэнтам Беларускага дзяржаўнага вышэйшага пединстытута. Вучыўся на эканамічным аддзяленні сацыяльна-эканамічнага факультэта. Заняткі ў інстытуце даваліся яму без цяжкасцяў, бо быў ён чалавекам начытаным, ведаў замежныя мовы. Да таго ж, трапіў у асяроддзе моладзі, якая імкнулася да ведаў. Вырашальнай сталася сустрэча са знакамітым вучоным, апантаным гістарычнай навукай, прафесарам Уладзімірам Мікалаевічам Перцавым, які тады загадваў катэдрай усеагульнай гісторыі пединстытута і яшчэ працаваў ва ўніверсітэце. У 1934 г., пасля паспяховай здачы дзяржаўных экзаменаў, Г. Ліўшыц быў пакінуты ў аспірантуры на катэдры ўсеагульнай гісторыі.

Г. М. Ліўшыц. Здымак 1954 г.

Будучы аспірантам, ён працаваў над дысертацыяй і чытаў лекцыі па гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў у пединстытутце і ва ўніверсітэце. Тэма ягонай дысертацыі — «Сацыяльна-палітычная барацьба 60-х гадоў І ст. да н. э. у Рыме і змова Каціліны» — была вельмі складаная і патрабавала ад аспіранта мабільнасці ў пошуках крыніцаў і матэрыялаў для праўдзівага выкладу гістарычных падзеяў таго часу.

6 снежня 1939 г. на паседжанні вучонага савета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта яму была нададзена вучоная ступень кандыдата гістарычных навук. Ён адзін з першых у Беларусі абараніў дысертацыю па ўсеагульнай гісторыі і ў 1940 г. стаў першым дацэнтам па гэтай навуковай спецыяльнасці. У тым жа годзе Г. Ліўшыц прачытаў цыкл лекцый у Заходняй Беларусі па гісторыі

сярэдніх вякоў для выкладчыкаў-гісторыкаў Беластоцкай вобласці.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Г. Ліўшыц тры месяцы знаходзіўся ў дзеючай арміі, а потым працаваў дацэнтам Кзыл-Ардзінскага пединстытута ў Казахстане. 25 кастрычніка 1944 г. ён з сям'ёй вяртаецца ў зруйнаваны гітлераўцамі Менск, выкладае ва ўніверсітэце, педагагічным і юрыдычным інстытутах. Ліўшыц займаўся таксама навукова-даследчай працай, якая пачалася яшчэ да вайны, калі ён узяў тэму доктарскай дысертацыі «Грамадска-палітычныя і філасофскія погляды Цыцэрона». Пазней даследаванне вылілася ў публікацыю навуковага артыкула.

40-я — 60-я гг. для вучонага былі насычаныя выкладчыцкай і публіцыстычнай дзейнасцю. Ён друкаваўся ў газетах і часопісах. Першы артыкул у газеце «Сталинская молодежь» (цяпер «Знамя юности») быў надрукаваны 10 кастрычніка 1945 г. пад назвай «Рускія ў Берліне» і прысвячаўся вайне і доўгачаканай Перамозе з гістарычным экскурсам у мінулае. Першы навуковы артыкул даследніка «Эпізод з барацьбы за дыктатуру ў Рыме I ст. да н. э. (змова 66 года)» быў змешчаны ў «Вучоных запісках БДУ» у 1948 г. У наступныя гады друкуе шэраг артыкулаў па гісторыі антычнага Рыма II—I стст. да н. э. у перыядычных выданнях, кнігах. Ягоныя працы публікуюцца за мяжой, прыцягваючы ўвагу навуковай грамадскасці шэрагу краінаў.

У гэтым жа годзе Г. Ліўшыц бярэ новую тэму доктарскай дысертацыі: «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанні супраць Рыма». Аднак яна была ўспрынятая некаторымі калегамі вельмі адмоўна. Час быў такі складаны, што многія лічылі ледзь не самагубствам выбар такой тэмы. Наскокі і цкаванне працягваліся даволі доўга, але Г. Ліўшыц праявіў навуковую мужнасць як даследнік і паказаў выдатны характар як чалавек. Сапраўды, гэта нялёгка было рабіць у перыяд панавання сталінскай партакратыі, якая ўсялякімі метадамі змагалася з гэтак званым касмапалітызмам ды іншымі «-ізмамі». Перспектывы ў Ліўшыца былі бляклыя, рызыка неймаверная.

У БДУ, як і ўвогуле ўва ўсёй краіне, сумленным, глыбокім вучоным было нялёгка. Ва ўніверсітэце барацьбу з касмапалітызмам узначалілі І. Гутараў, што тады працаваў у апараце ЦК КПБ і чытаў лекцыі студэнтам, а таксама Л. Абэцэдарскі, які распачынаў сваю кар'еру. Заўважым, што апошні нібыта нават сябраваў з Г. Ліўшыцам. Безумоўна, актыўную ролю адыгрываў партком універсітэта. З БДУ пачалі выганяць лепшых выкладчыкаў і студэнтаў. Запрацавала «цанаўская кантора» (Міністэрства дзяржаўнай бяспекі БССР), куды для «размоваў» пачалі запрашаць выкладчыкаў і студэнтаў. Вядома, што пад пільным вокам МДБ знаходзілася ўся краіна. Асабліва заўзята яно распраўлялася з «касмапалітамі» яўрэйскай нацыянальнасці, некаторыя з іх апынуліся ў турмах і лагерах. Асноўная маса студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта выключна адмоўна аднеслася да гэтай чарговай антынавуковай і антысеміцкай кампаніі.

У такіх умовах Г. Ліўшыц працягваў працаваць над «крамольнай» дысертацыяй. Толькі дзякуючы «хрушчоўскай адлізе» змог дабіцца, каб выдавецтва БДУ выпусціла ягоную кнігу. Манаграфія «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанні супраць Рыма» з вялікімі цяжкасцямі і ўсялякімі перашкодамі ўсё ж выйшла ў 1957 г. Аднак адразу з'явіліся «добразычліўцы», найперш з іх І. Гутараў, які на вучоным савеце універсітэта заявіў, што кніга Ліўшыца можа выклікаць міжнародныя ўскладненні.

Рэктар БДУ А. Сеўчанка забараніў перадаваць наклад кнігі ў гандаль — такое тады было магчыма. Быў намер пусціць выданне пад нож, нягледзячы на тое, што абавязковыя экземпляры кнігі ўжо разаслалі ў шмат якія бібліятэкі краіны. Рэктар, каб адвесці ад сябе бяду, падстрахаваўся тым, што накіраваў кнігу для ацэнкі ў Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР і Міністэрства замежных справаў СССР. У сваю чаргу, гэтыя міністэрствы звярнуліся ў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт і ў Інстытут гісторыі АН СССР, якія далі станоўчыя водгукі на працу Г. Ліўшыца. Як толькі манаграфія апынулася ў руках гісторыкаў-антычнікаў, ім адразу стала зразумела, што ў БДУ пануюць прафанацыя і несумленныя адносіны да аўтара.

У траўні 1958 г. у выніку абмеркавання манаграфіі як доктарскай дысертацыі на катэдры гісторыі старажытнага свету Маскоўскага ўніверсітэта вучоныя аднадушна прыйшлі да высновы, што «кніга Г. Ліўшыца — гэта сур'ёзная навуковая праца, якую трэба перавыдаць і рэкамендаваць для ўсіх, хто цікавіцца старажытнай гісторыяй». Яны падтрымалі

прапанову рэцэнзента з Інстытута гісторыі АН СССР прафесара М. Поршнева, што дзеля абароны доктарскай дысертацыі неабходна яшчэ выдаць працу пра Кумранскія рукапісы, якія маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі старажытнага свету як крыніца першараднага значэння, што змяшчае багаты матэрыял пра рухі і паўстанні ў правінцыях антычнага Рыма.

Але на радзіме пакуты Г. Ліўшыца працягваліся. Ён трапіў у няміласць, давялося двойчы звяртацца ў ЦК КПБ і ў ЦК КПСС да К. Мазурава і М. Паспелава, каб абараніць сваю годнасць і кнігу, мець магчымасць працягваць навуковую дзейнасць. Нарэшце Міністэрства замежных справаў СССР дало афіцыйнае заключэнне, што кніга Г. Ліўшыца ні з кім не ўскладняе адносінаў і мае права на існаванне.

Баронячы сваю годнасць вучонага, а гэта забірала шмат маральных і фізічных сілаў, ён настойліва працаваў над манаграфіяй пра Кумранскія рукапісы. Трэба было аператыўна вырашаць гэтую складаную навуковую праблему, бо яна давала багатую інфармацыю пра незвычайныя знаходкі ля Мёртвага мора. Зноў былі пастаўленыя рагаткі на шляху публікацыі кнігі. Аўтар звяртаецца да рэктара БДУ, у Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР. Пасля працяглых спрэчак яе ўключылі ў план універсітэцкага выдавецтва. Манаграфія Г. Ліўшыца «Кумранскія рукапісы і іх гістарычнае значэнне» пабачыла свет у 1959 г., стала папулярнай у нас і за мяжой.

У лютым 1960 г. на паседжанні вучонага савета БДУ Г. Ліўшыц нарэшце атрымаў навуковую ступень доктара гістарычных навук. Спатрэбілася амаль 15 цяжкіх, бязлітасных гадоў, каб дасягнуць запаветнай мэты. А праз два гады ён становіцца прафесарам.

Дзеля таго каб бліжэй пазнаёміцца з навуковымі пошукамі і знаходкамі прафесара, варта звярнуцца да ягоных фундаментальных працаў па гісторыі старажытнага свету. Антычнаму Рыму і ягоным правінцыям ён прысвяціў дзве манаграфіі і шэраг навуковых артыкулаў. Назва першай з іх мае адбітак заідэалагізаванасці тагачаснай савецкай навукі: «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанні супраць Рыма (Да праблемы сацыяльна-эканамічнага ладу Рымскіх правінцый)». Знаходзячыся пад негатыўным уздзеяннем партыйна-дзяржаўнага прэсу, аўтар вымушаны быў даць такую

Г. М. Ліўшыц. Здымак 1930 г.

назву кнізе, змест якой значна шырэйшы і глыбейшы. Г. Ліўшыц меў намер назваць кнігу «Іудзея і Рым». А ўвогуле, на мой погляд, на вокладцы кнігі мусела стаяць назва «Антычны Рым і правінцыі», што адпавядала б структуры і зместу выдання.

У манаграфіі аўтар здолеў паказаць месца, ролю і асаблівасці Іудзеі ў рабаўладальніцкім грамадстве Міжземнамор'я, сацыяльна-палітычную і, у меншай ступені, эканамічную сітуацыю ў гэтай краіне. Кніга адлюстравала гісторыю Блізкага і Сярэдняга Усходу ў элііністычную эпоху, а таксама міжнароднае становішча Іудзеі на працягу чатырох стагоддзяў і вынікі ейных войнаў з суседнімі дзяржавамі. Тут жа падрабязна выкладаецца гісторыя рымскай дзяржавы і права, у якіх былі закладзеныя падмуркі прававедамасці ўсяго грамадства. Прыблізна толькі трэцяя частка кнігі прысвечаная сацыяльнай барацьбе ў Іудзеі і паўстанням супраць Рыма. Г. Ліўшыц падкрэслівае, што барацьба правінцыяў супраць Рыма мела найперш сацыяльны, а не нацыянальны характар, аднак зараз у гістарычнай навуцы ў нас і за мяжой прызнаецца, што гэтыя выступленні былі ў рэчышчы сацыяльнай

і нацыянальнай барацьбы, прычым адны даследнікі акцэнтуюць сацыяльныя асаблівасці такіх выступленняў і паўстанняў, другія — іхны нацыянальны каларыт, этнічную і рэлігійную накіраванасць.

Адметная рыса працы Г. Ліўшыца — насычанасць спасылкамі на шматлікія крыніцы, аргументацыя на аснове новых дакументаў і твораў антычных аўтараў. Тады ў савецкай навуцы не любілі спасылацца на духоўную і царкоўную літаратуру, а Г. Ліўшыц звярнуўся да Старога запавету, Торы, Талмуда (палесцінскага і вавілонскага), Мішны і Гамэры. Антычныя крыніцы, хрысціянская кананічная і апакрыфічная літаратура дазволілі вучонаму дэталёва высветліць і дасканала даследаваць гістарычныя падзеі старажытнай мінуўшчыны. Ён шмат увагі надаў гісторыі Рыма і правінцыяў, калі ў «вечным горадзе» панавала рэспубліканскае кіраўніцтва, лічыў, што пераход яго ад гэтай формы ўлады да імператарскай ёсць крызіс рабаўладальніцкай сістэмы і ўсталяванне ваеннай дыктатуры.

Г. Ліўшыц меў рацыю, калі адзначаў неаднароднасць сенатарскай знаці і коннікаў, іх несупынную барацьбу з імператарскай уладай, аднак усё гэта сказана дэкларатыўна, не падмацавана гістарычнымі фактамі. Наагул, у кнізе арыстакратыя выступае як адзіная маналітная, злавесная з'ява, хоць вядома, што была неаднолькавая як паводле светапогляду, так і па кірунках дзейнасці.

Шмат месца ў кнізе адведзена гісторыі іудзейскай вайны, паўстанням і выступленням народных масаў у Іудзеі ў 60—70-х гг. Даследнік даў вычарпальную ацэнку творам Іосіфа Флавія і самому аўтару, удзельніку гэтай вайны. Г. Ліўшыц даводзіць, што Іосіф Флавій не змог зрабіць аб'ектыўнага апісання вайны, таму што ён апынуўся ў палоне і, зразумела, быў настроены праримску, імкнуўся паказаць сябе і рымлянаў з лепшага боку. Вучоны сцвярджаў, што ваенныя дзеянні вяліся з 65-га па 73-ці год. Прычынай паўстання была сацыяльна-эканамічная, палітычная, ваенная, рэлігійная палітыка Рымскай імперыі і мясцовай знаці. Гэтыя з'явы справакавалі стыхійнае, але сур'ёзнае выступленне народных масаў Іудзеі супраць рымскага панавання. Яно было таксама накіравана супраць мясцовай свецкай і духоўнай знаці, якая эксплуатавала народ і здраджвала ягоным інтарэсам. Даследніку зноў давялося прапусціць праз рэшата навуковай крытыкі ўсе гістарычныя падзеі аблогі, узяцця і знішчэння рымскім войскам на чале з Цітам у верасні 70 г. горада Іерусаліма. Г. Ліўшыц вельмі прадметна, дэталёва, з прыцягненнем картасхемы апісаў усе этапы барацьбы іудзейскага насельніцтва горада, гэтаксама як і ваенныя дзеянні арміі Ціта, ейны поспех і няўдачы ў аблозе цытадэлі, а таксама мужнасць і самаадданасць іудзейскіх воінаў і страшэнную паразу Іерусаліма. Адной з прычынаў, якая прывяла да падзення горада, ён лічыў жорсткую барацьбу розных партыяў і груповак сярод абаронцаў.

Пасля іудзейскай вайны то ў адным, то ў другім рэгіёне Блізкага і Сярэдняга Усходу ўзнікалі паўстанні іудзеяў, якія выкарысталі ваенныя дзеянні паміж Рымам і Парфіянскім царствам дзеля актывізацыі сваёй барацьбы з прыгнятальнікамі. Аўтар разглядаў гэтыя выступленні як працяг іудзейскай вайны. Найбольш ведамым з іх было паўстанне пад кіраўніцтвам Сімяона Бар-Кохбы (132—135 гг.). У прозвішчы кіраўніка паўстання даследнік бачыў ягоны месіянскі характар і лічыў легендарнымі звесткі аб ім. Што да паўстанцаў, дык яны некаторы час утрымлівалі зруйнаваны рымлянамі горад Іерусалім. Рымляне разграмілі іх, большасць гарадоў іудзеяў зруйнавалі, частку насельніцтва забілі, а астатніх перадалі ў нявольніцтва. Г. Ліўшыц падкрэсліваў, што не толькі іудзеі падняліся на барацьбу супраць рымлянаў, але і шмат якія народы Ўсходу і Заходняй Еўропы вялі бязлітасную вайну з прыгнятальнікамі.

Вучні прафесара доктар гістарычных навук В. Фядосік і кандыдат гістарычных навук К. Равяка ў прадмове да кнігі «Іосіф Флавій. Іудзейская вайна» пісалі: «Пры падрыхтоўцы іх (каментараў.— М. Б.) былі выкарыстаныя працы шмат якіх савецкіх гісторыкаў-антычнікаў, найперш прафесара Г. М. Ліўшыца, працы якога па гісторыі антычнай Іудзеі дасюль не маюць сабе роўных у гістарычнай навуцы». Трэба асобна зазначыць, што даследнік і надалей працягваў вывучэнне гісторыі народных рухаў у Іудзеі. Ён выкарыстаў Кумранскія рукапісы як гістарычную крыніцу для больш дэталёвага знаёмства з барацьбой народных масаў Палесціны супраць рымскіх захопнікаў.

Вельмі коратка пра тое, што ўяўляюць сабой Кумранскія рукапісы, якім даследнік прысвяціў дзве манаграфіі. Іх знай-

шлі бедуіны ды археолагі ў 40—60-х гг. нашага стагоддзя ў раёне Кумрана, паблізу аазіса Айн-Фэшхі. Гэтыя рукапісы або кавалкі іх ці фрагменты на скурах, пергаменце, папірусах, медных таблічках цудам захаваліся ў адзінаццаці пячорах, да якіх было цяжка і складана дайсці. Высветлілася, што яны напісаныя на васьмі мовах і дыялектах. Большасць з іх на старажытнаяўрэйскай, арамейскай, старажытнагрэцкай і лацінскай мовах. Вучоныя лічаць, што рукапісы былі зроблены ў перыяд з III ст. да н. э. па VIII ст. н. э. Ёсць меркаванне, што гэта — бібліятэка кумранскай абшчыны, якая налічвала 600 кніг. Зараз бедуінамі і археолагамі знойдзена каля 40 тысячаў фрагментаў кніг. Цалкам захавалася з гэтага кнігасховішча не больш за адзінаццаць твораў. Рэстаўрацыю ўсіх тэкстаў маглі зрабіць толькі высокакваліфікаваныя спецыялісты. Адным з іх быў прафесар Іерусалімскага ўніверсітэта Э. Сукенік. Публікацыя за мяжой тэкстаў Кумранскіх рукапісаў дазволіла савецкім даследнікам, у тым ліку Г. Ліўшыцу, правесці вялікую тэксталагічную працу. Пасля расшыфроўкі рукапісаў высветлілася, што частку з іх складаюць біблейскія тэксты, а таксама апокрыфы, г. зн. тэксты, якія не ўвайшлі ў біблейскі канон, яшчэ дакументы кумранскай абшчыны. Даследнік прааналізаваў шматлікія рукапісы, звярнуўшы ўвагу на час напісання, захаванасць, параўнаў іх са Старым і Новым запаветамі, старажытнаяўрэйскім (масарэцкім), грэцкім (Септуагінтай) і лацінскім (Вульгатай). Кумранскія рукапісы далі мажлівасць падысці да ўзнаўлення першапачатковага тэксту Бібліі. У пячорах каля Мёртвага мора знайшлі шмат каментараў да Святога пісьма, якія даюць каштоўны матэрыял дзеля вывучэння светапогляду кумранскай абшчыны. Дакументальныя крыніцы дазволілі Г. Ліўшыцу ўсвядоміць і апісаць побыт і заняткі кумранітаў. Вучоны даказаў, што яны карысталіся сонечным, а не месяцавым календаром, а таму святы і пасты, якія абыходзілі іерусалімскія жрацы, не супадалі са святамі і пастамі кумранскай абшчыны, хоць яна захоўвала пэўныя кантакты з Іерусалімскім храмам, падзяляла некаторыя погляды на жыццё і смерць чалавека.

Агульнымі дуалістычнымі ідэямі для Новага запавету і Кумранскіх рукапісаў ёсць барацьба двух пачаткаў: святла і

Дзед і баба Г. М. Ліўшыца па лініі бацькі.

цемры, дабра і зла, месіянскія, апакаліпсічныя эсхаталагічныя веранні. Г. Ліўшыц зрабіў такую выснову: «Галоўнае бачыцца не ў супадзенні асобных тэрмінаў і выразаў, а ў вялікім падабенстве ідэяў і абрадаў, у блізкасці шэрагу тэалагічных дактрынаў, у вядомай агульнасці сацыяльных прынцыпаў. Усе адзначаныя моманты даюць падставу прылічыць Кумранскую секту да ліку папярэднікаў хрысціянства».

Даследнік лічыў, што іудзейская рэлігія ў дыяспары павінна была прыняць іншыя формы, чым у Палесціне, таму там паўсталі розныя секты. Ён выказаў думку, што хрысціянства ўзнікла не ў Палесціне, а ў дыяспары. Некаторыя вучоныя, абапіраючыся на супярэчлівыя выказванні Ф. Энгельса, сцвярджаюць, што яно бярэ пачатак менавіта ў Палесціне.

Працы прафесара Г. Ліўшыца пра паходжанне хрысціянства, а таксама па біблеістыцы адыгрываюць важную ролю ў вывучэнні гэтых глабальных навуковых праблемаў, таму што зробленыя на высокім навуковым узроўні.

Марат БАТВІННІК

НЯЗДЗЕЙСНЕНЫ ЗАРОК

Пры пошуку архіўных матэрыялаў, звязаных з гісторыяй вядомага Туганавіцкага двара на Наваградчыне каля возера Свіцязь, маю ўвагу прыцягнула справа аб прашэнні Канстанціна Туганоўскага на будаўніцтва ў ягоным маёнтку капліцы (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 299, воп. 1, спр. 182, арк. 1—18). Туганоўскія — старадаўні род, які паходзіў ад князёў Масальскіх і меў аднолькавы з імі герб. У 1510 г. прашчур Туганоўскіх Сямён Іванавіч атрымаў прывілей Жыгімонта І на двор Туганавічы ў Наваградскім павеце (Русская историческая библиотека. 1903. Т. 20, с. 637—639). Нашчадкі Сямёна Іванавіча Іван і Міхал у другой палове XVI ст. ужо насілі прозвішча Туганоўскія. Туганоўскія валодалі маёнткам да 1755 г., калі прадалі яго ксяндзу Ігнацію Вішнеўскаму. З 1778 г. гаспадарамі Туганавічаў становяцца Верашчакі. Тут гасцяваў Тадэвуш Касцюшка, а ў 1820—1821 гг. Туганавічы былі месцам паломніцтва Адама Міцкевіча, закаханага ў Марылю Верашчаку. У 1831 г. Туганавічы набывае былы старшыня Наваградскага земскага суда Ян Туганоўскі. Маёнтак зноў стаў радавым. У 1844 г. Ян перадае маёнтак свайму пляменніку Канстанціну, які пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта працаваў горадзенскім губернскім сакратаром. Канстанцін выказаў сябе патрыётам Наваградчыны, стала клапаціўся пра захаванне гістарычных помнікаў у Туганавічах, асабліва ўсяго, што было звязана з імем Міцкевіча.

10 лютага 1848 г. Канстанцін звяртаецца ў Мінскае губернскае праўленне па дазвол на будаўніцтва капліцы ў сваім маёнтку. Туганоўскі пісаў, што раней даў зарок «...побуждаемый искренней любовью к родне моей, построить в вотчинном имении Тугановичи на кладбищах фамильный каменный гроб для хранения усопших там, чтобы в оном отправляема была за умерших панихида». Да прашэння быў прыкладзены праект капліцы, распрацаваны грамадзянскім інжынерам Мінскай палаты дзяржаўных маёмасцяў С. Дамброўскім. Паводле малюнка плана і фасада, гэта быў велічны і арыгінальны будынак. Губернскае праўленне склала прашэнне Туганоўскага на разгляд у Мінскую праваслаўную, Віленскую рыма-каталіцкую кансісторыі і наваградскаму земскаму спраўніку. Праз некалькі дзён прыйшоў адказ з Вільні, у якім адзначалася, што з боку рыма-каталіцкай кансісторыі ніякіх перашкодаў да будаўніцтва капліцы не існуе. Паколькі ад Мінскай праваслаўнай кансісторыі на працягу месяца адказу не паступіла, 31 сакавіка губернскае праўленне звяртаецца да яе з лістом, у якім просіць паскорыць прынящце рашэння. І вось 5 красавіка ў губернскае праўленне прыходзіць адказ кансісторыі, які варта працытаваць: «...предмет о построении иноверческих фамильных гробов не относится к рассмотрению епархиального начальства, что же касается богослужения в оном по Римскому обряду, то епархиальное начальство на отправление таковового соизволения дать не может, из опасения совращения недавно воссоединенных православных тамошних и окрестных жителей и еще несовершенно утвержденных в православии». Такім чынам, з аднаго боку — гэта нас не тычыцца, але ж з другога — мы гэтага не жадаем. Пасля такога рашэння рапарт наваградскага земскага спраўніка, што «...на постройку помещиком К. Тугановским в им. Тугановичах фамильного гроба, по удостоверению моему на месте, никаких препятствий не имеется», ужо не меў ніякага значэння. 27 мая 1848 г. К. Туганоўскі атрымаў адмову: «Как Православная Духовная Консистория по изложенным в отзыве её поводам не изъявляет согласия на отправление в имеемом построить в имении Тугановичах помещика Тугановского каменном фамильном гробе панихиды, то ходатайство по сему предмету оказанного помещика оставить без удовлетворения». Скончылася ўсё тым, што К. Туганоўскі заплаціў адзін рубель трыццаць капеек серабром за шэсць аркушаў паперы, якую чыноўнікі выкарысталі на вядзенне справы.

Зразумела, што пазіцыя праваслаўнай кансісторыі была абумоўленая палітыкай царызму на Беларусі, афіцыйнай падтрымкай «истинной» рэлігіі — праваслаўя. Стагоддзямі на Беларусі жылі побач праваслаўныя і каталікі, вуніяты ды іудзеі, пратэстанты і мусульмане. Аднак нашая гісторыя не ведала рэлігійных войнаў ці сур'ёзных міжнацыянальных сутычак. Пасля ж далучэння Беларусі



да Расейскай імперыі пачалася арганізаваная царскімі ўладамі кампанія супраць «інаверцаў». Зачыняліся альбо ператвараліся ў цэрквы касцёлы, была скасаваная вунія, людзей прымушалі зракацца веры сваіх продкаў.

Падчас паўстання 1863—1864 гг. Канстанцін ТугаНоўскі быў акруговым кіраўніком інсургентаў Наваградскага павету. Арыштаваны і кінуты ў віленскую вязніцу, ён памёр там пад следствам. Сумны і лёс ягонай сям'і. На руках жонкі — Зоф'і з Верашчакаў, пляменніцы славутай Марылі, засталося трое дочак: пяцігадовая Канстанцыя, сярэдняя Юзэфа і немаўлятка Ядзвіга. Першая дачка ТугаНоўскіх, Марыля, памерла яшчэ да паўстання. Маці ўзгадавала дочак і ў 1879 г. памерла. А праз тры гады памірае Ядзвіга (ёй было 18 гадоў), і тым жа годам сканалі Канстанцыя і ейная дачка, унучка ТугаНоўскага, Зося. З дзяцей Канстанціна Тугаўскага XX ст. сустракала адна Юзэфа.

Канечне, цяжка злучыць трагедыю сям'і з няздзейсненым бацькавым зарокам, аднак сымбаль усё ж атрымоўваецца тужлівы.

Валеры ШАБЛЮК

Вінцук **АДВАЖНЫ**

КНЯЗЬ І ЛАПАЦЬ

СУЧАСНАЯ КАЗКА

ЧАСТКА II

НА ЎСХОДЗЕ

III. Чырвоная камісія і народны суд

а) Выдра

О, як шустра і як хітра
Ловіць рыбку ў рэчцы выдра!
Як вужака мякка гнецца —
Праз усе вузлы прарвецца.

Пазуркі ў яе стальныя,
Вочкі як агонь жывыя.
А так скача, лазіць спрытна,
Так ніколі ненасытна!

Можа зьнішчыць гнёздаў сотні,
Як той майстар у дрывотні
Рвець, стружэ і крышыць, рэжа...—
Выдра любіць мяса сьвежа,

А найлепш як льецца кроў!
Не, ня выпусьціць з зубоў,—
Нэрвы так дрыжаць, як струны...—
Гэта ж ёсьць абраз камуны! —

А зманіць яна так рада!
А ўся праца — подступ, здрада,

А ўся радасьць — кроў жывая,
А ўсё шчасьце — сьмерць чужая...

Раніць, грызьці, мучыць, дзерці —
Вось дзе роскаш з чужой сьмерці!
І да нас яны прыйшлі —
Твораць пекла на зямлі.

*

Называюць гэта «раем».—
Так дракон над нашым краем
Растапырыў лапы ў злосьці,
А зубамі крышыць косьці.

Пражылі мы дзьве вайны:
Праплывалі шчасьця дні,
А плылі гады няволі —
Край парэзаны ў нядолі.

Хто пабачыць, хто паслыша?
Хто раскажа, хто апіша?!
А з найгоршых гуннаў-гунны —
«Выдры з Краснае Камуны»!!!

Пачатак у № 3, 1994 г.

б) Камісоўка

Як над морам праляцелі,
Самалёты ў Рызе селі.
Вось спусьцілі галышоў
І старых і малышоў:
Згрупавалі іх у Рызе,
Запісалі ў чорнай кнізе.

А там шустрыя агэнты
Сартавалі дакумэнты:
А той верыў, той ня верыў,
Што няма у іх папераў
І пры той усей галечы —
Ні адзежы чалавечай.

Пісар піша, носам круце
І народ той баламуце:
— Як у мора ты скакаўшы,
Дакумэнтаў не забраўшы,
А ўсяго адна мінута,
А цяпер і мне пакута...—

Як, гражданка, у паводку
Без манэты лезла ў лодку?
Грошы ў нас, як прышч на носе,
Пры сабе і дурань носе.
Вы прывыклі цопам-лопам
І тапіліся галёпам.—

А былі айцы і маткі,
Што тварылі там выняткі,
Што знайшлі ў сваіх кішэнях
І цяпер трымалі ў жменях
Грошы і паперкі ў плесьні,
Дык чытай іх, хоць ты трэсьні!

Ну, ўсё тое барахло
У камісію пайшло.
Знайшлі нейкую бамбізу,
Што рабіла экспэртызу.—
Працавалі там бяз меры —
Горбу змазалі паперы...

Рэзультат з таго усенькі,
Як меў Сталін ад Лысенкі.

*

Так людзей трымаць-трымалі,
Сто разоў пісаць-пісалі:
А як добра надаелі,
Дзетак крышку прыадзелі.
Гаманілі людзі сьціха:
«...нас сюды занесла ліха!»

Абразы кідалі ў бандзе —
Дабравольна — па камандзе.
Аж зрабілі ў тым пацеху
Чорту Лысаму ў пасьпеху.

Ну, цяпер ужо астылі,
Як грахі ў вадзе абмылі.

І ужо, адвагі поўны,
Быў адзін другому роўны:
Капшуку хто біў паклоны
І кідаў свае іконы,
І дзівак таксама гэты,
Хто падкінуў два партрэты.

А як скончылі там гулі,
Іх у фабрыкі заткнулі:
Хто быў здатны, хоць ня ласы,
Тых пагналі у калгасы:
Кажны быў скамісаваны
І навек прышрубаваны.

в) Сьледзтва і суд

Дон Капшуко разматаўся —
Аж на сто кусочкаў рваўся!
Прабаваў заклеіць дзюры:
Нос павесіў, стаўануры,
Бо над ім вісела хмара
І пярун удэрыў зара.

А найперш паўстала хрыя:
Як прасьлепіў сем'і тыя,
Што ў Нарвэгіі ў шпіталі
Вольнай волі запыталі?
— Як ты там за імі бегаў,
Што пусьціў з рук да Нарвэгаў? —

Капшуковыя заслугі
І удалыя натугі
Аценілі так, як сечку,
І зьдзьмухнулі так, як сьвечку.
Пункт другі яму дасталі:
— Дзе партрэты Ленін — Сталін?

Трэці пункт быў сам-найгоршы:
Тут Капшук быў як абмёршы.
— Ты агэнт быў загранічны —
Вёз мяшок дыпляматычны:
Ты павінен сам лепш згінуць,
Як той скарб у мора кінуць! —

Бо далі там Капшуку
Пад пячацямі ў мяшку —
Даражэй як дыямэнты —
Здымкі, пляны, дакумэнты,
Што іх вартасьці ня знялі
Тыя, што іх з штабу кралі...

— Супраць лёгікі падзеяў,
Дзе ты сплавіў карыфэяў,
Што далі людзям свабоду?
Хто іх кінуў там у ваду?
Ты ўчыніў нам стыд і страту —
Зробім мы з табой расплату!

Пракурор казаў: — Прызнайся!
Ты — шпіён: Капшук, пакайся!
За такі учынак твой
Ты заплаціш галавой.
Той мяшок нам быў важней,
Як вас сто дурных людзей.—

Суд назначаны народны,
Што «Капшук шпіён нягодны —
Заграніцай меў выгоды —
Прычыніў нам толькі шкоды.
І камуне і Саюзу
Трэба вычысьціць абузу —
Здраду выкінуць за борт —
Тут шпіёнства злосны сорт!..»

*

Так Капшук экзамін здаў —
Скуру і душу прадаў:
Ён прызнаўся да ўсяго:
(Сам ня ведаў, да чаго) —
Пункты ўсе зыйшліся складна —
Пакараны быў прыкладна!

Ён пастух быў чалавечы:
(Шчасьце, што Капшук меў плечы!) —
Там ня гладзяць па галоўцы —
Мог-бы дындаць на вяроўцы.
Хоць да сьмерці быў гатоў,
Дастаў толькі сем гадоў.

Капшука мы тут пакінем.
Можа ён бяз нас ня згіне?
А як будзе нам патрэбным
З рамяслом сваім ганебным,
Мы яго ў савецкім віры
Пашукаем у... Сібіры.

*

Пракурор, разумны дзядзька,
Клопат меў: — Дзе «Сталін-Бацька?»
Дзе прычына, што так скора
Праваліўся, бедны, ў мора?

Значыць, тое кіравецтва
Трэба зара браць у сьледзтва.
Пасадзілі заўтра рана
Сем падручных капітана:
Машыністых, качагараў,
А ніжэйшых большу хмару.
Іх пастрашылі так зручна,
Што яны ўсе адназгучна,
Як гісторыя нясе,
Падпісалі ўсё ўсе.

Сьледзтва клопату ня знала:
Іх і білі вельмі мала —
Ну там толькі для парадку —
Так ішло ўсё чыста-гладка!
Мелі лёгкую фатыгу —
Пратаколаў сшылі кнігу,
Капшука ўканцы прышылі
І так справу завяршылі...

Суд тым майстрам ад вады
Даў зь бяды па тры гады,
Бо там мокры той народ
Гарадзіў п'яны гарод:
Як цыган на панскім балі
На сябе зашмат налгалі.—
(Мог-бы тут і Маркс салгаць,
Пальцы як пачнуць ламаць...)

*

А Івану Кругляку
Ня ўсё пайшло ў руку:
Хоць на дно схаваўся мора,
Дый яго дасталі скора —
Праўда, толькі ня фізычна,
А як трэба, юрыдычна.
Суд яму зрабіў абнову —
Вось якую пастанову:
1) Мусеў знаць Кругляк натуру
І згадаць наперад буру!
2) Трэ' было наперад бачыць —
«Бацьку» ў рамонт назначыць.
3) Выйшла бура першы сорт,
Дык чаму ня зьбег у порт?
4) І чаму ў страшны час
«Бацьку» кінуў самапас?
5) Як ён сьмеў так бескантрольна
Утапіцца самавольна?!

*

Аб ганебным тым скандале
Кучу сьведкаў дапыталі.
Паказалі сьведкі згодна:
— Капітан наш дзеіў шкодна.—

Пракурор там больш гадзіны
Разьбіраў усе прычыны —
(Матар'ял такі багаты!),
Што Кругляк быў вінаваты:
1) Ён ламаў усе загады,
2) Ён дзяржаўнай вінен здрады,
3) А ўканцы, як ненармальны,

Зганьбіў наш прэстыж маральны.
«Кара мусіць быць ня меней
Найвышэйшае ступені!»

Адвакат прасіў паблажкі,
Добрай меры, большай ласкі —
Крышку меншае пакуты.—
Гаварыў аж тры мінуты!

*

Суд тады, як выйшаў з залі,
У бакоўцы разважалі,
Што зрабіць ім з гэтым фантам —
З капітанам, такім франтам,
Непаслушным, грубаскурым,
Тым шпіёнам самадурам?..

Аж зыйшліся вельмі скора
На той думцы пракурора,
Што ім трэба мець на воку
Меру самую высоку.
«Другі раз ён пабаіцца
Самавольна так тапіцца!»

*

РЭЗАЛЮЦЫЯ Капітану Кругляку:
1) Хоць ён быў гэрой двайны
З той Вялікае вайны,
Дык заслугі і мэдалі
Зьняць зь яго... і гэтак далей.
2) Адабраўшы парт-білет,
Так прагнаць на гэны сьвет:
У камуне, каб пазналі
Нашу праўду... і так далей.
3) За праступкі рангу зьняць
4) І пасьмертна расстраляць!
«Ён, Кругляк, не варты ласкі,
Ні найменшае паблажкі —
Вельмі шкодны элемэнт!..»
Падпісалі дакумэнт:
Прадседацель — Безабразаў,
Сакратар — Фрол Крутамазаў.

Словам, Суд зрабіў практычна —
Расстраляў тэорэтычна.

IV. Што з дукамі?

Дзе гэрой наш, Дук Сымон?
Шляхціц, князь, «Наполеон»...
Ён, хоць жыў з сваёй сям'ёю,
Пачуваўся сіратою,
Бо яго, замест у Менску,
Прымасьцілі ў Смаленску.

Дзе даўней была Літва,
У Смаленск зайшла Масква:
Ад сьвякроўскай той апекі
Людзі сталі недарэкі.
Хоць браты ад веку нашы,
А чужыя скваркі ў кашы.
Дык налезьлі і ражны
Ад маскоўскае казны:
Так Смаленск, наш горад слаўны,
Стаў і сам сабе нястраўны:
Хоць гасьцілі яго ласа,
Стаў — ні рыба, ані мяса.

Крок уперад, два назад —
Адыйшоў у трэці рад...
Трэ' прызнацца тымчасамі —
Вінаватыя мы самі:
Калі шапку з вачэй здымем?
Калі вернем сваё Імя?

Наша Імя — словы два:
Мы — ВЯЛІКАЯ ЛІТВА!

*

На будоўлі, пры рабоце,
Дук у пыле і ў балоце
Так згубіўся ў тым народзе,
Што забыўся аб выгодзе,
Аб парадку, аб сыстэме,—
ЧОРНЫ ХЛЕБ быў у праблеме!

А найгорш, што «НЯМА ЧАСУ»!
Згрызьці хлеба, выпіць квасу.
Бо спазьніцца хоць на ёту
На народную работу —
Скажуць: — Дук — работнік дрэнны:
Ты — няпільны, нясумленны...—

Скажуць: — Вун, буржуй крывы —
Бяз ног-рук, без галавы.
У Амэрыцы там недзе
На сваёй машынцы езьдзіў.—
Ты ў трамвай запхніся ўвесь,
Ці вазьмі ў аўтобус лезь!..—

— А пасьля яшчэ тужы —
Крокаў тысяч тры бяжы!..—
Дук з заморскай гаспадаркі
Не хацеў згубіць тут маркі.
Не жадаў з другога боку
Стаць бяльмом на іншым воку.

Жыць зь людзьмі хацеў у дружбе
І дастаць аванс на службе.
Ён у сэрцы і ў душы
Так Амэрыку зглушыў,
Што сказаць мог у сумленьні:
— Я парваў усе карэньні.—

*

Брыгадзір дзяркач быў шорсткі,
Крычаў: Дук, ты — пень нью-ёрскі!
На работу толькі глянеш
І пытаеш нас аб пляне?
Ты ня ведаеш, сарока,
Што плян робіцца на вока? —

Брыгадзір быў з партызанаў,
З гэных, што з ваенных плянаў
І зь вясковай нашай шкоды
Мелі ў лесе ўсе выгоды,
Сьцерагліся днём і ў ночы,
Каб ня ўлезьці немцу ў вочы.

Брыгадзір шукаў прычэпкі —
Не хапала мусіць клёпкі?
А Сымон яму чамусьці
Ад пачатку быў ня ў гусьце.
Кажа: — Вы там балявалі —
Кроў за вас мы пралівалі...—

Ведаў Дук, у чым тут ліха:
Працаваў як вол той ціха.
Ці як зубр ён трос рагамі —
Аж грунт грэбаў капытамі!
Думаў: — Прыйдзе лепшы час,
Бог тады рассудзіць нас.—

А што думаў брыгадзір,
Гэны смык, Ігнат Сьнігір?
Грызься — Дук той хоча ўлезьці,
На маё каб месца сесьці:
Пхаць Дука мне трэба ззаду
У рамонтную брыгаду.

Аж дадумаўся Сьнігір:
— ...лепш яшчэ, каб у Сібір! —

*

І ў Анюты душа й цела
Вельмі моцна тут пацела,
Дык вось Аньця мала-мала
Пад сакрэтам уздыхала:
— Ня прывыкну я ніколі
Тут да новай райскай волі!

— Бо ўсё тут не такое:
Там мы мелі тры пакоі,
Кухню і выгоды з ваннай,
Газ у кухні — чыста і танна...
— Вось стаўкліся мы ў адным:
Дзе-ж падзецца чацьвярым?

— Як да новага жыцьця
Будзем мець яшчэ дзіця?...
Кухня тут на тры сям'і:
Тры раі ў адным вулы...
Мы як шэршні ці як восы —
Злыя ўсе, разнагалосы.

— І адзін на ўсіх тут кран:
Трэ' набраць вадзічкі збан —
Пры другіх і спаць і мыцца,
Есьці, працаваць, маліцца...

Разам склад, салён, камора —
Радасьць, сварка і ўсё гора.
— Людзі-сьведкі навакола.
Чалавек — то ня жывёла,
Каб па сталінскім загадзе
Жыць у стадзе.
А зімой і дзеці ў хаце:
Дзе ім бегаць, дзе гуляці?

— Кажуць нам: «Такое шчасьце
Толькі зь неба можа спасьці!»
«У нас, кажуць, ашуканцам,
Ну, і вам, амэрыканцам,
Месца так даюць адразу,
Бяз ніякага заказу».

— «А савецкі чалавек
Прачакаеш доўгі век:
Трэ' прасіць і набівацца,
Па чужых кутох бадзяцца».—

*

Плачуць дзеці: — Ма-а-ма!
Малака чаму няма?
А дзе хлеб наш западзеўся?
Чорны зьеўся, белы зьвеўся...—

Матка кажа: — Ну, нічога.—
Вам пытаць ня трэба многа.—

— Мама, а зь якой прычыны
Тут схавалі ўсе машыны?
Наша вуліца пустая:
Страшна выйсьці — ўся глухая...—

— Ціха, дзеткі! Край наш гэты —
Беларускія Саветы.—
— Тата, тут аж пуста ў краме!
Лепш было ў Амстэрдаме:
Там і есьці было шмат.—
Мама, едзем-дай назад! —

— Добра, добра! Бог ласкаўшы —
Будзе лепей, пачакаўшы.—

— Мама, тата... гэта-тое...—
— Міла дзетка, залатое,—

Матка кажа: — Хлеб кульгае,
Бульба ў полі падрастае,
Масла згасла... не дасталі,
Цукар хворы ў шпіталі...
— Вось вам, дзеткі, цэлы сказ —
Перацерпім гэты раз.—

*

— Тата! казку хоць скажы.
— Бачыў грушу на мяжы:

Грушкі, грушкі як званкі!
Вось і сказ увесь такі.

— Ліска хоча пажывіцца:
Пачалі зь ёй грушкі біцца:
Стук! адна лісічку ў нос,
Каб ён большы не падрос.
А другія — злыя дзьве —
Стук лісу па галаве!

Як тут вецер наляціць,
Дай жа грушу тармасіць!

Грушкі скачуць ледзь ня ўсе —
Малаціць дай па лісе!
А малюсенькая грушка,
Як ускочыла у вушка,
Дык лісічка рвала, рвала —
Пазурок сабе зламала —
Пазурок стаў як крывулька —
Аж заплакала, бядулька!

Дай у лес, давай у скокі —
Ад той грушы на ўцёкі!
Замяла свой сьлед хвастом
І заснула пад кустом...—

*

Трэці месяц няма часу
І ніякага запасу...
Надта-ж трудна без лядоўкі!
А каб выйсьці з галадоўкі,
Трэба добра патужыць,
Каб да вечара дажыць.

Стогнуць так усе ў Саюзе —
Самі на сваёй абслузе:
Як у будні, так у сьвята
Толькі босая гарбата,
Пападзе кусочак мяса,
Хлеб і соль — уся акраса!

Боршч, бліны, або яешня.
У Саюзе недарэчна —
Сыр, піраг, тварог і масла!
Моцна ў памяці прыгасла.
Мёд і цукар і сьмятана —
Кукіш-купіш, як прадана!

На такі буржуйскі збытак,
Каб штодзённы мець пажытак —
Пры грашах і асьцярожна,
Хто дасужы, дастаць можна.
Як на чорным зловяць рынку,
Дык пасадзяць пана ў скрынку...

*

Дзе падзеўся час Анюты?
Ні гадзінкі, ні мінуты —
Вечна ў працы і ў бядзе..
— Мусіць, нехта час крадзе?
Блутаніна тут ліхая —
Сьвет такой ня знаў, ня знае...

І якраз вось, як на тое,
Кажа нам Пісьмо Сьвятое:
— Як да рэшты час той зыйдзе,
Зара і Антыхрыст прыйдзе:
Супраць Бога, Божай Маці
Сьвет пачне ён бунтаваці.

— Людзі будуць жыць у стадах.
Як зьбяруцца, у грамадах
Будуць блюзьніць Богу ў неба.
Бог тады ня дасьць ім хлеба —
Аж сябе ўжо будуць грызьці
Бяз ніякае карысьці...—

Аньця раз пытала мужа:
— Разум мне ніяк ня служа:
Ці ўжо гэтыя Саветы —
Людзі ўсе — «народ адпеты»?
Ці ты, Дук, — заморскі блягер —
Лезеш сам сабой у лягэр?

— Ці то я не гаспадыня,
Ці камуна — дрэні скрыня?

*

Аньця аж выходзіць з толку:
Круціць бедную галоўку,
Як бялізну мыць у хаце,
Як адзежку шыць дзіцяці?
— Скрозь чужыя прад табой,
Як памыцца мне самой?

Тут жанчыны маюць волю,
Якой сьвет ня знаў ніколі:
Ці на сушы, ці на моры
Пераносіць будуць горы.
Падыймаць, драбіць каменьні,
Пілаваць, спускаць бярвеньні.

Бо камуна, як магла,
Дык жанчынам ўсё дала:
На вайне, ці за вайною
Баба можа стаць гэроям,
Ці ў гуце, ў кузьні, ў шклярні,
У сталярні, у смалярні...

М. К. РАДЗІВІЛ І ЯГОНЫ ДЫЯРЫЮШ

«Працу гэтую маю нашчадкам пакідаю, хай кожны выбярэ, што яму будзе ўдала і адкіне хай тое, што прыдзецца не да спадобы»,— гэтыя словы Міхал Антоні Базыль князь Радзівіл, ведамы па мянушцы «Рыбанька», ваявода віленскі, гетман вялікі літоўскі і інш., інш., запісвае ў «Дыярыюш»— дзёньнік, які амаль штодзённа вёў на працягу большай часткі свайго жыцьця.

Ледзь не стагодзьдзямі складаліся міты і байкі пра Радзівілаў, пра магнатэрыю наагул — камусьці бачацца яны напаўвар'ятамі, садыстамі і дэбіламі, а хтосьці падае іх нейкімі сусальнымі кумірамі шляхоцкага грамадзтва ды айцамі ўсіх сваіх падданых. Але ці не прысьпеў час нарэшце выслухаць і «трэці» бок — самых Радзівілаў? Тым болей што прадстаўнікі гэтага роду ўмелі й любілі пісаць — лісты і дзёньнікі, апісаньні падарожжаў, вершы, драмы і праекты дзяржаўных перабудоваў.

Пісьмовая спадчына Радзівілаў — сапраўдны «архіўны айсбэрг». Але дагэтуль толькі нявялікая частка трапіла на друкаваныя бачыны, ды й тыя выданьні ў большыні беларускаму чытачу недаступныя, бо выходзілі на польскай мове, часам яшчэ ў мінулым стагодзьдзі. Дарэчы, нядаўна ў зборніку «Кніга жыцій і хаджэньняў» убачыла сьвет «Пэрэгрынацыя» Мікалая Крыштафа Радзівіла ў перакладзе С. Шупы. Здаецца, «маўчаньне» нарэшце заканчваецца. Магчыма, нягучная павольная аповесьць, ці, хутчэй, гаворка, князя Рыбанькі дадасьць свой штрых у ачалавечваньне постацяў мінулага, нашай гісторыі.

XVII—XVIII стст. у літаратуры, дакладней, у пісьмовасьці Рэчы Паспалітай — гэта часы, калі дзёньнікі, успаміны, разнастайныя нататкі, хронікі, рэляцыі да нашчадкаў былі ледзь не дамінуючымі. Створаныя найчасьцей дзеля сямейнага карыстаньня, яны доўгі час існавалі ў рукапісах. Гэтыя помнікі прыцягнулі ўвагу польскіх гісторыкаў і пісьменьнікаў яшчэ ў першай палове XIX ст., пасьля першых спробаў публікацыяў. Так, «Успаміны» мазавецкага шляхціча Яна Хрызастома Пасака сталі сапраўдным адкрыцьцём — адкрыцьцём уласнай гісторыі ў ейных жывых непасрэдных рэаліях, сакавітай старасьвецкай пальшчызны і, мо галоўнае, непадробнага сьвету думак і пачуцьцяў чалавека зь мінулага. Гэта выклікала бадай што бум «успамінавыданьня». Цэлы шэраг таленавітых пісьменьнікаў, між імі Ходзька, Жэвускі, Крашэўскі, твораць літаратурныя містыфікацыі ў жанры «Дыярыюшаў». Менавіта ўспаміны Пасака мелі рашаючую ролю і ў стварэньні знакамітай «Трылёгіі» Сянкевіча.

Бальшыня помнікаў пісалася на польскай мове (часам лацінай ці іншымі, францускай альбо нямецкай мовамі), але падзеямі лякальнага характару, прывязанасьцяй да пэўнай мясцовасьці ці паходжаньнем аўтараў яны нярэдка выдавалі прыналежнасьць да Беларусі. Прычым сувязь гэтая далёка не мэханічная: адбітак тутэйшага вялікалітоўскага патрыятызму,

Міхал Казімер Радзівіл. З гравюры Г. Ляйбовіча. XVIII ст.

рэгіянальнага ці этнічнага сьветапогляду, захаваны ў паказе мясцовых падзеяў, стварае часам яскравы помнік нацыянальнай гісторыі і нацыянальнага мэнталітэту ў пэўны пэрыяд. Так, вывучаючы нашую гісторыю XVIII ст., цяжка абысьціся, прыкладам, без успамінаў Крыштафа Завішы ці Мартына Матушэвіча. Цікавыя яны бываюць і для мовазнаўцаў, бо пісаныя часта жывою народнаю гаворкаю ці з моцным уплывам мясцовай моўнай стыхіі. Мабыць, яшчэ большы інтарэс маюць яны для гісторыка культуры: калі аўтары і абыходзяць часам падзеі гісторыі, дык рэаліі побыту, штодзённага жыцьця зазвычай трапляюць у поле іхнае ўвагі. Канешне, ня ўсе аўтары дзёньнікаў валодалі прыродным дарам літаратара, але нават у

іхных няхітрых радках зафіксаваная кранаючая шчырасьць пачуцьця й непасрэднасьць думкі.

Напэўна, усё вышэйсказанае датычыцца і «Дыярыюша» Рыбанькі, які ў арыгінале налічвае некалькі тысячаў старонак, што распавядаюць пра сямейныя радасьці і няшчасьці, соймавыя паседжаньні і галаўныя болі, падарожжы ў Вену і Парыж, пра хатнія забавы ловамі, тэатрам і папойкамі. Міхал Казімер (нар. у 1702, пам. у 1762) не вызначаўся ані асаблівымі талентамі, ані ўдзелам у вялікіх падзеях. Але меў ён надзвычайную «фартуну», як тады называлі маёмасьць,— быў найбагацейшы магнат Вялікага Княства, а мо й усяе Рэчы Паспалітай, а няўмольны лёс зрабіў яго, жадаў ён таго ці не, галавою ўсяго магутнага клана Радзівілаў. Гэта, вядома, надае значнасьці ягоным няхітрым запісам, у якіх ён, магчыма, міжволі застаецца часьцей за ўсё чалавекам простым, нават «маленькім», калі б не стаялі за ім месты й вёскі, сотні жаўнераў і мільёны чырвоных злотых. Але падаецца, што менавіта гэтая прастата, прыватнасьць рыбанькавага дыскурсу й робіць помнік папраўдзе цікавым для сёньняшняга чытача. Скрозь дзіцячую пыху і дамарослую вучонасьць шурпатай лаціны зіхаціць часам аголенасьць чалавечай істоты, непараўнальна больш натуральная, чым, прыкладам, у халодных ацэнках Матушэвіча.

Што да біяграфіі Міхала Казімера, дык яна старанна выкладзеная на старонках дзёньніка. Трэба дадаць толькі, што ніякая «фартуна» не ратуе ад лёсу: адзіны прамы нашчадак Рыбанькі, Кароль Станіслаў, слынны Пане Каханку, памёр бязьдзетным. А пасьля сьмерці Дамініка Радзівіла галоўная нясьвіская лінія Радзівілаў практычна выгасае, уладаньні пераходзяць да бакавых галінаў, і Нясьвіж ніколі ўжо ня ўбачыць тае раскошы й бляску, што былі ў XVIII ст.

Дарэчы, XVIII ст. дагэтуль ці не самае цьмянае ў нашай гісторыі. Калі век Рэнэсансу ці часы Полацкага Княства ўжо ў пэўнай ступені засвоеныя гісторыкамі, пісьменнікамі, нават мастакамі, дык эпоха барока, часы апошняга бляску і трагічнага ўпадку больш населеныя фантастычнымі ценямі, чым рэальнымі ў сваёй складанасьці падзеямі і постацямі. Тое ж самае і з публікацыямі тэкстаў — толькі ў апошнія гады польскамоўнасьць помнікаў беларускай шляхоцкай культуры, здаецца, перастае ўспрымацца як злачыннасьць, і адкрываецца магчымасьць засвоіць гэтую велізарную культурную прастору, што падавалася яшчэ нядаўна пустэчай, дзе пасьвіліся адно прагныя і да свайго і да чужога суседзі.

У адрозьненьне ад бальшыні помнікаў, што публікуюцца зараз па-беларуску, «Дыярыюшу» Міхала Казімера Радзівіла гэтак і ня выпала пабачыць сьвет нават на польскай мове. Мо́жа, падаўся ён недастаткова значным у сэнсе літаратурным ці адштурхнуў велізарны аб'ём, але рыхтаваныя, верагодна, напрыканцы мінулага стагодзьдзя да выданьня дзёньнікі гэтак і не былі надрукаваныя. Урыўкі зь іх скарысталі ў сваіх кнігах знаны польскі архівісты А. Сайкоўскі, а таксама А. Мальдзіс і Г. Барышаў. Але ж і цяпер мы можам прапанаваць чытачу далёка ня поўны варыянт.

Аўтограф «Дыярыюша» захоўваецца ў Галоўным архіве Старажытных Актаў у Варшаве, а ў Нацыянальным архіве ў Менску ёсьць толькі копія, зробленая, відавочна, напрыканцы XIX ст. і трохі скарочаная ў параўнаньні з арыгіналам. Яна і была ўзятая за аснову перакладу.

Рыбанька пісаў дзёньнік на польскай мове, але перанасычанай шматлікімі лексычнымі, граматычнымі й стылістычнымі формамі, уласьцівымі тагачаснай гутарковай беларускай мове. Часам ён мудрагеліць пакніжнаму, але часам амаль літаральна фіксуе плынь сваёй сьведамасьці. Па сутнасьці, гэта польская «трасянка» зь беларусізмамі, архаізмамі, іншамоўнымі цытатамі, індывідуальнымі выразамі, характэрная шмат для якіх твораў згаданага жанру, напісаных у нас у пэрыяд панаваньня польскалацінскай кніжнасьці. Яна месцамі цяжкаватая, але арыгінальная й досыць сакавітая і, думаецца, мае шмат цікавага і нават карыснага матар'ялу дзеля вывучэньня моўных формаў мінулага ды ёсьць у нейкім сэнсе схові-шчам беларушчыны.

Пры перакладзе мы палічылі мэтазгодным пакінуць гэтую «трасянку», бо ў ёй праўдзівы мэнталітэт таго часу нібыта ажывае. Дзеля гэтага перакладчык паспрабаваў максымальна захаваць лексычны склад дзёньніка, па магчымасьці не разбураць канструкцыю сказаў, лёгіку думкі, а як быццам бы перавесьці «стрэлкі» трасянкі ў кірунку ад пальшчызны XVIII ст. да беларушчыны.

Вацлаў АРЭШКА

ДЫЯРЫЮШ

Князя Міхала Казімера РАДЗІВІЛА Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В. К. Літ.

In Nomine Sanctissimae Trinitatis [1]

Anno [2] 1702

Нарадзіўся я дня 13 Junij [3] апоўначы, уласна кажучы, значыцца гэта а гадзіне дванаццатай на паўзэгару, у замку Олыцкім, ад Ясьнеасьвяцоных Караля Станіслава і Ганны, што ад князёў Гераніма і Канстанцыі Сапяжанкі, ваяводзінкі віленскай, Любартовічаў на Белым Коўню і Сувалках, Сангушкаўны, Радзівілаў, князёў на Олыцы і Нясьвіжы, Біржах, Дубінках, Слуцку, Копылю і Клецку, і Сьв. Гаспадарства Рымскага грабяў на Міры, Крозах, Шыдлаўю і Белай, канцлераў вялікіх В. К. Літ., Перамышльскіх, Члухаўскіх, Крычаўскіх, Камянецкіх, Астроскіх, Ніжынскіх старастаў, бацькоў і дабрадзеяў маіх; нарадзіўся ў веры сьвятой каталіцкай рымскай, за што імя Езус хай пахвалёна будзе, і цяпер запэўніваю, што ў сьвятой веры гэтай жыць і ўмерці для яе прагну. Адразу бацькі мае загадалі мяне ахрысьціць, а як ніводнае ім зь дзяцей не гадавалася перада мною, дык загадалі дзеду з бабаю са шпіталю Сьвятога Духа трымаць (для хрышчэньня.— **Пер.**), як жа і трымалі. Гэткая трафіла асаблівасьць, што нарадзіўся я ў замку, які быў пад пратэкцыяй Сьв. Міхала; ксёндз Броніш Societas Jesu [4], які мяне хрысьціў, меў імя Міхал, асыставаў п. Міхал Талалай, віцэ-кусташ касьцёла Олыцкага, дзед, што да хросту трымаў, Сэбасьцян Паўловіч ды Эва Талалаева, а чацьвёртаму, мне, імя было дадзена Міхал Казімер Антоні Базыль. Другая асаблівасьць, што таго ж дня нараджэньня майго была Клішаўская баталія швэдаў з палякамі; таксама ж дапамога прыйшла швэдзкая абложанай Белай, у якой затварыўся быў Ям [5] пан Ежы Сапега, стольнік В. К. Літ.; былі мы на швэдзкім баку, а Пацей, цяперашні гетман В. К. Літ., а на той час падкаморы Берасьцейскі, здабываў яго, і сталася Белая вызваленаю ад аблогі, каторая як для адбіваючых, гэтак і для бароннячых дужа напсаванай была.

Бацькі мае, хутка па нараджэньні маім, праз дамовыя разрухі ўцякаць мусілі з намі і са скарбамі. Падаліся былі да вугорскай мяжы, а адтуль да Прускай Памераніі і ў малым Шчэцінку цэлы рок прабылі, потым у Стараградзе, нарэшце ў Члухаве, дзе пачаў я вучыцца чытаць і пісаць ад ксяндза Градэльскага, дамініканіна і на той час каплана бацькоў маіх. Там спазнаў я Караля Станіслава, каторы абед еў і начаваў у нас. Потым

Кароль Станіслаў Радзівіл, бацька Міхала Казімера. З гравюры Г. Ляйбовіча. XVIII ст.

Ганна Кацярына Радзівілавая (з Сангушкаў) — маці Міхала Казімера. З гравюры Г. Ляйбовіча.

айцец мой паехаў да Белай, а матка мая са мною ў Вармію, да Тыльзы, дзе паўроку пражылі мы самаю найцяжкою зімою.

У року 1709 і мы ў тыя маразы шчасьліва прыбылі да Белай. У Тыльзе далі мне пана Казімера дэ Лятура, маёра ў войску Літоўскім, у рэгімэнце айца майго, за гувэрнёра, які мяне ў тым ўзросьце мунштраваў; зь пікаю, флінтаю і харугвай навучыў; перад прыбыўшым да Белай Ям панам Людвікам Пацеем гетманам вял. В. К. Літ. айцец мой мяне шыхтаваў і з мунштраў маіх быў укантэнтаваны, бо адразу ж гувэрнёра майго авансаваў на обэрштлейтэнанцтва ў тым жа рэгімэнце.

У року 1710 пан Вэнцноўскі, слуга бацькоў маіх, вучыў мяне катэхізму, і ў вялікі чацьвер меў я шчасьце найпершы раз камунікаваць, а Вэнцноўскі застаўся місыянэрам, пабожны чалавек. У Белай мне далі ксяндза Камінскага, езуіта, пасьля таго як вярнуліся з Варшавы, дзе былі на Сойме Дэнгафскім.

У року 1712 вучыўся я вельмі тупа.

У року 1715 па нараджэньні брата майго Гераніма, айцец мой узяў брата майго старэйшага Мікалая, падстолія В. К. Літ. і мяне да Варшавы, і там бавіліся мы, і абое мы, браты, сталіся без накрытых галоў, мне тое не пашкодзіла, а княжа падстолі напёк галаву і ледзь да Белай заехалі мы, у малігны ўпаў, з каторых, тыдню не ляжаўшы, Пану Богу, зь вялікай роспаччу цэлай фаміліі, душу аддаў на дваццатым року веку свайго. З тае сьмерці ўражаны, гувэрнёр мой, на якога руках брат мой сканаў, кінуў вайсковую обэрштлейтэнанцкую службу і запісаўся ў Хрыстусовую, стаўшыся сьвецкім ксяндзом і затым плябанам Нясьвіскім і архідыяканам Беларускім, але і ў рызах быў маім гувэрнёрам да сталых гадоў.

Відарыс Варшавы. Афорт з абраза. Маст. Каналета. XVIII ст.

У тым жа року брат Людвік, сярэдольшы, паміж мной і Геранімам, на Запусты памёр.

Канфэдэрацыя Тарнаградзкая ствярылася, на каторую, як пераехала да Лэнчнай, у року 1716 айцец мой сам паехаў і мяне з сабою ўзяў, і дзе ўжо засталі мы ў арышцэ Ягамосьцяў пана Адама Сяняўскага, кашталяна Кракаўскага, гетмана вял. Кароннага, а наш, літоўскі (гетман.— **Пер.**), Пацей, ледзьве да Люблiна напярэдадні прыезду нашага ўцёк да Сасаў, і мы самыя сталі на Вілянаве ў яго кватэры. На сэсіях cum arbitris [6] выступаць мне ўвогуле не дазволена было.

Там Ям пан Станіслаў Ледахоўскі, маршалак Канфэдэрацыі генэральнай Кароннай, даў мне ліст з загадам, року 1716 дня 4 жніўня на харугву панцырную ў войску Каронным, і сам я тую харугву з абозу выводзіў, калі войска сабе пад Вэнграў рушыла, а мы да Белай вярнуліся, дзе нядоўга бавіўшы паехалі з князем Ямсцем айцом маім на Камісію Скарбовую, якая адпраўлялася ў Берасьці. Быў на ёй маршалкам Ям пан Казімер Сапега, ваявода Віленскі, і там ізноў выступаюць мне cum arbitris не дазволена было.

Напрыканцы року 1716 княжа Іхмосьць, вярнуўшыся зь Берасьця, у року 1717 паехаў на трактат і Сойм Нямы, на каторым circums criptia [7] войска адбылося, і мая харугва зь іншымі разам у войску Каронным зьліквідаваная была, але мне з ласкі Панскай, хаця й адсутнаму на Сойме, у Літве Петыгорская дасталася, як жа пра тое ў архівах паведаміць можа прывілей, альбо ліст загаду sub dato 10 Maij in anno 1717 [8], і ад таго часу маю я харугву на Літве і жаўнерам войска гэтага лічыцца магу.

Потым ізноў да навукі пачаў я аплікаваць, але езуіта, каторы пораху б ня выдумаў, борза мяне пакінуў і нядобра трактаваў, аж мусіў я скардзіцца матцы маёй, каторая яго зараз і адправіла з двара, а мяне з сабой да Нясьві-

Магнатэрыя ў XVIII ст.

жа ўзяла. Былі мы ў Вільні, на Трыбунале, і мне гэтая валакіта спадабалася, бо нічога сабе не вучыў. Айцец мой, дабрадзей, стараўся, абы ж далі яму езуіты для мяне ксяндза Бжазоўскага, на той час казнадзея Варшаўскага, калі ж яму гэтага адмовілі, узгневаны пісаў да піяраў. Па вяртаньні да Белай, пакуль піяр дыстынгнаваны дзеля мяне прыбыў бы зь Лесны, піяра ксяндза Тэадора адшукана было; з тым паўроку бавіўся я, але не прафітаваў анічога; потым прыехаў ксёндз Цэзары ад Сьв. Юзафа, піяр; гэты быў у мяне гады са два, з гэтым сіла прафітаваў я, і дзісь што ўмею, дык зь інструкцыяў яго. Памёр ужо, хай з Богам спачывае навекі.

У 1718 року ў Белай Ямць ксёндз Якім Пшэбендоўскі, біскуп Луцкі, ў Вялікі Чацьвер дары сьвятыя сьвяціў і на другі дзень сьвятаў крыжмаваў у аа. рэфарматаў, дзе я ўмацованы сьвятой споведзяй і камуніяй крыжмаваўся. Patrinus [9] мой быў Ям пан Уладзіслаў Сапега, ваявода Берасьцейскі, швагер маці маёй, таму што меў за сабою Хрысьціну Сангушкаўну, родную сястру малодшую маткі маёй; узяў я імя Юзаф з маёй ахвоты, Дэадатус з загаду Яа князя айца маяго і дабрадзея.

У тым жа року княства Іхмосьці бацькі мае на Сойм да Горадні паехалі. Пры гэтым Яемосьць пані Эльжбета, зь Любамірскіх Сяняўская, кашталянава Кракаўская, з адзіначкай дачкой, да Мендзырэчча, добраў сваіх, прыехала. Hoc sciendum [10], што з гэтай паннай брат мой старэйшы Мікалай мала ня быў заручоны; партыя пэўная і поўная bonorum paternorum et maternorum [11] у дзядзіцтва; удаўся я ў канкурэнцыю; я там уставічна аморы пладзіў і са студэнта гжэчным гахам зрабіўся. У той час бацькі мае вярнуліся; маці жадала гэтай партыі, айцец жа мой не жадаў; вярнуліся княства Іхмосьці in Decembri [12].

1719

Цэлы месяц Januarius [13] княства Іхмосьці бавілі ў Белай з добрай кампаніяй, аж да 6-га Februarij [14].

Die [15] 17 Febr. Захварэла сястра мая Караліна на воспу.

D. 11 Martij [16]. Мой брат малодшы Геранім таксама на воспу захварэў.

Каралеўскі замак у Варшаве. Маст. Каналета.

D. 18 Mar. Сястра мая Тэкля таксама на воспу захварэла.

D. 21 Mar. У маладосьці хварэў я часта на фэбры тэрцыяльныя, да таго праз кожныя тыдні са два-тры болі галаўныя, зь цяжкімі меў ванітамі; пачалася водра, і тыя ўсе слабасьці трывалі да воспы, на якую цяпер захварэў, ад якой вельмі цяжкія болькі высыпалі, і меў іх незьлічоную колькасьць на целе і аж да 23 Aprilis[17] з ложка не ўставаў, чым айца маяго моцна стурбаваў, бо ўгрызаўся ён, абы страціўшы in anno 1715 двух сыноў, мяне трэцяга не згубіў; з гэтакай альтэрацыі і сам, спачатку на жаўтуху, потым на пухліны d. 24 Aprilis захварэў, у каторай хваробе d. 24 Augusti desijt vivere[18] на вялікае няшчасьце фаміліі і жаль Маэстату, Сэнату і ўсіх прыяцеляў, якіх мог мець, быўшы трыццаць гадоў міністрам і пячатарам, зышоў з гэтага сьвету, зь пекнай душы дыспазыцыяй. Тастаманту не пісаў ніякага, калі ж запытана было ў яго, як disponit domum,[19] адпавёў: пакідаю пачцівых жонку і дзяцей, усё гэта іхнае. Ям ксёндз Пшэбендоўскі, біскуп Луцкі, даў яму папескую абсалюцыю ante agonem[20], хай ён з Богам спачывае, і хто гэты пункт чытаць будзе, суплікую таго за душу ягоную, аб трох прывітаньнях анёльскіх. П. Бог гэты ўчынак міласэрны ўзнагародзіць. Пакінуў нас шасьцёра, гэта значыцца Кацярыну панну, другую дачку Канстанцыю, якую айцец мой за жыцьця яшчэ выдаў замуж за Ям пана Яна Сапегу, кашталяна Троцкага, каторы паўроку толькі зь ёй жыў і, як паклуцiліся між сабою, дык сястра ў доме ў нас жыве, мяне Міхала Казімера, Тэклю панну, Караліну, таксама панну, і брата майго Гераніма ў пятым року. Я, досыць малады, застаўся цэлай фаміліі апекуном і мусіў з моладу мысьліць аб інтарэсах Дому.

D. 26 Augusti. Княгіня Яймосьць дабрадзейка, матка мая, захварэла; бо далібог у поўным адчаі была і не раней у сябе прыйшла, як дня 13 Septembris[21].

D. 10 Septembris. Я сам захварэў быў цяжка на ваніты, якія з тае ака-

Дрэздэнскі Цьвінгэр. Маст. Каналета. XVIII ст.

зіі паходзілі, што на кані хібіў бягучым, праз што зь нязьмерным моцам з каня шванку меў; гэтак заўсёды бараніў Пан Бог няшчасьця, але ж вось, як перад гэтай сваёй хваробай усядаў на каня, дык у той момант парвала яго хвароба вялікая і на каменьне перад замкам Бельскім кінула, з гэтакай альтэрацыі і айца жалю, на ваніты захварэў і трываў у хваробе аж да 28 Sbris.

D. 1. Octobris.[22] Паехаў я да Янава, да Ям ксяндза Пшэбендоўскага, біскупа Луцкага; таго ж дня на ноч да Высокага, да Ям пана пісара Літоўскага Сапегі стаў; там заначаваўшы, назаўтра паехаў да Чарнаўчыц на абед да князя Ям ваяводы Наваградзкага, стрыя майго, там пераначаваўшы, да Тарэспаля, да Ям пана гетмана Пацея, які мне быў рады і пусьціў аж назаўтра па абедзе, і адкуль назад да Белай вярнуўся.

D. 26 Decembris. Выехалі мы да Варшавы на ўзнаўленьне Сойму ў Горадні, лімітаванага пад ляскай Ям пана Крыштафа Завішы, старасты Менскага. 30 Dbris. Сойм шчасьліва распачаўся.

1720

Цэлы месяц Januarius бавіліся мы на Сойме.

D. 20 Ferbuarij. Аддаваў я па айцу маім пячатку ў Сэнаце. Пан Бог дазволіў, што меў plausum[23] у пана і ва ўсіх, калі большая палова плакала, і там мог убачыць, што: ня май сто коп, май сто другаў, бо праз акамадацыю сваю айцец мой знайшоў да сябе кампасію і мне праз памяць яго ласкаўцаў і дабрадзеяў пакінуў. Propter жа majorem curiositatem[24] у гэты Дыярыюш упісваю, каб яе (прамову.— **Пер.**) па архівах не шукаць et tenor est talis[25]:

«Як ня маючы пасольскага, Сойм гэташняга характару маю скарыстаць, Найясьнейшы Міласьцівы Кароль Пане і Пане мой міласьцівы, з жалаблівай інструкцыяй tristis fali[26] неадплаканага айца майго cum voce passiva[27] ад асірацелага Дому маяго

Духавенства. XVIII ст.

перад Маэстатам Вашай Каралеўскай Міласьці, Пана маяго Міласьцівага, Найшаноўнейшым Сэнатам і ўсёй Рэччу Паспалітай самотны стаю orator [28]...»

Па скончанай прамове маёй Ям пан Шэмбек, канцлер вялікі Каронны, прыгожа і годна падзякаваў мне за аддадзены і гэтак доўга кансэрваваны ў доме маім дэпазыт, прадракаючы і ў далейшым часе ласку панскую для мяне і маіх. Сам аддаў я да рук Аўгуста II, пана майго міласьцівага, які, прымаючы з рук маіх ворак зь пячаткаю, сьціснуў рукі мне, і сьлёзы яму навярнуліся на вачох, а я яго ў валечную пацалаваў руку. Таго ж моманту князь, Ям Сангушка, маршалак надворны В. К. Літ. на той час, а цяпер вялікі (маршалак.— **Пер.**) Літоўскі, родны брат маткі маёй, гэтую ж пячатку ад трону перадаў князю Міхалу Вішнявецкаму.

Item [29] Сойм. d. 23 Februarij, а гадзіне дванаццатай па поўдні зарваўся з аказіі той, што Ям пан Сяняўскі, кашталян Кракаўскі, гетман вялікі Каронны, аддаў над войскам чужаземным каманду пану Флемінгу, генэрал-лейтэнанту войска Кароннага і фэльдмаршалку Саскаму, і потым заўважыў, што сам ня мае рацыі і адабраць нічога ня можа з усяго, што даў: узрушыў грамаду. Паслы ўпіраліся, і чатырнаццаць паслоў з урачыстаю маніфэстацыяй супраціў камандзерства Флемінга зь ізбы выйшлі, і Сойм зарвалі, аднак non praejdical [30] Горадзенскаму in Loco [31] Сойму.

На гэтым Сойме сусьпіраваў я да панны Кракаўскай з аблігацыі маткі маёй.

D. 3 Martij. Атрымаў з ласкі панскай засьведчаны прывілей subdato d. 28 Februarij 1720 на староства Перамышльскае.

D. 22 Martij. Ямць ксёндз біскуп Луцкі Пшэбендоўскі меў урачыстае чытаньне па нябожчыку сьв. памяці аніколі не аплаканым айцу і дабрадзею маім. Па абедзе таго ж дня, той жа Ямць ксёндз біскуп Луцкі саленнае цела сьв. п. айца і дабрадзея майго выправадзіў аж за места pontifkaliter [32] разам і з намі, каторае цела гэтае выправаджана да

Шляхта. XVIII ст.

Нясьвіжа і там павінна быць пахавана, як in Domo aeternitatis [33], аднак жа дэпанавацца будзе пакуль у касьцёле Мірскім і там стаяць будзе да пахаваньня.

D. 9 Maij. Выяжджаў я на старства Перамышльскае, пры асыстэнцыі Іхмосьцяў пп. Сяняўскага, кашталяна Кракаўскага, гетмана в. Кароннага, Ябланоўскага — ваяводы Рускага, Фрэдры — кашталяна Львоўскага, Ябланоўскага — старасты Чыгрынскага, і іншых Ямцяў паноўураднікаў. Найперш прыехалі мы да касьцёла катэдральнага, дзе меў ахвяру Сьвятому Духу Ям ксёндз Драеўскі, дэкан Перамышльскі, па чым проста на замак паехалі, дзе вітаў мяне Ям пан Ябланоўскі, ваявода наш Рускі, ад ваяводзтва, а Ям пан Устжыцкі, харунжы на той час Перамышльскі, ад зямлі, мелі прамову. Юрамэнту слухаў Ям пан Сяняўскі кашталян Кракаўскі, гетман в. Кар. Я слухаў пана Карвоўскага, пісара, ды зь ім судзіў абы фундаваць юрысдыку. Войска сіла, харугваў і рэгімэнтаў было in assistentiam [34] уезду маяму; там некалькі разоў прамову мецьмусіў.

Празь некалькі дзён splen-didissime [35] трактаваў я. Па судовых паседжаньнях прысьвяцілі мне айцы езуіты панегірык, пасьля якога пайшлі мы пад намёты, пакуль на сталы накрылі. Потым елі мы абед, па абедзе пайшлі ўсе пехатою на дол, да маткі маёй; дадзена нам ведаць было, што Ям пані Кракаўская едзе, насустрач каторай выехалі мы да переводу, і якая, стаўшы ў Перамышлі, ела ў нас вячэру.

D. 14 Maij. Судзіў я і на судох, даваў прысягу паном віцэрэгенту Вяняўскаму і рэгенту Кульчыцкаму, субдэлегатам. Па судох адʼехалі мы да Ям пана Кракаўскага на абед. Пры гэтых кратахвілях Пан Бог мяне скрушыў, бо сабе жадаў я каралеўны Шарлёты, і матка мая ўжо была ўпэрсвадаваная, а цяпер нешчасьлівыя фактары йзноў намовілі, гэтак што пана Кракаўскага аб дачцэ для мяне прасіла. Гэты ж, як ад Радзівілаўны жа народжаны, дык жадаў дачцэ сваёй партыі, але матка яе таму працівілася моцна, аднак жа жонку ўпрасіў і сам мяне заручыў з дачкой; ужо тады аб маёй дабрадзейцы Шарлётцы думаць ня можна было. Па абедзе Ям пан Кракаўскі зь Ям паняй Кракаўскай на замак езьдзілі, для сусцэпту, і потым Ям пан Кракаўскі паехаў зь Перамышля, правёўшы якога, Ям пані Кракаўская, узяўшы з сабою

Войска Рэчы Паспалітай саскіх часоў.

Ям панну Кракаўскую, да нас на вячэру прыехалі, па вячэры ўсе паразьехаліся.

(Ад 15 траўня да 7 ліпеня — падрыхтоўка да ўрачыстага пахаваньня айца. Зьяжджаюцца запрошаныя.— **Пер.**)

D. 8 Julij [36]. Зрана цэлебраваў Ям Ксёндз Пшэбендоўскі біскуп Луцкі pontificaliter, казаньне меў Ям ксёндз Чарнеўскі, архідыякан Беларускі. Па набажэнстве выправоджвалі цела зь вялікай апарэнцыяй. Пры выхадзе прамову меў Ям ксёндз Дэ Лятур, былы мой гувэрнёр, па лаціне. Суправаджалі цела ксяндзы біскупы: Бжастоўскі — Віленскі, Пшэбендоўскі — Луцкі, Анцута — каад'ютар Віленскі, намінат Смаленскі, Падкоўскі — інфулат Кодзенскі, усе асыставалі pontificaliter. Мы ж з усёю фаміліяй ішлі за целам пехатою, аж за места. Потым цела ўстаноўлена было на возе, дзеля гэтага прыгатаваным, пры якім устанаўленьні рэгімэнты тры разы сальвы далі, потым паўсядалі ўсе да карэтаў такім чынам: у першай Ям ксёндз біскуп Віленскі і Ям ксёндз каад'ютар, якія проста да Нясьвіжа паехалі, у другой Ям ксёндз біскуп Луцкі і намінат Смаленскі, у трэцяй Ям пан мечнік Каронны, у чацьвёртай княгіня Яймосьць Радзівілава мечнікава В. К. Літ.; князь жа Ямць мечнік В. К. Літ. і я затрымаліся зь целам і рэгімэнтамі, якімі сам Ям пан Станіслаў Дэнгоф, гетман польны В. К. Літ., ваявода Полацкі камандзераваў, а пад ім быў Ям пан Пакаш, харунжы надворны В. К. Літ., палкоўнік гусарскі Ямці пана гетмана в. В. К. Літ. ад усяго войска В. К. Літ.

Мяшчане. XVIII ст.

польскага аўтарамэнту, ад кожнай харугвы гусарыі і петыгорыі, колькі іх было, па васьмі з пахолкамі камандзераваных было. Hoc sciendum [37], што ўвесь час, ад сьмерці ў Белай і пры дэпазыцыі (цела.— **Пер.**) у Міры імшы цяклі, сьпяваньні зь вігіліямі адпраўляліся. Абед елі мы ў Гарадзею, у карчме, дзе нас Ям пан гетман польны В. К. Літ. і цэлая тая гміна трактавалі. Пры гэтым з князем Янам, ваяводам Наваградзкім і Мікалаем Фаўстынам Радзівілам, стрыямі маімі, хочучы ўкрыцца ад п'янства, да Рудаўкі схараніліся, і там чакалі мы, пакуль цела айца маяго не надыдзе. Тады далі нам знаць, што на гасьцінцы праміж войскам стаўся тумулт; ускочылі мы з князем мечнікам на коняў у панчохах і жалобных плашчыках: знайшлі мы гетмана ўзгневаным і войсчычка наша бунтуючым; але ж пэрсвазыяй усьмірылі мы яго і на тым полі, пакуль цела надышло, дзесяць бочак віна выпілі. Затым, як цела прыбыло, suo ordine [38] кожны йшоў да места, і гэтая дэдукцыя ўрачыстая фунэбральная выправаджэньня цела князя Ямці айца і дабрадзея маяго зь места Міра да места Нясьвіжа спраўленая была ўвечар а гадзіне дзевятай, такім чынам: ішлі ад самай Рудаўкі да фарнага касьцёла Нясьвіскага грамады і мужы ўсяго княства Нясьвіскага і грабства Мірскага і ўсіх добраў у ваяводзтве Наваградзкім парамі, кожны ў руцэ сьвечку несучы. Потым цэхі і месты ўсе, у тым жа ваяводзтве Наваградзкім быўшыя, suo ordine ішлі, цэхі са стрэльбамі, а месты са сьвечкамі; пасьля іх ішоў рэгімэнт пешы Ям пана Пацея, гетмана вялікага В. К. Літ.; правадырстваваў ім Ям пан Зіновіч, стараста Ашмянскі, палкоўнік пешы булавы польнай В. К. Літ. За імі петыгорыя і гусарыя йшлі, каторых Ям пан Пакаш, харунжы надворны, палкоўнік булавы в. В. К. Літ. вёў. За імі йшлі брацтва ў капах, потым аа. бэрнардыны, дамінікане, аа. езуіты ў комжах; Clerus [39] дыяцэзіі Луцкай і Віленскай; за імі йшло інфулатаў: Альшанскі Олыцкі, Падкоўскі Кодзенскі, Туміловіч апат Сьвятакрыскі, Нясьвіскі ў інфулах і чатырох біскупаў таксама ў інфулах, менавіта: Бжастоўскі Віленскі, намінат Смаленскі, Панцэжынскі суфраган Беларускі; за імі воз шасьціконны, на каторым цела стаяла, коні і людзі ў капах кармазына-

Палац Радзівілаў у Варшаве. Маст. Каналета. XVIII ст.

вых аксамітных, з галёнам залатым і цалун такі ж; пакаёвых дваццаці чатырох з паходнямі, таксама ў капах аксамітных кармазынавых вакол возу йшло. За цалун трымаліся мы самыя, за возам ідучы, сьпярша радзіна — браты і сёстры, потым князь Мікалай Радзівіл, мечнік В. К. Літ., з Барбарай Завішанкаю, жонкаю сваёй, Ям пан Дэнгоф, гетман польны В. К. Літ., Ям пан Заранх, стараста Жмудзкі, і сіла іншых сэнатараў, дыгнітараў,ураднікаў В. К. Літ.; за імі йшоў рэгімэнт драгоніі булавы польнай В. К. Літ. конна, і гэтак, з гэтакай фунэбральнай помпай прайшлі мы празь места; перад брамай прамову меў Ям ксёндз Дэ Лятур, прымаючы цела да места; як сталі на цьвінтары, Ям ксёндз Антоні Вайніловіч, казнадзей ардынарыйны Нясьвіскі, меў прамову, па сканчэньні каторай айцове езуіты з возу труну зьнялі і самыя занесьлі да касьцёла, паставілі на катафалку, які разам з касьцёлам каштоўна і вельмі пекна быў ілюмінаваны. Пры гэтым рэгімэнты пешыя і драгонія тры разы выдалі сальвы, гэтае ж і цэхі ўчынілі, пры гучным біцьцю ў замку з гарматаў.

D. 9 Julij. А чацьвертай гадзіне пачаліся вігіліі рускія аа. базыліянаў і імша сьпяваная, пасьля каторай заканчэньня аа. бэрнардыны вігіліі сьпявалі безь імшы; потым Claerus дыяцэзіі Віленскай зь біскупам сваім Ямцем ксяндзом Бжастоўскім вігіліі сьпявалі і памянёны біскуп меў імшу сьвятую, у сярэдзіне каторай Ям ксёндз Ян Жаброўскі, пралат і афіцыял Віленскі, Funebralem [40] вельмі годна меў прамову. Падчас заканчэньня імшы пяхоты, драгонія, цэхі, гарматы замкавыя йзноў, як учора, агню давалі пры досыць значнай музыцы і пекнай ілюмінацыі як касьцёла, гэтак і Cactri doloris [41], якія цалкам новымі агнямі і іншым манерам ад учарашняй ілюмінаваныя былі; потым усіх, як біскупаў, кліры-каў, панства і войска ў замку Нясьвіскім трактавана. Матка мая ў пакоі была, як сінагорліца плачучая ў жалю, аднак жа ніводнага дня не прапускала, каб у араторыюме, што над скарбніцай, насупроць араторыюма езуіцкага, падчас цырымоніі ў касьцёле ня быць.

D. 10 Julij. У тым жа касьцёле diverso splendore et apparata [42] ад учарашняга адараваным, ксяндзы бэрнардыны, а па іх дамінікане вігіліі

Дрэздэнскі Цьвінгэр. Каля 1750 г. Маст. Каналета.

сьпявалі, па якіх Яснавяльможны Ям ксёндз Анцута, каад'ютар Віленскі, намінат Смаленскі, cum suo claero officium defunctorum decantabat tandem [43]; па скончаных hoc ordine вігіліях, той жа Ям ксёндз намінат Смаленскі pontificaliter убраны, імшу сьвятую цэлебраваў, падчас каторай імшы, Ям ксёндз Сухоцкі, схалястык катэдральны і аўдытар Луцкі, меў казаньне фунэбральнае, а па скончаным казаньні, як жа і па імшы сьвятой, надышоў кандукт у гробе фундатарскім, пры каторым я сам, разам з ксяндзамі езуітамі, меў гэтае шчасьце, exportare [44] цела сьв. памяці князя Ямці айца і дабрадзея маяго, пры дэпазыцыі якога, як пяхотай, драгоніяй, цэхамі, гэтак жа і гарматамі агню давана. Асыставала пахаваньню цела, справуючы гэты кандукт, чацьвёра вышэйпамянёных ЯВВ. Іхмосьцяў ксяндзоў біскупаў. Па скончаным кандукце панегірыка меў прамовіць Ям ксёндз Чарнецкі, аддаўшы мне пасьля панегірык. Потым гэтыя ўсе ЯВВ. Імці ксяндзы біскупы, як жа таксама і клірыкі, законы і іншыя status saectaris [45], прысутныя, да замку на абед запрошаныя і трактаваныя былі ад мяне.

D. 11 Julij. Іншай ізноў апарэнцыяй касьцёл прыаздоблены быў, у якім пасьля адсьпяваных Іхмосьцямі ксяндзамі бэрнардынамі, потым дамініканамі вігіліях, пачался імша, сьпяваная, якую цэлебраваў Ям ксёндз Панцэжынскі, суфраган Беларускі. Казаньне меў ксёндз езуіт Керсьніцкі, казнадзей каралеўскі Варшаўскі. Па набажэнстве ўсе да замку на абед накіраваліся. Таго ж дня Ямць ксёндз біскуп Віленскі да Вільні, Яемосьць пані ардынатава Замойская да Гарадышча, князь Ямць Радзівіл, ваявода Наваградзкі, з сынам да добраў сваіх ад'ехалі.

D. 12 Julij. Іншай ізноў апарэнцыяй касьцёл прыаздоблены быў, у якім Іхмці ксяндзы езуіты абавязковую службу адпраўлялі; вялікую Імшу сьпяваў Ямць ксёндз Бжазоўскі, казнадзей Варшаўскі. З касьцёла ўсіх у рэфэктары езуіцкім трактавалі, на якім трактаваньні (як лічана) было асобаў трыста. Гэтага ж дня, зранку, перад набажэнствам, Ям пан Дэнгоф, гетман польны В. К. Літ., ад'ехаў да Стаўпцоў; па скончаным жа абедзе, князь Ямць крайчы В. К. Літ. з княгіняю Яймцяй да Турца, Яемць пані ваяводзіна да Менска з дачкою сваёй ад'ехалі.

D. 13 Julij. Ізноў іншая апарэнцыя, якую штодня пераманяюць у касьцёле была, дзе вігіліі ксяндзы

Кавалерыст. З гравюры Рыдынгера. XVIII ст.

бэрнардыны калі адсьпявалі, дык імшу цэлебраваў Ям ксёндз Падкоўскі, інфулат Кодзенскі, канонік Жмудзкі; казаньне меў Pater Soc. Jesu. Зіхэн, якому на амбоне галава ад сьвечак гэтак захварэла, што, казаньне ня скончыўшы, з амбона зышоў і ў пяць дзён fatis cessit [46]. Абед усе елі ў замку; па абедзе Ям ксёндз каад'ютар Віленскі, намінат Смаленскі ад'ехаў да Наваградка.

D. 14 Julij. Дзеля нядзелі і сьвята ніводнае фунэбральнай у касьцёле цырымоніі не адпраўлялася, абед, аднак, для ўсіх у замку быў звычайны.

D. 16 Julij. Касьцёл, як заўсёды, іншым манерам і апарэнцыяй быў прыаздоблены. Абавязковую імшу і імшу de Requiem [47] сьпявалі спачатку ксяндзы бэрнардыны, а па іх вялікую імшу цэлебраваў В. Ямць ксёндз Сухоцкі, схалястык катэдральны і аўдытар Луцкі, былы гувэрнёр і дырэктар нябожчыка, брата майго князя падстолія Літ.; пасьля імшы на абедзе ў замку ўсе былі, каторых трактаваў я.

D. 17 Julij. Апарэнцыя касьцёла і ў гэты дзень зьмененая была; вігіліі ж і сёньня ад законаў сьпявана, па якіх Іхмці ксяндзы езуіты Сьвятаміхальскія абавязковую службу адпраўлялі; імшу сьпяваў Ям ксёндз Лукашэвіч у аўтара фундатарскага С. Крыжа; па імшы на абед да замку ад мяне запрошаныя ўсе, хто дачыненьне меў да гэтага пахаваньня. І гэтак акт гэты фунэбральны скончыўся, які трываў праз дзевяць дзён. Па закончаным пахаваньні, госьці, ad propria [48], як Ям ксёндз Пшэбендоўскі біскуп Луцкі да Янава, князь Ям мечнік В. К. Літ, з княгіняю Яймцяй сваёй да Цімкавічаў разьехаліся. Пры ўсіх аблігацыях, павінных дзецям ды матцы, і за гэтую апошнюю паслугу, што айцу маяму праз яе ўчыненая, няхай Бог ёй у добрым пачуцьці ўзросту кансэрвуе здароўе.

D. 18 Augustij. Выехалі мы на абед да Наваградка, дзе трактаваў я шляхту праз цэлы дзень.

Саскі каралеўскі двор.

D. 19 Aug. Пайшлі мы сойм Аўтакаміцыяльны, дзе без усялякай кантрадыкцыі абралі мяне на пасла першы раз, дадаўшы мне за калегу Ям пана Жабу, падкаморыя ваяводства Наваградзкага. Па абіраньні запрасіў я ўсю шляхту да сябе і трактаваў.

D. 29 Septembris. Падпісалі мы ў Белай кантракт пажыцьцёвай прыязнасьці паміж Ям панам Браніцкім, старастам Бранскім, і сястрою маёй старэйшай Кацярынай. (Шлюб меў адбыцца 21 кастрычніка т. г.— **Пер.**)

1721

(Падарожжа за мяжу.— Пер.)

D. 4 Novembris [49]. Выехаў з Члухава дарогай на Кюстрын і Франкфурт да Бэрліна, куды прыбыў 22-га г. м.

D. 23 Nov. Зранку быў зь візытам у мяне Ям пан енэрал Швэрын, зь якім а гадзіне дзесятай раніцы паехалі дзеля прывітаньня караля Ямці Прускага. Гэтага ж дня еў абед у караля, а на каляцыі быў у княгіні Яймці маркграфавай.

D. 26 Nov. Таксама ў Бэрліне. Прэзэнтаваў мне Ям пан енэрал і міністар Форкады ўсялякія каралеўскія сплендоры і raritates [50]. Гэтага ж дня еў абед у Ям княгіні маркграфавай... і ў той жа дзень на асамблях і каляцыі быў у каралевы Яймці; у гэты ж дзень быў у мяне зь візытам Ям пан Кумпф, падкаморы Брандэнбурскі.

D. 16 Decembrij. Спыніўся я ў Дэсаў у князя Ямці Ангальцкага і таго ж дня ўвечары быў у стрыевай маёй.

D. 18. Dec. У гэты дзень з князем Ангальцкім езьдзіў я на паляваньне, на якім сваёй уласнай рукою забіў дзікоў пяцёх.

D. 22 Dec. Быў з князем Ангальцкім на вялікім паляваньні, на якім сваёй рукою забіў дзікоў дзевятнаццаць і сарнаў тры. У той жа дзень, разьвітаўшыся з князем Ангальцкім, стрыевай маёй і ўсімі астатнімі, вырушыў.

1722

D. 7 Januarius. Спыніўся я шчасьліва ў Дрэзьне, дзе праз ардынанса маткі і дабрадзейкі маёй для сябе і для людзей прыгатаваную знайшоў кватэру. Тут застаў Ям пана Францішка Бажэнцкага, судзьдзевіча земскага Перамышльскага, які тут на мяне чакаў і пры мне праз увесь час будзе ў тых краёх заставацца.

D. 8 Jan. Адслухаўшы імшы сьв., вітаў я караля Ямць у гэты дзень; у каралевіча Ямці ня мог быць, паколькі паляваньнем ён бавіўся, аднак жа быў зь візытам у Ям пана Фіцтума і ў Ямці пана кухмістра Кароннага.

D. 7 Februarij. Зранку сабраліся мы на пакоях. Адтуль на пляц, дзе бегаюць да пярсьцёнка; двума бандамі бегалі мы, кароль з адной паловай кавалераў, і я пры панскай быў бандзе, каралевіч з другой паловай. Два здарыліся казусы: першы, калі князь Міхал Чартарыскі, падстолі Літоўскі, кароткага зроку, бегучы да пярсьцёнка, прамянуў яго і над ім трапіў, і, ламануўшы, каня свайго ў крыж ударыў, мала з каня не зьляцеўшы. Другі: Ям пан Залускі, ваявода Кіеўскі, як прыйшло шпадай другі браць пярсьцёнак, дабываючы шпады, пусьціў каня мыльна, конь як скочыў супраціў караля, ланцуг жалезны зарваў, а сам ён Пана мала шпадай не прабіў, нарэшце ж людзі каня з кавалерам схапілі; Пан аб тым ня гневаўся, толькі вымавіў: «que cela est maladroit.» [51] Па скончаным карузэлю кож-

ны з нас дахаты, да адпачынку да сябе ад'ехаў, што і я зрабіў.

D. 8 Feb. Быў я на пакоях; з панам у касьцёле, потым сказана мне былоісьці да каралеўскага стала на абед, куды й пайшоў; некаторыя сэнатары з аднаго боку стала ўсядаць пачалі, а кароль сеў у канцы стала, потым мне паказаў, каб сеў пры ім, я сеў, пры мне сядзеў князь Чартарыскі, падстолі Літоўскі. Па абедзе Чартарыскі прыходзіць да мяне, як жа быў у гадох старэйшы, і пачынае выгаворваць мне, нібыта зь сяброўства, што яго і іншых ураднікаў Каронных падсядзеў; адразу ж экскузаваў я, што мне Пан сам загадаў і, калі заўважыў, што яшчэ штосьці бурчэць ён пачаў, паведаміў, што мы ня ў Польшчы, але ў Imperio, і я не павінен мейсца саступаць ураднікам, будучы Princeps Imperij [52]; «але гэта кароль польскі» — я, бачачы, што канвэрсацыя наша разагравацца пачала, кажу яму, што няма мне што экскузаваць, і хто мае крыўду ці сам Ваша Княжа Мосьць вольна прыгадаць аб ёй, я дам сатысфакцыю заўсёды, і на гэтым скончылася, калі князь убачыў, што ad togam [53] суплікуе, а не ad sagam [54]. Увечары быў на балі ў графа Флемінга, фэльдмаршала войскаў Саскіх, дзе быў міласьцівы Пан і ўся фамілія; дапазна там бавіўся.

D. 11 Febr. На ранішніх пакоях загадалі нам нумары браць, я ўзяў № 7-мы ў бандзе каралеўскай, пры гэтым Пан так ласкавы быў, што па васьмі кавалераў у кожнай бандзе было і восем бандаў; Пан да сваёй усіх узяў палякаў, толькі адзін быў барон Рахвіц, канюшы вялікі Саскі, і гэтак былі мы: Кароль, Машчынскі, шамбелян, Панятоўскі, падскарбі В. К. Літ., Шэмбек, Канцкі, енэрал Падольскі і артылерыі Кароннай, кн. Чартарыскі, падстолі В. К. Літ., я і Рахвіц. Mademoiselle Пэнцых малодшая, пекная comme les amoure [55], мяне да сябе за moitie [56] атрымала. Загадалі нам на вячэры быць з дамамі нашай банды ў караля, абед у сябе; а трэцяй гадзіне зьехаліся мы на пакоі і там вячэру з Панам елі, з нашымі moitie, па каляцыі — у маскі; з гардэробу каралеўскага даміны паўкладаўшы, з Панам пайшлі мы на рэдуту. Каралеўская moitie была баронава Левэндалева, маршалкава найвышэйшая Саская.

Коньнік у манэжы. З гравюры Рыдынгера. XVIII ст.

D. 12 Febr. Штодня вельмі рана ў шпадзе эксэрцытаваўся, таму што ў Польшчы вельмі мала ад француза старога скалечанага навучыўся. Кароль так ласкавы быў, што перад вокнамі сваімі казаў мне даваць лекцыі; потым на пакоях, абед у сябе, па якім каляцыя ў графа Кёнігсеха, пасла цэсарскага і гранд-майстра каралевы, Пан там прысутнічаў і ўся найясьнейшая фамілія.

D. 14 Febr. Па абедзе, досыць раньнім, у Цьвінгэргардэне ўсе разам з Панам стралялі мы да цэлі з паляўнічых мушкетаў; мне ня вельмі ўдалося, бо нічога ня выйграў, таго дамогся, што ні пераможцам ні быў, як іншыя, каторым вершапіс панегірыкі правіў, ні гэтакім, як тыя, што вельмі дрэнна стралялі, дык капусты ім есьці загадвалі, пазьбег абодвух тых клопатаў з ласкі Божай.

D. 15 Febr. На набажэнстве і на пакоях быў, абед у сябе, вечарам на балі ў каралевіча, чуўся неўкантэнтавана, пайшоў гуляць у фараона і, прайграўшы тысячу таляраў бітых, як змыты, вячэры ня еўшы, спаць пайшоў. Вый-

шла мне гэта на дабро, бо вотум учыніў і праз увесь вояж болей не гуляў, а патроху мог бы болей прайграць, ад чаго мяне Пан Бог абараніў.

D. 16 Febr. Абед у сябе; з пакояў паслаў прэзэнт маёй moitie, штучэц шчыразлоты ангельскі для падвешваньня з дыямэнтамі, вахляр, за якія даў сто чырвоных злотых, некалькі тузінаў рукавічак на лаку чынскім, пекных вельмі; вечарам быў у апартамэнтах каралевы баль і каляцыя, на якой я быў, і, заплаціўшы доўг учарашні, лягчэй мне танцаваць было.

D. 17 Febr. Па раньнім абедзе ўсе ў сукнях машкарных убраныя былі; наш строй быў ружовы градэтуравы, з галёнам срэбным, а плашчыкі гарнастаямі падшытыя, на галаве каскеты высокія зь пер'ем белым. Гэтакім парадкам выехалі мы з замку: un d'etachement [57] драбантаў, потым коні на повадзе, машталеры ў палатне ружовым, так жа сама ўбраныя, як і мы, потым катлы і трубачы, за імі кароль, за Панам нас тры пары, Рахвіц у канцы адзін, за ім трыумфальны воз у восем коняў, і там дамы нашай банды ўсе сядзелі; у нас, у кожнага, па чацьвёра людзей пяхотай, у палатне ружовым, як і возьнікі ў возе, і за намі арлекінаў банда тым жа парадкам выступала, і гэтак усе банды йшлі адна за адной, перад кожнай маючы коняў на повадзе, катлы і трубачоў; канклюдаваў марш другі аддзел драбантаў. Калі прыйшлі мы на пляц, дамы ў залях Цьвінгерскіх узялі мейсцы свае, а мы бегаць пачалі па нумарох. Трэба было сьпярша ад кожнай банды па аднаму выехаць, што ўчыніла восем, і чацьвёра супраць чацьвярых бягуць, мы супраць арлекінаў; і статуі былі з дрэва, падобна да арлекінаў паўбіраныя, а яны да скарамушаў бегалі. Першая статуя трымала ў адной руцэ кружок, а ў другой кій скураны, саломай напханы, сама на шрубе, трэба было, ламануўшы ў гэты кружок, праскочыць; калі хто ўдарыць добра, дык нічога; калі ж нядобра, дык павернецца тая статуя і гэтым кіем у лоб дасьць; другая статуя на грудзёх мела круг жалезны, куды куляй глінянай трэба было ўдарыць, дык як трафіў у сярэдзінку, дык ракета ўгору вылятала, калі ж дрэнна, дык мільён шмэрмэляў пад ногі конскія і чалавека самога абсыпала. Трэцяя статуя мела на раменьні скрынку, у якую, калі трафіў, дык зь яе пташын розных вялікіх, а менавіта: фазанаў, курапатак, перапёлак, бакасаў і малых таксама розных вылятала — а калі трафіў у другую, дык уцякаць ад таго, што ў той скрынцы трэба было. Чацьвёртая статуя мела на грудзёх кружок, у які лапаткай трафіць трэба было, дык з губы вядро вады вылівалася міма кавалера, калі ж ня шыбка адскочыш, дык усяго аблівала. Пятая скрынка на зямлі ляжала, у якую, калі трафіў, дык лісы, зайцы, трусікі выбягалі. Гэтыя ўсе штукі трэба было ў адным заходзе бегаючы рабіць, і восем кавалераў тое рабіла; то коні зьдзічэлыя жахаліся, то, хаця я й добра зрабіў, але ж як калега дрэнна, дык усе тыя птушкі і зьвяры, і ракеты і найлепшага каня зьмяшаюць. Дзякаваць Богу, што я ніводнай гісторыі не нарабіў. Па скончаным карузэлю раздавалі нумізмы аб тым карузэлю, мне два дасталіся. Пайшлі мы на каляцыю, было восем сталоў, і кожная банда ў сваёй кампаніі сядзела, адтуль пайшлі мы на рэдуту, і там кожная банда танцавала дапазна.

D. 18 Febr. У касьцёле, на пакоях, абед у сябе; увечары быў у пана Клаўра, сакратара каралеўскага і банкіра маяго, ад якога браў грошы, калі мне патрэбна было. Позна, калі йшлі, вяртаючыся да сябе, паж мой, на той час п. Яблоньскі, застаўся сцаць на вуліцы, потым, скончыўшы, пабег даганяць мяне, пры гэтым ронт, што хадзіў, заўважыўшы, што нехта бяжыць,— за ім, ён, гэта бачучы, хутчэй да нас пасьпяшаўся, тады варта надыйшла, і празь яго мала нас да кардыгардыі не пабралі, але ж кожнага да станцыі прыправодзілі. Я спыніўся ў Дрэзьне на Тэпергасэ ў Катэрбургхауз; вельмі ж лапкі лізаў, што ў кардыгардыі бязьвінна мала не апынуўся.

D. 27 Febr. Быў у касьцёле і разьвітаўся з панам, потым каралеваю і каралевічамі; абед еў у фэльдмаршалка Флемінга, з markнымі разьвітаўся і ў падскарбіевай вялікай каронннай Пшэбендоўскай быў на кампаніі.

D. 28 Febr. У касьцёле быў, потым абед у сябе еў; адправіў да Польшчы пана Бялазора са зваротам назад, да мяне, таксама Ружэўскага, кухмістра, каторы сваволіў, і пана Грабоўскага, якога хатнія інтарэсы ад розных звольнілі забаваў. Рушыў фурманамі экіпаж мой, у якім паехаў Ям ксёндз Швай-

Панарама Бэрліна. З гравюры. XVIII ст.

коўскі, Ям пан Бажэнцкі, Ям пан Курдваноўскі, камэрдынер Фішар і лёкаі; я з пажам Яблоньскім конна застаўся. Увечары поштай выехалі, на першай пошце Зайзэн начуем, тут з экіпажам ізноў сустрэліся.

D. 2 Martij. Прыбыў да Прагі.

D. 5 Mar. Быў зь візытам у графа Цьвірбі, вялікага бургграбія Чэскага, які мяне запрасіў на абед. Па абедзе быў у графавай Марлінікен; там мяне прэзэнтавала яна дамам, а там такі звычай: хто першы раз будзе, трэба каб нехта прэзэнтаваў, тады ўжо на ўсіх асамблях міла будзеш прыняты, і толькі прыйшоўшы, гаспадыні трэба павітаць, якую лёгка пазнаць, бо ў фартуху кітайкавым гафтаваным ходзіць, і такі ж ёсьць звычай ва ўсіх местах цэсарскіх.

D. 7 Mar. Розныя ў месьце аглядаў raritates, абед у сябе; пошту да Польшчы пісаў, да маткі маёй.

D. 9 Mar. Абед у сябе, вечарам на асамблях у графавай Турн; hoc sciendum, што на тых асамблях анічога не ядуць, ані п'юць.

D. 14 Mar. Дзень паштовы, нікуды з дому не выходзіў. Тут паляка з панам Чацкім знайшлі мы, нейкага Дольнэра, якога я за пажа прыняў да сябе, дзяцюк, здаецца, будзе гжэчны, а з адным пажам цяжка, асабліва калі ў яго экспэнса грашовая, а ён разам функцыю падскарбія спаўняе.

D. 14 Mar. Выехаў з Прагі, і 22 г. м. прыбыў да Ведня [58].

D. 23 Mar. У нашай гасподзе спыніўся граф Фэрдынанд Альтгайм, які быў сьпярша ў Саскім войску енэралмаёрам, потым тут у Польшчы ў Літоўскім служыў, ён, як бываў у нас часта, ды аддзячаны за службу ў бацькоў маіх і мяне знаў, дык зь ім трымаю кампанію; ён мяне ўсюды інтрадукаваў, як ніжэй пра гэта. Там некаторыя рэчы загадаў зрабіць для сябе, праз што ўвесь дзень не выходзіў са станцыі.

D. 24 Mar. Атрымаў пошту ад маткі маёй з Польшчы і паслаў даведацца пана Курдваноўскага да падкаморыя цэсарскага, просячы аб прызначэньні гадзіны для аўдыенцыі цэсарскай; даў яе на заўтра а гадзіне трэцяй па поўдні.

D. 25 Mar. Па абедзе коньмі ў вялікіх кутасох і пекным экіпажам, што сабе справіў, выехаў да замку, там некалькі вялікіх прайшоў апартамэнтаў, у астатнім затрымаўся пакоі; пры гэтым, як часіна настала, выйшаў падкаморы і выклікаў: «Князь Радзівіл!» — і мяне ўпусьціў. Сам жа выйшаў за дзьверы; я йшоў, тры разы каленам прыкленчыўшы тут на прастоле пад балдахінам сядзеўшаму Каралю VI, цэсару хрысьціянскаму, які ў строі гішпанскім убраны быў, на галаве капялюш зь пер'ем; вымавіў яму камплімэнт, на што ён пекна адказаў і пытаўся: адкуль еду і куды, і ці доўга тут забаўлю? Потым галавою кіўнуў, што азначала, каб пайшоў ужо; я, яго ў руку пацалаваўшы, адышоў аж да дзвярэй, тылу яму не паказваючы, тры разы прыкленчыўшы, выйшаў; там таго ж пана Курдваноўскага пасылаў я да падкаморыя Вялікага цэсаравай пануючай, просячы аб прызначэньні аўдыенцыі і ў яе, якую ж на заўтра на трэцюю гадзіну прызначыў. Першы раз я быў на асамблях, куды мяне прывёў граф Альтгайм і

прэзэнтаваў мяне княгіні Рабулью[59], якая заўсёды штодзённа асамблі давала, нягледзячы на старасьць гадоў сваіх; яна была па дому князёўна Галштынская і primo voto[60] была за графам Зюцэндорфам, айцом цяперашняга вялікага канцлера Аўстрыі, а потым за французам Рабулью. Спавядаўся і камунікаваў таксама.

D. 26 Mar. На прызначаную гадзіну паехаў я на замак і пайшоў на апартамэнты цэсаравай пануючай; упушчана мяне да Audienc-Zimmer [61]; тым жа спосабам, тры genuflexje [62] ўчыніўшы, застаў я пад балдахінам на прастоле Альжбету, з дому Брунсвэк-Вольфэнбютэль, цяперашнюю каралеву цэсараву хрысьціянскую рымскую. Пані паважная і сьлічная; па кампле-мэнце, мною ўчыненым, вельмі са мною ласкава размаўляла. Потым пацалаваўшы ў валечную ручку, да сябе вярнуўся; увечары быў на асамблях. Пасылаў таго ж пана Курдваноўскага да графа Вальтэр, гранд магістра цэсаравай Амаліі, удавы, просячы аб аўдыенцыі, якую на чацьвёртую гадзіну прызначыў на заўтра.

D. 27 Mar. Зранку быў на замку, падчас абеду цэсара і цэсаравай; толькі яны ўдвая сядзяць у стала на абедзе, і кавалеры ў стала служаць, а пажы яду носяць; як першую чарку цэсар вып'е, дык панства і кавалеры разыходзімся, кожны да дому на абед, толькі застаюцца падкаморы і камэр'юнкеры і да канца служаць; што да нас, дык толькі стаім, глядзім, пакуль цэсар не нап'ецца. Па абедзе паехаў на аўдыенцыю да цэсаравай Амаліі, да якой таксама з патройным прыкленчаньнем падыходзіў; яе застаў, як і вышэйзгаданых, на прастоле, пад балдахінам прастол. Амалія, цэсарава з дому Гановэрскага, удава, жонка Юзафа, цэсара рымскага, матка каралевы польскай Марыі Юзэфы; дык яна, маючы дачку за сынам Пана нашага, мяне міла й ласкава прыняла, і сіла пра што пыталася; яе таксама пацавалаўшы ў руку, вярнуўся да сябе. Вечарам ізноў быў на замку, на вячэры цэсарскай, тут ёсьць ужо дыфэрэнцыя, бо так жа сама цэсарства само сядзіць у стала, дамы дворскія пры стале служаць, есьці носяць. Што на абедзе, дык вольна прысутнічаць, але да вячэры трэба паведаміць зранку грандмайстра, дык у рэгестар упіша, і тады да тых пакояў упушчаюць. Хаця б найпершы прыйшоў міністар, а не ўпісаўся зрана ў рэгестар, дык прыдзьвернік ня ўпусьціць, але трэба штодня пасылаць, труднасьці гэта ня чыніць ніякай; тое ж самае, трэба разумець, і ва ўдовае цэсаравай, у якой таксама на вячэры прысутнічаў; яна толькі з дачкой, яшчэ паннай, але ўжо заручанай за сынам электара Баварскага, ад Сабескай народжанага, дачкі караля, несьмяротнай памяці, Яна. Адтуль пасьля быў на асамблях; пошту да маткі маёй у Польшчу экспэдаваў, пасылаў да графавай ахмістрыні, просячы аб аўдыенцыі дзьвюх дачок, каралеўнаў, і прызначылі на заўтра на трэцюю гадзіну, пасьля абеду.

D. 28 Mar. На замку быў і асыставаў абеду цэсарскаму, па якім вярнуўся да сябе; праз тыя абеды вельмі позна ў Вэдэнскім двары ядуць. Па абедзе ў прызначаную гадзіну меў гонар аўдыенцыю мець у арцыкнязёўны Марыі Тэрэзы, у пятым року веку свайго, і ў другой, у чацьвёртым року, Элеаноры Хільбурны Юзэфы, калі першая нарадзілася anno 1717, дня 3-га траўня, другая anno 1718, д. 14 верасьня; дочкі яны цяперашняга цэсара Караля, панны ў досыць маладым веку, але як што, дык за старога сур'ёзьнейшыя; старэйшая пыталася: адкуль еду? І ці доўга тут буду бавіць? — па гэткай канвэрсацыі, пацалаваўшы ў ручкі, разам у абедзьве, і, разьвітаўшыся, адышоў да сябе; увечары, подле звычаю свайго, на асамблях быў; ізноў пасылаў да грандмэтрэсы, просячы аб аўдыенцыі ў цэсараўны Юзэфаўны, і назначаная на заўтра была а трэцяй гадзіне.

D. 29 Mar. На пакоях падчас абедаў цэсарскіх, потым абед еў у сябе, па абедзе меў гонар у замку, на апартамэнтах, мець аўдыенцыю ў арцыкнязёўны Марыі Амаліі, дачкі цэсара Юзафа народжанай anno 1701, д. 21 кастрычніка і таксама сястры малодшай каралевы нашай Польскай; яна досыць ласкава са мной гаварыла, руку ёй пацалаваўшы, пайшоў. Вечарам быў на асамблях; ізноў пасылаў таго ж пана Курдваноўскага да грандмэтрэсы прасіць аўдыенцыі ў дзьвюх цэсараўных Леапольдаўных, і дадзена мне была аўдыенцыя на заўтра, у адной а гадзіне трэцяй, у другой — а чацьвертай.

D. 30 Mar. Таксама ж ранак стравіўшы, як і ўчора, па абедзе ў сябе,

Шэнбрун. Імпэратарскі палац. 1760 г. Маст. Каналета.

паехаў на замак і меў у адным з апартамэнтаў першую аўдыенцыю ў арцыкнязёўны Марыі Элізабэт, народжанай anno 1680, д. 13 сьнежня, дачкі цэсара Леапольда, сястры цэсараў Юзафа і Караля, якая мяне міла прыняла і веле мне чыніла квестый, між іншым, пыталася мяне, ці ведаю каралеўну Сабескую Шарлёту? Адказаў я, што ведаю і маю той гонар да яе належаць [63]. Трэба ведаць, што маці цэсарская і яе (арцыкнязёўны.— **Пер.**), Леапольдава жонка, была князёўна Нэйбурская, з дому Палатынаў, родная сястра электара Караля Палатына і каралевы польскай Якубавай Сабескай, праз што Шарлёта была цэсараўне цётачнай сястрою. Пры гэтым гаворыць: «Кажы мне шчыра, з чаго ня выйшла тая прыязьнь паміж вамі?» Адказваю, што каралеве нешта не здалося. «А цяпер хочаш?» — зрэзала, бо быў у Польшчы замоўлены з дамаю non parvi momenti [64], але меў да каралеўны вялікае сэрца і вырашыў прасіць, абы ў гэтым патрафіла, на што мне абяцала, мовячы: «Таго толькі асьцерагаюся, ці не дарэмна ўжо, бо мелася ўжо пайсьці за княжыча le Boullion, аднак жа буду старацца перашкодзіць таму». Затым, руку ёй пацалаваўшы, адышоў. Потым да другога пайшоў апартамэнту на аўдыенцыю арцыкнязёўны Марыі Магдалены, народжанай anno 1690, д. 18 сакавіка, дачкі таго ж цэсара Леапольда, роднай сястры Марыі Элізабэты, Юзафа і Караля, цэсараў; з гэтай, ня так веле мовіўшы і пацалаваўшы ручку, пайшоў і паехаў да сябе, потым на асамблі.

D. 31 Mar. Пачаў па раніцах вучыцца фэхтаваць, і ў Польшчы ўжо трохі ўмеў, бо гувэрнёр мой ксёндз Дэ Лятур вучыў мяне, а тут Дэ Лувэн даваў мне лекцыі; аднак жа штодзень на пакоях бываў, зранку і ўвечар. Тая асаблівасьць, што цэсар з цэсаравай абед самыя толькі елі, другі абед цэсарава Амалія з цэсараўнай дачкой, трэці абед цэсараўны Леапольдаўны елі, дык трэба было пры тых трох абедах адзін за адным асыставаць і ў кожным чакаць, пакуль ня вып'юць; тое ж самае і вячэра; абед праз гэта позна, а вячэры ўвогуле ня еў, але па вячэры цэсарскай той жа час на асамблі ехаў. Як я да двара заўжды езьдзіў, да дамаў дворскіх сіла падкахоўвайся, і добрая была кампанія з дамамі, адны есьці носяць, другія ў пярэдніх пакоях з намі сваволяць і досыць любіў там мешкаць, бо часу не прыходзілася губляць, заўжды колькі разоў на дзень валасы акамадаваць

трэба было; і ўсё бадай што пры двары, бо на асамблях чалавек і прыгожага ўбачыць і цікавага спазнае; тое толькі горшыла, што па адпраўленай аўдыенцыі даводзілася швайцарам прыдзьверным цэсарскім манэты плаціць як патрэбна; яшчэ горш, што грандмайстар пры кожным двары па аўдыенцыі таксама прыходзіць, і таму трэба даць, і сіла мне гэта каштавала.

D. 1 Aprilis. Зранку быў у аа. капуцынаў, візытаваў целы дому Аўстрыяцкага ў труне ляжачыя; там жа скарбец цэсарскі бачыў, цернь сапраўдны Пана Езуса, цьвік ад рукі Пана Езуса і сіла пекных і праўдзівых рэліквіяў; асабліва бачыў гэтае: фляшку шкляную, у якой муха лазіць, як прыйдзе да дзюркі, нічым незашпунтаванай, дык назад да донка спадае, а шпунта ў фляшцы нямашака, і паведамленьне ёсьць, што гэта некалькі сот гадоў, як сьвяты экзарцысты закляў д'ябла і загадаў у муху абярнуцца, і дагэтуль сядзіць у той постаці ў фляжцы.

D. 2 Apr. Трэба паведаміць, што двор гэты вельмі пабожны; быў на імшы ў касьцёле катэдральным сьв. Стэфана, спавядаўся, і ўся цэсарская фамілія там была, камунікавала там Панства зь вялікай прыкладнасьцяй; потым з Панствам паехаў я на замак, дзе перад абедам цэсар сам умываў дванаццаці ўбогім ногі і карміў іх сваёй рукою, сам есьці ім насіў, потым ялмужыны даў, што і цэсарава ў другой залі рабіла, з той розьніцай, што не дзядам, але бабкам дванаццаці ўмыла ногі, карміла і ялмужыну давала. Па гэтай цырымоніі цэсарства да стала села; аб тым забыўся яшчэ, што поруч не сядзяць, але на адным баку, на адным канцы стала адно, другі ж, на другім канцы стала сядзіць. Як цэсарства напілося, пайшлі на пакоі цэсаравай Амаліі, тая з дачкой бабкам, як і цэсарава пануючая, ногі мыла, карміла і ялмужыну дала, потым у стала з дачкой сядзела, як напілася, пайшлі мы на пакоі арцыкнязёўнаў, якія тым жа спосабам бабкам тые ж чынілі паслугі. Мыцьцё жа тым спосабам, што мядніцу вялікую пад ногі ўбогаму паставяць; першая дама прысутная ваду на ногі ліе, сам цэсар рукой пашаруе і ногі сурвэтай выцера, а потым на сухой назе крыж вялікім пальцам рукі зробіць і гэтае месца пацалуе. Як уся цырымонія скончылася, паехаў на абед да сябе і дзень гэты набажэнствам скончыў.

D. 3 Apr. Наведаў гробы, што і цэсарства з усёй фаміліяй чыніла, зь вялікай пабожнасьцяй і прыкладам для ўсіх людзей, якія на гэта глядзелі. Графы там у капах па адным ходзяць праз места ад касьцёла да касьцёла; звычай пасіі і дысцыплін у капе такі там, што кожны, па вуліцы асобна ідучы, б'ець сябе дротавай дысцыплінай, дык кроў пушчае з плячэй, мяса шматамі на зямлю падае, а лёкай, за ім ідучы, воскам са сьвечкі ліючымся, прыпякае плечы збалелыя, каб цела ня падала і кроў не выцякала; капнік, як увойдзе да касьцёла, дык толькі лежачы моліцца, альбо кленчачы і то ў дзьвярох касьцельных, але там сябе ня б'е, але як рушыць далей, дык ходзячы сябе цьвічыць. Другая манера капнікаў: таксама паадзінку крыж вялікі, цяжкі і доўгі па вуліцах насіць басанож, у правай нагі вялікі ланцуг з куляй гарматнай, якая на ланцугу за ім цягнецца, і гэта таксама не малая мартыфікацыя. Трэцяя манера: кій доўгі працягне праз рукавы суккні і капы і гэтак, раскрыжаваныя маючы рукі, ад касьцёла да касьцёла ходзіць, і гэта вялікая ёсьць мартыфікацыя. Вуліцамі, якімі цэсарства гробы абыходзіла, паўсюль па шасьці бярвеньняў часаных дзеля выгаднейшага хаджэньня, як кладкі пакладзеныя. І гэтак дзень той сьвяты на служэньне Богу зышоў.

D. 5 Apr. Пры Двары былі ўрачыстасьці, як у першы дзень сьвятаў Вялікодных; з касьцёла паехала цэсарства да замка. Цэсар жа езьдзіць у карэце васьмю конямі, а возьнік на дышлевым кані сядзіць; цэсар сам, адзін, у тыле карэты, а цэсарава насупраць сядзіць. Ёсьць рацыя ў тым, што, хаця і жонкаю ёсьць, але падданая цэсарская, дык не разумею я, калі, едучы прыватна, побач сядаюць, асабліва цяперашняе панства, якое паміж сабою па-хамску кахаецца. Па прыбыцьці на замак даны быў абед. Цэсарства там паселі, цэсарава Амалія і ўсе арцыкнязёўны; як цэсар напіўся, усе мы разьехаліся. Я еў абед у Ямці ксяндза Грымальдзі, нунцыя папскага, зь якім меў яшчэ ў Польшчы, калі быў ён польскім нунцыем, знаёмства. Па абедзе, досыць позьнім, карэта мая не прыйшла, у нунцыевай да станцыі сваёй ад'ехаў, там, ва-

Параконны экіпаж. Маст. Каналета. XVIII ст.

ласы паправіўшы, на вячэру цэсарскую паехаў. Тым жа спосабам, што і на абедзе, цэсарская фамілія сядзела, толькі з той пераменай, што на абедзе цэсарава Элізабэт, пануючая, па правай руцэ цэсара сядзела, а цэсарава Амалія, удовая, па левай, а на вячэры Амалія па правай, а Элізабэт па левай, а калі пытаўся «Чаму?» адказалі: паколькі вячэра даецца ў апартамэнтах цэсаравай — заўжды, і толькі яе дамы служаць, дык Амалію як госьцю ў сябе прымае. Па якой вячэры быў я ў княгіні Рабулью на асамблях, подле штодзённага яе звычаю, хаця і пры старасьці гадоў, заўжды любіла яна кампанію.

D. 6 Apr. Зранку эксэрцытаваўся ў фэхтаваньні; абед еў у графа Альтгайма, па абедзе, каля чацьвёртай гадзіны езьдзіў на прамэнад, гэта ёсьць забава ўсіх годных у гэтым месьце; выяжджаюць за браму некалькі тысячаў карэтаў у парадзе, значыцца карэта за карэтай, да пэўнага мейсца едуць і заварочваюць то там, то сям, то тая, то гэты ў карэце мінаюць, хто з кім мае знаёмасьць, дык кланяюцца, хто ж не, дык сабе ў карэце сядзіць, і гэтак да вечара наезьдзіўшыся, на цэсарскую вячэру едуць, а адтуль на асамблі, што і я пунктуальна штодня рабіў. Забыўся напісаць, што прыбыўшы застаў тут Антонія, які перад тым быў у бацькоў маіх тапізьерам, родам зь места Міра, які з Рыму вяртаўся па-пілігрымску, гультай вялікі; як мне патрэба была ў лёкаях, дык казаў яму барвы злажыць, маючы намер, ад'яжджаючы стуль, даць яму новую сукню пілігрымскую і да Польшчы яго зьвярнуць.

D. 10 Apr. З асамбляў вярнуўшыся, вячэраю ў сябе. Ксёндз Швайкоўскі пачаў мне выгаворваць, мовячы, што мае моц мяне высячы ад маткі маёй яму дадзеную, чаму дыспанаваў я, і дужа мы зь ім лаяліся. Давёў яму, што я паўналетні, дык ніхто мне губэрнатара даць ня мог, і калі ж мне маці мая Вашмосьць пана дала, дык толькі pro socio itineris [65] і дзеля людзей маіх і дзеля паважнасьці маёй; спыніліся мы на тым у канцы, што

Марыя Элеанора, прынцэса Ангальт-Дэсаўская. З гравюры Ляйбовіча. XVIII ст.

абодва пісаць будзем да маткі маёй, ён ад сябе, а я ад сябе, і якую дэцызію атрымаем, дык абодва задаволеныя будзем.

D. 11 Apr. З раніцы, на ложку мяне застаўшы, выбачэньня прасіў у мяне, але ж не хацеў адступіцца, каб да маткі не пісаць, і пісалі мы абодва, кожны сваім сэнсам; па скончаных справах паштовых бавіўся я тым, што і ўчора.

Прабавіліся мы ў Ведні да 21 траўня, праводзячы час на тых жа самых забавах і паляваньні з Цэсарам.

Выехаў зь Ведня я да Мніхава [66] і прыехаў 28 траўня.

D. 29 Maija. З раніцы электарава Баварская, de domo Сабеская, караля Яна дачка, цётка мая, прыслала да мяне, каб да яе прыйшоў і меў аўдыенцыю; экіпажам ейным прыехаў да замка. І яна мяне мужу свайму электару прэзэнтавала; абед еў у сябе; на вячэры быў у княжыча Фэрдынанда, другога сына электаравага, і з самой княжной de domo Palatini Rheni [67] граў у лёмбра, дзе пазнаёміўся з усімі сынамі электарскімі: найстарэйшым Каралем, які з цэсараўнай заручаны, малодшай сястрой каралевіча Аўгуста жонкі, нявесткаю цяперашняга караля нашага, Клемансам, біскупам Мюнстэрскім, Тэадорам, біскупам намінатам Лескім, і гэтак за адзін дзень усю спазнаў фамілію.

D. 2 Junij. З раніцы быў на электарскіх пакоях, абед у сябе; па абедзе асыставаў электару на нешпары рэвіяльным за ўсіх электараў гадавіны, па заканчэньні якога паехалі да Сьв. Тройцы кляштара, дзе мнішкаю была электарава дачка, там засталі электараву, зь якой вячэру ў кляштары елі і потым адвезьлі да замку.

D. 3 Jun. Асыставаў электару ў касьцёле на экзэквіях, потым, прыправодзіўшы яго на пакоі, меў аўдыенцыю павіншавальную з тае нагоды, што сын старэйшы атрымаў дэклярацыю цэсараўны Юзэфаўны; падобныя ж меў у электаравай і ўсёй фаміліі; абед еў у сябе; вечарам быў у княжыча Фэрдынанда на кампаніі і з самым ім гуляў у карты, вячэра ў сябе.

D. 4 Jun. Па набажэнстве з пакояў электаравай глядзеў на працэсію Божага цела, на якой сам электар ішоў, была вельмі людная і з рознымі рэпрэзэнтацыямі, досыць цікава глядзець; абед у сябе еў. Увечары быў на апартамэнтах у садзе электарскім, там каляцыя, елі мы па малых століках, я ў століка электарскага сядзеў, потым быў баль і трываў дапазна.

D. 13 Jun. Канчаючы дваццаты рок веку свайго, спавядаўся, дваццаць першы шчасьліва пачаў. Абед і вячэра ў сябе.

D. 14 Jun. З раніцы, пасьля набажэнства, з электарам езьдзілі за паўмілі адсюль да Німфэнбурга, там елі мы абед і каляцыю і вялікай магніфіцэнцыі бачыў я maison de plaisance [68], сюды ў Мюніх позна вярнуліся.

D. 24 Jun. Выехаў зь Мюніха і, едучы на Аўгзбург, Ульм, Штутгард, прыбыў да Гэйдэльбэрга.

D. 5 Julij. Па абедзе, ад'ехаўшы мілі 2 ад Гэйдэльбэрга, спыніўся ў Мангэйме, месьце новазаложаным сучасным электарам; той, узгневаўшыся на лютраў, пакінуў рэзыдэнцыю ў Гэйдэльбэргу і цалкам новае места бу-

дуе Мангэйм і фартэцыю і замак нечуванай пекнасьці, і ўжо мала чаго няскончанага засталося; самога ж не застаў, бо выехаў за паўтары мілі да Швэтцынга ў лясную рэзыдэнцыю.

D. 6 Jul. Паслаў да Швэтцынга пана Францішка Бажэнцкага, кавалера маяго, з камплемэнтам да электара, просячы аб прызначэньні часу на аўдыенцыю для мяне, калі маю ў яго быць. Сам візытамі і агляданьнем асаблівасьцяў тутэйшых бавіўся.

D. 7 Jul. Прыслаў электар карэту ў шасьцёра коняў і кавалера, запрашаючы мяне да Швэтцынга, каб, сеўшы і ад'ехаўшы паўтары мілі, спыніўся на станцыі мне прызначанай; дык там меў у электара аўдыенцыю, які ўжо пан паджылы і вельмі мілы стары. Ласкава ён мяне прыняў з аказіі, што primo voto меў за сабой Караліну Радзівілаўну, князя Багуслава, канюшага В. К. Літ. дачку, зь якой меў Альжбету дачку, якая замужам за князем Шульцбахам, таксама з дому Палатынаў і спадкаберцам электарату гэтага, і абое жывуць пры айцы. Меў электар зь ёй і сына, але з асаблівым няшчасьцем, бо як Караліна Радзівілаўна нарадзіла сына, баба, што прымала, з радасьцю ўбачыўшы, што сын, з пацехі, на матку забыўшыся, сына мыць пачала, тут дайшло да яе, што матка памірае, яна сына ў ваду выпусьціўшы — да маткі, і сын утапіўся, і матка памерла, і гэтакі тая наша Матрона канец мела. Secundo voto [69] меў за сабой Любамірскую, сястру маю, якая нарадзілася ад князёўны Астроскай, сястры адзінакроўнай айца майго і дачкі Кацярыны Сабескай, сястры Караля Яна і маёй бабкі; але і гэтая in prolie [70] памерла. Затым быў я ў князя і ў самой Альжбеты, народжанай з крыві маёй, міла ад іх прыняты; абед з электарам, вячэру з княствам Шульцбахамі еў, таму што электар вячэры ня есьць, але абедаў ён з княствам, дачкой і зяцем; княжна сама сьпявае прыгожа і сама грае на клавіцымбале вельмі добра. Тут у палацы і начую я.

D. 8 Jul. Увесь дзень гэты ў Швэтцынгу бавіў, асыставаў электару ў полі з сабакамі на чаплі і качкі.

D. 9. Jul. Раніцою вярнуўся да Мангэйма, аддаваў візыты міністрам і паном, розныя рарытэты аглядаў.

D. 27. Jul. Спавядаўся, адзначаючы імяніны маткі сваёй, і электар загадаў, каб у гэты дзень урачыстасьці ладзілі, танцавалі мы дапазна.

Шляхціч і дама. Маст. Каналета. XVIII ст.

D. 4 Augustij. Сёньня разьвітаўся з электарам і князямі Шульцбахамі зь вялікім маім жалем і, ад'ехаўшы мілі са 2, да яхту ўсеў электарскага; Пан гэты так ласкавы быў да мяне, што шасьціконным возам загадаў прывезьці правізію — шмат вінаў і ежы; нарэшце ў месьце імпэрскім Вормсе начуем, дзе места такі ж мне падарунак дало, як і места Ульм, менавіта куф віна.

D. 4 Aug. Прыбылі мы да Кобленца, рэзыдэнцыі электара Трэвірскага, адзінакроўнага брата электара Палатына, там паведаміў я аб сабе і зараз жа прыслаў карэту да яхту. Прыехаўшы да замку, меў аўдыенцыю і з электарам абед еў; па абедзе, разьвітаўшыся, у далейшую пусьціўся дарогу. І гэты пан ласкавы таксама правізіі на дарогу прыслаў; начуем у Нойцайце.

D. 8 Aug. Пад Бонам вялікая бура настала, гэтак што мачту ў яхта паламала, мала мы не ўтапіліся; усё ж ласка Пана Бога, што яхт імпэт рушыў і

аж да паловы на сухую зямлю ўбіў, і ўжо стырнік і флісы пазлазілі на бераг і мы высадзіліся; вялікая праца была людзей зьбіраць, каб яхт гэты наш назад да вады ўпхнуць і мачту направіць. Я, пайшоўшы па беразе, зь зямлі зарваўся і ў ваду ўпаў, пэўна б утапіўся, каб на доле чалавек не стаяў з вудай, рыбу лавіў, я на яго ўпаў, і ён мяне выцягнуў; як ляцеў, зэгарак залаты з рэпетыцыяй з кішэні выпаў і на галінах завіс, пра тое я й ня ведаў. Потым, адплыўшы ўжо мілі са 2, заўважыў, што зэгарка нямашака, зьвярнуў пана Ежы Бялазора, кавалера маяго, і той шчасьліва на галіне знайшоў. Якое шчасьце я меў, што рыбак той ня бачыў, бо ўзяў бы і ніхто б аб тым і аб ім ня ведаў; мы жа начуем у Калёніі[71].

D. 9 Aug. У Калёніі быў у катэдры, дзе аглядаў целы трох каралёў; на адной галаве, дзе Пан Езус руку паклаў, ёсьць мейсца з валасамі; потым быў у касьцёле кананічак сьв. Уршулі, дзе бачыў гроб той вялікай сьвятой з таварышкамі; потым візытаваў кляштар паненак кармэлітак босых, дзе кланяўся князёўне, законніцы тамашняй, Шульцбахаўнай, маркграбінай Рэнскай, роднай сястры князя Шульцбаха; пазнаў там айца ксяндза Хэнкерада, майго дэкана Олыцкага і розныя аглядаў рарытэты; па абедзе рушыў далей у плаваньне і спыніўся ў Дзюсэльдорфе.

D. 10 Aug. Тут з загаду электара Рэнскага, пана таго места, вялікія мне тамтэйшы губэрнатар чыніў гонары і забавы.

D. 16 Aug. Прыплылі мы да Стэдрэхта; вялікая бура далей плыць не дазволіла, і казус з намі там здарыўся; як мы высадзіліся з яхту на абед, дык толькі адзін чалавек ксяндза Швайкоўскага, каноніка Кракаўскага, апата Аборскага, гувэрнёра майго, на імя Календа, на яхце тым застаўся; стырнік дрэнна прывязаў яхт, менавіта на тым мейсцы, дзе мора церпіць fluksum et refluksum[72] праз кожныя шэсьць гадзінаў; калі вада прыбываць пачала, яхт наш сам па сабе адвязаўся і паплыў на вялікіх хвалях; напэўна б загінуў, калі б спужаўся, але быў пры розуме і стыруючы, як бачыў марынараў, яхт да нас прыгнаў; як бліжэй ужо быў да нас, флісы на лодках скочылі і выратавалі; хваля, што так вялікая была, добра пакалаціла той яхт.

D. 26 Aug. Прыплылі да Амстэрдама. Ледзьве тры дні адпачыўшы, разхвараваўся на малігны, кроў пушчаў і быў ужо без надзеі жыцьця, але ўласна доктар П. Фэнелён мастацтвам сваім мяне выцягнуў і гэтак прабедаваўся я аж да дня 19-га верасьня.

---

1 У імя Сьвяцейшае Тройцы (лац.).
2 У год (лац.).
3 Чэрвеня (лац.).
4 Закон езуіцкі.
5 Ям, Ямць — скарачэньне, прынятае ад звароту Ягамосьць — яго міласьць; таксама: Імць — Іхмосьць; Вм — Вашмосьць; Яв, Явм — Яснавяльможны; Яа — Ясьнеасьвечаны; П — пан; у множным ліку Пп — панове; Аа.— Айцы і г. д.
6 Як слухачу (лац.).
7 Абмежаваньне, скарачэньне (лац.).
8 Пад датай 10 траўня у год 1717 (лац.).
9 Выконваючы ролю айца пры крыжмаваньні (лац.).
10 Да ведама (лац.).
11 Дабра па бацьку і матцы (лац.).
12 У сьнежні (лац.).
13 Студзеня (лац.).
14 Лютага (лац.).
15 Дня (лац.).
16 Сакавіка (лац.).
17 Красавіка (лац.).
18 Дня 24 жніўня скончыў жыцьцё (лац.).
19 Распарадзіцца маёмасьцю (лац.).
20 Перад кананьнем (лац.).
21 Верасьня (лац.).
22 Кастрычніка (лац.).
23 Апладысмэнты, тут у сэнсе «посьпех» (лац.).
24 З гэтае прычыны (жа) зь вялікім стараньнем (лац.).
25 І гэтакім парадкам (лац.).
26 Смутна страчанага (лац.).
27 З пакорным зваротам (лац.).
28 Прамоўца (лац.). Далейшы тэкст прамовы ў перакл. апушчаны.
29 Гэтакім чынам (лац.).
30 Перашкоды не зрабіўшы (лац.).
31 На мейсцы, тут: у свой час (лац.).
32 Тут: у арцыкапланскім убраньні (лац.).
33 У месьце вечнага спачываньня (лац.).
34 У суправаджэньні (лац.).
35 Зь вялікім бляскам, посьпехам (лац.).
36 Ліпеня (лац.).
37 Да ведама (лац.).
38 Сваім парадкам (лац.).
39 Клір, сьвятары (лац.).
40 Пахавальную (лац.).
41 Урачыста ўбраны катафалк (лац.).

[42] Рознымі ўпрыгажэньнямі і касьцельным начыньнем (лац.).
[43] З удзелам кліра абавязковую службу споўніў (лац.).
[44] Выносіць (лац.).
[45] Тут: тыя, хто ўдзельнічаў у суправаджэньні [цела] (лац.).
[46] Фатальна спачыў (лац.).
[47] Памінальную (лац.).
[48] А іменна (лац.).
[49] Лістапада (лац.).
[50] Рэдкасьці, размаітасьці (лац.).
[51] Што за няёмкасьць! (фр.).
[52] Зь першых асобаў Імпэрыі (лац.).
[53] Да таго, хто ў тозе (лац.), г. зн. шляхотнага.
[54] Да таго, хто ў плашчы (лац.),— нешляхотнага.
[55] Прыгажуня, спакусьніца (фр.).
[56] «Палавінку» (фр.) — па звычаю «даму сэрца» для падобнай імпрэзы атрымлівалі па кону.
[57] Адзін аддзел (фр.).
[58] Вена.
[59] У тэксце: Rabuliu, магчыма, маецца на ўвазе вядомае прозьвішча Rambouillet.
[60] Першым шлюбам (лац.).
[61] Прыёмны пакой (ням.).
[62] Кленчаньне (фр.).
[63] Быць яе кавалерам.
[64] Ня ў зручны момант (італ.).
[65] Дзеля таварыства ў падарожжы (лац.).
[66] Мюнхэн.
[67] З дому Палатынаў Рэнскіх (лац.).
[68] Дом для загарадных забаваў (фр.).
[69] Другім шлюбам (лац.).
[70] Безпатомна (лац.).
[71] Кёльн.
[72] Прыбываньне і ўбываньне (лац.).

ГЛАСАРЫ

АБЛІГАЦЫ — абавязкі.
АБСАЛЮЦЫЯ — адпушчэньне грахоў.
АДАРАВАЦЬ, АДАРАВАНЫ — асьвячаць, асьвечаны.
АКАМАДАЦЫЯ — лагоднасьць, АКАМАДАВАЦЬ — улагоджваць, часам у сэнсе «прыбіраць».
АЛЬТЭРАЦЫЯ — здарэньне, выпадак.
АПАРЭНЦЫЯ — паважнасьць, пышнасьць.
АПЛІКАВАЦЬ — тут: практыкаваць.
АРАТОРЫЮМ — малітоўная лёжа ў касьцёле, капліца.
АРДЫНАНС — загад, распараджэньне.
АРХІДЫЯКАН — тытул у касьцельнай герархіі, у даўнейшыя часы біскупствы дзяліліся на архідыяканаты, тыя ў сваю чаргу на дэканаты.
АСАМБЛІ — сьвецкія прыёмы ў старыя часы.
АХМІСТРЫНЯ — тут: настаўніца.
АЎДЫТАР — таварыш царкоўнага суда.
АЎТАКАМІЦЫЯЛЬНЫ СОЙМІК — соймік, які абіраў дэпутатаў на дзяржаўны сойм ці г. п.
АЎТАРАМЭНТ — строй войска. У РП войска было нацыянальнага аўтарамэнту — гусарыя, петыгорыя, казакі ды г. п. і чужаземнага — драгонія, райтарыя, нямецкая пяхота, артылерыя ды г. п.
БАНДА — тут: «каманда» ў спаборніцтвах.
БАРВЫ — тут: лёкайскае адзеньне.
ВАЯВОДА РУСКІ — Рускае ваяводзтва абдымала землі былой Чырвонай Русі: Львоўскую, Галіцкую, Перамышльскую, Жыдачэўскую, Холмскую.
ВАХЛЯР — веер.
ВЕРШАПІС — паэта.
ВІГІЛІЯ — ад лац. «начная варта» — начныя імшы (расейск. «бдения»).
ВОТУМ — зарок.
ВЭНГРАЎ — мястэчка ў Польшчы.
ГАХ — залётнік.
ГРАБЯ, ГРАБІЯ — граф.
ГРАДЭТУР — ядвабная тканіна.
ГУСАРЫЯ — цяжкаўзброеная кавалерыя нацыянальнага аўтарамэнту.
ДАМІНА — маскарадны строй.
ДАМОВЫЯ РАЗРУХІ — маецца на ўвазе Паўночная вайна (1700—1721), якая вялася пераважна на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і з удзелам ейных войскаў па розныя бакі.
ДРАБАНТЫ — целаахоўнікі.
ДРАГОНІЯ — войскі чужаземнага аўтарамэнту, якія біліся конна і пешшу.
ДРЭЗНА (суч. Дрэздэн) — на той час сталіца Электарату Саскага, дзе панаваў Аўгуст II Моцны.
ДЫГНІТАР — саноўнік, які займаў высокую дзяржаўную пасаду.
ДЫСПАНАВАЦЬ — адказваць.
ДЫСТЫНГНАВАНЫ — дасьведчаны, добра выхаваны.
ДЫСЦЫПЛІНА — бізун для флягеляцыі, пакута.
ДЫФЭРЭНЦЫЯ — адрозьненьне.
ДЫЯРЫЮШ — штодзённьнік.
ДЭДУКЦЫЯ — тут: праводзіны, суправаджэньне.
ДЭКЛЯРАЦЫЯ — абвешчаньне, абяцаньне.
ДЭПАЗЫТ — рэч, якая захоўваецца.
ДЭПАНАВАЦЬ — захоўваць.
ДЭЦЫЗІЯ — рашэньне.
ЗЯМЛЯ — ваяводзтва дзялілася на землі, тыя на паветы.
ІЗБА — пасольская палата ў Сойме.
ІЛЮМІНАВАНЫ — упрыгожаны.
ІНТРАДУКАВАЦЬ — увесьці.
ІНФУЛА — біскупская мітра; ІНФУЛАТ —

сьвятар, які, ня быўшы біскупам, меў правы ўжываць біскупскі ўбор.
КААД'ЮТАР — памочнік біскупа.
КАЗНАДЗЕЙ — прапаведнік, казаньнік.
КАЛЯЦЫЯ — вячэра.
КАМУНІКАВАЦЬ — прымаць Сьв. Дары, прычашчацца.
КАМПАСІЯ — прыязнасьць.
КАНВЭРСАЦЫЯ — размова.
КАНКЛЮДАВАЦЬ — завяршаць.
КАНТРАКТ — дамоўленасьць, дамова.
КАПА — верхняе сьвятарскае адзеньне на ўрачыстыя выпадкі.
КАПНІКІ — тут: сябры рэлігійных брацтваў, якія ў Вялікодны тыдзень абыходзілі сьвятыні, церпячы пакуты.
КАРАЛЕЎНА ШАРЛЁТА — Марыя Караліна Шарлёта з Сабескіх, у замужжы Дэ Бульён, унучка караля Яна III Сабескага, зь якой М. К. Радзівіл пазнаёміўся ў лістападзе 1719 г. у Алаве. Узаемны раман нічым ня скончыўся з-за неспрыяньня бацькоў, асабліва маці Міхала Казімера.
КАРМАЗЫНАВЫ — ярка-чырвоны колер, КАРМАЗЫН — каштоўная чырвоная тканіна, адсюль: КАРМАЗЫН — заможны шляхціч.
КАРОЛЬ ПРУСКІ — Фрыдэрык Вільгельм I (1688—1740), кароль Прускі з 1713 г.
КАРОЛЬ СТАНІСЛАЎ — Станіслаў I Ляшчынскі (1677—1766), кароль Рэчы Паспалітай у 1704—1709; 1733—1736 гг.
КАРУЗЭЛЬ — конныя вайсковыя спаборніцтвы, якія прыйшлі на зьмену рыцарскім турнірам і былі папулярныя ў XVII—XVIII стст. пры эўрапейскіх дварох.
КВЭСТЫЯ — пытаньне.
КІТАЙКА — тонкая ядвабная тканіна кітайскага вырабу.
КЛІШАЎСКАЯ БАТАЛІЯ — Міхал Казімер памыляецца: бітва пад Клішавам у Польшчы адбылася 19.07.1702. Швэдзкія войскі Караля XII перамаглі войскі Аўгуста II, якія падтрымліваў і аддзел войска Кароннага пад камандай гетмана вял. Кар. Гераніма Любамірскага.
КОМЖА — белае сьвятарскае адзеньне ў выглядзе кашулі з шырокімі рукавамі.
КОНТРАДЫКЦЫІ — контравыступы.
КУСТАШ — скарбнік.
КУФА — збан для напояў, тут: бочка.
ЛІМІТАВАНЫ — адкладзены.
ЛЁМБРЫ — папулярная ў XVIII ст. гульня ў карты.
ЛЮБАРТОВІЧЫ — князі Сангушкі выводзілі свой род ад Любарта Гедымінавіча.
ЛЮТРЫ — пратэстанты, пасьлядоўнікі Лютара.
ЛЯСКА — тут: маршалкоўскае жазло, «пад ляскай» — пад старшынаваньнем.
МАГНІФІЦЭНЦЫЯ — пышнасьць, надзвычайная прыгажосьць.
МАЛІГНЫ — гарачка.
МАРТЫФІКАЦЫЯ — пакута, мярцьвеньне цела.
МАРЫНАР — марак.
МАШТАЛЕР — конюх.
МАЭСТАТ — вялікасьць, тут: каралеўская вялікасьць, кароль.
НАМІНАТ — асоба, прызначаная на пасаду, але не зацьверджаная.
НЕЎКАНТЭНТАВАНА — незадаволена.
НЕШПАР — вячэрня.
НУМІЗМА — медаль.
ПАЛАТЫН — у даўняй Нямецкай Імпэрыі шляхоцкая годнасьць; існавалі два Палатынаты — Найвышэйшы і Рэнскі, роўныя княствам, на чале іх стаялі графі-палатыны.
ПАН — маецца на ўвазе Аўгуст II Моцны (1670—1733), электар Саскі Фрыдрык Аўгуст I Веттын, кароль РП у 1697—1706 і 1709—1733 гг.
ПАСІЯ — моцнае пачуцьцё, заўзятасьць, пакута.
ПЕТЫГОРЫЯ — у XVIII ст. цяжкая кавалерыя ў войску ВКЛ.
ПОМПА ФУНЭБРАЛЬНАЯ — пахавальны ўрачысты абрад.
ПРАФІТАВАЦЬ — мець карысьць.
ПЭРСВАЗІЯ — угаворы, перакананьне.
ПЯРСЬЦЁНАК — тут: абручок, у які трэ' было трапіць дзідай.
ПЯЧАТАР — захавальнік пячаткі.
РОНТ — начная варта.
РЭГЕНТ — сакратар канцылярыі.
РЭГІМЭНТ — у XVIII ст. аддзел войска чужаземнага аўтарамэнту, які складаўся зь некалькіх меншых аддзелаў, батальёнаў (пяхота) ці швадронаў (коньніца).
РЭДУТА — баль-маскарад.
РЭФЕКТАР — кляштарная сталоўня.
САЛЁННЫ — урачыста шанаваны.
САЛЬВА — салют.
СЛУХАЧЫ — да сяр. XVIII ст. соймы праводзіліся адкрыта, шляхцічы, не абраныя пасламі, маглі прысутнічаць як «слухачы» (arbiter), але ня мелі права выступаць.
СПЛЕНДОРЫ — каштоўнасьці, упрыгажэньні.
СТРЫЕВАЯ Ў ДЭСАЎ — Марыя Элеанора, дачка князя Яна Юрага.
Ангальт Дэсаў, удава стрыя Міхала Казімера Ежы Юзафа Радзівіла.
СТЫРНІК — руляві на караблі.
СУБДЭЛЕГАТ — ураднік гродзкага суда, з паўнамоцтвамі выкананьня судовых выракаў.
СУПЛІКАВАЦЬ — пакорліва прасіць.
СУСЬПІРАВАЦЬ — быць уздыхальнікам, «прыўздыхацца».
СУСЦЭПТ — агледзіны, прыём.
СУФРАГАН — сьвятар, які мае біскупскі сан, але без эпархіі.
ТАПІЗЬЕР — майстар па дыванох.
ТАРНАГРАДЗСКАЯ КАНФЭДЭРАЦЫЯ — завязалася ў 1715 г. супраць караля Аўгуста II.
ТРАКТАВАЦЬ[1] — весьці перамовы.
ТРАКТАВАЦЬ[2] — частаваць.

ТРАКТАТЫ — перамовы, дамовы, у тым ліку судовыя справы.
ТУМУЛТ — мітусьня.
УКАНТЭНТАВАНЫ — задаволены.
УПЭРСВАДАВАНЫ — перакананы.
ФАРАОН — гульня ў карты, папулярная ў XVIII ст.
ФЛІНТА — паляўнічая стрэльба.
ФЛІСЫ — тут: матросы.
ФУНЭБРАЛЬНЫ — пахавальны.
ФЭБРЫ ТЭРЦЫЯЛЬНЫЯ — пэрыядычная ліхаманка.
КРЫЖМАВАНЬНЕ — канфірмацыя.
ЦАЛУН — пакроў, пакрывец.
ЦЬВІНГЭР — палац саскіх валадароў у Дрэздэне.
ЦЬВІНГЭРГАРДЭН — сады пры палацы.
ЦЭЛЕБРАВАЦЬ — адпраўляць урачыстую імшу.
ЦЭСАР — Караль VI (1685—1740) імпэратар Сьв. Рымскай Імпэрыі з 1711 г.
ЧЛУХАЎ — добра Радзівілаў у Кароне. Туды сабраўся Двор Міхала Казімера Радзівіла, прызначаны яму ў падарожжа, які складаўся з ксяндза Швайкоўскага, чатырох дваранаў: Курдваноўскага, Грабоўскага, Бялазора, Бажэнцкага, пажа Яблоньскага, кухмістра Ружэўскага, камэрдынара Фішара і трох лёкаяў.
ШМЭРМЭЛЬ — фэерверк.
ШПАДА — шпага.
ШТУЧЭЦ — скарбонка.
ЭКЗЭКВІЯ — памінальная імша.
ЭКСЭРЦЫТАВАЦЬ — практыкавацца.
ЭКСКУЗАВАЦЬ — прасіць выбачыць.
ЭКСПЭНСА — растрата.
ЭЛЕКТАР — тытул, наданы 9-і ўдзельным валадаром Нямецкай Імпэрыі, якія мелі правы абраньня імпэратара: тое ж, што і курфюрст.
ЭЛЕКТАРАВА БАВАРСКАЯ — электар баварскі Максымілян Эмануэль (1679—1726), быў жанаты з дачкой караля РП Яна III Сабескага.
ЮРАМЭНТ — прысяга.
ЮРЫСДЫКА — адміністратыўна адасобленая частка горада, на якую не распаўсюджвалася ўлада гарадзкога самакіраваньня, звычайна належала да феадальнага ўладаньня.
ЯЛМУЖЫНА — дарэньне, міласьціна.

Дубой (Мінскай губэрні). Маетнасьць, нададзеная ў 1635 г. кн. Альбрэхтам Радзівілам пінскім езуітам. Пазьней сталася ўласнасьцю сям'і Куранецкіх. Мал. Н. Орды. (Подпіс пад малюнкам Н. Орды).

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ

ГІСТОРЫЯ ГЕАПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ

III. Геапалітычнае становішча Беларусі ў XIX — XX стст.

БЕЛАРУСЬ — СТРАТЭГІЧНАЕ ПЕРАДПОЛЬЛЕ РАСЕЙСКАЙ ІМПЭРЫІ

Захоп Расейскаю імпэрыяй амаль усяе тэрыторыі Беларусі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гг.) і далучэньне да Расеі ў 1807 г. Беласточчыны паводле француска-расейскага Тыльзыцкага міру стварылі новую геапалітычную сытуацыю. Цяпер Беларуска-Літоўскае гаспадарства ў складзе Рэчы Паспалітай страціла незалежнасьць, і Беларусь сталася памежным краем магутнай тады Расейскай дзяржавы. Такім чынам, Беларусь становіцца аб'ектам (а не суб'ектам) міжнароднай палітыкі і цалкам выкарыстоўваецца расейскім царызмам у ягонай эўрапейскай палітыцы.

Тэрыторыя Беларусі ад канца XVIII ст. стаецца стратэгічным пляцдармам для войнаў у Эўропе, месцам сталага разьмяшчэньня вялікіх кантынгентаў расейскай арміі і адначасова перадпольлем на выпадак наступальнай вайны з боку праціўніка, каб затрымаць тут варожую для Расеі армію і пазьбегнуць матэрыяльных і людзкіх стратаў на тэрыторыі Расеі. У сувязі з гэтым на Беларусі ў XIX ст. будуюцца моцныя Берасьцейская й Бабруйская фартэцыі ды іншыя фартыфікацыйныя ўмацаваньні.

Адначасова выкарыстоўваюцца і людзкія рэсурсы Беларусі. Тутэйшае сялянства дагэтуль ня ведала вайсковай службы, бо ў беларуска-літоўскім войску не служыла. Расейскі ўрад адразу пачаў праводзіць у Беларусі рэкруцкія наборы сялянаў у армію з доўгатэрміновай (да 25 гадоў) салдацкай службай. Беларускую шляхту набіралі ў юнкеры і афіцэры расейскага войска. Яны служылі імпэратару і фактычна выконвалі ролю ляндскнэхтаў у імпэрыі заваёўнікаў. Такім чынам, беларусы ўдзельнічалі ў войнах, змагаючыся дзеля чужых інтарэсаў і мэтаў. Пасьля захопу Беларусь сталася крыніцай узбагачэньня ўладароў Расеі за кошт падаткаў з насельніцтва і выкарыстаньня ейнай эканомікі, але перадусім была вельмі важным стратэгічным аб'ектам, што прыкрываў кірункі на абедзьве сталіцы Расеі — Санкт-Пецярбург і Маскву.

Гэтае становішча Беларусі царызм падмацаваў нутраной палітыкай, узяўшы курс у першыя дзесяцігодзьдзі свайго панаваньня на падтрымку тутэйшых памешчыкаў, дагэтуль амаль цалкам апалячаных. Каб захаваць у краі спакой, на іх распаўсюдзілі правы і прывілеі

Пачатак у №№ 1, 3, 1994 г.

Мірныя перамовіны ў Вэрсалі.

расейскага дваранства з усімі наступствамі. Былі захаваныя ранейшыя навучальныя ўстановы на чале зь Віленскім унівэрсытэтам (з польскай мовай навучаньня ў іх). Захавалася таксама справаводзтва на польскай мове ва ўрадавых установах, і толькі некаторыя дакуманты, якія падпісвалі губэрнатары ды іншыя вышэйшыя чыноўнікі, прыежджыя з Расеі, ды справаздачы, што ішлі ў Пецярбург, пісаліся па-расейску.

1812 г. на некалькі месяцаў зьмяніў сытуацыю. Падчас француска-расейскай вайны тэрыторыю Беларусі (за выняткам паўднёвай часткі) у другой палове 1812 г. занялі войскі «Вялікай арміі» імпэратара Напалеона І. Дэкрэтам Напалеона ад 1 ліпеня 1812 г. было ўзноўлена Вялікае Княства Літоўскае ў складзе Віленскага, Менскага, Горадзенскага дэпартамэнтаў (губэрняў), а «ўласна беларускія» губэрні — Віцебская і Магілеўская — атрымалі сваё асобнае кіраваньне кожная. Гэтыя губэрні не далучылі да Вялікага Княства Літоўскага, каб падчас эвэнтуальных мірных перамоваў з расейскім імпэратарам Аляксандрам І іх можна было б саступіць Расеі ўзамен за прызнаньне ёю Вялікага Княства Літоўскага.

Урадавыя і мясцовыя органы былі складзены з тутэйшых памешчыкаў. Ураду Вялікага Княства Літоўскага ў Вільні, урадавым камісіям у Віцебску і Магілеве, мясцовым органам кіраваньня пастанаўлялася набіраць дабраахвотнікаў у польскія злучэньні Напалеонавай арміі, ставіць коней для кавалерыі й абозаў, зьбіраць прадукты й фураж для францускай арміі. Сытуацыя давала магчымасьць аднавіць Беларуска-Літоўскую дзяржаву. Але Напалеон ня выкарыстаў гэтага, а таксама не дазволіў Вялікім Княствам Варшаўскаму і Літоўскаму зноў аб'яднацца ў Рэч Паспалітую. Рэальнай улады мясцовае насельніцтва ня мела. Таму большыня тутэйшых памешчыкаў і шляхты не падтрымала Напалеона. Не падтрымалі і сяляне. Шанц адрадзіць Беларускую дзяржаву быў страчаны. Перамога Расейскай імпэрыі ў гэтай вайне перакрэсьліла ўсе пляны стварэньня самастойнага ці ў фэдэрацыі з Польшчай Вялікага Княства Літоўскага. Беларусь па-ранейшаму засталася падзеленай на губэрні пад кантролем расейскага ўраду.

Пасьля перамогі Расеі ў вайне з Францыяй і далучэньня да Расеі паводле пастановы Венскага кангрэсу ў 1815 г. большай часткі Польшчы (Каралеўства Польскага) на правах аўтаноміі перадавыя рубяжы былі перанесеныя на мяжу з Прусіяй і Аўстрыяй — у раёны Каліша, Чанстаховы і Сандаміра, але для імпэрскага ўраду Расеі тэрыто-

рыя Беларусі ня страціла свайго стратэгічнага значэньня. Яна і ў XIX — пачатку XX ст. заставалася блізкім перадпольлем, дзе пастаянна знаходзілася вялікая колькасьць расейскіх войскаў.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРАЕКТЫ XIX СТ.

Цяпер, калі Расейская імпэрыя тут замацавалася, былі адкінутыя спробы лібэралізацыі рэжыму, флірту з тутэйшаю шляхтаю й магнатамі. Пасьля задушэньня паўстаньняў 1831 г. і асабліва 1863 г. пачалася палітыка жорсткай русыфікацыі нашай краіны. Яшчэ раней, у 1811 г., цар Аляксандар I адхіліў праект вядомага палітычнага дзеяча канца XVIII — першай чвэрці XIX ст. Міхала Клеафаса Агінскага (вядомы цяпер больш як кампазытар і аўтар паланэзу «Разьвітаньне з Радзімай»). Агінскі дарэмна спрабаваў пераканаць імпэратара ўзнавіць на тэрыторыі Беларусі, Літвы й Правабярэжнай Украіны былую Беларуска-Літоўскую дзяржаву з адным з братоў імпэратара на чале. Ён прапанаваў плян утварэньня такой дзяржавы з урадам з тутэйшых ураджэнцаў. Аляксандар I у 1813 г. адхіліў таксама праект князя Адама Юрыя Чартарыскага аб'яднаць Польшчу і Вялікае Княства Літоўскае на чале з братам Аляксандра I. Імпэратар заявіў А. Чартарыскаму, што расейцы «ніколі не дапусьцілі б, каб Літва (г. зн. Беларусь.— **А. Г.**), Валынь і Падолія зноў адышлі да Польшчы». Такім чынам, Расея разглядала Беларусь як сваю неад'емную здабычу.

У гэтым сэнсе яшчэ далей пайшлі дзекабрысты. Кіраўнік «Паўднёвага таварыства» П. Песьцель распрацаваў асноўныя палажэньні грамадзкага й дзяржаўнага ладу Расеі ў праграмным дакуманце «Руская праўда», зацьверджаным «Паўднёвым таварыствам». Ён быў ворагам фэдэратыўнага ладу і выступаў за адзіную ды непадзельную Расею. 4-ы разьдзел «Рускай праўды» так і завецца: «Расея ёсьць Дзяржава Адзіная і Непадзельная». Як вядома, лёзунг «Единая и неделимая Россия» шырока выкарыстоўваўся падчас грамадзянскай вайны расейскімі белагвардзейцамі, якія былі супраць самастойных нацыянальных дзяржаўных утварэньняў на тэрыторыі былой Расейскай імпэрыі.

Песьцель пералічваў народы і краіны, далучаныя да Расеі, і сярод іх згадаў Беларусь. Згадвае ён і беларусаў (як частку расейскага народу), што насяляюць Віцебскую і Магілеўскую губэрні. Але не гаворыць пра беларусаў у іншых губэрнях, бо гэтыя губэрні меркавалася, паводле пагадненьня з польскім Патрыятычным таварыствам, пасьля супольнай перамогі над царызмам перадаць у склад Польшчы. Песьцель адмаўляў ім у праве на самастойнасьць, бо беларусы «з-за слабасьці сваёй ніколі ня могуць складаць асобных Дзяржаваў, а з-за гэтага ўсе яны... павінны адмовіцца ад права асобнай Народнасьці».

16-ы разьдзел «Рускай праўды» меў праграмны загаловак «Усе плямёны павінны зьлітымі быць у адзін Народ». У гэтым разьдзеле ставіцца задача: «...У адну агульную масу зьліць так, каб насельнікі цэлай прасторы Расейскай Дзяржавы **ўсе** былі Рускія». Дзеля гэтага трэба, каб «на цэлай прасторы Расейскай Дзяржавы панавала адзіная толькі **мова** расейская: усе зносіны тым самым надзвычайным чынам палягчэюць». Песьцель таксама прапанаваў скасаваць заканадаўчым шляхам назвы нерасейскіх народаў і ўсіх назваць рускімі. Расейска-польская мяжа паводле «Рускай праўды»... «павінна ісьці ад Палангена (Палангі) самаю простаю рысаю на Дынабург (Дзьвінск або Даўгаўпілс). Ад Дынабурга Дзьвіною да Полацка. Ад Полацка па рацэ Ўшачы да Бярэзіны. Адсюль лініяй Бярэзінскаю ў кірунку да Прыпяці. Потым балотамі Прыпяцкімі ў кірунку да горада Астрога Валынскай губэрні. Ад Астрога да Карпацкіх гор». Такім чынам, уся Гарадзенская й Віленская губэрні ды большая частка Менскай адыходзілі б да Польшчы. У Менскай губэрні ад Барысава мяжа йшла проста на поўдзень, па Птычы, пакідаючы ў Польшчы Ігумен і Слуцак. П. Песьцель ды іншыя дзекабрысты дзялілі зямлю Беларусі з польскімі шляхоцкімі рэвалюцыянэрамі, не пытаючыся, натуральна, беларускага народу.

Паўстаньні беларускай шляхты разам з польскай і літоўскай у 1831 і 1863 гг. не зьмянілі геапалітычнага становішча Беларусі. Паўстанцкія ўлады бачылі ў будучыні Беларусь і Літву адзіным дзяржаўным утварэньнем з Польшчай, з цэнтрам у Варшаве, але з пэўнаю палітычнаю аўтаноміяй ці ў палітычным саюзе з Польшчай, як гэта прапаноўваў урад Вінцэнта Канстанціна Каліноўскага. Мяжою будучай вызваленай ад царызму дзяржавы паўстанцы лічылі мяжу Рэчы



Подпісы і пячаткі на тэксьце Вэрсальскае мірнае дамовы (28 чэрвеня 1919 г.).

Паспалітай з Расеяй перад першым падзелам 1772 г. Значыцца, у XIX ст. польскія, літоўскія і беларускія шляхоцкія патрыёты мелі альтэрнатыўны ў параўнаньні з расейскаю палітыкай дзяржаўны падыход да будучага ўзноўленага гаспадарства, дзе прадугледжвалася пэўная адасобленасьць Беларуска-Літоўскага краю.

Паўстаньне 1831 г. у Беларусі, узьнятае сьледам за паўстаньнем у Польшчы (лістапад 1830 г.), прыцягнула ўвагу дыпляматыі эўрапейскіх дзяржаваў. Англія, Францыя, Прусія і Аўстрыя кожная па-свойму паставіліся да паўстаньня, якое лічылі «агульнапольскім». Справа паўстанцаў у міжнародных дачыненьнях аслаблялася тым, што Польшча была аўтаномным каралеўствам, а Беларусь і Літва лічыліся «рускімі губэрнямі» і ў дыпляматычны разьлік увогуле ня браліся. Эўропа не цікавілася іхным лёсам. Паўстанцкі сойм у Польшчы 25 студзеня 1831 г. дэтранізаваў імпэратара Мікалая I як караля Польшчы і з гледзішча эўрапейскай дыпляматыі страціў легітымнасьць, хаця сам Мікалай I безупынна парушаў канстытуцыю 1815 г. і паступова ліквідаваў незалежнасьць Польшчы. Англія пасьля дэтранізацыі Мікалая I наагул спыніла кантакты з дыпляматычнай місіяй паўстанцаў. Аўстрыя й Прусія занялі варожую пазыцыю да паўстаньня, бо баяліся страціць свае тэрытарыяльныя захопы ў Польшчы й Заходняй Украіне. У Францыі за некалькі месяцаў да паўстаньня адбылася рэвалюцыя, рэжым Бурбонаў быў заменены лібэральным урадам караля Люі-Філіпа з малодшай, Арлеанскай галіны каралеўскай дынастыі, і гэтая краіна сама толькі выходзіла зь ізаляцыі. Такім чынам, паўстанцы і Польшчы, і — найперш — Беларусі былі кінутыя на волю лёсу. Паўстаньне скончылася паразаю.

Аналягічная сытуацыя паўтарылася ў 1863 г. Зноў на паўстаньне ў Беларусі эўрапейская дыпляматыя не зважала: ейная ўвага была прыцягнутая да паўстаньня ў Польшчы. Але пасьля паразы Расеі ў Крымскай вайне 1853—1856 гг. Англія, Францыя і Аўстрыя выкарысталі слабасьць імпэрыі ды паспрабавалі кожная па-рознаму займець з паўстаньня карысьць. Меркавалася разгледзець на міжнародным кангрэсе пытаньне аб паўстаньні і запатраба-

ваць ад Расеі ўзнавіць канстытуцыю Польшчы 1815 г., а таксама аднавіць Рэч Паспалітую ў межах да 1772 г. Асабліва актыўна падтрымліваў гэтую ідэю французскі імпэратар Напалеон III. Аднак рознагалосьсі ў патрабаваньнях і зьмена сытуацыі (расейскія войскі ўжо душылі паўстаньне) дазволілі расейскай дыпляматыі адбіць нацiск эўрапейскіх дзяржаваў.

ПЕРШАЯ СУСЬВЕТНАЯ ВАЙНА І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ БЕЛАРУСІ

Геапалітычнае становішча Беларусі не зьмянілася да пачатку XX ст. Новая сытуацыя для нашай краіны склалася падчас першай сусьветнай вайны. Ваенныя дзеяньні на фронце паміж германскімі й расейскімі войскамі ў 1914 г. адбываліся на тэрыторыі Польшчы. Улетку 1915 г. фронт пачаў набліжацца да Беларусі.

Германскае камандаваньне зьбіралася абкружыць групоўку расейскіх войскаў у Польшчы і такім чынам пераможна скончыць вайну. Аднак расейскае камандаваньне пастанавіла вывесьці свае войскі з аблогі і выраўнаць лінію фронту ад Нарава да Берасьця й Ковеля. Асноўнаю задачаю Заходняга фронту расейскай арміі было замацавацца ў раёнах Горадні, Беластока і да Берасьця, а таксама прыкрываць шляхі на Беларусь. Аднак на пачатку верасьня 1915 г. германскія войскі перайшлі ў наступ, прарвалі лінію на стыку Паўночнага і Заходняга франтоў і ўдарылі на Сьвянцяны (Сьвянцянскі прарыў), куды кінулі стратэгічную коньніцу. У выніку далейшага германскага наступу і адступленьня расейскіх арміяў апошнія ў кастрычніку 1915 г. замацаваліся на лініі Дзьвінск — Вялейка — Баранавічы — Пінск і далей на Валыні. Гэтая лінія фронту заставалася амаль нязьменная да лютага 1918 г., падзяліўшы Беларусь на зону, акупаваную германскімі войскамі, і на ўсходнюю частку, якая сталася бліжэйшаю і далейшаю прыфрантавою паласою расейскіх арміяў. Тым самым тэрыторыя Беларусі зноўтакі адыгрывала ролю стратэгічнага перадпольля для расейскіх губэрняў імпэрыі.

У адрозьненьне ад расейскай прыфрантавой зоны зь яе ваенна-паліцэйскім рэжымам, у нямецкай зоне акупацыі была дазволеная дзейнасьць нацыянальных грамадзкіх арганізацыяў, у тым ліку беларускіх, што паўплывала на далейшае разьвіцьцё беларускага адраджэнцкага руху. Нямеччына, зыходзячы ня толькі з задачаў сваёй усходняй палітыкі падтрымкі нацыянальных рухаў пад нямецкім кантролем, але і з мэтаю аслабіць праціўніка, абмежавана падтрымала і беларускі нацыянальны рух, не даючы яму ані тэрытарыяльнага самакіраваньня, ані якіх-небудзь палітычных абяцанак.

Становішча зьмянілася ў выніку падпісаньня Берасьцейскае мірнае дамовы 3 сакавіка 1918 г. Не зважаючы на спробы Беларускага нацыянальнага сакратарыяту ўзяць удзел у берасьцейскіх мірных перамовінах, абодва бакі — і расейскі, і германа-аўстрыйскі з саюзьнікамі — не прызналі за прадстаўнікамі беларускага народу права на самавызначэньне і не прынялі беларускую дэлегацыю.

Паводле ўмоваў Берасьцейскага мірнага пагадненьня, Расея адмаўлялася ад вярхоўнай улады над тэрыторыямі на захад ад абумоўленай лініі (артыкул 3). У дамове пісалася: «Расея адмаўляецца ад усялякага ўмяшаньня ў нутраныя справы гэтых абшараў. Германія і Аўстра-Вугоршчына маюць намер вызначыць наступны лёс гэтых абшараў пасьля кансультацыі зь іхным насельніцтвам». Новая расейская мяжа ішла па Дзьвіне да Друі, пакідаючы з расейскага боку Друю, Браслаў, Відзы, Паставы, Ашмяны, Дзевянішкі, потым па Нёмане на захад ад Наваградка, на захад ад Слоніма, Ружанаў, Пружанаў і на поўнач ад Берасьця, дзе мяжа абрывалася, бо далей ішла ўжо тэрыторыя Украінскай Народнай Рэспублікі. Усталёўвалася таксама ўсходняя мяжа Эстляндыі й Ліфляндыі. Такім чынам, самую заходнюю частку Беларусі зь Вільняй, Горадняй, Лідай, Ваўкавыскам і Беластокам Расея аддала Германіі і Аўстра-Вугоршчыне для далейшага вызначэньня ейнай дзяржаўнай прыналежнасьці. Значная ж частка тэрыторыі Беларусі была захопленая нямецкімі войскамі падчас наступу з 18 лютага 1918 г. і да падпісаньня дамовы. Яна сталася зонаю часовай нямецкай акупацыі да заключэньня ўсеагульнага міру (г. зн. да сканчэньня сусьветнай вайны) і канчатковай расейскай дэмабілізацыі (артыкул 4-ы).

На акупаваных землях знаходзіліся Полацак, Ворша, Магілеў, Гомель. І толькі ў расейска-германскай дадатковай дамове ад 27 жніўня 1918 г. гаварылася, што «Германія ачысьціць яшчэ да

Юзаф Пілсудзкі.

заключэньня ўсеагульнага міру занятую на ўсход ад Бярэзіны тэрыторыю паралельна наяўным складкам, якія Расея мае плаціць паводле артыкула 2-га расейска-германскага фінансавага пагадненьня», г. зн. з пачатку выплаты Германіі 6 мільярдаў марак рэпарацыяў. Нямецкія войскі пачалі адступаць у кастрычніку 1918 г. ад Магілева і Воршы.

Аднак у Нямеччыне адбылася Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г., і Ленін, скарыстаўшы гэта, правёў пастанову УЦВК (ВЦИК) аб ануляваньні Брэст-Літоўскае дамовы. Такім спосабам узнавілася расейская юрысдыкцыя над аддадзенымі Нямеччыне тэрыторыямі. Расейскі савецкі ўрад не прызнаў Беларускае Народнае Рэспублікі і па-ранейшаму ўважаў гэтыя землі за свае.

Утварэньне БССР на тэрыторыі Заходняй Камуны на зьезьдзе Кампартыі Беларусі было вымушаным крокам. З аднаго боку, з 25 сакавіка 1918 г. існавала Беларуская Народная Рэспубліка; з другога — беларусы-камуністы, што знаходзіліся на тэрыторыі Расеі, патрабавалі стварэньня Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі накшталт іншых нацыянальных савецкіх рэспублік, у тым ліку і ў Балтыйска-Чарнаморскім рэгіёне. І зьезд КП(б)Б вызначыў тэрыторыю наваствoранай БССР у межах Менскай, Магілеўскай і Горадзенскай губэрняў, большай часткі Віцебскай губэрні (бяз трох латгальскіх паветаў), Смаленскай губэрні (без чатырох усходніх паветаў), частку Нова-Аляксандраўскага павету Ковенскай губэрні, а таксама Вялейскі, частку Сьвянцянскага і Ашмянскага паветаў Віленскай губэрні і чатыры паветы Чарнігаўскай: Сураскі, Мглінскі, Старадубскі й Навазыбкаўскі.

Гэтая савецкая рэспубліка праіснавала ў сваіх вялікіх межах, улучна са Смаленскаю й часткаю Чарнігаўскай губэрняў, толькі два тыдні.

16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) на чале зь Леніным прыняў рашэньне вылучыць са складу БССР тэрыторыю Смаленскай, Віцебскай і Магілеўскай губэрняў, пакінуўшы толькі дзьве — Менскую і Горадзенскую. Цэнтральнае Бюро Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі 22 студзеня дало згоду на зьмену мяжы з РСФСР. 3 лютага 1919 г. усходнія тэрыторыі — Віцебская, Магілеўская і Смаленская губэрні — адным росчыркам пяра былі забраныя ў склад РСФСР, а 28 лютага 1919 г. астатняя тэрыторыя БССР сумесным рашэньнем ЦВК Літвы й Беларусі аб'ядноўвалася з маленькаю тэрыторыяй Літоўскай ССР; утварылася новая марыянэткавая дзяржава — Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел), у складзе якой быў толькі самы ўсходні акрайчык літоўскай тэрыторыі, г. зн. той, дзе стаялі аддзелы Чырвонай Арміі. Амаль уся Літва была пад юрысдыкцыяй дэмакратычнага ўраду незалежнай Літвы.

Абвешчаньне савецкіх нацыянальных рэспублік праходзіла без усялякіх кансультацыяў з насельніцтвам і было чыста фармальным актам. Абвешчаньне БССР адбылося наагул на партыйным зьезьдзе адной толькі партыі — бальшавіцкай, а не на зьезьдзе Саветаў. Такім чынам, нават фармальнасьць не захоўвалася. Гэтая рэспубліка стваралася як буфэрная, каб пазьбегнуць непасрэдных канфліктаў паміж РСФСР і ўзноўленаю Польшчай.

Такім жа чынам, імгненна, як узьнікалі, гэтак і ліквідоўваліся нацыянальныя савецкія рэспублікі — рашэньнем Леніна, ЦК РКП(б) і ўраду РСФСР, якія ён узначальваў. Незаўважна перастала існаваць і ЛітБел, калі падчас савецка-польскай вайны 1919—1920 гг. Бела-

русь захапілі польскія войскі, якія ў жніўні 1919 г. занялі прастору да Бярэзіны. Літоўскія войскі акупавалі паўночны захад гэтай тэрыторыі. Апарат ураду ЛітБел быў ліквідаваны бальшавіцкімі ўладамі, а сама рэспубліка скасаваная безь якога-небудзь заканадаўчага акту. ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі сваёй назвы не зьмяніў і пераехаў у Смаленск. Яму было даручана празь Бюро нелегальнай работы пры ЦК кіраваць на тэрыторыі Беларусі барацьбою чырвоных (камуністычных) партызанаў супраць польскіх уладаў і войскаў. І ЛітБел таксама стваралася як буфэрная рэспубліка паміж РСФСР і Польшчай; калі ж яна адыграла сваю ролю, была ліквідаваная кіраўніцтвам кампартыі і ўраду РСФСР.

У 1919—1920 гг. нашая краіна заставалася аб'ектам геапалітыкі суседніх (і ня толькі суседніх) дзяржаваў. Урад РСФСР пасьля ліквідацыі ЛітБел лічыў тэрыторыю Беларусі расейскаю. Пра гэта сьведчаць шматлікія штампы й пячаткі рэўкамаў на дакумантах, падрыхтаваныя ў штабе Заходняга фронту ў Смаленску. Рэўкамы былі часоваю савецкаю ўладаю пасьля заняцьця Беларусі. Яны прызначаліся камандаваньнем Чырвонай арміі. Усе штампы й пячаткі мелі надпісы, напрыклад, «Борисовский ревком Минской губернии РСФСР» ці «Новогрудский ревком Минской губернии РСФСР» і г. д.

Урад Леніна лічыў тэрыторыю Беларусі расейскаю (пра БССР ужо забыліся) падчас мірных перамовінаў з урадам Літоўскай рэспублікі ў Коўне. Каб перацягнуць Літву і яе дзьве дывізіі на свой бок ды скіраваць супраць Польшчы, урад РСФСР 12 ліпеня 1920 г. падпісаў у Маскве мірную дамову зь Літвой, аддаючы ёй значную частку беларускіх земляў. Так, у 2-м артыкуле дамовы вызначалася «дзяржаўная мяжа паміж Расеяй і Літвой», што ішла на поўдзень ад Аўгустова, у 30 км ад Горадні (якая перадавалася Літве), потым Нёманам да Дзяляцічаў (на поўнач ад Наваградка й Любчы), потым на Валожын, які разам з Маладэчнам заставаўся на расейскім баку (прычым мяжа йшла па ўскраінных вуліцах Маладэчна), і далей на поўнач. Вялейка, Новы Мядзел, Шаркаўшчына й Друя заставаліся на расейскім баку. Менавіта гэтую расейска-літоўскую мяжу паказваюць апошнімі гадамі на шматлікіх мапах у Літве.

Генэрал Люцыян Жалігоўскі.

Гэтаксама без удзелу ўраду зноў створанай 31 ліпеня 1920 г. БССР на мірных перамовінах у Рызе ў 1920—1921 гг. была ўсталяваная дзяржаўная мяжа паміж Польшчай і БССР. Хоць А. Чарвякоў і прысутнічаў у Рызе як экспэрт расейскай дэлегацыі (і, такім чынам, не прадстаўляў БССР), але да 19 лістапада кіраўнік савецкай дэлегацыі Іофэ не дапускаў яго да ўдзелу ў перамовінах. Пад папярэднюю расейска-ўкраінска-польскаю дамоваю 12 кастрычніка 1920 г. стаяць подпісы чатырох членаў савецкай дэлегацыі: А. Іофэ, С. Кірава, Дз. Мануільскага і Л. Абаленскага. Пад мірнаю дамоваю 18 сакавіка 1921 г. паміж Расеяй і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай — з другога, што вызначыла канчатковую дзяржаўную мяжу Польшчы з БССР і УССР,— подпісы пяці сяброў савецкай расейска-ўкраінскай дэлегацыі — А. Іофэ, Я. Ганецкага, Э. Квірынга, Ю. Кацюбінскага і Л. Абаленскага. Праўда, у ёй гаворыцца, што ўрад РСФСР упаўнаважыў дэлегацыю падпісаць дамову за сябе і за ўрад БССР.

Падчас папярэдніх мірных перамовінаў у кастрычніку 1920 г. польская дэлегацыя прапанавала савецкай вывесьці польскія і расейскія войскі з тэрыто-

Паштовыя маркі Сярэдняй Літвы.

рыі Беларусі (улучна са Смаленшчынай) і правесьці там плебісцыт для самавызначэньня Беларусі, аднак савецкая дэлегацыя адмовілася і згадзілася на альтэрнатыўны варыянт падзелу гэтага краю па ўказаньні ЦК РКП(б). Расея не хацела страціць выгадны плацдарм. Пры гэтым лёс Беларусі вырашаўся нават без удзелу мясцовых бальшавікоў.

Перад падпісаньнем дамовы аб замірэньні і папярэдніх умовах міру ў кастрычніку 1920 г. савецкі ўрад, працягваючы мірныя перамовы, лічыў, што можа саступіць Польшчы і тую маленькую прастору БССР, якая яшчэ захоўвалася прыкладна ў межах шасьці паветаў былой Менскай губэрні. Дырэктываю ЦК РКП(б) Іофэ быў падрыхтаваны згадзіцца на самыя цяжкія ўмовы і падпісаць мір, чаго б гэта ні каштавала. Ён заявіў А. Чарвякову, што мір заключае Расея з Польшчай, а не Беларусь. Гэта была адназначная і цынічная заява, але Чарвякоў змаўчаў.

Пасьля падпісаньня прэлімінарнай дамовы пра варункі міру ўрад РСФСР улічваў магчымасьць перадачы тэрыторыі БССР у склад Польшчы пры заключэньні канчатковага міру. Таму, па-першае, 3 лістапада 1920 г. народны камісар замежных справаў Г. Чычэрын прапанаваў Палітбюро ЦК РКП(б) пабудаваць дачыненьні паміж БССР і РСФСР так, каб падпарадкаваць БССР расейскаму ўраду: «г. зн. пакідаючы Беларускую Рэспубліку па-за РСФСР, але фактычна аб'ядноўваючы цэлы шэраг галінаў дзяржаўнасьці...». Тым самым БССР пазбаўлялася сувэрэнітэту і ў значнай ступені кіравалася ўрадам РСФСР. Па-другое, народны камісарыят замежных справаў РСФСР 6 лістапада 1920 г. накіраваў сакратару ЦК РКП(б) М. Красьцінскаму новую запіску, у якой лічыў «нежаданым далучэньне да Беларусі якіх бы ні было частак Віцебскай або Магілеўскай губэрняў. Мы яшчэ ня ведаем, праз якія тэрыторыі можа прайсьці лёс Беларусі, і павялічыць загадзя тую тэрыторыю, якая праз гэтыя пэрыпэтыі будзе праходзіць, было б вельмі неасьцярожна». І толькі ў 1924 і 1926 гг. усходнія раёны цяперашняй Беларусі — Віцебская, Гомельская і невялічкая частка Смаленскай губэрні — былі далучаныя да БССР як свайго роду плата за ўступленьне Беларускай ССР у СССР.

Перш дзяржаўная мяжа БССР і Польшчы была ўсталяваная 12 кастрычніка 1920 г. паводле дамовы аб замірэньні і прэлімінарных умовах міру паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай — з другога. У артыкуле 1-м гэтага дакумента вызначалася ўсходняя мяжа Польшчы з Украінай і Беларусяй прыкладна па лініі, што потым існавала як мяжа да 1939 г. У 2-м артыкуле мірнае дамовы паміж Расеяй і Украінай, з аднаго боку, і

Польшчай — з другога, падпісанай у Рызе 18 сакавіка 1921 г., дзяржаўная мяжа замацоўвалася канчаткова. РСФСР і УССР перадавалі Польшчы дадатковыя тэрыторыі Беларусі: паміж Ланьню і Случчу на поўдзень ад Вызны й Старобіна, а таксама Радашкавічы. І зноў у складзе савецкай дэлегацыі не было прадстаўніка БССР. Тэрыторыя Беларусі падзялялася на дзьве часткі Расеяй і Польшчай. Для Расеі захавалася стратэгічная прастора, якая па-ранейшаму прыкрывала кірунак на Маскву. Для Польшчы тэрыторыя Заходняй Беларусі сталася часткаю прыфрантавой (з бальшавізмам) зоны, часткай «санітарнага кардону».

Такая сытуацыя адноснай раўнавагі існавала каля 20 гадоў. Аднак Савецкі Саюз, утвораны ў 1922 г., амаль на той жа тэрыторыі, што і Расейская імпэрыя, паўтараючы яе, не зьбіраўся прымірыцца зь існым становішчам. Спачатку для імпэрскай экспансіі выкарыстоўваўся лёзунг сусьветнай рэвалюцыі. Калі спроба Камінтэрну падняць такую рэвалюцыю ў Эўропе ў 1923 г. (Нямеччына, Баўгарыя) не ўдалася, кіраўніцтва СССР вяртаецца да іншай тактыкі: пры вонкавым захаваньні мірных дачыненьняў з эўрапейскімі краінамі зрабіць усё, каб вярнуць сабе перададзеныя рубяжы ва Ўсходняй Эўропе, захопленыя царызмам у XVIII ст. (Прыбалтыка, Заходняя Беларусь) і напачатку XIX ст. (Фінляндыя, Польшча, Басарабія).

Падпісаўшы мірную дамову з Польшчай у 1921 г., Савецкая Расея, а потым Савецкі Саюз пачаў рыхтаваць ды інсьпіраваць паўстанцкі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1922 гг. І хаця значная частка партызанскіх аддзелаў стваралася беларускімі эсэрамі, паступова кампартыя Заходняй Беларусі, якая накіроўвалася зь Менска й Масквы, у 1924—1925 гг. апанавала кіраўніцтва партызанскім рухам. У БССР ствараліся й перакідваліся праз мяжу партызанскія аддзелы, якія ў Заходняй Беларусі абрасталі мясцовымі сіламі — ішоў экспарт рэвалюцыі. Кіраўнікамі партызанскіх аддзелаў і групаў сталі чэкісты С. Ваўпшасаў, В. Корж, К. Арлоўскі, А. Рабцэвіч, К. Такушэвіч ды іншыя. Мэтаю партызанскага руху было самавызначэньне Заходняй Беларусі і яе далучэньне да БССР. Аднак насельніцтва, перадусім сялянства, не падтрымала руху, і да канца 1925 г. ён быў падаўлены. Спроба СССР заняць гэтую тэрыторыю пад выглядам узьяднаньня беларускага народу не ўдалася.

БЕЛАРУСЬ У САВЕЦКА-НЯМЕЦКІХ ДАЧЫНЕНЬНЯХ

Уся гэтая палітыка вялася пры прапагандысцкай крытыцы Вэрсальскае сыстэмы мірных дамоваў, што склалася пасьля першай сусьветнай вайны. Пры гэтым СССР спрабаваў зрабіць саюзьнікам Нямеччыну, якая прайграла вайну і была пакрыўджаная ўмовамі Вэрсалю, у тым ліку і ў тэрытарыяльным пытаньні. Пачаткам расейска-нямецкага саюзу сталася дамова ў Рапала ў 1922 г. і патаемнае вайсковае супрацоўніцтва СССР ды Нямеччыны. Райхсвэр атрымаў магчымасьць адчыніць на тэрыторыі СССР танкавую (у Казані), вайскова-паветраную (у Ліпецку) і вайскова-хімічную (у Саратаве) школы, абыходзячы тым самым артыкулы Вэрсальскага міру.

Прыход Гітлера да ўлады ў Нямеччыне 30 студзеня 1933 г. зьмяніў добрыя савецка-нямецкія дачыненьні, і яны пачалі пагаршацца.

Яшчэ да гэтага, каб умацаваць сваё становішча на заходніх межах, СССР падпісаў сэрыю дамоваў аб ненападзе зь Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй і прадоўжыў у 1931 і 1934 гг. савецка-літоўскую дамову 1926 г. аб ненападзе і нэўтралітэце. У апошняй дамове гаварылася, што СССР па-ранейшаму прызнае расейска-літоўскую мяжу 1920 г., г. зн. у склад Літвы мела ўваходзіць тэрыторыя паўночна-заходняй Беларусі (хаця фактычна яна была ў складзе Польшчы). СССР тым самым прызнаваў сувэрэннай літоўскай тэрыторыю з гарадамі Вільня, Горадня, Ліда, Браслаў, Паставы ды інш. Усе дамовы аб ненападзе, заключаныя савецкім урадам з суседнімі ўсходнеэўрапейскімі дзяржавамі, мелі агульныя рысы; галоўным было захаваньне прынцыпаў непарушнасьці межаў.

25 ліпеня 1932 г. у Маскве была падпісаная савецка-польская дамова аб ненападзе, тэрмін якой 5 траўня 1934 г. прадоўжылі да 31 сьнежня 1945 г. Тэрытарыяльныя пытаньні на перамовінах нават і не ўзьнімаліся. Дзяржаўная мяжа паміж СССР і Польшчай, якая была вызначана Рыскаю мірнаю дамоваю 1921 г. і якая падзяліла Беларусь

і Украіну, заставалася нязьменнаю.

У 1934—1936 гг. пазначылася альтэрнатыва савецка-германскаму пакту 1939 г.: заключэньне пагадненьня паміж СССР і заходнімі дэмакратычнымі краінамі для супраціву фашыстоўскай агрэсіі. Але гэтая ідэя не ажыцьцявілася. Англія й Францыя ня вельмі ахвотна йшлі на саюз з СССР, бо ня верылі Сталіну, які ў 1936—1939 гг., падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі, ня толькі праводзіў палітыку падтрымкі іспанскіх рэспубліканцаў, але й спрабаваў пашырыць ваенна-палітычны ўплыў СССР у Іспаніі, а значыць, і ў Заходняй Эўропе, узмацніць пазыцыі Кампартыі Іспаніі ва ўрадзе і на месцах. Усё гэта паказвала, што чакае кожную краіну, куды ўступяць войскі Чырвонай арміі. Эўрапейскія дэмакратычныя дзяржавы баяліся іхнага прыходу. Да гэтага трэба дадаць, што масавыя рэпрэсіі, якія асабліва шырока разгарнуў у СССР камуністычны рэжым у 1937—1938 гг., выклікалі ў эўрапейскіх краінах яшчэ большы недавер да савецкага ўраду, ягонай палітыкі ды прапановаў. Магчымыя ваенныя саюзьнікі ў эвэнтуальнай вайне супраць гітлераўскай Германіі лічыліся і з тым, што рэпрэсіі значна аслабілі Чырвоную армію.

Тымчасам, ад самага прыходу Гітлера да ўлады, Сталін захоўваў патаемную сувязь паміж Масквой і Бэрлінам. У сьнежні 1933 г. на зьезьдзе Саветаў кіраўнік ураду В. Молатаў і наркам замежных справаў М. Літвінаў заклікалі (у тым і Гітлера) паляпшаць савецка-нямецкія дачыненьні. Аднак Гітлер ігнараваў і гэтыя і пазьнейшыя заклікі. Адначасова Сталін вёў зандаж настрояў кіраўніцтва Англіі й Францыі.

Калі ў канцы 1938 г. кіраўнічыя колы фашыстоўскай Германіі пачалі дыпляматычны наступ на Польшчу, стварыўшы данцыгаўскі крызыс і рыхтуючыся да вайны, урад СССР у сакавіку 1939 г. пачаў у Маскве перамовіны з прадстаўнікамі ўрадаў Англіі й Францыі пра заключэньне дамовы аб узаемнай дапамозе. Пры гэтым Англія й Францыя былі зьвязаныя ўзаемнымі абавязкамі з Польшчай і муселі абвясьціць вайну Германіі, калі тая нападзе на Польшчу.

Падчас маскоўскіх перамовінаў дэлегацыя СССР прапанавала, акрамя заключэньня трохбаковага пакту аб узаемнай дапамозе, аказаць ваенную дапамогу ўсім усходне-эўрапейскім краінам, якія мяжуюць з СССР ад Балтыйскага да Чорнага мора. Такая меркаваная савецкая дапамога была б зьвязаная з парушэньнем межаў Польшчы й прыбалтыйскіх краінаў, прадстаўнікі якіх на перамовіны не запрашаліся. Але думка пра ўвод вайсковых аддзелаў Чырвонай арміі на тэрыторыю сумежных краінаў, у тым і ў Заходнюю Беларусь, усё больш авалодвала Сталіным і Молатавым, які, акрамя пасады кіраўніка савецкага ўраду, з 3 траўня 1939 г. заняў пасаду наркама замежных справаў.

11 траўня 1939 г. Польшча адмовілася ад заключэньня пакту пра ўзаемную дапамогу з СССР. Польскі ўрад добра ўяўляў, што абмежаваны кантынгент войскаў Чырвонай арміі, уведзены на тэрыторыю Польшчы, хутка ператворыцца ў неабмежаваны, што, пабудаваўшы тут вайсковыя базы, аэрадромы, склады, аддзелы Чырвонай арміі замацуюцца на гэтай тэрыторыі, а пасьля СССР, знайшоўшы зручную прычыну, зьменіць на сваю карысьць усходнюю мяжу Польшчы ды наагул памяняе яе дзяржаўны лад, аказваючы польскаму народу «брацкую дапамогу», як гэта потым, у 1940 г., адбылося ў краінах Прыбалтыкі. У Польшчы ж добра памяталі абвешчаньне ў 1920 г. у Беластоку Польскай Савецкай Рэспублікі, калі Чырвоная армія ўступіла на гэтую тэрыторыю.

Падчас перамовінаў ваенных місіяў Англіі, Францыі і СССР у Маскве маршал К. Варашылаў, які ўзначальваў савецкую ваенную місію, 14 жніўня 1939 г. паставіў для заключэньня дамовы пра ўзаемную дапамогу і ваеннай канвэнцыі пра ўзаемадзеяньне папярэднюю ўмову — прапусьціць савецкія войскі «праз польскую тэрыторыю, празь Віленскі калідор і Галіцыю ды праз румынскую тэрыторыю», нават калі Польшча й Румынія дапамогі ў СССР не папросяць. Савецкая ваенная дэлегацыя прапанавала ўрадам Англіі й Францыі паўплываць на ўрады Польшчы й Румыніі ў гэтым пытаньні.

Польскі ўрад і асноўная маса насельніцтва не ўспрымалі сталінскага сацыялізму, ня верылі Сталіну й камуністычнаму рэжыму. Таму польскі міністар замежных справаў Ю. Бэк 20 жніўня 1939 г. адмовіўся ад пропуску аддзелаў Чырвонай арміі ў Памор'е, на Сувальшчыну і ва ўсходнюю Малапольшчу. Спроба заняць тэрыторыю Заходняй Беларусі й часткі Польшчы не ўдалася.

Але Польшча не адмаўлялася ад уваходу Чырвонай арміі падчас вайны.

Наступным днём, 21 жніўня, К. Варашылаў падчас паседжаньня ваенных місіяў на прапанову ангельскай і францускай дэлегацыяў перанесьці паседжаньне на 3—4 дні заявіў, што трэба адкласьці перамовіны на даўжэйшы тэрмін. Перамовіны былі сарваныя, паколькі ваенныя місіі больш не зьбіраліся. Сталін і савецкі ўрад фактычна палохалі германскаю пагрозаю Англію й Францыю ды спрабавалі дамагчыся іхнае згоды на далучэньне да СССР часткі тэрыторыі Польшчы ў абмен на ваенную дапамогу.

У той жа час Сталін і Молатаў ужо разьлічвалі дамагчыся сваіх імпэрыялістычных мэтаў з дапамогаю перамовінаў з Германій, нягледзячы на шэраг саступак, якія ўжо зрабілі дэлегацыі Англіі й Францыі.

Яшчэ ў сакавіку 1939 г. Сталін у спавешчаньні на XVIII зьезьдзе партыі двойчы заявіў, што СССР стаіць за ўмацаваньне дзелавых сувязяў з усімі краінамі. Гэты заклік да супрацоўніцтва Гітлер зразумеў. На пачатку 1939 г. пачаўся абмен думкамі наконт гандлёвае дамовы. У жніўні 1939 г. савецка-германскія кантакты ўрэшце прывялі да прапановы германскага боку заключыць пакт аб ненападзе і ўлічыць усе інтарэсы СССР у пытаньні аб Прыбалтыцы й Польшчы, пра што заявіў 3 жніўня Молатаву германскі пасол у Маскве граф Ф. фон Шуленбург. Найперш вырашаўся лёс Заходняй Беларусі.

14 жніўня 1939 г. германскі міністар замежных справаў Ё. фон Рыбэнтроп даручыў Шуленбургу паўтарыць Молатаву германскія прапановы ды папрасіць аўдыенцыі ў Сталіна. Наступіў пэрыяд інтэнсыўных папярэдніх перамовінаў паміж Масквой і Бэрлінам. Гітлер сьпяшаўся заключыць дамову аб ненападзе з СССР, каб хутчэй пачаць вайну супраць Польшчы. Сталін жа сьпяшаўся выкарыстаць сытуацыю, каб захапіць новыя тэрыторыі ва Ўсходняй Эўропе.

17 жніўня Молатаў ад імя Сталіна і савецкага ўраду даў згоду на падпісаньне гандлёвае дамовы, а потым і пакту аб ненападзе. Прапаноўваўся і спэцыяльны пратакол да пакту па палітычных пытаньнях. 19 жніўня Шуленбургу перадалі савецкі праект дамовы аб ненападзе з дадаткам спэцыяльнага пратаколу па зьнешнепалітычных пытаньнях. Праўда, савецкі бок не канкрэтызаваў сваіх экспансіянісцкіх тэрытарыяльных памкненьняў. 20 жніўня Гітлер даў згоду на гэтыя ўмовы.

23 жніўня 1939 г. у Маскве Молатаў і Рыбэнтроп у прысутнасьці Сталіна падпісалі дамову аб ненападзе паміж Германіяй і Савецкім Саюзам. Да яе быў прыкладзены дадатковы сакрэтны пратакол, таксама падпісаны Молатавым і Рыбэнтропам. Гэтым пратаколам абедзьве таталітарныя імпэрыі падзялілі між сабой краіны Ўсходняй Эўропы, запісаўшы іх у «сфэры ўплыву Германіі й СССР» ды вызначыўшы іхны лёс. Паводле тэксту пратаколу, Літва пачаткова была ўключаная ў сфэру ўплыву Германіі, а Вільня прызнаная Літве. Заходняя Беларусь і частка Польшчы на ўсход ад Віслы ўвайшлі ў сфэру ўплыву СССР. Так дзьве імпэрыялістычныя дзяржавы вызначылі лёс мільёнаў людзей. Сталін дамогся ўрэшце ўсёй тэрыторыі Беларусі як стратэгічнага пляцдарму для наступальнай вайны ў Эўропе і адначасова абарончага перадпольля, якое прыкрывала б наступ з Эўропы на Маскву.

ДРУГАЯ СУСЬВЕТНАЯ ВАЙНА

17 верасьня 1939 г. на досьвітку Чырвоная армія перайшла савецка-польскую мяжу і пачала прасоўвацца да папярэдне абумоўленай з Гітлерам лініі. 19 верасьня з Масквы ў Бэрлін перадалі, што Сталін, які спачатку быў згодны зь існаваньнем польскай дзяржавы, прапаноўваў увогуле яе ліквідаваць і пачаць пра гэта перамовіны.

Дзяржаўная прыналежнасьць Заходняй Беларусі цяпер ужо вырашалася Сталіным. Пры гэтым ён не выключаў магчымасьці далучэньня Вільні й Віленскага краю да Беларускай ССР. Так, у 20-х днях верасьня 1939 г., пасьля таго як Вільня была занятая Чырвонай арміяй, савецкі прадстаўнік у гарадзкой управе загадаў працаўнікам складаць сьпісы выбаршчыкаў на беларускай мове для маючых адбыцца выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі. І такія сьпісы па-беларуску складаліся. Але ў сярэдзіне першай дэкады кастрычніка 1939 г. (гэтым часам у Маскве вяліся перамовіны паміж урадамі СССР і Літоўскай рэспублікі пра падпісаньне савецка-літоўскага пакту аб узаемнай дапамозе) прыйшоў загад складаньне сьпісаў спыніць. Савецка-



І. Сталін, Ф. Рузвэльт і У. Чорчыль на Тэгеранскай канфэрэнцыі (лістапад 1943 г.).

літоўская дамова была падпісаная 10 кастрычніка 1939 г. СССР аддаваў Вільню й Віленскі край Літве, а за гэта ўводзіў на тэрыторыю Літвы свае войскі. Так Вільня стала разьменнаю манэтаю ў сталінскай міжнароднай палітыцы Савецкага Саюзу.

25 верасьня 1939 г. Сталін прапанаваў Гітлеру абмен — Літву аддаць СССР, а Люблінскае й частку Варшаўскага ваяводзтва з «порцыі» СССР перадаць Германіі. Гітлер згадзіўся, і 28 верасьня ў Маскве была падпісаная германа-савецкая дамова пра сяброўства й мяжу паміж СССР і Нямеччынай, у якой усталёўвалася новая дзяржаўная мяжа. У 3-м артыкуле дакумэнта адзначалася, што ўрад СССР праводзіць неабходнае дзяржаўнае пераўтварэньне тэрыторыі на ўсход ад лініі мяжы. У сакрэтным дадатковым пратаколе была запісаная дамоўленасьць паміж Германіяй і СССР пра абмен Літвы на ўсходнія тэрыторыі Польшчы. Такім чынам, СССР цяпер афіцыйна атрымаў права праводзіць выбары ў народныя сходы Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны і далучыць гэтыя тэрыторыі да СССР, што і адбылося ў канцы кастрычніка — першай палове лістапада 1939 г. Заходняя Беларусь (разам зь Беласточчынай) увайшла ў склад БССР. Вільня й Віленскі край былі перададзеныя Літве ў кастрычніку 1939 г. з тым, каб улетку 1940 г. далучыць і гэтую дзяржаву да СССР. А галоўнае — Чырвоная армія без вайны прасунулася далёка на Захад.

Падчас уключэньня Літвы ў склад СССР на сэсіі Вярхоўнага Савету СССР на пачатку жніўня 1940 г. першы сакратар ЦК КПБ П. Панамарэнка абвесьціў аб перадачы Літве тэрыторыі большай часткі Сьвянцянскага і Гадуцішкаўскага раёнаў Вялейскай вобласьці.

Аднак на працягу другой сусьветнай вайны геапалітычнае становішча Беларусі зьмянілася. Пасьля нападу фашыстоўскай Германіі на СССР і акупацыі нямецкімі войскамі ўлетку 1941 г. тэрыторыі Беларусі Гітлер дзяліў ужо сам, без свайго контрагента па ранейшых перамовінах. Гітлер нават не прыняў патаемнай прапановы Сталіна падчас вайны, перададзенай праз Бэрыю ды ягоную службу, заключыць новы Берась-



Савецкія стратэгічныя ракеты і бамбавальнікі на тэрыторыі Беларусі. Схема з газ. «Свабода», сакавік 1991 г.

цейскі мір зь перадачай у распараджэньне Германіі Прыбалтыкі, Беларусі, Украіны і Малдовы.

Заходнія раёны Беларусі — Беластоцкая вобласьць з Горадняй, Мастамі, Ваўкавыскам і Сьвіслаччу, паўночна-заходнія раёны Берасьцейскай вобласьці з Пружанамі, Камянцом і Высокім былі далучаныя да Ўсходняй Прусіі (Беластоцкая акруга). Беларускае Палесьсе зь Берасьцем, Бярозай, Пінскам, Туравам, Мазыром і Гомлем уключылі ў райхскамісарыят Украіну. Паўночна-заходнія раёны Вялейскай вобласьці з Ашмянамі, Смаргонямі, Відзамі далучылі да генэральнай акругі Літвы. Віцебская, Магілеўская, большая частка Гомельскай вобласьці і ўсходнія раёны Менскай (з Чэрвенем, Пухавічамі, Старымі Дарогамі й Любаньню) засталіся ў зоне армейскага тылу групы арміяў «Цэнтар». І толькі Баранавіцкая, Вялейская, Менская (без усходніх раёнаў), паўночныя раёны Берасьцейскай і Пінскай абласьцей увайшлі ў склад генэральнай акругі Беларусі. Гэтыя землі (чвэрць тэрыторыі БССР) былі ўключаныя ў склад райхскамісарыяту Остлянд з цэнтрам у Рызе і падзеленыя на дзесяць акругаў. На тэрыторыі генэральнай акругі Беларусі акупанты паступова дазвалялі дзейнасьць беларускіх нацыянальных арганізацыяў. Аднак пра дзяржаўнасьць Беларусі размовы не было: нямецкія фашысты не плянавалі стварэньня беларускае нацыянальнае дзяржавы.

ПАСЬЛЯ ВАЙНЫ

Пасьля выгнаньня фашыстоўскіх акупантаў у выніку Беларускай апэрацыі чатырох франтоў у чэрвені — ліпені 1944 г. тэрыторыя Беларускай ССР скарацілася: Сталін безь ніякага юрыдычнага акту перадаў Беласточчыну ў падпарад-

каваньне Польскаму камітэту нацыянальнага вызваленьня, альтэрнатыўнаму польскаму ўраду пад кантролем камуністаў і Масквы, улада якога ўсталёўвалася на польскіх тэрыторыях, занятых Чырвонай арміяй. Гэтым разам частка беларускіх земляў была перададзеная Польшчы. У каторы раз тэрыторыяй Беларусі вольна распараджаліся чужыя гаспадары.

Некалькі дзесяцігодзьдзяў БССР у геапалітычным пляне выконвала для СССР тую ж самую ролю, якая была вызначана ёй царскім урадам Расеі. Яна заставалася пляцдармам для ўварваньня ў Эўропу (праўда, пляцдармам другога рубяжу пасьля ГДР і Польшчы) ды передпольлем для абароны Масквы й цэнтральных раёнаў Расеі. Толькі пасьля другой сусьветнай вайны беларускі рубеж абароны стаўся ядравым. На гэтай тэрыторыі павінны былі запускацца ядравыя ракеты ў бок праціўнікаў СССР або, наадварот, праціўнікі СССР мелі зьнішчаць разьмешчаныя тут савецкія ракеты разам з усім, што ёсьць на гэтай зямлі. Нават і пасьля абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й ліквідацыі СССР нашая тэрыторыя і яе насельніцтва застаюцца закладнікамі ядравай стратэгіі расейскіх генэралаў, якія не жадаюць пераносіць рубеж абароны на Смаленшчыну. Таму на сувэрэнітэт і нэўтралітэт Беларусі з боку расейскіх шавіністычных колаў і вайсковага кіраўніцтва вядуцца палітычныя прапагандавыя наступы. Дзеля гэтага ў Беларусі актывізуюцца здрадніцкія сілы, калябаранцкія элемэнты, дзеля гэтага не выводзяцца расейскія войскі, прапануюцца вайскова-палітычныя саюзы, фэдэрацыя ці хаця б канфэдэрацыя з Расеяй або нават рэанімаваньне Савецкага Саюзу. Па-ранейшаму Беларусь і яе народ застаюцца мішэньню першага ўдару ў выпадку ядравага канфлікту. Такім чынам, лёс Беларусі па-ранейшаму шмат у чым залежыць ад тых, хто знаходзіцца ў Крамлі.

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ: З ГІСТОРЫІ СТВАРЭННЯ

Пасля зачынення царскімі ўладамі Віленскага ўніверсітэта (1832) і Горы-Горацкага земляробчага інстытута (1863) Беларусь на доўгі час засталася без вышэйшай школы. Некалі славутая сваімі культурнымі здабыткамі краіна паступова ператваралася ў «задворкі» імперыі. Мясцовая моладзь, каб атрымаць адукацыю, вымушаная была ехаць на чужыну. Некаторыя асядалі там назаўсёды, а тыя, хто вяртаўся, глядзелі на сваю бацькаўшчыну пасля той «навукі» як на Паўночна-Заходні край альбо як на «крэсы ўсходнія». Ненармальнасць такога становішча разумелі розныя колы грамадства: ад свядомых беларусаў-адраджэнцаў да так званых «западнарусаў». Апошнія, праўда, дамагаліся тут стварыць «истинно» рускі ўніверсітэт расійскай дзяржаўнай ідэалогіі. На пачатку XX ст. пытанне аб утварэнні Краёвага ўніверсітэта неаднаразова ўздымалася земствамі і органамі гарадскога самакіравання беларускіх губерняў, але гэтыя спробы не далі станоўчых вынікаў. За хутчэйшае адкрыццё ўніверсітэта ў 1916 г. выступаў на старонках газеты «Дзяньніца» З. Жылуновіч. Пра гэта ж марылі вядомыя беларускія навукоўцы, раскіданыя па розных кутках Расійскай імперыі: М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, М. Янчук ды інш.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі, калі беларускі нацыянальны рух заявіў пра сябе на поўны ґолас, пытанне аб вышэйшай школе стала адным з праграмных для беларускіх нацыянальных партыяў і арганізацыяў. Але спадзяванні, што Часовы ўрад дасць народу Беларусі свабоду нацыянальнага і культурнага развіцця, хутка развеяліся. З восені 1917 г. ідэі ўтварэння Беларускага ўніверсітэта і незалежнасці Беларусі робяцца непарыўнымі. На Усебеларускім з'ездзе ў снежні таго ж года пытанне пра ўніверсітэт не раз уздымалася ягонымі дэлегатамі. Калі, напрыклад, браў слова Карскі, многія дэлегаты дружна сустракалі яго выкрыкамі: «Шчыра вітаем прафесара Беларускага ўніверсітэта!». Секцыя народнай асветы з'езду вы-

казалася «за неадкладнае адкрыццё на Беларусі Беларускага ўніверсітэта...» З абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі ідэя арганізацыі вышэйшай школы, здавалася, пачала ўвасабляцца ў жыццё. У красавіку 1918 г. Народны сакратарыят на чале з А. Смолічам даручыў Доўнар-Запольскаму і Карскаму ўлажыць праекты арганізацыі Краёвага ўніверсітэта, што яны ў хуткім часе і зрабілі. Яшчэ адзін праект быў прадстаўлены земскай губернскай управай, якая акрамя таго выдзеліла на гэтыя мэты 20 000 рублёў. У траўні таго ж года Доўнар-Запольскі паведамляў ураду БНР, што ён атрымаў згоду 36 вядомых навукоўцаў (у асноўным выхадцаў з Беларусі) на заняцце прафесарскіх пасадаў у Беларускім універсітэце. Вядомыя прозвішчы некаторых з іх: У. Завітневіч, П. Жуковіч, Я. Карскі, І. Лапа, М. Янчук, А. Ясінскі, Б. Эпімах-Шыпіла. 6 чэрвеня 1918 г. у памяшканні сакратарыята адбылася нарада, на якой абмяркоўваліся арганізацыйныя пытанні па стварэнні ў Менску ўніверсітэту. Сярод запрошаных былі П. Аляксюк, А. Аўсянік, Э. Будзька, кс. В. Гадлеўскі, Т. Грыб, К. Гадыцкі-Цвірка, А. Данілевіч, Л. Заяц, Р. Зямкевіч, Р. Каплан, М. Касцевіч (Краўцоў), І. Куодзіс, Ст. Лянкоўскі, Я. Лёсік, М. Масоніус, Д. Мейчык, У. Самойла, М. Фрумкіна, В. Янчэўскі ды інш. Прысутнічаў таксама вядомы юрыст Казімер Петрусевіч — той адвакат, што бараніў у 1907 г. Якуба Коласа на судзе, выступаў абаронцам Грамады (БСРГ) у 1927 г. у Заходняй Беларусі. Дададзім яшчэ, што ён — удзельнік з'езда РСДРП у Менску ў 1898 г. Зыходзячы з тагачасных рэаліяў (адсутнасць нацыянальных выкладчыцкіх кадраў, вучэбнай літаратуры і распрацаванай навуковай тэрміналогіі ў роднай мове), большыня прамоўцаў выказалася за выкладанне навукаў як у беларускай мове, так і ў расейскай і ў польскай, з паступовым пераходам цалкам на беларускую мову. Меркавалася стварыць ва ўніверсітэце польскую, літоўскую і яўрэйскую секцыі па вывучэнні гісторыі і культуры гэтых нацыянальных меншасцяў на Беларусі. На нарадзе быў абраны Арганізацыйны камітэт (Камісія) па закладзінах вышэйшай навучальнай установы ў складзе: Доўнар-Запольскі (старшыня), Масоніус (намеснік старшыні), Данілевіч, Гадыцкі-Цвірка, Заяц, Аўсянік, Зямкевіч, Лёсік, Лянкоўскі, Смоліч. Пазней у ягоны склад былі кааптаваныя і іншыя. Былі вызначаныя неабходныя секцыі па канкрэтнай арганізацыі новай навучальнай установы — па арганізацыі вучэбна-навуковай працы, фінансавая, гаспадарчая, музейна-калекцыйная (па архівах, бібліятэцы, музейных каштоўнасцях) ды інш. У вельмі адказную фінансавую секцыю разам з дзеячамі нацыянальнага руху В. Іваноўскім і Р. Скірмунтам запрашаліся ведамыя заможныя людзі Беларусі, неабыякавыя да лёсу беларускай культуры: М. Рагавы, Э. Вайніловіч, Ю. Булгак, княгіня М. Радзівіл ды інш. Інжынеру Каплану даручалася зрабіць праект новага будынка, а знанаму менскаму адвакату Мейчыку — афармленне арэнды на часовае памяшканне для ўніверсітэта. Няпэўнае палітычнае становішча, адсутнасць грашовых сродкаў не дазволілі ўраду БНР здзейсніць задуманае. 10 снежня Чырвоная Армія ўжо ўваходзіла ў сталіцу Рэспублікі — Менск.

Беларускія арганізацыі, што існавалі ў 1918 г. на тэрыторыі Савецкай Расіі, неаднаразова звярталіся да бальшавіцкага кіраўніцтва па пытанні стварэння беларускай вышэйшай навучальнай установы. Так, Беларускі абласны камітэт хадайнічаў аб пераводзе Нова-Аляксандраўскага інстытута ў Горы-Горкі, а Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) дамагаўся замацавання за Беларуссю эвакуяванага Юр'еўскага ўніверсітэта. Аднак гэтыя праекты не былі ажыццёўленыя. Савецкі ўрад не выяўляў асаблівай зацікаўленасці ўкладваць сродкі ў эканамічнае і культурнае развіццё «спрэчнай тэрыторыі», на якую прэтэндаваў новы імперыяліст — Польшча. Падчас кароткага існавання ССРБ ідэю стварэння ўніверсітэта высунулі дзеячы беларускага нацыянальнага руху В. Іваноўскі, У. Ігнатоўскі, А. Трэпка, Б. Тарашкевіч ды іншыя, што засталіся працаваць у Менску пры Саветах. Намаганнямі камісара асветы А. Чарвякова ЦВК ССРБ прыняў пастанову ад 25 лютага 1919 г. пра пажаданасць утварэння ўніверсітэта ў Менску і выдзеліў на гэтыя мэты 1 млн. рублёў. Была створаная Арганізацыйная камісія на чале з Я. Карскім. Адпаведная камісія была створана ў Маскве пры Наркамасветы РСФСР. Сапраўдная пазіцыя мясцовых бальшавікоў па гэтым пытанні выявілася пасля фактычнага разгону першага Ураду Савецкай Беларусі, які ўзначальваў З. Жылуновіч. У сакавіку — красавіку 1919 г. савецкія рэпрэсіўныя


Смолічу
Братка, у пятніцу, 14-VI — а 6 гадз. вечарам сход Арганізацыйнай Камісіі, назначу п. Массоніус
Трэба запрасіць
1, Массоніуса
2, Лёсіка
3, Земкевіча
4, Ленкоўскага
5, Смоліча
6, Данілевіча
7, Гадыцкага Цвірку Канстанціна
8, Зайца
9, Аўсяніка

Запіска Эдварда Будзькі народнаму сакратару асветы Аркадзю Смолічу ад 10 чэрвеня 1918 г.

органы арыштоўваюць і інтэрніруюць А. Трэпку і Б. Тарашкевіча. У траўні такі ж лёс чакаў і сябру Менскай камісіі Вацлава Іваноўскага, а ейнаму старшыні акадэміку Карскаму забаранілі чытаць лекцыі ў Менскім Беларускім педагагічным інстытуце «да высвятлення яго [Карскага] палітычнага крэда». Незаконныя арышты, канфіскацыі маёмасці, «кватэрныя ўшчыльненні буржуазных элементаў» адштурхнулі ад новай улады большасць мясцовай інтэлігенцыі, якая не йшла ўжо дабрахвотна на супрацоўніцтва з бальшавікамі. Усе гэтыя факты сведчаць, што прычыны, якія не дазволілі стварыць Краёвы ўніверсітэт у Менску ў 1919 г., крыліся не толькі ў знешнім фактары — польскай інтэрвенцыі, але і ва ўнутранай палітыцы бальшавікоў.

Вясной — летам 1920 г. ва ўмовах польскай акупацыі рэктар Беларускага пед-інстытута Вацлаў Іваноўскі намагаўся стварыць, нарэшце, нацыянальны ўніверсітэт, які адпавядаў бы ўзроўню, напрыклад, Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя. Падмуркам новай школы мусеў стаць той жа педінстытут. З боку польскіх акупацыйных уладаў гэтая ідэя не выклікала энтузіязму, наадварот, яны рабілі ўсё, каб перашкодзіць беларускім нацыянальным дзеячам у іхнай справе. Яшчэ ў верасні 1919 г. польская адміністрацыя ў прамым сэнсе слова выкінула на вуліцу выкладчыкаў і студэнтаў інстытута, забраўшы будынак пад вайсковы шпіталь. Частка інстытуцкай маёмасці (мэбля, рэчывы хімічнай лабараторыі ды інш.) было раскрадзена польскімі жаўнерамі; знішчаны каталогі і лекцыі па хіміі Іваноўскага. Выкладчыкам і настаўнікам беларускіх навучальных установаў Менску паўгода не плацілі зарплаты. Нягледзячы на такі ўціск, арганізацыя Беларускага ўніверсітэта рухалася наперад. Беларускі пед-інстытут меў моцны і вопытны прафесарска-выкладчыцкі склад. У ім выкладалі, акрамя Іваноўскага, Мікалай Байкоў, Кастусь Гадыцкі-Цвірка, Карскі, Ігнатоўскі, Тарашкевіч, Антось Трэпка, Уладзімір Тэраўскі. Былі запрошаныя таксама Максім Гарэцкі, кс. Фабіян Абрантовіч, Аляксандр Данілевіч, Васіль Дружчыц, Хведар Імшэннік, Станіслаў Любіч-Маеўскі ды інш. Пажаданне чытаць лекцыі па аграноміі і пачатках кааперацыі выказаў Ігнат Канчэўскі (Абдзіраловіч), выкладанне музыкі браў на сябе беларускі кампазітар Іван Тарасевіч. Пры інстытуце была створана спецыяльная камісія па выпрацоўцы навуковай тэрміналогіі (пазней, у 1921 г., у Вільні была выдадзеная «Арыхметычная тэрміналёгія» А. Данілевіча, ухваленая гэтай камісіяй). Пашыралася і навуковая база інстытута. Яму была падпарадкаваная Менская земская балотная станцыя, якую акупанты хацелі раней вывезці ў Польшчу. У распараджэнні інстытута меліся калекцыі Менскага га-

радскога музея, які былі створаны яшчэ ў 1912 г. Таварыствам аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. На карысць будучага Беларускага ўніверсітэта акадэмік Карскі дараваў сваю бібліятэку, якую ён вывез з Варшавы вясной 1920 г.

Зараз цяжка адказваць на пытанне: ці здолелі б беларускія нацыянальныя дзеячы здзейсніць сваю задуму пра ўтварэнне Беларускага ўніверсітэта, калі б не чарговы прыход Чырвонай Арміі ў Менск у ліпені 1920 г.? Гісторыя не любіць умоўнага ладу. Бясспрэчна тое, што на той час беларуская ідэя ўжо трывала замацавалася ў свядомасці многіх беларусаў і ігнараваць іхныя нацыянальна-культурныя патрэбы стала немагчыма. У 1921 г. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адчыніў свае дзверы...

ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 221, воп. 2, спр. 2; 3; 7; ф. 604, воп. 1, спр. 1; 2; 3; 6; 8.

Аўген Калубовіч. Акт 25 Сакавіка й адраджэнне нацыянальнай беларускай культуры // Яго ж: Крокі гісторыі. Мн., 1993.

У. І. Пічэта. Пытаньне аб вышэйшай беларускай школе на Беларусі ў Мінулым. // Працы БДУ, 1928. № 19.

Ф. Турук. Летопись Университета // Працы БДУ, 1921, № 1—2.

ВОПРОС ПО ПОВОДУ УНИВЕРСИТЕТА

1) Полагая, что уже имеется комитет из представителей общественных организаций, я считал бы наиболее необходимым, чтобы означенный комитет, а равно и рада, снеслись бы с земствами и городами и выяснили бы, насколько эти органы заинтересованы в открытии университета и могут ли его субсидировать. При настоящих условиях в этом деле наиболее целесообразно опереться на органы общественного самоуправления.

2) Полагаю, что комитет сам позаботится о подходящем помещении. Для анатомического театра желательно изолированное помещение с хорошими подвалами и ледниками.

3) Сейчас необходимо собирать: а) библиотеку — покупать книги и просить жертвовать; б) собрать все архивы, как в городе, так и разбросанные в разных местах, выяснить местонахождение эвакуированных архивов. Если свозить нельзя, нужно наложить печати и поставить охрану. Нужно просить частных лиц, особенно землевладельцев, жертвовать свои архивы; в) также нужно немедленно собирать сведения о предметах древности.

4) Нужно войти в сношения с Киевским университетом через здешнее правительство по следующим двум вопросам: а) университет св. Владимира владеет библиотекой Виленского университета и частью его коллекций. Надо просить их возвратить; б) тот же университет временно хранит еще не развернутую библиотеку графа Аполинария Николаевича Хрептовича-Бутенева. (Москва, Поварская, свой дом). Эта библиотека поступила в Киевский университет при моем содействии, с условием, что она будет передана белорусскому университету, когда последний будет основан. Об этом надо просить содействия у графа [1].

5) Желательно теперь же выяснить, можно ли отвести участок земли и леса для опытного поля и леса для агрономического факультета. Эти учреждения желательно иметь под самым городом, чтобы студенты действительно могли там заниматься. Желательно также определить участок для ботанического сада и зоологического. Если эти сады будут удобно расположены, то они могут, как московский зоологический сад, быть доходными статьями (устройство гуляний и театра).

6) В постановлениях рады, земств и городов желательно провести постановления о том, что университет будет пользоваться правами для студентов и для профессоров и других служащих. Для профессоров и других служащих в том смысле, что пенсионные права их будут обеспечены. Желательно принципиально постановить об увеличении пенсии сравнительно с ныне установленным окладом.

7) Предполагаю, что университет должен состоять из следующих факультетов:

1) Историко-филологический с двумя отделениями — историческим и историко-литературным;

2) Физико-математический в составе естественного, химического и агрономического отделений. Чистая математика привлекает немногих и потому сейчас удорожит содержание университета;


У Фінансовую камісію
1. 1) Рогов, Моисей Юрьевич
соб. д. Захарьевская ул.
~~2) Чапски Георгий Альбрехтович~~
2 8, Янчевский Виктор Осипович
3 7 Каплан Григорий Абрамович
~~5 Янковский~~
6, Скирмунд
7 Войнилович Эдуард Адамович
8 Булгак Юрий
9 Иванцевич Вацлав
~~10 Бонч-Осмоловский~~
10 Радзивилл Магдалена

Спіс кандыдатаў фінансавай секцыі арганізацыйнай камісіі. Пісана рукой Эдварда Будзькі. 6 чэрвеня 1918 г.

3) Юридический;

4) Коммерческо-экономический. Он имеет теперь большое применение и потребует весьма мало особых кафедр, раз читаются науки юридические, исторические и естественные;

5) Медицинский;

6) Советовал бы открыть и богословский факультет. При параллельном существовании с историко-филологическим факультетом будет стоить недорого, ибо потребует немного особых кафедр (около 10), и сверх того, его содержание могло бы быть принято духовенством на счет церковных сумм.

7) При распланировке университетского преподавания следует достигнуть наибольшего удешевления университета. Намеченные мною факультеты распланировываются таким образом, что многие кафедры обслуживают сразу два или даже три факультета. Число кафедр определяется самое необходимое, без излишней роскоши. В университет следует допустить мужчин и женщин, причем последних с обычными аттестатами женских гимназий, как они принимаются на женские курсы. Все эти меры, в связи с расчетливым оборудованием учебно-вспомогательных учреждений, должны умень-

шишить расходы на содержание университета.

8) Однако придется сделать исключение для историко-филологического факультета и допустить на нем известного рода роскошь преподавания, что называется, национальным характером университета (кафедра белорусская, польская и литовская).

9) Кстати заметить, что я разумею языком преподавания русский с допущением в известных случаях польского.

10) Жалованье профессорам надо назначить достаточное, примерно: доцентам 4500, экстраординарным 6000, ординарным 9000. По теперешним временам и это немного. Получают больше. Выслужившим уже пенсии придется уплачивать жалованье полностью.

11) Следует одновременно открыть народный университет и привлечь к нему профессоров.

12) Подробную смету составлю по получении ответа и уяснения других подробностей. Теперь же замечу, что полный университет, то есть, все четыре курса, должен иметь 75 кафедр, без богословского факультета. Предполагая оплату каждой кафедры в среднем в 7000 р., на содержание личного состава потребуется 525 000 р. Содержание ассистентов, лаборантов, приват-доцентов — до 200 000 р. На 4000 студентов, по 200 р. в год дадут 800 000 р. При готовых зданиях представляется уже возможным или почти возможным существование университета без субсидий. Но, конечно, нужны затраты на оборудование, правильно было бы поднять статьи дохода и понизить статьи расхода.

13) С будущего года следовало бы открыть первые курсы всех факультетов. Для чтения на этих курсах пришлось бы пригласить 20—25 профессоров. При этом желательно было бы не стесняться в средствах и иметь возможность пригласить с первого же года и профессоров, кафедры которых относятся к следующим курсам, руководствуясь следующими соображениями: 1) приглашать профессоров — уроженцев Белоруссии, желающих вернуться на родину; 2) следует сделать исключение для выдающихся ученых, желающих к нам перейти независимо от их происхождения. Работа для таких профессоров найдется по устройству и оборудованию университета, по чтению необязательных курсов.

14) Для практического осуществления предполагаю образовать здесь комитет из своих коллег и сверх того, советую нужным снестись по всем вопросам с профессорами-белоруссами: Завитневичем, Карским, Лаппо, Жуковичем и др.[2].

Киев. Проф. Довнар-Запольский.

Дакумент захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве, ф. 604, в. 1, спр. 3, арк. 470—470а. Дакладная дата напісання невядомая.

[1] Пытанне аб вяртанні бібліятэкі графа Храптовіча было ўзнята праўленнем Белдзяржуніверсітэта ў дваццатыя гады, але яно не было вырашана станоўча.

[2] У дакладной запісцы маюцца яшчэ пункты 15, 16, 17 і 18 (матэматычныя разлікі па каштарысу планаванага ўніверсітэта), якія паўтараюць змест і сэнс пунктаў 10 і 12 і для часопіснай публікацыі неістотныя.

ЗАПІС НАРАДЫ СХОДУ ДАКЛАДЧЫКАЎ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ЗАКЛАДЗІНАХ БЕЛАРУСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА 1918 ГОДУ ЧЭРВЕНЯ 6-га ДНЯ А 9.30 ВЕЧАРА.

Нараду распачаў Сэкратар Асьветы А. Смоліч, далажыўшы сходу аб мэтах гэтай нарады.

Массоніус даведваецца — ці меіць быць поўны ўніверсітэт, ці філёлёгічны факультэт, бо з гэтага факультэту найлягчэй пачынаць будову ўніверсітэту.

Смоліч паясьняіць, што першыя гады навука ў Беларускім Універсітэце будзіць ня толькі па беларуску, а і па расейску, па польску, вось дзеля гэтага прафесурай абязпечыць Беларускі Універсітэт досыць лёгка, як думаюць прафесары Довнар-Запольскі і Карскі.

На запытаньня аб дастатках для універсітэту Смоліч паясьняіць, што яшчэ пэўнага нічога няма, алі як ужо падрахоўывалася, дык дастаткі акажуцца. Відаць гэта і з пісьма праф. Довнар-Запольскага, каторае Смоліч прачытваіць.

Массоніус крытыкуіць даверчывыя надзеі на ўніверсітэт сёліта. Дзівіцца, чаму дапускаць навуку ў Беларускім Універсітэце на чужых языках, а ні па беларуску.

Фрумкіна думаіць, што чыста беларускі нацыянальны Ўніверсітэт — ня скорая ўдача, а Краявы Ўніверсітэт — самая патрэбная цяпер на Беларусі школа. Слухаць лекцыі па польску ні, канешна, ехаць у Варшаву або куды-нібудзь слухаць лекцыі па расійску можа каму і захочацца, алі студэнты будуць рахавацца з эканамічнай стараной — і з гэтай стараны ім будзіць дагадней у Краі вучыцца, чымся дзесь далёка выižджаць. Евреі пэўнаж у Краёвы Ўніверсітэт кінуцца. Варта, каб ва Ўніверсітэце былі навукі і спец. евреев інтересующія, як із гісторыі і культуры еврейскай.

Янчэўскі радзіць ня ўсе факультэты адкрыць, а толькі нікаторыя. Найперш патрэбнейшымі ёсьць навукі па зямельнай гаспадарцы, і для гэтага найлепі адкрыць інстытут сельска-гаспадарскі. Вялікія грошы цяпер дастаць, здаецца, трудна, бо на падмогу ад земстваў спадзівацца ня можна, яны ці ні рассыпюцца і найбольшай падмогі хіба трэба спадзівацца ад Краёвай уласьці, калі такая будзіць.

Каплан кажыць, што і ў Расеі і ў Японіі ў вышэйшых школах пачыналі вучыць на чужых мовах.

Лянкоўскі кажыць, што ў Японіі і цяпер яшчэ на чужых мовах здараюцца навукі ў вышэйшых школах.

Смоліч паясняіць, што, рахуючыся з сіламі, у праекце і ёсьць — адкрыць універсітэт у Менску з навукамі па нескульскіх языках, бо толькі па беларуску — гэта цяпер німажлівая рэч.

Смоліч просіць зрабіць выбары камітэту для арганізацыі Беларускага Ўніверсітэту. Паясняіць — што пры Народным Сакратару Асьветы сазываецца камісія, каторая, так як цяпер, будзіць рашаць важкія справы і выбіраць К-т, каторы далей будзе дабівацца да мэты.

Ідзець гутарка аб кандыдатах.

Усімі згодна выбіраіцца старшынёй камітэту прафесар М. В. Доўнар-Запольскі. Намесьнікам старшыні ўсімі згодна выбіраецца Марыян Массоніус. Сакратаром — выбіраецца Адвард Будзька.

Далей у парадку дня — выбары Фінансавай сэкцыі.

Старшыня Массоніус радзіць выбраць найперш старшыню Фінансавай сэкцыі, а тады падбіраць яму таварышоў.

Смоліч і Фрумкіна радзюць пірачысліць усе камісіі, якія выбіраць трэба, а тады выбіраць будзем.

Рашылі, што прысутныя самі запішут сябе на сьпіске да той камісіі, да якой кажды пачуваіцца быць карысным. На нараду гэтых камісій запрасіць і другіх грамадзян, сьпісак каторых цяпер зроблін.

Прызнаецца права Камісій кооптоваць посьля памоцнікаў.

Далей ідуць выбары ў арганізацыйную камісію. Тут далей разводзюцца гутаркі аб тым — што маіць значыць «Беларускі Ўніверсітэт»: ці то маіць значыць нацыянальны ці толькі геаграфічна-краёвы. Лёсік і Земкевіч кажуць, што ён мусіць перш наперш задаволіць патрэбы беларускага народу, яго народавыя жаданьня. Можа калі будзіць у ім выкладацца навука толькі па беларуску, алі цяпер ніхай і на іншаму, абы выкладалася найперш тое, што для беларускай ідэі пільней патрэбна.

Кіраўнік сходу —
Народны сэкрэтар [А. Смоліч]
Пісар Адвард Будзька

Дакумент захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве, ф. 604, в. 1, спр. 3, арк. 479—482.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА АБ ПРАЦЫ ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТУ З 1-га САКАВІКА ПА 15 КРАСАВІКА 1920 г.

Лічучы сваім абавязкам інфарміраваць Беларускую Школьную Раду аб тым, што робіцца цяпер і што Інстытут думае рабіць далей, даводзім да ведама Рады аб працы інстытуцкай з 1-га сакавіка па 15 красавіка 1920 г...

Арганізацыя інстытуту падобна да арганізацыі Віленскага Універсітэту, маючы на мэце, што інстытут разаўецца ў Беларускі Універсітэт. У галаве адміністрацыі стаяць рэктар і прарэктар інстытуту, у галаве педагогаў — дзеканы і факультэцкія сходы.

Інстытут складаецца:

1) Курсу прыгатаваўчага, на каторым дапаўняюцца навукі ў межах сярэдняй школы;

2) Астатніе два курса, на каторых праходзяцца больш менш у межах 2-х першых курсаў аналёгічных да факультэту Універсітэту.

3) Спецыяльнага курса, гдзе будуць адбывацца спецыяльныя навукі і педагагічная практыка. Прымаючы пад увагу, што ў прошлым гаду і агульныя прошлыя гады блізка зусім не было практычных работ, думаем заняцца ў першую

чаргу з студэнтамі старшых курсаў практычнымі работамі. Так, п. В. Міхальскі, кіраўнік балотнай станцыі, дэкляраваў узяць на сябе экскурсіі з батанікі. Лабарант фізікі А. Трэпка заняты апрацаваньнем практыкі для 1 і 2 курсаў, тое самае робіць і асыстэнт хіміі В. Ю. Ленкевіч.

Што датычыць сыстэматычных курсаў, то ў першую чаргу манімся закончыць з 4 курсам і выпусціць іх Беларусамі... На жаль, усе яны з боку беларушчыны слабаваты, дзеля чаго трэба былоб правясьці семінарыі беларускай мовы і беларусазнаўства. На жаль, прафэсар беларускай мовы Тарашкевіч дагэтуль затрыманы ў Варшаве з справамі Беларускіх Школ. Прафэсар Ігнатоўскі збіраецца выехаць у Саветчыну да сваёй сямы.

У цяперашні час Інстытут перапісваецца вось з якімі гісторыкамі:

1) І. Іодкоўскім — Городня, Пачтовая вул., дом уласны.

2) Імшэньнікам — Марына Горка,— які мае пераехаць чераз нядзелю ў Менск і заняцца працай у Інстытуце.

3) Дружчыцам.

...З першым курсам манімся зачаць работу так, як усе навукі ад пачатку да канца праходзіліся як у Беларускай Школе. Пасланы запрашэньня лектарам. Ёсьць ужо: Цвірко-Гадыцкі, які хворы цяпер, так сама ёсць прафэсар лацінскай мовы ксёндз Абрантовіч. Пачатая работа з прычыны хваробы К. Цвірко-Гадыцкага, а так сама атсутнасьць Тарашкевіча зацягваецца. Прымаючы пад увагу пільную патрэбу падручнікаў з матэматыкі, запрошаны як спецыяліст у тым напрамку п. А. Данілевіч, катораму даручана падгатаваць матэматычную тэрміналёгію і перагледзіць рукапісі падручнікаў, ім ужо перагледзяны і пахвалены «Асноўныя пачаткі арыфметыкі» Цымельмана. Скончыўшы гэту работу, ён прыступіць да сабраньня і ўпарадкаваньня арыфметычнай тэрміналёгіі, каторая будзе разгледжана і зацверджана Камісіяй. Вось што зроблена Інстытутам за полтара месяца. Як праца будзе ісьці, далей будзем Школьную Раду паведамляць.

Рэктар Інстытуту — В. Іваноўскі.

Дакумент захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве, ф. 604, в. 1, спр. 6, арк. 252. Друкуецца са скарачэннямі.

Прадмова і падрыхтоўка публікацыі Уладзіміра ЛЯХОЎСКАГА.

БЕЛАРУСКІ ПАДРУЧНІК ПАЛІТАЛЁГІІ 1931 г.

Палітычныя і грамадзкія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасьці

МАНАРХІЗМ, АРЫСТАКРАТЫЗМ, ДЭМАКРАТЫЗМ, КАМУНІЗМ (САЦЫЯЛІЗМ), ФАШЫЗМ І АНАРХІЗМ

Палітычныя і грамадзкія кірункі заўсёды цікавілі тых людзей, якія не замыкаліся ў сваей вёсцы або засьценку, але прымалі ўдзел у тварэньні новага жыцьця. Мы цяпер перажываем такі час, у каторым людзі змагаюцца за новыя формы народна-палітычнага і грамадзкага бытаваньня, і затым высьвятленьне гэтых формаў будзе для ўсіх, а асабліва для моладзі, дужа карысным.

Але пакуль мы пяройдзем да агляду розных формаў палітычнага і грамадзкага жыцьця, мы павінны выясьніць, што такое палітычнае і грамадзкае жыцьцё і паставім перадусім пытаньне, што такое **палітыка!**

Людзі, асабліва вяскоўцы, пачуўшы аб палітыцы, адразу думаюць як найгорш. Яны часта пераконаны, што слова «палітыка» азначае хітрасьць, подступ і крые ў сабе нейкае ашуканства. Людзі часта глядзяць на палітыку як на спосаб здабыцьця ўлады і гнібеньня свайго праціўніка — затым на кожнага палітыка глядзяць крывым вокам. Аднак, праўду кажучы, гэткае суджэньне аб палітыцы дужа памылковае: людзі часта бяруць **праявы** палітычнага жыцьця і дзейнасьць некаторых палітыкаў за самую палітыку і затым прыпісваюць самай палітыцы розныя недарэчнасьці.

Дык што такое палітыка?

Палітыка ёсьць навукай аб тым, як найлепш кіраваць людзкой супольнасьцяй, аб'яднанай у дзяржаўны або які іншы грамадзкі арганізм. (...)

Ведаючы, што такое палітыка, мы пяройдзем цяпер да выясьненьня розных палітычных кірункаў.

Ад самага пачатку існаваньня роду людзкога быў паміж людзьмі нейкі парадак, нейкі лад, паводле якога яны жылі. Без парадку, бяз ладу жыцьцё людзкое было-б немагчымым. Затым у гісторыі чалавецтва мы бачым розныя лады: бачым лад, абапёрты на ўладзе аднэй асобы: адна асоба камандуе, а ўсе мусяць слухаць (манархізм); ізноў-жа здараўся лад, які апіраўся на

Гэты папулярны нарыс паліталёгіі, ілюстраваны прыкладамі заходнебеларускага палітычнага жыцьця, выдалі ў Вільні ў 1931 г. маладыя дэмакратычныя дзеячы цэнтрысцкай арыентацыі, згуртаваныя вакол папулярнага часопіса «Шлях моладзі».

тым, што камандавалі грамадзянствам адзінкі (арыстакрацыя або алігархія); ёсьць лад, які апіраецца на волі ўсяго народу, пры роўнасьці ўсіх грамадзян (дэмакратызм); цяпер выдумалі новы лад, які дзяржыцца на загадах аднэй партыі, каторая пры помачы сілы хоча накінуць сваю волю ўсяму народу (камунізм, фашызм); ёсьць ізноў кірунак, які ня прызнае ніякай улады і ніякага прымусу (анархізм),— словам, ёсьць многа формаў палітычнага жыцьця, аб якіх мы будзем гаварыць у наступных артыкулах.

Парадак артыкулаў будзе такі: 1) манархізм, 2) арыстакратызм, 3) дэмакратызм, 4) камунізм (сацыялізм), 5) фашызм і 6) анархізм. У канцы разгледзім усе гэтыя кірункі, дадаючы крытыку кожнага зь іх.

1. МАНАРХІЗМ

Слова «манархізм» выводзіцца ад грэцкіх слоў м о н о с (адзін) і а р х э (улада), значыць, слова «манархізм», пераложанае на нашу мову, азначала-б тое самае, што «адзінаўладзьдзе». Дык манархізм — гэта такі спосаб дзяржаўнага ўстройства, у якім уладу над усімі мае нехта адзін (монос), каторы дзеля гэтага і завецца «манарх», або па-нашаму — адзінаўладзец.

Манархізм у працягу гісторыі меў розныя формы. І так — бывалі такія дзяржавы, у каторых манарх меў неабмежаваную ўладу, ён быў панам жыцьця і сьмерці сваіх падданых і не прызнаваў над сабою ніякай кантролі. Воля яго была для ўсіх найбольшым правам, і ніхто ня сьмеў пярэчыць у ягоных распараджэньнях. Нават калі ён мыляўся — і то трэба было споўніць ягоную памылку! Такім неабмежаваным манархам быў да апошніх часоў расейскі цар і дзеля таго зваўся «самадзержац», гэта значыць, ён сам «дзяржаў» у сваіх руках усю паўнату ўлады.

Цяпер такіх неабмежаваных манархаў мала дзе ёсьць, іх улада абмежавана канстытуцыяй (дзяржаўным статутам) і парлямантам (народным прадстаўніцтвам). Такі, нпр., ангельскі кароль ня мае бадай ніякай улады і сам ад сябе ня можа нічога пастанаўляць і выдаваць законаў. Ён толькі рэпрэзантуе Ангельскую дзяржаву і падпісвае важнейшыя дзяржаўныя паперы. Усю-ж уладу мае парлямант, які праз сваіх міністраў кіруе дзяржаўным жыцьцём.

Арыйскія (індаеўрапейскія) народы ў пачатках свайго дзяржаўнага жыцьця бадай усе мелі манархістычную форму ўладаньня. Форма гэтая, магчыма, разьвілася з даўнейшай патрыярхальнай улады (патэр — бацька, архэ — улада) і зрабілася насьледнай, г. ё. пераходзіла з бацькі на сына як-бы ў насьледзтве — і славяне, як галіна вялікага арыйскага племяні, у пачатках свайго гістарычнага жыцьця маюць сваіх старшых (роданачальнікаў), якія ў сваім родзе спраўляюць уладу. Але гэтая ўлада моцна абмежавана народным зборам (радаю, вечам), да таго нават, што народны збор можа скінуць аднаго князя, а выбраць другога (што і практыкавалася ў нас на Беларусі ў да-Літоўскі пэрыяд нашай гісторыі). Аб такой форме манархізму можна сказаць, што яна толькі з назовы манархічная, а сама па сабе яна моцна абмежавана на карысьць народу. Тут, як гэта кажуць, манарх «пануе, але не ўладае».

Зусім адменнай формай уладаньня бывае абсалютная або неабмежаваная манархія. Тут да манарха належыць уся паўната ўлады: ён ёсьць жаралом усякага права; ён мае ня толькі правадаўчую, але і выканаўчую ўладу; ад яго імя адбываюцца суды і выносяцца прысуды; ён карае і мілуе; ён прадстаўляе ўсю дзяржаву ў міжнародных адносінах. Дык нічога дзіўнага, што згрупаваньне гэткай неабмежаванай улады ў руках аднэй асобы часта выраджалася ў розныя дзікія формы, як, нпр., тыранію, дэспатызм і да г. п. (...)

2. АРЫСТАКРАТЫЗМ

Апроч манархіі, вадзілася даўней (і цяпер часам здараецца) зблізжаная да манархіі форма дзяржаўнай улады, якая завецца арыстакратызмам.

Арыстакратызм — гэта слова таксама грэцкае. Азначае яно тое самае, што панашаму «ўлада лепшых, шляхотных» (арыстос — лепшы, шляхотны, а кратэо — уладаю, маю сілу). Значыць, арыстакратызм — гэта ўлада не аднаго чалавека, а многіх «лепшых», якія ў дзяржаве маюць паўнату ўлады. У аснове арыста-

кратызму ляжыць тое пракананьне, што дзяржавай павінны кіраваць лепшыя, выбраныя людзі. Толькі гэтая «лепшасьць» у розных краёх розна вырашалася. У аднэй старане за «лепшых» уважалі тых, што выводзіліся з шляхоцкага роду (радавая арыстакрацыя), у другой — тых, што выдзяляліся спасярод іншых ваеннымі чынамі (вайсковая арыстакрацыя), у трэцяй — тых, што мелі шмат маёмасьці і багацтва (плютакрацыя) — словам, усюды па-свойму вызначалі «лепшых». Рэдка дзе за лепшых уважалі тых, што сапраўды былі лепшымі і розумам і душою.

Вось такія «лепшыя» людзі і называюцца арыстакратамі, а форма іхнай улады арыстакратызмам. Арыстакратызм заўсёды найбольш дзяржаўся там, дзе панаваў манархізм. Манарх, паводле іхняй тэорыі,— гэта найлепшы чалавек, а лепшыя ўсе тыя, што каля манарха, а ўсе далейшыя — гэта чэрнь, якая ня варта добрага слова. Арыстакратычная ўлада, злучаная з манархізмам, была даўней у В. Княстве Літоўскім (баярства, магнаты) і ў Польшчы (шляхта, магнаты). Калі кучка арыстакратаў захапляла ў свае рукі ўладу, такая форма ўладаньня называлася **алігархія** (олігоі — нямногія, архэ — улада).

Проціпастаўленьнем да арыстакратызму ёсьць дэмакратызм.

3. ДЭМАКРАТЫЗМ

Зусім адменнай ад арыстакратызму формай дзяржаўнага ўстройства ёсьць дэмакратызм.

Слова «дэмакратызм» выводзіцца ад грэцкіх слоў «дэмос» (народ) і «кратос» (улада) і азначае тое самае, што народаўладзтва. Пры дэмакратычным устройстве дзяржавы ўлада належыць не да аднэй асобы (манарха), не да некалькіх асобаў (арыстакратаў), а да **ўсяго народу** (дэмасу).

Дэмакратызм зрадзіўся ў даўнейшай Грэцыі, асабліва ў горадзе Атэнах. Тамака кожны свабодны грамадзянін меў права прымаць удзел у абгаворваньні грамадзкіх справаў і агульна-дзяржаўных пастановах; кожны грамадзянін мог быць выбраны на найвышэйшае нават становішча: адміністрацыйнае, судовае або вайсковае,— словам, у даўнейшай Грэцыі кожны грамадзянін мог прымаць удзел у кіраваньні дзяржавай. Слабою стараною грэцкае дэмакрацыі было тое, што гэты ўдзел мог прымаць толькі грамадзянін свабодны, нявольнікі-ж былі гэтага права пазбаўлены — і гэта было вялікім мінусам у старагрэцкай дэмакрацыі, якая толькі што нараджалася.

У нас, на Беларусі, у Полацкі пэрыяд нашай гісторыі быў таксама дэмакратызм. Народ кіраваўся сам сабою: ён пастанаўляў для сябе законы, аб'яўляў вайну і заключаў мір, выбіраў вышэйшых урадоўцаў і скідаў іх. Ды выбіраў ня толькі ўрадоўцаў, але нават самых князёў, якіх часта пазбаўляў улады за якую правіну і выбіраў каго іншага. Гэтакім парадкам, князь у старадаўнай Беларусі меў толькі рэпрэзэнтацыйнае значэньне і быў павадыром войска на выпадак вайны.

Усе справы народ вырашаў на народным зборы, каторы называўся **вечам.** На голас вечавога звону народ валіў на рынак, дзе вырашаліся ўсе справы. Там князь або які іншы вышэйшы ўрадовец рэфэраваў справу, посьле адкрывалася дыскусія (гутаркі над справай), а посьле часам і спрэчкі. Абсудзіўшы ўсю справу (як гэта цяпер робіцца на нашых грамадзкіх сходах), народ **большасьцю** галасоў вырашаў справу і выносіў пастанову. Вось-жа **на гэтай большасьці народнай і грунтуецца ўвесь дэмакратызм.** Тая будзе важная пастанова, за якую стаіць большасьць народу, бо паводле аснаўнога правіла дэмакратызму, меншасьць павінна пакарыцца большасьці і ўступіць. Тутака дэмакратызм апіраецца на такім разуменьні, што трэба заўсёды некага паслухаць. Калі няма згоднай пастановы, трэба слухаць або аднаго чалавека (манарха), або некалькіх людзей, захапіўшых у свае рукі ўладу. Калі ўжо трэба кагось слухаць, то, паводле дэмакратызму, найлепш паслухаць не аднаго чалавека і ня некулькіх, а большасьці. І вось на гэтай уладзе большасьці народу грунтуецца галоўная аснова дэмакратызму.

Але паводле дэмакратызму, як мы ўжо сказалі, **усе людзі маюць роўнае права голасу.** Як гэта зразумець? Даўней людзі зьбіраліся на веча, і там кожны грамадзянін падаваў свой голас — і гэтая справа адбывалася дужа проста. Тагды

да такой дэмакратычнай рэспублікі належаў адзін горад з «прыгарадамі», дык кожны грамадзянін мог лёгка прыйсьці на агульнае веча і споўніць свой абавязак. Але цяпер як? Тагды зыходзілася некалькі тысяч народу, дык сяк-так маглі згаварыцца. Але цяпер як змогуць людзі зыйсьціся з усей дзяржавы, абгаварыць справу і падаць голас? Гэта-ж ня тысячы народу, як было даўней, але цэлыя мільёны? Як яны зыдуцца, дзе памесьцяцца і як абгавораць?

Але і на гэта знайшлі спосаб. Калі ня могуць прыйсьці ўсе грамадзяне, дык **пасылаюць** сваіх прадстаўнікоў. Гэтых прадстаўнікоў выбіралі даўней на сходзе, давалі ім наказ, чаго яны маюць дамагацца, і пасылалі іх на агульны сход або веча. І цяпер гэтаксама адбываецца. Толькі цяпер такі агульны сход выбраных народам прадстаўнікоў (або паслоў) не называецца вечам, а **соймам** (ад слова сыйсьціся) або **парлямантам** (ад францускага слова «парле», што зн. гаварыць). Выбары паслоў цяпер адбываюцца інакш, як даўней. Затым, што цяпер людзі ня могуць зыйсьціся ў адно месца ня толькі з цэлага ваяводзтва, але нават і аднаго павету, дык выбары адбываюцца пры помачы картачак: кожны грамадзянін кідае картачку на тых кандыдатаў, якія яму найбольш да ўспадобы.

Цяперашнія дэмакратычныя выбары адбываюцца найчасьцей паводле так зв. пяціпрыметнай сыстэмы. Паводле гэтай сыстэмы выбары павінны быць: 1) агульныя, 2) таемныя, 3) беспасрэдныя, 4) роўныя і 5) прапарцыйныя (...).

...Пры выбарах непрапарцыйных большасьць заўсёды бярэ верх і можа ня пусьціць у парлямант ніводнага кандыдата зь меншасьці (так, як гэта бывае, напр., пры выбарах у вёсцы на грамадзкіх сабраньнях). Зусім што другое, калі выбары адбываюцца прапарцыйна да колькасьці галасоў, як, напр., на гмінных сабраньнях. Тамака сьпісак, які атрымаў (дапусьцім) 40 галасоў, праводзіць (дапусьцім) 4 кандыдатаў, а сьпісак, які атрымаў 30 галасоў, праводзіць паводле прапорцыі 3 кандыдатаў. Гэтак і ўсюды. Такім парадкам пры прапарцыйных выбарах меншасьць астаецца непакрыўджанай і праводзіць сваіх паслоў паводле колькасьці пададзеных галасоў. Прапарцыйныя выбары — гэта ўжо, як кажуць, дасканаласьць дэмакратычных формаў у кіраваньні дзяржавай, бо нават меншасьці дазваляецца мець уплыў на дзяржаўныя справы. Пры ўсім гэтым рэч зусім зразумелая, што пры дэмакратычным устройстве дзяржавы выбары павінны быць **свабодныя,** г. зн. бязь ніякага націску з боку адміністрацыйных, вайсковых і іншых уладаў. За свабодныя выбары дэмакратызм заўсёды вёў заўзятае змаганьне з рознымі дыктатарамі, якія хацелі накінуць сваю волю народу і гэтым сфальшаваць народны голас.

Дэмакратызм у працягу вякоў меў розныя формы свайго разьвіцьця. Як мы ўжо бачылі, у старадаўняй Грэцыі ён быў даволі куртаты: ня толькі дазваляў нявольніцтва, але нават адсоўваў нявольнікаў ад удзелу ў выбарах. У пазьнейшых часох дэмакратызм нават загінуў быў зусім, на яго месца прыйшла неаграмічаная ўлада манархаў або арыстакрацыі, але ў 18 стагодзьдзі дэмакратычныя ідэі аджываюць ізноў. Найбольшым змагальнікам за тыя ідэі ў той час зьяўляецца францускі філёзаф Ян Руссо. **Ён цьвярдзіў аб роўных правох усіх людзей.** Потым француская рэвалюцыя кідае ў сьвет тры клічы: **лібэртэ, эгалітэ, фратэрнітэ,** што знача свабода, роўнасьць і братэрства — і ад гэтага часу дэмакратызм захапляе ўсіх, людзі праз усё 19 стагодзьдзе імкнуцца правесьці ў жыцьцё гэтыя клічы. Праводзячы гэтыя клічы ў жыцьцё, дэмакратызм дамагаецца поўнай свабоды сумленьня і веры, а таксама свабоды слова, друку, свабоды арганізацыяў і таварыстваў — словам, ідзе да таго, каб паміж людзьмі запанавала запраўдная свабода, роўнасьць і братэрства.

Але з пачаткам 20 стагодзьдзя ў дэмакратычных імкненьнях бачыцца пералом; да гэтага пералому прычыніліся дзьве новыя палітычна-грамадзкія тэорыі: камунізм і фашызм, якія імкнуцца да таго, каб панавала ня большасьць, але меншасьць. Замест большасьці народу ў кіраваньні дзяржавай яны ставяць партыйную меншасьць і аддаюць ей кіраўніцтва ўсім дзяржаўным жыцьцём.

4. КАМУНІЗМ (САЦЫЯЛІЗМ)

Дагэтуль мы гаварылі аб палітычных кірунках у гісторыі чалавецтва, але, апроч палітычных кірункаў, ёсьць яшчэ **грамадзкія.**

Чым-жа рожніцца палітычны кірунак ад грамадзкага?

Рожніцца тым, што палітычны кірунак бярэ пад увагу толькі спосаб кіраваньня дзяржавай, не зварочваючы або мала зварочваючы ўвагі на тое, як будзе ўстроена грамадзянства ў дзяржаве; а грамадзкі кірунак бярэ пад увагу так-жа грамадзкі лад у дзяржаве. Палітычныя кірункі, аб каторых мы дагэтуль гаварылі (манархізм, арыстакратызм, дэмакратызм), апіраюцца на тым грамадзкім ладзе, які людзі атрымалі ад вякоў, г. зн. на прыватнай уласнасьці, на сямейным жыцьці, на рэлігіі і г. д., з той толькі рожніцай, што дэмакратызм ідзе да таго, каб дзе-якія няроўнасьці паміж людзьмі згладзіць і завесьці новы лад, абапёрты на сапраўднай вольнасьці і роўнасьці, а манархізм і арыстакратызм хочуць, каб усё асталося па-старому, з усімі каралеўскімі і панскімі прывілеямі (кансэрватызм).

Камунізм-жа заводзіць зусім новы грамадзкі лад: ён касуе прыватную ўласнасьць, зносіць сямейнае жыцьцё і ня прызнае ніякай рэлігіі, затым ён ёсьць ня толькі палітычным, але і грамадзкім кірункам.

,Што-ж такое камунізм і адкуль ён пайшоў?

Каб лепш зразумець камунізм, нам трэба выясьніць яшчэ адзін, блізкі да яго, грамадзкі кірунак, які завецца **сацыялізмам.** Гэтыя два кірункі разам паўсталі, разам разьвіваліся і вельмі падобныя адзін да другога, як два браты, хоць адзін да другога вельмі варожыя.

Слова «сацыялізм» выводзіцца ад лацінскага слова «соціаліс», што зн. грамадзкі, так як лацінскае слова «соціетас» азначае па-нашаму «грамаду». Сацыялізм, таксама як і камунізм, імкнецца да таго, каб зьнесьці прыватную ўласнасьць, а завесьці грамадзкую, гэта значыць, каб ніхто ня мог сказаць, што вось гэта «мая» зямля і «мой» дом, «мой» млын, «мая» фабрыка, «мая» жывёла, «мой» плуг, але ўсё гэта грамадзкае: і зямля, і дом, і жывёла, і ўсе прылады вытворчасьці. Паводле сацыялістычнай навукі, усё гэта мае быць «соціале» (грамадзкае), і згэтуль назоў «сацыялізм».

Камунізм выводзіцца ад лацінскага слова «коммуніс», што значыць **супольны.** Камуністы ідуць ня толькі да таго, каб зямля, дамы, фабрыкі, жывёла і ўсе прылады вытворчасьці былі грамадзкімі або супольнымі, але каб нават было супольным усё дабро, атрыманае пры супольнай працы. Такім парадкам, камуністы ідуць яшчэ далей за сацыялістых: калі сацыялісты стаяць за тое, каб супольнымі былі толькі варштаты працы і прылады вытворчасьці, то камуністы дамагаюцца супольнасьці нават у карыстаньні з яшчэ тых прадуктаў, якія былі атрыманы пры супольнай працы. Паводле сацыялізму — разам будзем уладаць, разам працаваць, але потым падзелімся тым, што мы зарабілі, і кожны па сабе будзем спажываць запрацаванае дабро, а паводле камунізму — ня толькі разам уладаць і разам працаваць, але яшчэ і разам спажываць. Ніякай уласнасьці, ніякага падзелу прадуктаў камунізм не прызнае: камуна ў вытворчасьці, камуна і ў спажыцьці — тагды, калі сацыялізм стаіць толькі за камуну ў вытворчасьці, а дапускае сякую-такую ўласнасьць у спажыцьці (свая ежа, сваё адзеньне і г. д.).

І гэта будзе галоўная тэарэтычная рожніца паміж сацыялізмам і камунізмам. Але ёсьць і іншыя рожніцы, якія дзеляць гэтыя два грамадзкія кірункі, а гэтыя рожніцы будуць перадусім у справе **тактыкі.**

Сацыялізм апіраецца на **эвалюцыі,** або паступовым разьвіцьці грамадзкага ладу ад прыватнай уласнасьці да супольнай, а камунізм стаіць за **рэвалюцыю,** г. зн. за гвалтоўную перамену сяньняшняга ладу на камуністычны, не спыняючыся нават перад крывавым змаганьнем з праціўнікамі гэтай перамены. Сацыялісты кажуць, што грамадзянства само сабою, паступова і памаленьку прыдзе да таго праканаьня, што сацыялістычны (грамадзкі) лад лепшы за цяперашні і такім парадкам бязь ніякага прымусу згіне прыватная ўласнасьць, а наступіць супольная. Сацыялісты цьвердзяць, што ня можна накідаць сацыялістычнага парадку сілаю, што трэба тлумачыць народу ўсе карысьці супольнага валаданьня і супольнай працы — і тагды толькі, калі большасьць народу зразумее і захоча скасаваньня прыватнай уласнасьці, тагды пры помачы галасаваньня можна правесьці такую важную рэформу, як сацыялізм, і зьнясьці прыватную ўласнасьць. Гэтак цьвердзяць сацыялісты...

Затым, што сацыялісты прызнаюць народнае галасаваньне і апіраюцца ў сваіх

рэформах на большасьці народных галасоў — іх называюць **сацыял-дэмакратамі,** гэта значыць, што яны пры сваім сацыялізьме не адкідаюць і дэмакратызму.

Зусім ня тое ў камуністаў. Яны не прызнаюць ніякага дэмакратызму (народаўладзьдзя), не зварочваюць увагі на ніякую большасьць, не прызнаюць і дэмакратычнага галасаваньня,— яны апіраюцца толькі на ўладзе аднэй партыі: што скажа партыя — тое сьвята, хаця-б гэтая партыя мела ў народзе і значную меншасьць.

На чым-жа сацыялісты і камуністы думаюць абаперціся ў праводжаньні сваіх рэформаў?

Як сацыялісты, так і камуністы заўсёды цьвердзяць, што яны апіраюцца на пралетарыяце. Што-ж такое пралетарыят? Пралетарыят — гэта слова лацінскае, яно выводзіцца ад слова «пролес», што зн. дзеці, патомства. Пралетарыятам у старадаўнім Рыме называлі тых людзей, якія не давалі дзяржаве нічога (ніякіх падаткаў), апроч дзяцей. Пралетарыят тагды ня меў, бадай, ніякай уласнасьці, гэта былі работнікі, якія жылі з працы рук, наймалі для сябе кватэру і так пражывалі свой век. Цяпер пралетарыятам называюць такіх людзей, якія ня маюць на ўласнасьць варштатаў вытворчасьці (зямлі, фабрык), а жывуць, працуючы на чужых варштатах працы.

Пралетар — паводле сацыялістычнага і камуністычнага разуменьня — гэта такі чалавек, які ня мае **свайго** варштату працы. Такі-ж чалавек, каторы мае на ўласнасьць **сваю** зямлю, або каторы мае **свой** варштат працы,— гэта ўжо ня будзе пралетар, а буржуа. Селянін, які працуе на **сваім** кавалку поля, або рамесьнік (каваль, сталяр), які працуе ў **сваёй** майстэрні,— гэта ўжо ня будуць пралетары, а дробныя буржуа. Работнік-жа, каторы працуе ў майстра, або парабак у гаспадара — гэта будуць пралетары, бо яны ня маюць свайго варштату працы, а працуюць на чужым. (...)

Дзе-ж пачатак камунізму (сацыялізму) і якія яго галоўныя асновы?

Пачаткі камунізму мы бачым ужо ў далёкай прошласьці. Яшчэ перад Нараджэньнем Хрыста некаторыя людзі задумоўваліся над тым, ці ня лепш было-б жыць **разам** і прадаваць **супольна,** і такі, напр., грэцкі філёзаф Плято (4 век перад Хрыстом) цьвярдзіў, што паміж прыяцелямі павінна быць камуна. Далей мы бачым камуністычныя асновы ў старадаўным хрысьціянстве, аб каторым пішацца, што «грамада веруючых мела адно сэрца і адну душу, ніхто зь іх нічога ня меў на ўласнасьць і не называў сваім, але ўсё было ў іх супольнае» (Апост. Дзеі 4—32). Але гэтая супольнасьць у старадаўным хрысьціянстве была ня з прымусу, а з добрай волі і з свае ахвоты — і гэта была болей супольнасьць спажыцьця (кансумпцыі), чым супольнасьць вытворчасьці і працы. Даўнейшыя хрысьціяне працавалі паасобна, толькі потым запрацаванае дабро прыносілі ў супольную касу, з каторай абдзялялі ўсіх, асабліва ўдоў і сірот.

І ў цяперашнім хрысьціянстве камунізм ня вывеўся: яго мы спатыкаем у манастырох, дзе ёсьць ня толькі супольнасьць спажыцьця, але і супольнасьць маёмасьці і працы. Манах у манастыры ня мае права мець нічога на ўласнасьць, усё належыць да манастыра або да цэлага іхнага ордэну.

Але трэба сказаць праўду, што гэты хрысьціянскі камунізм, таксама як і даўнейшы грэцкі, ня мае нічога супольнага зь сяньняшнім, які паўстаў у 19 стагодзьдзі. Бацькам сяньняшняга камунізму ёсьць Кароль Маркс (нямецкі жыд, памёр у 1883 г.), які разам з Энгельсам у 1848 годзе выдаў г. зв. «Камуністычны маніфэст»,— і ад гэтага году трэба лічыць нарадзіны сяньняшняга камунізму.

Якія-ж былі асновы камунізму Маркса і Энгельса?

Першай асновай была супольнасьць маёмасьці і працы (вытворчасьці) і супольнасьць спажыцьця (кансумпцыі) вытвараных супольнай працай прадуктаў. Прыватная ўласнасьць касуецца, а ўсе працуюць разам і разам карыстаюцца з прадуктаў працы. Паводле камуністычнай тэорыі, гэтая супольнасьць (камуна) заводзіцца прымусова пры помачы дыктатуры пралетарыяту.

Другою асновай камунізму было скасаваньне сям'і, а гэта затым, што сям'я ёсьць галоўным фундамэнтам прыватнай уласнасьці. Бацькі, маючы дзяцей, стараюцца забясьпечыць іх быт і зьбіраюць для іх прыватную ўласнасьць. Паводле камуністычнай тэорыі, мужчына з жанчынай можа зыходзіцца і разы-

ходзіцца, калі толькі хоча, няма паміж імі ніякай вечнай сувязі, а ёсьць толькі «супольнае» жыцьцё. Дзеці выхоўваюцца не пры бацьках, але ў камуністычных прытулках. Такім парадкам, паводле камуністаў, зносіцца сям'я, а разам зь сям'ёю і прыватная ўласнасьць.

Трэцім галоўным пунктам марксаўскага камунізму ёсьць адкіданьне ўсялякай рэлігіі. Марксізм стаіць на тым пункце, што няма Бога і душы, а ёсьць толькі матэрыя, затым ніякая рэлігія ня можа мець месца ў камуне. Хрысьціянства і наагул кожную рэлігію камунізм стараецца выкараніць усімі спосабамі, ня толькі агітацыяй, але нават зьдзекамі і прасьледам. Да агітацыі пакліканы спэцыяльны «Саюз бязбожнікаў», які пры помачы газэт, брашур і прадстаўленьняў стараецца выкараніць усялякую рэлігію, а ўрад забараняе камуністам спаўняць рэлігійныя практыкі (хадзіць у царкву, хрысьціць дзяцей і г. д.). За ахрышчэньне дзіцяці, напрыклад, або які іншы рэлігійны абрад выключаюць з камуністычнай партыі. Апошнім часам ня прымаюць на работу і не выдаюць картачак на кватэру, прадукты і адзеньне тым, хто не адрачэцца веры ў Бога і не адчураецца сваей рэлігіі.

Такім парадкам, уваходзячы ў справы рэлігійныя, камунізм Маркса і Энгельса ёсьць ня толькі грамадзка-палітычным кірункам, але і мэтафізычна-рэлігійным, творачым нейкую новую веру, новую рэлігію, якая ня можа перанесьці старой. Камуністы ня толькі змагаюцца за сваю тэорыю, але яны **верацъ** у яе, так як верылі першыя хрысьціяне або магамэтане. **Камуністы пэўны,** што іхная тэорыя ёсьць найлепшая, і за сваю тэорыю гатовы цярпець... Яны стварылі нават свой філязафічны сьветагляд (гістарычны матэр'ялізм), які апіраецца на мэтафізычных (надразумовых) асновах, так як і кожная рэлігія. Затым, што яны людзі **веручыя ў сваю тэорыю,** яны такія фанатыкі ў праводжаньні гэтай тэорыі.

Якая-ж гісторыя сяньняшняга расейскага камунізму?

Спачатку расейскія камуністы не называліся камуністамі, а так, як і іхныя заграпічныя таварышы,— сацыял-дэмакратамі. Яны стаялі на грунце **эвалюцыі** і, апіраючыся на гістарычным матэр'ялізьме, цьвердзілі, што грамадзкі лад сам па сабе **мусіць** прыйсьці да сацыялізму. Яны казалі, што спачатку будзе капіталізацыя ўсіх прыладаў вытворчасьці (зямлі, фабрык, машынаў) у руках адзінак (капіталістаў), а потым дарогай гістарычнай канечнасьці прыдзе сацыялізацыя: уласнасьць, зграмаджаная ў руках нямногіх капіталістаў, пярэйдзе ў рукі многага пралетарыяту. Тымчасам гэтая рахуба не апраўдвалася, капіталізацыя наступала толькі ў галіне фабрычнага промыслу, а ў зямельнай уласнасьці ня толькі ня было капіталізацыі, але штораз большае раздрабленьне... Гэты факт мусіў выклікаць рэвізію дасюлешняга сацыялістычнага пагляду на справу эвалюцыі — і гэтую рэвізію зрабіў Уладзімер Ульянаў.

Ленін (радзіўся ў 1870 г., памёр у 1924 г.) адкінуў сацыялістычную эвалюцыю, а ўвёў рэвалюцыю і гэтым пхнуў сацыялізм на новы шлях, шлях сілы і дыктатуры. На зьезьдзе «Расейскай сацыял-дэм. рабочай партыі» ў Лёндыне (1903 г.) Ленін праводзіць свае ідэі, большасьць зьезду становіцца на яго бок, і на тым-жа зьезьдзе наступіў падзел на бальшавікоў і меншавікоў: прыхільнікі Леніна, якія былі ў большасьці, назвалі сябе бальшавікамі, а сваіх праціўнікаў назвалі меншавікамі.

Калі-ж бальшавікі ў 1917 годзе ў кастрычніку здабылі ўладу ў Расеі і пачалі праводзіць дыктатуру, трэба было зьмяніць назоў «сацыял-дэмакратычная» партыя на які іншы, бо дэмакратызм вымагае большасьці народу, а дыктатура адкідае гэтую большасьць і заводзіць права меншасьці. Дык бальшавікі адкінулі назоў «сацыял-дэмакратаў», а сталі называцца камуністамі, а сваю партыю назвалі «камуністычнай партыяй бальшавікоў».

Сацыялісты-бальшавікі і сацыялісты-меншавікі даўней працавалі разам і тварылі адзін сацыялістычны інтэрнацыянал (саюз сацыялістычных партыяў розных народаў). Першы інтэрнацыянал быў заложаны самым Марксам у 1864 годзе ў Лёндыне, але ён скора разваліўся. Тагды ў Парыжы ў 1889 г. быў заложаны другі інтэрнацыянал, рэарганізаваны ў Гамбурзе ў 1923 г., куды ўваходзяць усе сацыял-дэмакратычныя партыі. Трэці, або камуністычны, інтэрнацыянал (коратка: Камінтэрн), заложаны ў 1919 г., абымае ўсе камуністычныя партыі, якія годзяцца з праграмай расейскіх камуністаў.

Паміж другім і трэцім інтэрнацыяналам ідзе заўзятая барацьба. Сябры з 2-га інтэрнацыяналу, стоячы на грунце дэмакратызму (сацыялісты), спагадлівей адносяцца да сяброў 3-га інтэрнацыяналу (камуністаў), затое камуністы, якія стаяць на грунце дыктатуры і сілы, расстрэліваюць бязь ніякай літасьці сваіх таварышоў з 2-га інтэрнацыяналу, хоць тыя такія самыя работнікі і пралетары, як і камуністы.

Гэтак адбыўся вялікі падзел, і ідзе гарачая спрэчка ў аднэй сацыялістычнай сям'і. Кажам — у аднэй сям'і, бо, сапраўды, паміж сацыялістамі і комуністамі **ў тэорыі,** бадай, няма ніякай рожніцы: як адны, так і другія ідуць да скасаваньня прыватнай уласнасьці, да зьнясеньня сям'і і ўсякай рэлігіі, а розьняцца паміж сабою, як мы ўжо казалі, толькі **ў практыцы.** Адны хочуць завесьці сацыялізм пры помачы эвалюцыі і дэмакратызму, а другія — пры помачы рэвалюцыі і дыктатуры. (...)

5. ФАШЫЗМ

Фашызм — гэта, бадай, найнавейшая палітычная тэорыя сяньняшніх дзён. Паўстала яна ў Італіі на пачатку ўсясьветнай вайны ў 1914 г. з тым, каб пасьля вайны вырасьці ў магутную арганізацыю, якая захапіла (1922 г.) у Італіі ўладу ў свае рукі. Як на чале бальшавізму стаў Ленін, так на чале фашызму стаў Муссоліні (фашыстаў у Італіі налічваюць каля 1 мільёна).

Слова «фашызм» паходзіць ад італьянскага слова «фасці», што зн. гурткі, саюзы. Гэтыя гурткі ў 1914 г. дамагаліся вайны з Аўстрыяй і Нямеччынай, а пасьля вайны выступілі праціў сацыялізму і камунізму. Гуртавалі яны ў сабе пераважна моладзь работніцкую і дробных уласьнікаў (мяшчан і сялян), а пасьля вайны здэмабілізаваных жаўнераў, якія ў 1922 г. пад павадырствам Муссолі рушылі ўзброеныя на Рым і захапілі ўладу ў свае рукі. Называюць фашыстаў яшчэ партыяй «чорных кашуль», бо носяць, як адзнаку партыі, чорныя кашулі.

Якая-ж праграма фашыстаў?

Самі фашысты кажуць, што яны не стварылі ніякай новай тэорыі, але ўвялі ў практыку ўсё тое, што ўважалі за найлепшае для свайго краю. Яно можа і праўда, што фашысты ня выдумалі нічога новага, бо, праўду кажучы, нічога новага і няма пад сонцам, але тое, што яны **робяць,** зьяўляецца новым кірункам у сяньняшнім палітычным і грамадзкім жыцьці — і гэтая работа адбываецца паводле пэўнай праграмы.

Праграма фашызму, агулам бяручы, працістаўляецца клічам францускай рэвалюцыі (свабода, роўнасьць і брацтва) і клічам расейскай рэвалюцыі (клясавая барацьба). Іншымі словамі, фашызм выступае праціў дэмакратызму і камунізму.

Кліч **свабоды,** высунуты францускай рэвалюцыяй (1793 г.), дамагаецца поўнай свабоды для кожнага чалавека. Дзяржава павінна абясьпечыць гэтую свабоду для кожнага грамадзяніна, каб ён мог рабіць усё тое, што ўважае за карыснае для сябе і для ўсяго грамадзянства. Такім парадкам стварылася нават асобная тэорыя, званая **лібэралізмам** (ад лацінскага слова «лібэр», што зн. свабодны), якая дамагалася поўнай свабоды для ўсіх людзей, калі толькі гэтыя людзі ня шкодзяцць грамадзянству.

Вось-жа фашызм выступіў праціў такой свабоды, якую вясьціў лібэралізм. Паводле фашызму, поўнай свабоды для кожнага чалавека быць не павінна. На першы плян фашызм высунуў не свабоду адзінкі, а свабоду народу і дзяржавы. «Усё для дзяржавы, нічога за дзяржавай, а перадусім нічога праціў дзяржавы»,— казаў Муссоліні ў парляманце ў 1927 г. Значыць, фашызм хоча паддаць інтарэсы адзінкі інтарэсам народу і дзяржавы, а нат, хочучы прымусіць адзінкі да послуху, увёў дыктатуру партыі.

Таксама рашуча выступае фашызм праціў другога дэмакратычнага клічу — **роўнасьці.** Як ведама, дэмакратызм дамагаецца поўнай роўнасьці для ўсіх грамадзян: роўнасьці палітычнай, грамадзкай і эканамічнай, роўнасьці і нават прапарцыйнасьці выбараў, каб кожная група мела свой голас у дзяржаўным жыцьці.

Ня тое ў фашыстаў. Фашызм цьвердзіць, што дзяржаўнае жыцьцё

павінна апірацца не на роўнасьці, але на здольнасьці (кампэтэнцыі). Дзяржаўная ўлада павінна знаходзіцца ў людзей здальнейшых, якія могуць узьнясьціся над свае ўласныя інтарэсы і пасьвяціцца працы для інтарэсаў усяго народу. Прынцыпу роўнасьці фашысты проціўстаўляюць прынцып аўтарытэту і герархіі (старшынства). Ня роўнасьць, але арыстакратызм духу і самаахвярнасьць для дзяржавы і народу — гэта клічы фашызму. Той павінен мець уладу ў дзяржаве, хто сваей працай найбольш прыносіць карысьці дзяржаве і народу.

Фашызм выступае так-жа процiў сацыялізму і камунізму. Сацыялізм, таксама як і камунізм, зносіць прыватную ўласнасьць — фашызм яе задзержвае, сацыялізм і камунізм высоўвае на першы плян інтарэс аднэй клясы (пралетарыяту), фашызм — інтарэс усіх кляс, усяго народу; сацыялізм і камунізм выступае процiў рэлігіі і сям'і — фашызм паддзержвае і рэлігію, і сям'ю. На рэлігію фашызм глядзіць як на спосаб паддзяржаньня еднасьці ў народзе і вышэйшай абычайнасьці, а на сям'ю — як на спосаб павялічэньня і пашырэньня італьянскай нацыі, затым паддзержвае і рэлігію, і сямейнае жыцьцё. (...)

У тактыцы фашызм высоўвае на першы плян сваю арганізацыю, абапёртую на герархічных асновах (так, як і ў камуністаў). На чале партыі стаіць павадыр (Іль Дучэ) Муссоліні (у камуністаў Сталін), а так-жа Вялікая Рада фашыстаў (у камуністаў ВЦІК). Усімі справамі кіруе генэральны сакратар (так, як і ў камуністаў). Словам, у арганізацыі як фашыстаў, так і камуністаў ёсьць шмат падабенства.

Падабенства яшчэ можна знайсьці і ў тым, што як адны, так і другія вельмі высока цэняць працу. Кожная праца — ці гэта будзе разумовая, ці фізычная,— у праграме фашыстаў (так, як і камуністаў) мае вялікае народнае значэньне. Артыкул 2 выданай у 1927 г. «Карты працы» гэтак кажа: «Праца ў кожнай форме — разумовай, тэхнічнай, ручной — ёсьць грамадзкім абавязкам. Уся прадукцыя становіць еднасьць з народнага пункту гледжаньня. Мэта працы — гэта ёсьць дабрабыт працуючых і разьвіцьцё народнай магутнасьці».

Затым кожная забастоўка ў дзяржаўных прадпрыемствах срога караецца (так, як і ў камуністаў) як праступак ня толькі процiў дзяржавы, але і процiў абавязку працы.

Як бачым, фашызм у тактыцы і арганізацыі шмат падобны да камунізму, а калі яшчэ дабавім сюды яго рэвалюцыйнасьць і дыктатуру партыйнай меншасьці над народнай большасьцю, дык падабенства будзе вялікае. Аднак гэта толькі ў тактыцы і на першы пагляд, а ў самай рэчы рожніцы паміж фашызмам і камунізмам аграмадныя. Фашызм нацыяналістычны, а камунізм інтэрнацыянальны, фашызм прызнае прыватную ўласнасьць, рэлігію і сям'ю, абапёртую на хрысьціянстве, а камунізм усяго гэтага не прызнае. Фашызм стаіць за салідарнасьць усіх клясаў у працы для агульнага дабра, а камунізм стаіць на грунце змаганьня кляс з тым, каб зьнішчыць усе клясы і абярнуць усіх у пралетарыят і гэтым стварыць адну пралетарскую клясу. Фашызм не адбірае прыватнага капіталу, а камуністы адбіраюць, фашысты дапускаюць ініцыятыву ў промысьле і гандлі, а камуністы касуюць. (...)

Але ў практыцы фашысты і камуністы ідуць часта рука ў руку, паддзержваюць адны адных, заключаюць дагаворы і саюзы, выкарыстываюць усе магчымасьці, каб пры помачы сілы перавярнуць сьвет дагары нагамі і завесьці сваю фашыстоўскую ці камуністычную дыктатуру. Фашысты ў Італіі ці Нямеччыне (гітлероўцы) цьвердзяць, што яны настолькі моцныя, што не баяцца камуністаў і затым могуць зь імі лучыцца ў пэўных выпадках... Тое самае цьвердзяць і камуністы. Лучыць іх рэвалюцыйная тактыка сілы і імкненьне да дыктатуры... Кожная партыя хоча да яе дайсьці чым скарэй, і тагды — тагды будзе панаваць над усім народам.

Проціпастаўленьнем да ўсялякай сілы і ўсялякай дыктатуры будзе анархізм.

6. АНАРХІЗМ

(...) Ідэйны анархіст ня верыць у ніякую сілу і не спадзяецца сілай перамяніць грамадзкі строй: **ён хоча перамены душы людзкой.** Калі нават анархіст і кідае

бомбу, дык не на тое, каб самому захапіць уладу, але на тое, каб зьнішчыць сілу, якая не пазваляе людзям адчыніць вачэй і глянуць на вольны шлях.

Тады, калі ўвесь камунізм — гэта барацьба за ўладу, то ўвесь анархізм — гэта барацьба проціў улады.

Калі камуніст глядзіць на чалавека як на нешта паганае і сапсутае і хоча сілай яго прымусіць рабіць так, а ня йнакш, то анархіст у кожным чалавеку стараецца відзець толькі дабро — толькі трэба гэтае дабро вызваліць і даць яму магчымасьць разьвіцца. Паводле анархістаў, цяперашняе жыцьцё так сапсута і зьвіхнута гістарычнымі абставінамі, што чалавеку трудна выбрацца на шлях поўнага анархізму, затым трэба бомбай і дынамітам руйнаваць стары парадак і гэтакім чынам прабудзіць людзкое сумленьне да новага жыцьця.

Вось і будзе тэорыя анархізму ў галоўных рысах. Як бачым, анархізм пабудаваны на вельмі ідэальных асновах, якіх у жыцьці людзкім трудна і знайсьці. Затым усе людзі, якія любяць апірацца на сіле і арганізацыі (камуністы, фашысты), сьмяюцца з анархістаў і называюць іх філязафічнымі, нявдольнымі да жыцьця.

Як бачым, у тэорыі анархізм шмат у чым падобны да камунізму і сацыялізму (касуе прыватную ўласнасьць), падобны да дэмакратызму, бо стаіць за роўнасьць, вольнасьць і брацтва ўсіх людзей, але ў практыцы ён рожніцца ад гэтых і ад усіх іншых грамадзкіх і палітычных кірункаў. Ён дае найболей свабоды людзям, зносіць усякую прымусовую арганізацыю і ўладу — і затым ён мае так мала прыхільнікаў у нашыя часы, дзе ўсё грамадзкае жыцьцё пабудавана на арганізацыі і сіле.

І так мы ўжо прагледзелі ўсе важнейшыя палітычныя і грамадзкія кірункі ў сучаснасьці і мінуўшчыне. Крытыку гэтых кірункаў мы астаўляем на другі раз.

7. КРЫТЫЧНЫ АГЛЯД РОЗНЫХ КІРУНКАЎ

Гаварылі мы ў цэлым радзе артыкулаў аб розных грамадзкіх і палітычных кірунках. Была гутарка аб манархізьме, аб арыстакратызьме, аб дэмакратызьме, аб камунізьме, фашызьме і анархізьме. Прадстаўлялі мы ўсе гэтыя тэорыі, як яны ёсьць, не дадаючы ад сябе ніякай крытыкі. Цяпер-жа мы папрабуем іх пакрытыкаваць і паглядзець, які з гэтых кірункаў будзе найлепшы.

Ось-жа перадусім **манархізм.** Аб манархізьме можна сказаць, што гэтая тэорыя ўжо аджыла свой век і цяпер мае мала прыхільнікаў. Яна, можа, некалі, у часах патрыярхальных, і добрая была, але цяпер, калі кожны імкнецца да большай свабоды і незалежнасьці, яна ня можа мець павагі ў людзей. Даўней кароль быў як бацька ў сям'і: ён загадваў, што трэба рабіць, вёў парадак у гаспадарцы, караў непаслушных — словам, правіў сваім «гаспадарствам». Цяпер зусім ня тое. Тэхніка сяньняшняга жыцьця зусім іншая, патрэбы людзкой супольнасьці значна ўзрасьлі, навука і прамысловасьць дайшлі да нябывалай вышыні, аднаму чалавеку абняць усе дзяржаўныя справы сваім розумам і адпаведна пакіраваць — рэч зусім немагчымая, дык трэба шукаць адпаведных людзей (міністраў), тыя-ж людзі адказныя ня перад кім іншым, а перад манархам, каторы сам мала разьбіраецца ў дзяржаўных справах — згэтуль ідзе вялікае сапсуцьцё, і ў канцы манархія валіцца разам з манархам, ягонымі міністрамі і з усім дваром. Добра калі яшчэ манарх чалавек геніяльны (напр., Аляксандр Македонскі, Цэзар, Напалеон), але калі здарыцца які вырадак або дэгенэрат, што тагды? Або калі пачне правіць дэспатычна, па-тыранску і мучыць людзей? Калі гэта будзе рэспубліка, то ўзялі, скінулі і выбралі другога, а пры манархіі гэтага зрабіць законным спосабам няможна, трэба чакаць сьмерці манарха. А нават калі-б узялі, і скінулі, і выбралі другога, то хто ведае, ці сын або ўнук гэтага новага манарха ня будзе горшы ад даўнейшага? Такім парадкам, манархія мае шмат слабых бакоў, дзеля якіх яна сяньня ня мае прыхільнікаў. Калі дабавім яшчэ сюды кошты ўтрыманьня каралеўскага двара, усёй каралеўскай радні і прыдворнай арыстакрацыі — дык людзі атрасаюць рукі ад манарха і выбіраюць прэзыдэнта на некалькі гадоў, а манарха ня хочуць.

Тое, што мы сказалі аб манархізьме, можна было-б датасаваць і да **арыстакратызму**, затым аб арыстакратызьме тут шырэй гаварыць ня будзем і пяройдзем да дэмакратызму.

Дэмакратызм, як палітычны кірунак, мае ў сабе шмат дадатніх бакоў і таму высока цэніцца некаторымі людзьмі. Дадатнія бакі дэмакратызму будуць такія: **роўнасьць** усіх грамадзян перад законам і роўнасьць у кіраваньні дзяржавай; **свабода** арганізацыі, свабода сумленьня і веры, свабода слова і друку; апроч гэтага, брацтва ўсіх людзей, якое апіраецца якраз на роўнасьці і свабодзе. Кожны ведае, што бяз роўнасьці і свабоды ня можа быць брацтва. Дык дэмакратызм у найвышэйшым сваім разьвіцьці дае тое брацтва, да каторага людзі заўсёды йшлі і каторага так жадаюць.

Аднак поўны дэмакратызм можа там толькі існаваць і разьвівацца, дзе грамадзянства падгатоўлена да яго, дзе-ж грамадзянства не падгатоўлена, г. зн., дзе яно нясьведамае і цёмнае, дзе людзі ня знаюць усіх дзяржаўных патрэбаў і ня знаюць, як кіраваць дзяржавай,— там дэмакратызм падае. Прыкладам упадку дэмакратызму можа быць Расея, Польшча, Гішпанія або Італія, дзе народ быў заўсёды цёмны, непадгатаваны да дэмакратызму або самакіраваньня і дзе ўладу захапілі розныя дыктатуры. Прыкладам ізноў сапраўды дэмакратычнага жыцьця ёсьць Англія, а асабліва Швайцарыя. Але там народ доўгі час гатовіўся да гэтакага жыцьця, там ня было такой няволі, як па другіх краёх, і затым там кожны грамадзянін разумеецца на дзяржаўных справах, патрапіць падаць свой голас і гэтакім парадкам адпаведна пакіраваць дзяржаўным жыцьцём. Там ужо ніякі агітатар нічога не паможа — кожны грамадзянін ведае, што рабіць.

Пры малым усьведамленьні і некультурнасьці народу дэмакратызм можа прыводзіць людзей нават да бітвы, а гэта тады, калі меншасьць ня хоча паддацца большасьці. Так было ў некаторых парлямантах, так было і ў старадаўным Ноўгарадзе, дзе меншасьць часам выступала проціў большасьці і пачынала сапраўдную бітву. Бітва найчасьцей адбывалася на масьце над ракою Волхаў, куды партыі стараліся скідаць сваіх праціўнікаў. Да таго даходзіла, што духавенства выходзіла з працэсіяй, каб разьдзяліць і супакоіць звадку.

Да ад'емных бакоў дэмакратызму належыць яшчэ і тое, што пры няўсьведамленьні народнай масы (дэмосу) дэмакратызм часта пераходзіць у ахлякрацыю (улада натоўпу), а натоўпам кіруюць розныя безадказныя крыкуны-агітатары, якія сваім крыкам зьбіваюць народ з толку і прыводзяць да вельмі цяжкіх насьледкаў і руіны краю.

Наагул бяручы, дэмакратызм вельмі добрая рэч, але толькі тады, калі народ усьвядомлены і знае, што робіць. На наш пагляд, у будучыні, калі ўсе людзі будуць разумецца на дзяржаўных справах, які іншы кірунак, акрамя дэмакратызму, будзе проста немагчымы, бо ўсе грамадзяне маюць роўнае права падаць свой голас у тых справах, якія іх абходзяць. А калі ўжо хто мае кіраваць дзяржавай, то няхай лепш кіруе народная большасьць, чым мела кіраваць меншасьць, не гаворачы ўжо аб тым, каб кіравала кучка арыстакратаў ці адзін які чалавек.

А цяпер пераходзім да **камунізму**.

Камунізм у тэорыі і практыцы мае ў сабе шмат слабых бакоў. Перадусім супольная маемасьць і супольная праца. Мы ведаем добра, як людзі абходзяцца з супольным, або, інакш кажучы, грамадзкім дабром. На такое дабро людзі глядзяць як на нешта казённае, не шануюць яго, марнуюць і псуюць. Зусім іншыя адносіны да справы ствараюцца тагды, калі гэтая рэч свая, тагды чалавек зусім інакш адносіцца да яе, шануе яе і цэніць. У фабрыцы, дзе стаяць няжывыя машыны, каторыя не патрабуюць такога дагляду, як жывыя стварэньні, яшчэ паўбяды, але ў камуністычным двары (камуне ці калектыве) справа выглядае зусім інакш: там жывыя стварэньні патрабуюць лепшага дагляду. Дык няма нічога дзіўнага, што ў савецкіх камунах здыхаюць коні, каровы, сьвіньні і г. д.— без належнага дагляду скаціна жыць ня можа. У панскім двары глядзеў за парадкам пан або аканом, калі парабак рабіў неакуратна, выкідалі яго вон, а ў камуне ці калектыве ўсе гаспадары, дык няма каму і за парадкам глядзець; а калі наставяць камісара-аканома, каб ён загадваў і камандаваў, то ці варта было рабіць рэвалюцыю, каб варочацца да аканомскага бізуна? І ўсё-такі пад бізуном ня тая праца, што на сваей ральлі! І як часам «добра» жывецца ў двары, а ўсёж-такі кожны пара-

бак хоча кінуць службу і здабыць сваю гаспадарку і быць вольным!
Яшчэ ад'емны бок камунізму — гэта дыктатура. Дыктатура, наагул бяручы, не ўзгадоўвае народу, а прывучае яго да рабства і пасыўнасьці; гэтак дзеецца ня толькі ў Саветах, але ўсюды, дзе пануе дыктатура. Народ прывыкае, што за яго нехта думае і кіруе, і становіцца стадам баранаў, каторых можна гнаць куды хочаш. Гэтак дзеецца ўсюды, а асабліва ў Расеі, дзе даўней была дыктатура царская, цяпер камуністычная, а народ як быў, так і цяпер астаецца адсунуты ад улады. Урэшце, дыктатура і сіла ня маюць дадатняга ўзгадаваўчага значэньня: яны не ўзгадоўваюць народу, але прыводзяць да яшчэ большага азьвярэньня, бо зьвярэе той, каторы б'е, і зьвярэе той, каторага б'юць, — гэтакім чынам чалавецтва варочаецца да стану дзікасьці.

Вельмі ад'емным баком камунізму ёсьць так-жа прасьлед кожнай рэлігіі, а асабліва хрысьціянства. На наш погляд, у рэлігійных справах павінна быць поўная свабода, як хто хоча, так няхай верыць, тымчасам пры камунізьме гэтай свабоды няма. Камуністы вымагаюць поўнага бязьвер'я, веручых людзей ня толькі выкідаюць з партыі, але нават не даюць работы, чым наражаюць на галодную сьмерць. Гэтакі рэлігійны прасьлед не павінен мець месца ў 20 стагодзьдзі.
Ізноў нядобрай справай у камунізьме ёсьць расхістанасьць сямейнага жыцьця. Шлюб — калі хочаш, развод — ізноў, калі хочаш, ну а што зь дзяцьмі? Тыя, што бывалі ў Расеі, расказваюць, што найгоршым злом тамака цяпер ёсьць бездаглядныя дзеці. Гэта ёсьць як-бы малыя бандыты, пасярод якіх шырыцца ўсялякая распуста і зараза. Няма для іх ніякай сьвятасьці, няма паняцьця аб справядлівасьці, растуць як дзікары ў лесе — а гэта ўсё насьледкі свабоднага сямейнага жыцьця. Апроч гэтага, камуністы руйнуюць ідэалізм моладзі ў так зв. «камсамоле», заахвочваючы моладзь да распуснага жыцьця, што практыкавалася нават у віленскім камсамоле за часоў «Грамады» і «Змаганьня», калі прымушалі хрысьціянскіх дзяўчат-камсамолак жыць з камсамольцамі-жыдамі...

Такім парадкам, камунізм ня прыносе шчасьця чалавецтву, не вядзе да вышэйшых ідэалаў, не дае свабоды, роўнасьці і брацтва, а нясе толькі бяспраўны зьдзек партыйнай меншасьці над народам і руйнуе здаровую народную душу.
А што сказаць аб **фашызьме**? Бадай, тое самае, што і аб камунізьме. Як там, так і тут дыктатура і бізун, а ўсякі ведае, што пад бізуном дзічэе ня толькі скаціна, але і чалавек.
А што аб **анархізьме**? Анархізм — гэта няжыцьцёвая тэорыя. Яна вельмі ідэалізуе чалавека і хоча для яго надта вялікай свабоды.
Чалавек не такі добры, як вучаць ідэйныя анархісты, чалавек бывае часам горшы за зьвяра. Пры анархізьме было-б вельмі добра для бандытаў і ўсялякіх прайдзісьветаў, якія толькі глядзяць, каб дзе што ўкрасьці. Пры цяперашнім сапсуцьці нават часам патрэбна сільная ўлада, якая-б навяла парадак у краі і вывела featurednae зло. Так што анархізм ня прыймаецца паміж людзьмі і мала мае прыхільнікаў. Дый, урэшце, анархізм, таксама як камунізм, стаіць за супольнасьць маемасьці і працы.

Які-ж з усіх гэтых кірункаў найлепшы? На наш пагляд, найлепшы дэмакратызм, ён нясе чалавеку ўсё тое, што наймілейшае яго сэрцу: роўнасьць, свабода і брацтва. Пры дэмакратызьме няма ні пануючага, ні падданага, ні цара, ні раба, ні мужыкоў, ні шляхты, але ўсе роўныя. Кожны спаўняе свой абавязак, мае аднолькавае права ў кіраваньні дзяржавай, кожны можа быць урадоўцам, а нават прэзыдэнтам, перад кожным чалавекам адкрыта дарога да ўсіх годнасьцяў у дзяржаве. Прэзыдэнт у сапраўды дэмакратычнай рэспубліцы — гэта толькі першы грамадзянін паміж роўнымі грамадзянамі. Ён ня мае ніякіх асаблівых правоў, а толькі стаіць на чале ўсяго народу, як выбраны старшыня на чале свае воласьці.
Але яшчэ раз паўтараем, што, каб дайсьці да гэтакага дэмакратызму, трэба вялікага народнага ўсьведамленьня. Трэба, каб кожны грамадзянін разумеўся на палітыцы, ведаў, што карысна для народу, а што некарысна, трэба, каб рупіўся аб свой народ і стаяў за яго,— тагды толькі дэмакратызм стане на моцныя ногі, калі кожны грамадзянін будзе сьведамы сваіх правоў і абавязкаў.
А да гэтага ўсьведамленьня павінен весьці свой народ кожны грамадзянін,

які ўжо сам усьведаміўся і ведае, як пакіравацца ў палітычным жыцьці. Да гэтага ўсьведамленьня і мы павінны ісьці, бо гэта наш сьвяты абавязак перад народам і ўсім чалавецтвам.

* * *

Як-жа выглядаюць усе гэтыя кірункі паміж беларускім грамадзянствам у Зах. Беларусі?

Аб манархізьме ня чуваць бадай зусім, толькі, можа, дзе-ня-дзе старыкі ўспамінаюць цара Мікалая; аб арыстакратызьме тое самае; што да дэмакратызму, то на грунце дэмакратычным стаіць Беларускі Нацыянальны Камітэт (тры партыі: Б. Хр. Дэмакрацыя, Сялянскі Саюз і Правасл. Дэм. Аб'яднаньне), да камунізму імкнулася даўнейшая «Грамада» і потым «Змаганьне»; фашыстаў і анархістаў бадай што ня чуваць, на грунце беларускім яны не праяўляюць ніякай дзейнасьці.

Наагул беларусы ў працягу гісторыі і ў цяперашнім часе большую мелі склоннасьць лучыцца з дужымі, чужымі сіламі і кірункамі, а ня мелі адвагі і ахвоты тварыць свае сілы, свайго кірунку — і гэты нахіл беларускай народнай душы мы ўважаем за прычыну ўсіх гістарычных няшчасьцяў нашага народу.

Бо, прылучыўшыся да чужой сілы, трэба быць падданым гэтай сіле... А стварыўшы свой кірунак, чалавек шукае лепшай долі не для каго іншага, а для сябе.

НЕЧАКАНЫ РАКУРС

Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла.
Надпіс на адвароце ягонаю рукою па-польску: фат. Міх. Мялешка 14-га ліпеня 1929 г. у хмызьняку каля сядзібы Хадакова (1-ы прыпынак — Волчкавічы ад Мінска да Койданава). Ляжу ў гамаку, чытаючы газэту «Савецкая Беларусь». Бр. Эпімах-Шыпіла.

СЛОВА ПРА ПЯТЛЮРУ

Апантаны!.. Складана знайсьці іншае больш трапнае слова дзеля вызначэньня характару Сымона Пятлюры — чалавека, чыя роля ў станаўленьні незалежнай Украіны, нашае паўднёвае суседкі з такім падобным да Беларусі лёсам, замоўчвалася ў савецкіх падручніках гісторыі, але пераацаніць яе цяжка. Ня будучы прафэсійным вайскоўцам, ён узьняў на збройную барацьбу за волю дзясяткі тысячаў украінцаў і ўзначаліў яе, стаўшы легендарным атаманам украінскага войска.

Нарадзіўся Сымон Пятлюра 10 траўня 1879 г. у казацкай сям'і ў Палтаве. Гогалеўскі дух навакольных мясьцінаў і казацкія традыцыі, што сьвята захоўваліся й шанаваліся ў сям'і, не маглі не паўплываць на ягонае раньняе нацыянальнае самаўсьведамленьне. Жыла сям'я небагата, і пра выхаваньне й навучаньне дзяцей у гімназіях і ўнівэрсытэтах не было чаго й думаць. Таму Сымона аддалі ў Палтаўскую духоўную вучэльню, а потым у сэмінарыю. Не апошнюю ролю ў такім выбары бацькоў адыгралі ягоныя здольнасьці да навукі й музыкі (у сэмінарыі ён паказаў сябе добрым сьпеваком, дырыгентам і скрыпачом). Гэтае захапленьне музыкай паспрыяла

Сымон Пятлюра.

таму, што ў 1901 г. ён быў выкінуты з сэмінарыі. Рэч у тым, што Сымон запрасіў паслухаць сьпевы сэмінарыстаў Міколу Лысенку — першага сапраўды нацыянальнага ўкраінскага кампазытара. Такі чалавек, безумоўна, ня быў жаданым госьцем у мурох расейскай царкоўнай навучальнай установы, таму вінаваты, г. зн. Сымон Пятлюра, неўзабаве пакінуў шэрагі сэмінарыстаў. Выключэньне, праўда, дужа яго не засмуціла, бо, як бачым, у сэмінарыі панаваў маскоўскі вялікадзяржаўны дух, які не даваў вольна

У новай рубрыцы «Міжмор'е» часопіс мяркуе асьвятляць гісторыю і культуру краінаў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы, разьмешчаных паміж Балтыйскім і Чорным морамі, паміж Расеяй і Нямеччынай. Да гэтага рэгіёну адносіцца і Беларусь. Спадзяемся, што малавядомыя факты з жыцьця суседзяў, лёсы й творчасьць іхных выдатных постацяў дапамогуць нам лепш усьведаміць месца й ролю ў сьвеце і нашай краіны.— **Рэд.**

Абвешчаньне III Унівэрсалу 20 лістапада 1917 г. Кіеў, Сафійская плошча. Пасярэдзіне — М. Грушэўскі і С. Пятлюра.

пачуваца такім, у добрым сэнсе слова, нацыяналістам, якім быў Пятлюра.

Выйшаўшы з сэмінарскіх муроў, ён пэўны час зарабляў на хлеб прыватнымі заняткамі, досыць актыўна супрацоўнічаў з Рэвалюцыйнай партыяй, якая перарасла потым ва Ўкраінскую сацыял-дэмакратычную партыю. Гэтае супрацоўніцтва скончылася тым, што паліцыя напала на ягоны сьлед, і ён мусіў у 1902 г. выехаць на Кубань. Там Пятлюра пазнаёміўся з прафэсарам Шчарбінам і нямала дапамог таму ў зборы і ўпарадкаваньні матар'ялаў па гісторыі Кубанскага Казацкага Войска, якія былі потым выдадзеныя ў трох тамох.

Паводле словаў прафэсара Каралёва-Старога, Сымон Пятлюра «быў сярэдняга росту і важыў каля 150 фунтаў, ён меў бледна-жоўтае аблічча, сьветла-шэрыя вочы, а ў сваіх тонкіх вуснах заўжды трымаў цыгарэту, у яго былі рэзкія рухі, і падчас размоваў ён хадзіў па пакоі, гаварыў тэнарам барытонавай афарбоўкі, а свае публічныя прамовы пачынаў ціха, але пакрыху ўзвышаў голас і пераконваў сваёй аргумэнтацыяй». Прамоўніцкі талент хутка вывеў яго ў лідары Рэвалюцыйнай партыі, і, каб быць у цэнтры ейнае дзейнасьці, а таксама ўцякаючы ад перасьледу паліцыі, Пятлюра нелегальна перайшоў аўстрыйскую мяжу й пад імем Сьвятаслава Тагона пасяліўся ў Львове.

Вялікі ўплыў у той час меў на Сымона Пятлюру Іван Франко. Менавіта пад гэтым уплывам Пятлюра ўсё болей спрабуе свае сілы ў літаратурнай крытыцы ды публіцыстыцы, дасылае артыкулы ў розныя ўкраінскія выданьні, напрыклад, «Волю» ці «Літературно-Науковий Вісник». Трэба адзначыць, што ня быў ён абыякавы й да праблемаў беларускага адраджэньня, пра што сьведчыць хоць бы невялічкая рэцэнзія на кнігу д. Дарашэнкі, напісаная ў 1908 г. (пераклад гэтае рэцэнзіі мы прапануем увазе чытачоў).

Ад пераезду Пятлюры ў Львоў і ажно да I сусьветнай вайны ён рэдагаваў розныя ўкраінскія выданьні ў Львове, Пецярбурзе, Кіеве, Маскве: «Праця», «Селянин», «Вільна Украіна», «Слово», «Украинская жизнь».

У той час акадэмік Ф. Корш пісаў: «Украінцы самі ня ведаюць, каго яны маюць у сваіх шэрагах. Яны думаюць, што Пятлюра выдатны рэдактар, патрыёт, грамадзкі дзяяч. Гэта ўсё праўда, але ня поўная. Пятлюра — бязьмерна вышэйшы за тое, што пра яго



Ордэн (Крыж) Сымона Пятлюры. Зацьверджаны ў 1932 г. для ўсіх вэтэранаў арміі УНР.



Ордэн рыцараў Жалезнага Крыжа арміі УНР. Зацьверджаны ў 1920 г. Галоўным Атаманам Войскаў УНР Сымонам Пятлюрам.

думаюць. Ён — з пароды правадыроў...» Гэтае сьцьверджаньне знанага вучонага пачало спраўджвацца ў 1917 г., калі Сымон Пятлюра 29 чэрвеня заняў месца вайсковага міністра ў Генэральным Сакратарыяце — першым урадзе аўтаномнай Украіны. Гэтую ж пасаду ён пакінуў за сабой і ў новым Генэральным Сакратарыяце, перафармаваным у ліпені, пасьля плённых перамоваў з Часовым урадам у Петраградзе. Але з бальшавіцкім пераваротам у Расеі пачалося й «вясёлае» жыцьцё на Ўкраіне: у сьнежні 1917 г. Ленін абвясьціў вайну Кіеву, і бальшавікі распачалі наступ. 7 лютага, нягледзячы на супраціў войскаў Пятлюры, яны захапілі ўкраінскую сталіцу. У такіх умовах 22 студзеня 1918 г. быў прыняты Ўнівэрсал аб незалежнасьці Ўкраінскае Народнае Рэспублікі. Моцы супрацьстаяць бальшавіком маладой дзяржаве неставала, і яна вымушаная была зьвярнуцца да Нямеччыны й Аўстра-Вугоршчыны, з дапамогаю якіх ужо 28 лютага камуністычная акупацыя Кіева была зьліквідаваная. На кароткі час на Ўкраіне ўсталяваўся мір, ці, хутчэй, зацішша, і Сымон Пятлюра ў гэтай сытуацыі ўзначаліў Кіеўскую Земскую Ўправу і Ўсеўкраінскі Саюз Земстваў.

Але ў іншых колах украінскае палітычнае думкі расла незадаволенасьць сацыялістычным урадам УНР, і 29 красавіка 1918 г. адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога ўсю ўладу ў сваіх руках сканцэнтраваў гетман Паўла Скарападзкі. Рэзка адмоўнае стаўленьне Пятлюры да новае ўлады цалкам выявілася ў ягоным мэмарыяле, прачытаным 7 ліпеня, праз які 12 ліпеня ён апынуўся за кратамі.

У лістападзе Пятлюра быў вызвалены й адразу распачаў актыўную падрыхтоўку паўстаньня супраць гетмана. 13 лістапада ўтварылася Дырэкторыя — новы кіраўнічы орган УНР; узначаліў яго Ўладзімер Віньнічэнка, а Пятлюра быў у ліку астатніх чатырох чальцоў. Гетман Скарападзкі, апынуўшыся ў небясьпечным становішчы, 14 сьнежня 1918 г. зрокся ўлады, і Дырэкторыя такім чынам стала адзінай уладай на Ўкраіне. Гэта пацьвердзіў і Ўсеўкраінскі Працоўны Кангрэс, што адбыўся 23 студзеня 1919 г.

Гэтак пачаўся 1919 год — год, які, па сутнасьці, вырашыў лёс Украінскае Народнае Рэспублікі і ейнага

Камандант Гайдамацкага Каша Слабадзкой Украіны Сымон Пятлюра са штабам.

войска пад камандай старшыні Дырэкторыі (Віньнічэнка ў лютым 1919 г. падаў у адстаўку й выехаў за мяжу) і Галоўнага атамана Сымона Пятлюры. Да чэрвеня, пасьля хуткага адступленьня на захад і цяжкіх баёў з бальшавікамі, ад, лічы, 100 тысячаў пятлюраўцаў засталося каля 15 тысячаў. І ўсё ж гэтыя рэшткі, аб'яднаўшыся з Галіцкай Арміяй, здолелі 30 жніўня адваяваць Кіеў, але ўжо наступнага дня яго занялі дзянікінскія войскі — ня меншыя ворагі Пятлюры, чым расейскія бальшавікі. А ў кастрычніку да іншых бедаў дадалася й эпідэмія тыфусу, якая забрала жыцьці большай часткі ўкраінскага войска.

Спадзявацца на лепшае ў такім становішчы амаль абсурдна, але Пятлюра надзеі не губляў і вёў перамовы зь Юзафам Пілсудзкім. Апошні згадзіўся дапамагчы ўкраінцам у іхным змаганьні, але запатрабаваў за гэта значныя тэрыторыі ў Заходняй Украіне. Умовы, вядома, былі няроўныя, але іншага выбару Пятлюра ня меў. Вайсковая дапамога палякаў была нязначная й вялікай карысьці не прынесла. Акрамя таго, польскі бок ня раз здраджваў заключанай дамове. Асобныя аддзелы былога магутнага пятлюраўскага войска змагаліся да лістапада 1921 г.

Сам жа галоўны атаман, адчуўшы, нарэшце, марнасьць сваіх намаганьняў на Бацькаўшчыне, у 1920 г. выехаў у эміграцыю. Там, спраўляючы абавязкі старшыні Дырэкторыі, ён вярнуўся да свайго колішняга захапленьня — літаратурнае дзейнасьці, але гэта былі ўжо не рэцэнзіі й літаратуразнаўчыя артыкулы, а роздумы пра лёс Украіны, пра магчымасьці заваяваньня незалежнасьці, пра мэты і задачы ўкраінскай эміграцыі.

Нават жывучы ў Парыжы, Сымон Пятлюра ўяўляў сабой небясьпеку для спакойнага існаваньня УССР. За ім вялося натуральнае паляваньне, а ў 1926 г. Сымона Пятлюру забілі. Забойцу — бальшавіцкага агента — суд апраўдаў. На жаль, у сусьветнай гісторыі часта здаралася, як, зрэшты, здараецца й зараз, што праўдзівы злачынца ўсю сваю віну перакладаў на ахвяру.

Ісыдар Нагаеўскі пісаў: «...Сымон Пятлюра вытрымаў на пасадзе праваднра народу да канца й застаўся верным ідэі дзяржаўнасьці Украіны, за якую аддаў сваё жыцьцё».

Сымон ПЯТЛЮРА

ПУБЛІЦЫСТЫКА

БЕЛАРУСЫ ДЫ ІХНАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ

Напісаў Д. Дарашэнка, стар. 32, к. 5 к., Кіеў, 1908 г. Выдавецтва «Український Учитель», ч. 15.

У канцы сваёй выдатна напісанае кніжкі д. Д. Дарашэнка кажа: «Думаем, што й нашым чытачом будзе цікава даведацца пра беларускі рух; наш народ зьвязаны мноствам ніцяў зь беларускім народам у гістарычным лёсе і ў сучасным жыцьці; тым большую цікавасьць мае для нас беларускае нацыянальнае адраджэньне» (стар. 32). Натуральную патрэбу нашага грамадзтва ведаць пра тое, як наладжана справа з нацыянальным рухам у іншых народаў, падобных гістарычнай доляй да нашага,— невялічкая брашура д. Дарашэнкі задавальняе цалкам. Аўтар, на падставе знаёмства з найноўшаю беларускаю літаратурай, распавядае пра мінуўшчыну беларускага народу й пра сучаснае жыцьцё яго ды змаганьне за нацыянальную волю. Пераказ асноўных фактаў гісторыі беларускага нацыянальнага адраджэньня зроблены коратка, але досыць выразна й праўдзіва. Аўтар больш спыняецца на літаратурным руху й мала на палітычным. Гэта — хіба кніжкі, якой аўтару рабіць было ня трэба. Таксама ня можам не зазначыць і таго, што аўтар не заўжды ўтрымлівае стыль у мове: другая частка ягонае працы напісаная з гледзішча папулярнасьці куды лепей, як першая. А шкада, бо, па-першае, нашаму народу варта ведаць пра тое, што дзеецца ў іншых народаў, а па-другое, Дарашэнка выдатны папулярызатар і ўмее проста, зразумела распавядаць пра складаныя пытаньні. Увогуле ж кніжка д. Дарашэнкі робіць цудоўнае ўражаньне на чытача й сваёй тэмаю, і знаёмствам аўтара з гэтаю тэмаю, і, нарэшце, тым прыхільным да беларусаў тонам, якім яна напісаная. Выдавецтва «Український Учитель» зрабіла выдатную паслугу грамадзтву тым, што выдала брашуру пра беларусаў ды пра іх нацыянальнае адраджэньне.

1908.

НЭГАТЫЎНЫЯ РЫСЫ ПАЛЕМІКІ ВАКОЛ УКРАІНСКАГА ПЫТАНЬНЯ

У палеміцы, што разгарэлася на газэтных старонках вакол украінскага пытаньня наагул і пытаньня ўкраінскае культуры ў прыватнасьці, зьвяртае на сябе ўвагу адна асаблівая рыса, характэрная тым удзельнікам гэтае палемікі, якія адмаўляюць украінскаму народу ў праве на ўласную нацыянальную культуру. І П. Струвэ, і ягоныя аднадумцы з правых органаў прэсы, кваліфікуючы сучасны стан украінскай культурнай творчасьці як штучную «выдумку» (А. Пагодзін) або як рух, «на шчасьце, яшчэ зусім пазбаўлены народнага характару» (П. Струвэ), выключаюць з дыскусіі, адны, магчыма, несьвядома, іншыя сьвядома, тэму дасягненьняў ды здабыткаў украінскае

культуры, тыя апошнія этапы ў ейным разьвіцьці, калі каштоўнасьці культурнае творчасьці адкладваюцца ў супольнай сьвядомасьці, увахо-дзяць у культурнае жыцьцё грамадзтва як арганічны элемэнт, як ягоная стыхійная складовая частка. Дый увогуле, расейскае грамадзтва мала знаёмае з тым, што ўласна ахоплівае паняцьце ўкраінскае культуры. Тым больш убогі ды аднабаковы матар'ял прапануюць ягонай увазе тыя з удзельнікаў палемікі, якія, накрэсьліўшы сабе пэўнае кола дзеяў з мэтаю пакласьці канец разьвіцьцю ўкраінскае культуры, лічаць непатрэбным сьпярша азнаёміць чытачоў з тым канкрэтным зьместам яе, з тым status quo, на якім яна стаіць сёньня. Такі чытач, які спажывае толькі абмежаваны матар'ял, ня ў стане асэнсаваць сутнасьці спрэчкі і вырашыць, ці слушныя тыя шляхі да яе вырашэньня, якія вымалёўваюць п. Струвэ ды ягоныя аднадумцы. Тымчасам тэма спрэчкі, якая й раней, перад вайною, распальвала пачуцьці, стаецца цяпер асабліва пякучаю і вымагае дзеля ўсебаковае ацэнкі як найболей фактычнага матар'ялу, ігнараваньне якога загадзя прадказвае тэндэнцыйнае й аднабаковае вырашэньне пытаньня, а гэта пагражае балюча ўразіць мільёны людзей, зацікаўленых у выніках спрэчкі.

Дык жа расейскае грамадзтва павінна ведаць, што тая частка ўкраінскага народу, якая доўга жыла ў іншай дзяржаве, дзе палітычныя правы спрыялі разьвіцьцю нацыянальнае культуры, цяпер, у сувязі з захопам Галіччыны й Букавіны расейскім войскам, перажывае дні хваравітага чаканьня. Яна споўненая невыразных прадчуваньняў пра лёс, што чакае яе ды ейныя культурныя набыткі ў новай бацькаўшчыне. Што скажа галіцкім украінцам наступны дзень: ці прынясе ён ім прызнаньне культурных дасягненьняў, здабытых коштам вялікіх ахвяраў і працай цэлага шэрагу пакаленьняў на крыжовым гістарычным шляху, ці, можа, спаткае тыя дасягненьні лёс, грунт для якога так старанна рыхтуюць і П. Струвэ, і «Галицко-Русское Общество», і шэраг іншых дзеячоў, якія зацята акрэсьліваюць шляхі дзеля вырашэньня пытаньня, што вымагае асаблівай абачлівасьці ды ўсебаковага вывучэньня. Гэтае пытаньне, асабліва ў галіцка-ўкраінскіх дачыненьнях, было б аднабаковым, калі б абмежавалася толькі тым матар'ялам, які прапануюць такія дзеячы Галіччыны, як Дудыкевіч або супрацоўнікі «Прикарпатской Руси», зь іх нэрвовай партыйнасьцяй й выразна выяўленай тэндэнцыяй да асьвятленьня тых стасункаў такім чынам, які не адпавядае ані сапраўднасьці, ані гістарычным зьвесткам. Тымчасам, адлюстраваньне справы на падставе згаданага матар'ялу, прычым выключна яго, кідаецца ў вочы пры азнаямленьні зь літаратурнымі выступамі ў прэсе шмат каго з тых асобаў, якія лічаць сябе цалкам кампэтэнтнымі з ходу вырашаць лёс заваяванае краіны і гатовыя ўціснуць складаныя яе дачыненьні ў рамкі 2-га т. «Свода Законов и Губернских Учреждений». Калі ў гісторыі ўкраінскага насельніцтва Галіччыны разгортваецца цяпер новая чыстая старонка, дык гэта яшчэ, вядома, не азначае, што на ёй можна пісаць тыя пісьмёны, якія лягчэй накрэсьліць па інэрцыі ці па шаблёне, не турбуючыся, ці будуць такія нормы й пляны грамадзкага ладу Галіччыны адпавядаць найбольш бязбольнаму зьліцьцю гэтага краю з Расеяй.

Перад расейскай супольнасьцяй цяперашнім часам стаіць бязьмернае й цяжкое заданьне: яна мае зьдзейсьніць вялікую падрыхтоўчую працу ў вывучэньні акупаванай краіны, каб вынікамі яе маглі скарыстацца нашыя заканадаўчыя ўстановы, калі ім давядзецца працаваць над пытаньнем пра нармальны лад Галіччыны. Чым больш differentiated розанабаковым будзе гэты матар'ял, чым менш у зьбіраньні й вывучэньні яго будзе перадузятасьці й тэндэнцыйнасьці, тым больш натуральным і слушным будзе тое рашэньне, якое зробяць заканадаўчыя ўстановы ў пытаньні, што цяпер мае стаць адным з найпякучых пытаньняў расейскае сучаснасьці. Справа дзяржаўнага ўладкаваньня Галіччыны і правядзеньня для яе насельніцтва мудрай дзяржаўнай палітыкі занадта складаная, каб ухваліць ужо цяпер тыя пасьпешлівыя праекты, што ствараюць нейкія грамадзкія дзеячы, якія наяжджаюць у Львоў і пасьля кароткатэрміновых гастроляў у акупаванай краіне лічаць сябе ўжо за цалкам кампэтэнтных, каб «судзіць і радзіць» — і праектаваць захады, скіраваныя на ігнараваньне ўсяго самабытнага й індывідуальнага як у гра-

мадзка-нацыянальным, гэтак і ў рэлігійным укладзе жыцьця тутэйшага насельніцтва. Няцяжка пабачыць у такіх праектах, сьпехам скроеных і не да ладу пашытых, уплыў кансультантаў з «Прикарпатской Руси», якія больш занятыя зьвядзеньнем старых рахункаў са сваімі ідэйнымі ды палітычнымі праціўнікамі, ніж сур'ёзнаю й праўдзіваю дапамогаю ў азнаямленьні расейскае супольнасьці з новымі ці малавядомымі яму абставінамі ў заваяваным краі.

...Клясычным прыкладам гэтага можа паслужыць выступ праф. Д. Пазьнеева («Киев», ч. 311, 20 лістапада 1914 г.), які ў вадным са сваіх артыкулаў, прысьвечаных Галіччыне, сьцьвярджаў, нібыта ўкраінцы выдавалі «кнігі, часопісы й газэты моваю, цалкам незразумелаю насельніцтву Галіччыны». Відавочная недарэчнасьць гэтага сьцьверджаньня кідаецца ў вочы кожнаму, хто імкнецца даведацца, што хаваецца за ім. Можна, вядома, па-рознаму ацэньваць кніжныя здабыткі галіцкіх украінцаў, але каб дагаварыцца да таго, што насельніцтва не разумее ўласнае мовы, гэта значыць — не спрабаваць дайсьці да сутнасьці тае супярэчнасьці, якая хаваецца ў гэтым сьцьверджаньні. Дапусьцім, што думка п. Пазьнеева слушная, але чым у такім разе растлумачыць пашырэньне «незразумелых» кніг сотнямі тысячаў і мільёнамі асобнікаў, газэтаў ды часопісаў (каля 50 выданьняў), чым растлумачыць, што тая самая незразумелая мова была моваю выкладаньня ў ніжэйшай ды сярэдняй школах, праклала сабе шлях да ўнівэрсытэту, стала моваю паважнай навуковай літаратуры? Няўжо толькі тым, што нейкая купка чарадзеяў ды штукароў «адмыслова» пісала «незразумелыя» кнігі, а мільённыя масы народу ўкраінскага, каб дагадзіць, дзеля задавальненьня колькіх штукароў, чыталі й «не разумелі»? Адказ на гэтае пытаньне занадта ясны, каб трэ' было казаць пра яго. І было б яшчэ добра, калі б убогія веды нейкіх прафэсараў пра Галіччыну заставаліся толькі пры іх: кожны мае права чагосьці ня ведаць і з чымсьці быць мала азнаёмлены. Але ж такія інфарматары, як праф. Пазьнееў, лічаць за патрэбнае выявіць сваё невуцтва, якое варта было б прыхаваць, хоць бы дзеля таго, каб не кампрамэтаваць свайго прафэсарскага званьня.

...Калі раней украінства, як зьяву культурнага характару, бралі пад сумнеў, дык цяпер выявілася магчымасьць западозрыць і тыя ягоныя захады, зь якімі яно прыходзіць на дапамогу дзяржаве ў клопаце пра ахвяры вайны, у аблягчэньні пакутаў пацярпелых падчас баёў. Дзе была магчымасьць і дазвалялі сродкі, украінцы за свой кошт арганізоўвалі шпіталі, як, напрыклад, у Кіеве, Петраградзе й Маскве. Сьведкі гэтага, ахопленыя агульнай падазронасьцяй, і тут, у непасрэднай праяве чалавечага пачуцьця, угледзелі патаемную тэндэнцыю, якая зьяўляецца працягам той жа «пагражальнай» думкі пра ўкраінскі сэпаратызм. Такім чынам, да палітычнага й літаратурнага сэпаратызму дадалі новы від яго — «шпітальны». Ролю новага Калюмба ў гэтай вынаходцы ўзяла на сябе праніклівая рэдакцыя «Утра России», што выбухнула грамавым артыкулам у духу растапчынскіх буфанадаў пра нэдарэчнасьць і небясьпеку наладжваньня нацыянальных шпіталяў. У гэтай публікацыі шмат проста непрыстойных выпадаў на адрас арганізатараў украінскага шпіталю («Кобзар») у Маскве, моцных лаянкавых словаў ды яшчэ болей хлусьні. Можна сьцьвярджаць, што хлусьнёю прасякнуты ўвесь артыкул маскоўскае газэты, якая не пасаромелася цьвердзіць, нібыта адміністрацыя згаданага шпіталю прымае на лячэньне толькі ўкраінцаў, тады як папраўдзе, згодна з пастановай агульнага сходу чальцоў «Кобзара», там ніякіх нацыянальных адрозьненьняў ня робяць, і дзьверы шпіталю адчыненыя для кожнага, хто пацярпеў на вайне, без папярэдняга пытаньня пра яго нацыянальнае паходжаньне. Можна сьцьвярджаць, што ў гэтым шпіталі знайшлі-б прытулак і догляд таксама й публіцысты «Утра России», калі б лёс пажадаў паставіць іх у такія ўмовы, дзе заміж таго, каб разьліваць атрамант дзеля ратаваньня Расеі ад прыдуманых імі прывідаў, яны б рабілі ёй больш істотныя паслугі, падобныя да тых, якія робяць украінцы, б'ючыся ў шэрагах войска й чынна праліваючы кроў сваю за цэласьць дзяржавы. У выступе «Утра России» пра «шпітальны сэпаратызм» столькі ж розуму, колькі й такту. Хоць, мусіць, розуму меней.

Вы бачыце на гэтым прыкладзе, як перакручваюцца задачы друкаванага слова, як яны наагул скрыўляюцца, калі іх вылучае сёньняшні дзень, і людзі, якія прэтэндуюць на ролю выразьнікаў думак расейскае супольнасьці, глыбока перакананыя, што слушна разумеюць свае функцыі, калі выступаюць зь недазволенымі нападамі на пачуцьці гуманнасьці ды элемэнтарнай чалавечнасьці толькі таму, што іх выяўляюць украінцы.

Нескладаныя тыя мэтады, з дапамогай якіх згаданая маскоўская газэта, а таксама й іншыя органы нацыяналістычнай расейскай прэсы намагаюцца апанаваць тэму палемікі вакол украінскага пытаньня. Падобныя мэтады пастулююцца дзяржаўнымі меркаваньнямі, праўда, у своеасаблівым разуменьні іх, але, ва ўсялякім разе, умоўна бездакорнымі, у тым, натуральна, сэнсе, што спрэчкі зь імі ня можа быць, бо ж моманты культуры нельга прыцягнуць да спрэчкі без скрыўленьня самой прыроды культуры. Крыху іначай выглядае роля тых праціўнікаў украінскага руху, якія выступаюць проці яго з матываў абароны расейскае культуры ад магчымага раздваеньня яе пры ўмове шырокага развою культуры ўкраінскай. На пытаньне: ці магчымы нутраны ўплыў і пэўныя захады, што павінныя загнаць апошнюю ў «ціхую затоку» ды зьвесьці яе да ступені абломку ды да згасаньня згадкі пра мінулае, што аджыла й стала толькі матар’ялам для этнографа ды гісторыка? — згаданая намі разнавіднасьць праціўнікаў украінства дае станоўчы адказ. Дзеля большай пераканаўчасьці гэтае цьверджаньне падсілкоўваюць выкарыстаньнем палітычных аргумантаў, міжнародных і дзяржаўных, і такім чынам пастаноўка пытаньня пра ўкраінскую культуру страчвае сэнс, бо немінуча сыходзіць з прынцыповае глебы, пераходзячы ў тую роўніцу, дзе разглядаюць гэтае пытаньне абаронцы перадрэформавых дзяржаўных прынцыпаў — прыхільнікі тых захадаў дзеля ўплыву на культуру, якія нічога супольнага зь ёю ня маюць.

У большасьці выпадкаў такое зьмяшаньне зыходных поглядаў, прыцягненьне да палемікі непатрэбнага балясту — лішняе для мэтаў палемікі і ў прыватнасьці для таго, хто скарыстаўся падобным мэтадам дзеля ўплыву на шырокія колы грамадзтва й прышчапленьня яму пэўных поглядаў на прадмет палемікі. Так і атрымалася з П. Струвэ. Ягоны выступ выклікаў вялікі галас у прэсе, але ня даў таго эфэкту, на які, відавочна, разьлічваў рэдактар «Русской Мысли». П. Струвэ змагаўся са станоўчым стаўленьнем расейскага (прагрэсіўнага) грамадзтва да ўкраінскага пытаньня, ён лічыў такое стаўленьне амаль злачынным і прапанаваў ужыць у дачыненьні да ўкраінцаў дзяржаўныя захады дзеля ўплыву, пакуль, маўляў, яшчэ ня позна, пакуль украінскі рух рэпрэзэнтаваны толькі коламі інтэлігенцыі. Парады пана Струвэ не знайшлі прыхільнага водгуку ў сугучных зь ім колах расейскага грамадзтва і выклікалі цэлы шэраг пярэчаньняў з боку такіх прадстаўнікоў расейскае грамадзкае думкі, як акадэмік Ф. Корш, П. Мілюкоў, Ф. Какошкін, Н. Грэдэскул, М. Каробка, праф. М. Чубінскі ды іншыя, што пасьпяшаліся адмежавацца ад той ролі, якую навязваў рэдактар «Русской Мысли» расейскай інтэлігенцыі; яны сьцьвердзілі непрымальнасьць імі мэтадаў барацьбы з украінскай культураю, якія востра супярэчаць і традыцыям гэтае інтэлігенцыі, і разуменьню абавязкаў дзяржавы што да пытаньняў культуры. Палеміка п. Струвэ, ужо не з украінцамі і, у прыватнасьці, ня з нашым часопісам, а з названымі выдатнымі расейскімі дзеячамі ці вучонымі, нам, украінцам, важная тым, што ўкраінскае пытаньне стала аб’ектам увагі з боку расейскае супольнасьці, набыло актуальнасьць і вымагае вывучэньня ды пэўнага стаўленьня да яго. Гэтаму павелічэньню ўвагі да ўкраінскага пытаньня ды зацікаўленьню ім у значнай ступені спрыяла акупацыя Галіччыны і зьвязаныя зь ёю задачы расейскага ўраду і расейскага грамадзтва, што датычылі ўкраінскага насельніцтва заваяванага краю, але так ці гэтак, а ўкраінскае пытаньне набывае цяпер значэньне аднаго зь пякучых пытаньняў сучаснасьці. Мы зазначылі вышэй, што мэтад, якім карыстаецца дзеля яго вырашэньня П. Струвэ, непрымальны для прагрэсіўных колаў расейскага грамадзтва. Яшчэ больш непрымальны ён для ўкраінскага грамадзтва, якое, вядома, мае права вымагаць ад

п. Струвэ, як кіраўніка прагрэсіўнага расейскага часопіса, большага такту, чымся той, што выявіў п. Струвэ ў дачыненьні да нас у цяперашні час.

...Ацэньваючы выступы П. Струвэ з украінскага гледзішча, мы, не зважаючы на ўжо падкрэсьлены намі момант, што характарызуе пазыцыю нашага працiўніка ў тактычным дачыненьні, павінны зазначыць адну, ня менш адмоўную рысу гэтага выступу, што датычыць ужо фактычнага боку яго. П. Струвэ, які сумняваецца, «каб у межах Расейскае Імпэрыі маларасейская ці ўкраінская стыхія склалася ў нацыянальнасьць», не спрабаваў, як вядома, падмацаваць сваё сумненьне адпаведным далучэньнем інфармацыйных крыніцаў пра зьмест і дасягненьні ўкраінскае культурнае творчасьці. Без сумненьня, такая інфармацыя зрабіла б вялікую паслугу тым з чытачоў Струвэ, якія хацелі б праверыць схемы й формулы, якія склаў ён для ўкраінскае культуры. Тымчасам, разьвіцьцём гэтых формулаў ды гістарычна-філялягічна-літаратурнымі аналёгіямі, у шматлікіх выпадках недакладнымі ці няправільна вытлумачанымі, па сутнасьці, справа й скончылася. Можна было чакаць, што цяпер, калі спрэчка пра ўкраінскую культуру набыла крыху іншы характар, бо ў Галіччыне ўкраінская народнасьць, існаваньне й фармаваньне якой у Расеі, на думку п. Струвэ, сумнеўныя, існуе й стварыла сваю нацыянальную культуру. Струвэ, перш чым выступаць з новымі схемамі русыфікацыйнага характару ўжо што да Галіччыны, будзе лічыць за патрэбнае здрадзіць свайму ўлюбёнаму мэтаду і сьпярша азнаёміць сваіх чытачоў з тым станам украінскага насельніцтва Галіччыны, у якім засьпела яго акупацыя краю. На жаль, нічога гэтага няма і ў новых артыкулах Струвэ. Шматслоўная сутнасьць іх нескладаная, хоць і прыхарошаная доўгімі прастарэкаваньнямі; практычны вынік тых захадаў і адносінаў, якія ён хацеў бы бачыць ужытымі да ўкраінцаў Галіччыны, па сутнасьці, палягаў бы ў давядзеньні ўкраінцаў да таго стану, пры якім сталася б немагчымым ня толькі далейшае разьвіцьцё створанай імі культуры, але зь лягічнаю немінучасьцяй і іхныя дасягненьні пачалі б адміраць і станавіцца матар'ялам для ўспамінаў ды этнаграфічнага ці гісторыка-літаратурнага вывучэньня. У ахвяру схеме, такім чынам, прыносіцца жывое жыцьцё народу, што зьбярог праз крыжовы гістарычны шлях, у векавой барацьбе з мацнейшымі культурнымі ўплывамі — сваю індывідуальнасьць, сваю народную душу, свой псыхалягічны досьвед і, не зважаючы ні на што, здолеў знайсьці ў сабе вялікія адпорныя сілы дзеля таго, каб, ператрываўшы векавыя няшчасьці, стварыць сваю культуру, што ўліла і ўлівае да сусьветнае скарбніцы індывідуальна-непаўторны струмень.

Цікава, што захады, якія праектуе п. Струвэ адносна ўкраінскае культуры, пастулююцца інтарэсамі расейскае культуры. Гэта дужа шляхотна, калі б разам з тым гэта не было скрыўленьнем самога разуменьня культуры ўвогуле, якая ніколі не патрабуе ахвяраў у форме зьнішчэньня аднае нацыянальнае культуры на карысьць іншай, і калі б у такой абароне расейскае культуры не прасьвечвала няпэўнасьць адносна яе ўнутранай моцы, занадта вялікай дзеля таго, каб абысьціся без дапамогі пэўных формаў дзеяньня звонку дзеля пашырэньня свайго ўплыву. Калі псыхалягічная, магчыма й неўсьвядомленая, сутнасьць пазыцыі Струвэ ў пытаньні ўкраінскае культуры зводзіцца да страху за расейскую культуру, дык практычна, у сваіх выявах і наступствах, яна шчыльна прысоўвае Струвэ да тых працiўнікаў правоў украінскага народу на стварэньне свае культуры, якія ў барацьбе зь ёю чапляюцца за захады, што ня маюць нічога супольнага з культурным уплывам...

1914.

ДА НАСЕЛЬНІЦТВА ЎСЯЕ САБОРНАЕ ЎКРАІНЫ

Сяляне, працоўныя і ўвесь народзе Ўкраіны!

З вартаю захапленьня заўзятасьцяй вось ужо два гады ўкраінскае войска адбівае напады то чырвоных, то чорных ворагаў, што насоўваюцца з Масквы, каб падбіць пад сваё панаваньне ўкраінскі народ.

Голад і галеча, якія часам даводзіцца трываць, не зьняверылі абаронцаў свабоды нашай рэспублікі, і моцнаю сьцяною стаяць яны ўсё гэтак жа аддана й шчыра перад напорам спачатку бальшавіцкіх, а цяпер дабравольчых бандаў, крывавая праца якіх яшчэ не забытая...

Тысячы абрабаваных гаспадарак, спаленыя сёлы, людзі, якіх жывымі закопвалі ў зямлю, згвалтаваныя дзяўчаты, забітыя бацькі, браты й сыны — усе гэтыя злачынныя ўчынкі, як жывыя, стаяць перад вачыма нашага шматпакутнага народу.

Бессаромна, распусна падыходзяць гэтыя новыя каты і, падкраўшыся, намагаюцца здушыць нас, намагаюцца скарыстацца з тых посьпехаў, якімі пакрыла свой слаўны шлях наша войска. То называючы нас бальшавікамі, зь якімі білася да поўнае перамогі наша ваярства, то працягваючы сваю крывавую руку да паразуменьня, гэтыя новыя драпежнікі любым чынам спрабуюць абараніць чужую нацыянальна нашаму народу маскоўскую зграю чарнасоценцаў і забясьпечыць ейнае панаваньне над лёсам украінскага народу.

Цяжкі шлях, народзе Ўкраіны, да твайго шчасьця... Цернямі ўсьцілаюць яго твае ворагі і, як дзікія зьвяры, чакаюць хвіліны, калі б кінуцца да цябе й сваімі бруднымі кіпцюрамі ўчапіцца ў тваё маладое цела... і смактаць зь яго тваю сьвятую кроў. А ты, зьняверраны й стомлены, блукаеш сярод гэтага бруду, чутак, правакацыяў, ліслівых абяцанак, якія толькі распыляюць твае сілы й разьбіваюць дух твой. Зьняверанасьці, расчараваньню ня можа быць месца ў час, калі на доўгія гады вырашаецца твой лёс, тваё шчасьце й твой дабрабыт. Толькі моц, лучнасьць і цьвёрдае непахіснае імкненьне да поўнае незалежнасьці й свабоды можа быць нашым пабрацімам.

Цьвёрда памятай і вер, што Найвышэйшы Ўрад твой ды міністры, ім прызначаныя, распачаўшы барацьбу за інтарэсы народу Ўкраіны супраць клятае гетманшчыны й пераадолеўшы непрыдатны ды варожы нам бальшавізм, не спынілі й ня спыняць барацьбы супраць усіх гвалтаўнікоў, былі б гэта бальшавіцкія ці дабравольчыя банды рабаўнікоў, пакуль не забясьпечаць поўнай свабоды, незалежнасьці ды дабрабыту народу Ўкраіны.

Найвышэйшы Ўрад Рэспублікі, Дырэкторыя,— са мной на чале,— складаецца з чальцоў, праф. Ф. Швэца ды А. Макаранкі. Між Дырэкторыяй ды Радай Народных Міністраў пануе поўная згода й паразуменьне што да кіраваньня нашаю дзяржаваю.

Ворагі народу пашыраюць усялякія хлусьлівыя чуткі пра наш урад ды ягоныя заданьні й мэты, а таму абвяшчаю, што цяперашняе Народнае Міністэрства Рэспублікі Ўкраінскай мае наступны склад: Старшыня Рады Народных Міністраў і Народны Міністар Унутраных Справаў Ісак Мазэпа, Народны Міністар Зямельных Справаў Мікола Кавалеўскі, Народны Міністар Фінансаў Барыс Мартас, Народны Міністар Працы Бяспалка, Вайсковы Міністар палк. Пятрыў, Міністар Юстыцыі й Кіраўнік Міністэрства Замежных Справаў Андрэй Лівіцкі, Народны Міністар Шляхоў Украіны Сяргей Тымашэнка, інжынэр, Народны Міністар Гаспадаркі Мікола Шадлун, Народны Міністар Здароўя й Апекаваньня Дзьмітро Адрына, Народны Міністар Поштаў і Тэлеграфаў Іван Палівода, Народны Міністар Прэсы й Інфармацыяў Тэафіль Чаркаскі, Міністар Культаў Іван Агіенка, Міністар Габрэйскіх Справаў Красны й Дзяржаўны Сакратар Ляўко Шрамчэнка.

Найцяжэйшая хвіля барацьбы не спыніла працы Ўкраінскага Ўраду на карысць і дабрабыт Бацькаўшчыны. Урад Украінскае Народнае Рэспублікі ведае, што ўсё здабытае ўкраінскім народам у рэвалюцыйнай барацьбе павінна належаць народу, і таму, каб збудаваць моцную ды вольную Ўкраінскую Рэспубліку, у праграму свае чыннасьці пакладае такія падваліны.

Першая падваліна: *самастойнасьць і незалежнасьць Украінскае Народнае Рэспублікі,*— каб ніхто з блізкіх ды далёкіх суседзяў не замахваўся на наша самастойнае дзяржаўнае жыцьцё ды дабрабыт украінскага народу.

Другая падваліна: *перадача* земляў скарбовых і ўсіх буйных уласьнікаў *бяз выкупу* ў рукі сялянства.

Трэцяя падваліна: поўнае забесьпячэньне працоўнае клясы, як таго па-

трабуюць інтарэсы самых працоўных ды інтарэсы рэспублікі,— *8-гадзінны працоўны дзень і страхаваньне працоўных.*

Чацьвертая падваліна: *агульнае, роўнае, таемнае, непасрэднае, прапарцыйнае* права абіраць сваіх прадстаўнікоў ва ўсе ўстановы *народнае ўлады.*

Пятая падваліна: *мір, добрае сужыцьцё з усімі* народамі сьвету ды завязваньне зь імі гандлёвых дачыненьняў, каб забясьпечыць украінскае насельніцтва ўсім неабходным: *сыравінай, сольлю, нафтай, скурай, жалезам, тканінамі* й г. д.

Каб канчаткова збудаваць ды скончыць будоўлю Ўкраінскае Дзяржавы, Урад Рэспублікі пры першай магчымасьці *скліча Вялікую Дзяржаўную Раду,*— якая назавецца ўкраінскім *Парлямантам з устаноўчымі функцыямі,* у склад якога ўвойдуць прадстаўнікі найшырэйшых колаў *украінскага грамадзтва.* Гэты *парлямант,* а ня хтось іншы, вырашыць справу нашага дзяржаўнага ладу й дасьць нарэшце *спакой, згоду й моц Дзяржаве.*

Войска ўкраінскае, абараняючы інтарэсы народу, *мусіць весьці і надалей вызвольную барацьбу.* Разам зь ім змагаюцца й нашыя браты, галіцкія ўкраінцы (а не аўстрыякі,— як клічуць дурныя людзі); змагаюцца, каб агульнымі сіламі здабыць лепшую долю ўсім нам, сыном *Саборнае Адзінае Ўкраіны.*

СЯЛЯНЕ, ПРАЦОЎНЫЯ І ЎВЕСЬ НАРОДЗЕ ЎКРАІНЫ!

Ня верце новым акупантам Украіны — дзянікінскім дабрахвотнікам. Гэта тыя «гетманцы», якія летась катавалі вас і накладалі на вас кантрыбуцыю, толькі ў іншай шкуры. Яны разам з расейскімі памешчыкамі ды жандарамі хочуць зноў запрэгчы вас у панскае ярмо, адабраць ад вас зямлю, яны хочуць зноў завесьці царызм, які душыў нас сотні гадоў. Гэтыя чарнасоценцы распускаюць чуткі, нібыта мы, украінцы, ідзем разам зь імі. Гэта хлусьня...

Будзьце сьвядомымі, не давайце веры нікому, хто будзе дурыць вас, што нібы *Пятлюры* й ягонага войска ўжо няма, украінская справа ўжо заснула. *Пятлюра, Украінскае Рэспубліканскае войска, Украінскі Сацыялістычны ўрад ёсьць.* Яны будуць жыць і працаваць датуль, пакуль жыць будзе рыцарскі вальналюбны *Народ Саборнае Ўкраіны,* і яшчэ добра дадуцца ў знакі ўсім ягоным ворагам. Не губляйце ж духу, шукайце праўды ў сваёй грамадзе й ведайце, што з вашай дапамогай усе нашыя ворагі будуць раструшчаныя ўшчэнт, а мы, запанаваўшы ў сваёй старонцы, збудуем такую Дзяржаву,— дзе мы — сам Народ,— будзе кіраваць сваім жыцьцём.

Розум і сумленьне, зброя й праца — парука таму.

Галоўны Атаман усіх войскаў Украінскае Народнае Рэспублікі.

Пятлюра.

У Стаўцы году 1919, дня 17, м-ца верасьня.

Зь ліста да Івана Агіенкі

...Надаючы справе арганізацыі ўкраінскай царквы вялікае значэньне з гледзішча дзяржаўнага, я, азіраючы пройдзены ёю шлях, прыходжу да высноваў, што мы не прадумалі да лягічнага канца пастаўленага перад украінскаю дзяржаўнасьцяй пытаньня пра нацыяналізацыю нашае царквы. Мы бачым яе ў гэтак званай аўтакефаліі. Гэта альгебрычная формула, якую можна вырашаць па-рознаму. Справу аўтакефаліі царквы можна разумець па-ўсякаму, як з гледзішча тэарэтычна-кананічнага, так і з гледзішча царкоўнай практыкі. На маю думку, гэтая справа нашымі царкоўнымі дзеячамі не раскрытая як сьлед, не канкрэтызаваная, а што да свайго ерархічнага зьместу (дагэтуляшняга), то да канца не даведзеная. Мы мяркуем, што як будзем мець уласных япіскапаў, дык гэтым ужо ставім царкву на цьвёрдую аснову, зь якой ніякія палітычна-царкоўныя канфлікты яе ня ссунуць. Далей уласнага мітрапаліта ў сталічным горадзе нашыя аўтакефальныя мары і змаганьні ня йдуць і па-за «вышэйшую царкоўную раду»

пры тым жа мітрапаліце не сягаюць. Наколькі памылковыя і аблудныя такія мары, паказала нам практыка часоў Скарападзкага, якая аўтакефальным змаганьням украінскай царквы адразу ж надала цалкам процілеглы зьмест, абвясьціўшы залежнасьць нашай маладой царквы ад маскоўскага патрыярха, тым самым абярнуўшы ў нішто самую ідэю аўтакефаліі, а маястат галавы маскоўскай царквы ўзьняўшы да становішча фактычнага зьверхніка нашае царквы. Калі зважаць на значнасьць палітычных момантаў такой залежнасьці, то мы прыйдзем да высновы, што гэткая залежнасьць будзе ўсё зьвязваць — і палёт, і разьвіцьцё як царкоўнай, так і палітычна-дзяржаўнай думкі ўкраінскай нацыі. Якімі б пасьпяховымі ў будучыні ні былі нашыя здабыткі й дасягненьні ў роўніцы палітычнай барацьбы, усё адно ідэю нашай дзяржаўнай незалежнасьці будзе зьвязваць вось гэтая залежнасьць у роўніцы царкоўнай, гасячы і падцінаючы самастойніцкія змаганьні нашага народу. Нацыя, якая імкнецца да ўласнага дзяржаўнага жыцьця, ня можа зьмірыцца з такою залежнасьцяй. На прыкладзе сербскай праваслаўнай царквы мы бачым, што пры першай магчымасьці, разам з зацьверджаньнем палітычна-дзяржаўнай самастойнасьці, праводзіцца зацьверджаньне і царкоўнай незалежнасьці ў форме арганізацыі ўласнага патрыярхату, тым самым ставячы сапраўды належную «кропку» над справай аўтакефаліі сербскай царквы і ўзносячы ейны маястат да найвышэйшай ступені.

Спыняючыся над справаю аўтакефаліі ўкраінскай царквы, я мяркую, што мы павінны цалкам пасьлядоўна раскрыць зьмест гэтай формулы і зрабіць лягічныя высновы зь яго. Відавочная рэч, што прадыктаваныя палітычнымі момантамі кіеўскія ўхвалы 1918 г., якія ўсталявалі залежнасьць нашай царквы ад маскоўскага патрыярха, будуць належнымі пастановамі часовых вышэйшых органаў украінскай царквы (у форме сабораў) скасаваныя. Але я мяркую, што гэтым скасаваньнем справы суцэльнай аўтакефаліі нашай царквы мы на непахісны грунт яшчэ не паставім; неабходна пайсьці далей і надаць самастойніцтву нашай царквы такія формы, якія б адпавядалі дзяржаўным інтарэсам украінскай нацыі і былі б лягічным завяршэньньем самой ідэі пра царкоўную аўтакефалію.

...Калі ерархічныя моманты апошняй [украінскай царквы] будуць увасобленыя толькі ў форме ўласных епіскапіяў, а на чале інстытуту япіскапаў будзе стаяць мітрапаліт кіеўскі,— гэтага, на маю думку, ня будзе дастаткова для таго, каб украінская царква стала нароўні, ва ўсьведамленьні і нашым, і іншых народаў, зь іншымі праваслаўнымі цэрквамі. Пры гэтых умовах царква Андрэя Першапазванага заўсёды будзе «ў хвасьце», ніколі ня будзе мець таго аўтарытэту, тае пашаны, якія ёй павінны належаць як з матываў дзяржаўных, так і з матываў царкоўнай гістарычнай традыцыі, як да царквы, першапазваным Ісуса Хрыста апосталам заснаванай. Я прадбачу большыя ўскладненьні для нашай справы, што вынікаюць з гэткай незавершанай, маўляў, «палавіністай ерархічна-арганізацыйнай структуры ўкраінскай царквы». Гэтая структура не дае гарантыі выкананьня патрабаваньняў царкоўнай дысцыпліны найвышэйшымі дастойнікамі нашае царквы, адкрывае магчымасьці адцэнтравых імкненьняў зь іхнага боку, царкоўна-палітычнага авантурызму, г. зн. дае магчымасьці для рэцыдыву ў маладой украінскай царкве зьяваў, што выпустошваюць нутраную сілу царквы, яе адпорнасьць, яе вонкавы маястат, зьяваў, вядомых у нашай царкоўнай гісторыі: 1) падчас увядзеньня вуніі і 2) у часе падпарадкаваньня нашай царквы пад зьверхніцтва царквы маскоўскай.

І, як прычынаю страты нашае дзяржаўнае незалежнасьці, акрамя эканамічна-палітычных прычынаў, была незавершанасьць працэсу кансалідацыі ўкраінскай нацыі падчас сьмерці гетмана Багдана, адсутнасьць у гэтых наступнікаў адзінай дзяржаўнай *ідэялёгіі,* якая б мела аб'ектыўную каштоўнасьць для ўсіх клясаў тагачаснай украінскай нацыі,— так прычынаю страты ўкраінскаю царквою тагачаснай аўтакефаліі была адсутнасьць адзінай царкоўнай думкі ў найвышэйшых ейных дастойнікаў, адсутнасьць адпаведнай дысцыпліны сярод іх і не завершаная як сьлед арганізацыйная структура нашае тагачаснае царквы, галава якой — мітрапаліт кіеўскі — меў больш маральную сілу

для нашай царквы, чым ерархічна-фактычную. На мой погляд, будучая ерархічная структура ўкраінскай царквы, наколькі можна пра яе меркаваць на падставе дагэтуляшняй практыкі і паколькі ня будуць зробленыя адпаведныя карэктывы да яе, хавае ў сабе і нутраную «чарваточыну» і ня дасьць гарантыяў безупыннага разьвіцьця нацыянальнай царквы. Калі ўзяць будучыя дачыненьні нашае царквы з сугучнымі сабе, хаця б з грэцкаю, царгародзкаю ці сербскаю, то тут будзе мець месца няроўнасьць; на нашую царкву, на найвышэйшых прадстаўнікоў яе і на галаву яе, мітрапаліта, патрыярхі іншых цэркваў увесь час будуць пазіраць «згары», адпаведным чынам трактуючы і нашую царкву, што для ейнага аўтарытэту, маястату было б непажаданым, а з боку дзяржаўных інтарэсаў нават шкодным. Гэтаксама і для культываваньня аўтарытэту царкоўнай ярархіі сярод царкоўных колаў, сярод вялікай украінскай дзяржаўнай парафіі фігура мітрапаліта як галавы — узначаленьня нашае царквы была б мала імпанавальнаю. Дый, па сутнасьці, калі хочам надаць украінскай царкве, як царкве апостала Андрэя Першапазванага, адпаведнае ёй значэньне, то мы павінны моманты, зьвязаныя з гэтым заданьнем, прадумаць да лягічнага канца і ўвасобіць у такую вонкавую форму, якая адпавядала б таму зьместу, што ў ёй і ў ейным гістарычным атрыбуце зьмяшчаецца.

Я думаю, што ўкраінская аўтакефальная царква павінна сваім галавою мець *уласнага* патрыярха, як цалкам лягічнае завершаньне ейнай ерархічнай архітэктонікі і эвалюцыі нашай нацыянальнай думкі, нашай нацыянальна-царкоўнай ідэялёгіі.

Украінскі патрыярх — роўны патрыярху маскоўскаму — гэта справа, патрэба ў якой вымагаецца інтарэсамі ўкраінскай царквы й своечасоваю ацэнкаю тых небясьпекаў, якія будуць паграджаць — я прадбачу гэта — у яе натуральным разьвіцьці. У магчымых канфліктах нашае дзяржавы з Масквою нутрана моцная, ерархічна здысцыплінаваная ўкраінская царква можа адыграць вялікую пазытыўную ролю ў наступствах такой барацьбы. У зносінах, у пашырэньні свайго маральнага ды іншага ўплыву на праваслаўныя цэрквы (грузінскую, беларускую, польскую, латыскую, армянска-грыгарыянскую) дзяржаваў, узьніклых на месцы старой Расеі, *такая ўкраінская* царква, як я хацеў бы ў магчымай блізкай будучыні яе ўявіць, магла б гэтаксама дапамагчы ўзмацненьню ды ўплыву нашай дзяржаўнасьці, ня кажучы ўжо пра тыя набыткі, якіх гэтым шляхам і для свае сілы яна можа дасягнуць.

Выказваючы вось гэтыя мае меркаваньні ў такой важкай справе, я мала раблю сабе клопату з таго, што яны прыходзяць у галаву сярод такіх неспрыяльных абставінаў. Не аглядаючыся на апошнія, мы павінны мець яснасьць і pia desideria нашага дзяржаўнага будаўніцтва, інтэгральнаю часткаю якога ёсьць і плянавае будаўніцтва ўкраінскай царквы. Такой — дакладна, да дэталяў прадуманай праграмы — мы ня мелі; і гэта, з майго погляду й дасьведчаньня, было адною з галоўных нашых няўдачаў. Мусім усё зрабіць, каб гэтая ідэя перамагла, стала элементарна зразумелаю, знайшла сваіх актыўных адэптаў і абаронцаў. Я ўпэўнены, што ідэя ўласнага патрыярхату, як найбольш мэтазгоднай ерархічнай формы ў арганізацыі ўкраінскай аўтакефальнай царквы, носіцца ў сьведамасьці ці, можа, у напаўсьведамасьці нашых царкоўных колаў, шукаючы толькі стымулу, імпульсу для свайго выяўленьня й крышталізацыі.

19 сьнежня 1921 г.

Прадмова і пераклад
Сяргея СМАТРЫЧЭНКІ

Віктар ДОЛЬНІК

ЭТАЛАГІЧНЫЯ ЭКСКУРСІІ ПА ЗАБАРОНЕНЫХ САДАХ ГУМАНІТАРЫЯЎ

Вандроўка па гісторыі з падручнікам эталогіі

Высветліўшы ў папярэдніх частках, як уплываюць на паводзіны людзей інстынктыўныя праграмы, уласцівыя чалавеку як біялагічнаму віду, як страката і блытана пераламляюцца яны ў нашай свядомасці, мы маем права паспрабаваць прыкласці атрыманыя веды да гісторыі створаных чалавецтвам дзяржаваў і да тых тэорыяў, якімі імкнуліся растлумачыць іхнае ўзнікненне. Эталагічнае гледзішча не можа быць вычарпальнае ці цалкам правільнае. Ягоная вартасць — у іншым падыходзе.

АЎТАКРАТЫЧНЫЯ РЭЖЫМЫ АБАПІРАЮЦЦА НА ІНСТЫНКТЫЎНЫЯ ПРАГРАМЫ

Багацце і галеча імперыяў. Гісторык і этолаг па-рознаму ўспрымаюць магутныя аўтакратычныя ды таталітарныя дзяржавы мінулага й сучаснага. Гісторыку гэтыя шматпрыступкавыя іерархічныя ўтварэнні бачацца ў дасягненнях розуму, цудоўнай арганізацыі, геніяльных цароў і правадыроў. Яны ўзвышаюцца над арганізацыяй іншых плямёнаў і народаў, нібы егіпецкія піраміды ў барханах.

Для этолага — гэта прымітыўныя самаўтвораныя структуры, што разрасліся да вялізных памераў. Іх стварылі не геніі, а «паханы». Самазбор геаметрычна дасканалых структураў бывае і ў нежывой прыродзе. Кожны мог назіраць, як у насычаным растворы самазбіраюцца прыгожыя крышталікі. Хто не захапляўся мудрагелістай формай сняжынак, што ўтвараюцца з пары вады ў паветры! Вада мае некалькі варыянтаў (праграмаў) самазбору, таму ў залежнасці ад знешніх умоваў утвараюцца розныя сняжынкі.

У выніку інстынктыўных праграмаў людзі самазбіраюцца ў іерархічныя піраміды, што амаль непазбежна, як і ўтварэнне крышталікаў. Калі задзейнічаць увесь шэраг іерархічных праграмаў, людзі могуць стварыць вялізных маштабаў, але прымітыўную структуру супадпарадкавання — аўтарытарную

Пачатак у №№ 2, 3, 1994 г.
Пераклад з расейскай мовы паводле часопіса «Природа», № 3, 1993 г.

імперыю. Гэтая структура зусім не самая лепшая для кожнага чалавека і ўсіх разам ці самае эфектыўнае ды правільнае з таго, што маглі стварыць людзі. Яна — самае простае. З эталагічнага гледзішча, стварыць аўтакратычную дзяржаву — гэта не ўзняцца на вяршыню, дзеля чаго патрэбныя дакладна скіраваныя намаганні, а скаціцца ў лейку, калі можна ці нічога не рабіць, ці дзейнічаць няправільна, боўтацца. Думка нечаканая, але прадуктыўная.

«Чалавек — жывёла палітычная»,— напісаў некалі Арыстоцель, знаўца жывёлаў ды стваральнік заалогіі. Палітычнае — гэта поліснае, што ўтварае структуру іерархічна сфармаванага паселішча, як мурашка — жывёла мурашкавая, азёрная чайка — каланіяльная, мядзведзь — тэрытарыяльная, бусел — сямейная.

Калі падсвядомасць вызначае свядомасць. Мы пазнаёміліся з уладаю як праявай іерархічных законаў. Але між людзьмі існуюць яшчэ і матэрыяльныя дачыненні. Як жа было ў продкаў? У калектыўных насякомых складана арганізаваны, з падзелам працы, вытвар ежы ды будаўніцтва значаць усё. У прыматаў жа інакш (чалавек — выключэнне). Але некаторыя матэрыяльныя стасункі між імі існуюць. Яны маюць інстынктыўную аснову, якая, без сумлеву, зрабіла сваё, калі чалавек распачаў вытвар матэрыяльных дабротаў.

Колішнія ўяўленні пра доўгія сотні тысячаў гадоў паляванняў на буйных звяроў, а таксама і спрэчкі гуманітарыяў пра тое, як дзялілі продкі чалавека здабычу, цяперака сталі анахранізмам. Перыяд Вялікіх Паляванняў быў кароткім шчаслівым імгненнем, яго прайшло не ўсё чалавецтва, і паляўнічыя амаль паўсюль вымерлі, а не ператварыліся ў земляробаў. Падчас тых больш чым паўтара мільёнаў гадоў, пакуль адбывалася біялагічная эвалюцыя продкаў разумнага чалавека, тушы жывёлаў не здабывалі, а знаходзілі. Што робяць у такім выпадку звяры ды птушкі ў добра вывучанай саванне, ведама: яны ахоўваюць знаходку, хутка яе разбіраюць, расцягваюць кавалкамі і ядуць, колькі ўлезе. Захоўваць ці цягаць з сабою няз'едзенае няма сэнсу. Тамака нават прайду (устойлівай групе) леваў ды леапарду не заўсёды ўдаецца ўсцерагчы здабычу ад гіенаў ды гіенавых сабакаў. А грыфы ды сіпы бачаць усё зверху. Слабым, невідушчым у цемры людзям (нам цяперака ведама, што ні вогнішчаў, ні сабакаў яны не мелі) цярпець дзеля рэшткаў ежы напады зграяў гіенаў ці нават лева-адзінца, які таксама харчуецца чужымі недаедкамі, было б глупствам.

Вялікія запасы харчу ўпершыню, відаць, з'явіліся ў раслінагадоўчых папуляцыях па зборы ўраджаю. З прычыны разнароднага размеркавання прыдатных на сяўбу дзялянак ды прывязкі да іх, у такіх групах мусела слабнуць абарончая структура. Вось тады імі, разам з уласнасцю, і магла завалодаць іерархічна з'яднаная група людзей, якія нічога не вырабляюць. Яна магла выступіць як захопнік, а магла як дабрахвотна-прымусовы абаронца ад іншых захопнікаў. Яна магла быць тутэйшаю, з гэткай жа гаворкаю, а магла быць і прышлаю.

З якімі ж прыроджанымі праграмамі людзі маглі ўступаць у эканамічныя ўзаемадачыненні? З тымі, што мелі іхныя продкі заўсёды.

Шэсць спосабаў прысвоіць чужое. Амаль усе віды калектыўных жывёлаў маюць шэсць прыроджаных праграмаў здабывання чужога дабра.

Першая — захоп крыніцы дабротаў: разнастайнага на корм месца, пладаносных раслінаў, статка маларухомых жывёлаў, трупа, вады ды г. д. Захопленае дабро трымаецца сілай: і ўсіх, каго здолеюць прагнаць, праганяюць. Дзеянне гэтай праграмы можна назіраць, калі сініцы змагаюцца за кармушку. Пасля некалькіх сутычак ёю авалодвае самы настырны самец і нікога не падпускае да ежы. Сініцы — прыклад усім ведамы, але вельмі просты. Некаторыя віды маюць больш вытанчаныя прыёмы ўтрымання крыніцы дабротаў, асабліва калі гэта робіцца гуртам. У чалавека такая праграма выяўляецца яшчэ ў дзяцінстве. Зазвычай крыніцу дабротаў утрымлівае моцная асобіна, і ўжо сам факт валодання ёю — прыкмета сілы ды ўлады.

Другая — адбіранне чужой уласнасці сілком, скарыстоўваючы сваю фізічную перавагу (рабаўніцтва). Дзеці рабуюць раней, чым пачынаюць гаварыць.

Трэцяя — адбіранне дабротаў у ніжэйшых рангам без сутычак, «па праву» дамінавання. Гэта — адзін са спосабаў усталявання іерархіі (некаторыя віды

так робяць заўжды, хаця б сымбалічна). Гэтак паводзяць сябе і калектыўныя малпы. Падпарадкаваныя асобіны не толькі пакорліва аддаюць усё дамінанту, але й апярэджваюць ягоны гнеў, «кожны сам яму прыносіць ды дзякуй гаворыць». Адразу нават не даўмеешся, даніна гэта ці падарунак. Шмат цікавага ды прыкрага ўзнікла на гэтай глебе ў людзей. Заўсягды начальнікі вымагалі «падарункі». Колькі стэлаў захавалася з пералікам ды выявамі падданых, што стаяць доўгім гужам з данінай тырану.

Нам важнае іншае: перадача дароў знізу ўверх па іерархічнай пірамідзе «натуральная» для людзей у тым сэнсе, што мае добра адпрацаваную інстынктыўную аснову.

Чацвёртая праграма раздабывання чужой уласнасці — крадзеж. Ён прынцыпова адрозніваецца ад рабавання, бо робіць гэта асобіна ніжэйшага рангу. Таму жывёлы крадуць таемна, строяць розныя хітрыкі, а потым уцякаюць ды хаваюць здабычу ці з'ядаюць. Калі ў жывёлы запускаецца праграма зладзейства, дык яна адразу папярэджвае пра забарону: зловяць — адлупцуюць. Зладзейства ў малпаў з прычыны жорсткай структуры квітнее на ўсю моц. Чалавек — таксама істота памаўзлівая.

Пятая праграма — папрашайніцтва. На гэта здольныя амаль усе жывёлы. Згадайма заапарк: гэта збор папрашаек розных відаў. Часцяком пастава папрашайніцтва імітуе паставу дзіцяняці, якое выпрошвае ежу. Малпы — заўзятыя папрашайкі, гэта ўсім ведама. Просяць яны вельмі настойліва і з такою жальбою, што не даць ім немагчыма. Папрашайніцтва заўсягды адрасаванае наверх: ці звернута да таго, хто захапіў крыніцу дабротаў, ці да больш моцнай асобіны, ці роўнай па рангу. Без сумлеву, выпрошваюць у асноўным малпы, якія знаходзяцца ўнізе. У чалавека папрашайніцтва развіта мацней, ніж у малпаў: мы заўсёды просім што-небудзь ці вымушаныя прасіць.

Урэшце, шостая праграма — абмен. Ён распаўсюджаны між малпамі ды груганамі. Мяняюцца жывёлы аднаго рангу. Малпы ды крумкачы заўжды імкнуцца схлусіць: яны маюць хітрыя праграмы, як абдурыць супольніка, падсунуць яму не тое, захапіць абодва прадметы, якімі мяняліся, ды г. д. У чалавека абмен таксама развіты, і падсвядомы ягоны бок — выгада («не схлусіш — не прадасі»). Сумленны ўзаемавыгадны абмен — пазнейшае дасягненне розуму, што змагаецца з махлярскай інстынктыўнай праграмай.

Чыё аблічча мае сацыялізм! У мінулым стагоддзі, калі пра жыццё малпаў ведалі няшмат, звесткі пра тое, як яны дзеляцца ежаю, у некаторых выклікалі замілаванне. Варта развіць гэтую звычку — і атрымаеш грамадства справядлівага размеркавання ў продкаў чалавека. У нашым стагоддзі некаторыя ўпрошвалі заолагаў: знайдзіце «зародкі», яны вельмі патрэбныя на падмурак Правільнага Вучэння! Але дарэмна. Не знайшлі. Затое выявілі іншае. Іерархі статкавых малпаў ніколі не дзеляцца з іншымі самцамі тым, што здабылі самыя. Яны раздаюць адабранае, прычым тое, што самому не патрэбна. Вандроўнае жыццё вымагае: калі не з'еў ці не схаваў за шчоку, кідай ці «размяркоўвай». Адорваюць «шэсцёрак» ды самых прыніжаных папрашаек, часцяком некалькі разоў даюць падачку і зноў адбіраюць. Гэткая працэдура — не клопат, а яшчэ адзін спосаб прадэманстраваць іерархічную перавагу.

Этолагі правялі над малпамі шмат доследаў дзеля вывучэння матэрыяльных дачыненняў. Калі павіянаў у загоне навучыць замыкаць куфэрак, яны адразу сцямяць, як зручна захоўваць у ім пажыткі. Дамінант, маючы куфэрак, назапашвае адабранае і нічога не раздае. Калі ўсе атрымліваюць па куфэрку — дамінант збірае іх ля сябе. Другі доследх: малпаў навучылі качаць пэўны час рычаг і мець за гэта жэтон, на які можна праз аўтамат купіць тое, што за шклом. Суполка адразу падзялілася: адны зараблялі жэтон, астатнія жабравалі ля аўтамата, а дамінанты — рабавалі, прычым сцямілі, што адбіраць жэтоны, якія можна хаваць за шчакою, лепш, ніж купленую працаўніком харч. Апошнія таксама падзяліліся на два тыпы: адны працавалі на запас і збіралі жэтоны, іншыя, атрымаўшы іх, адразу праядалі. Бегам часу працаўнікі, якіх рабавалі дамінанты, адчаіліся ды таксама пачалі працаваць на адзін жэтон і адразу яго расходаваць. З доследаў вынікае: на грунце сваіх інстынктыўных праграмаў прыматы камунізму не будуюць. Яны будуюць заўсёды адно і тое — «рэальны сацыялізм».

Правобраз «дзяржавы новага тыпу». Гісторыкі ды мысліцелі XIX ст. лічылі першымі дзяржавамі нявольніцкія дэспатыі Сярэдняга Ўсходу. Нам жа цяперака ведама, што дэспатыям папярэднічалі палацы-дзяржавы — на Сярэднім Усходзе, у Міжземнамор'і, Індыі, Кітаі, а таксама на Амерыканскім кантыненце (што вельмі важна, бо гэта незалежныя цывілізацыі). На сёння яны самыя першыя дзяржавы ў гісторыі чалавецтва. Іхнае ўладкаванне напачатку падавалася дзіўным: у цэнтры — вялікая будыніна, лабірынт нейкіх збудаванняў. Па часе выявілася, што гэта ўсялякія склады. Некаторыя дзяржавы мелі пісьмовасць, здабыткі якой займаюць частку памяшканняў — архівы. Змест тэкстаў ведамы: парады — што, дзе, калі сеяць, жаць, даіць, колькі чаго паставіць у засекі, калі, каму, якія будаўнічыя ды транспартныя работы выконваць. Рабілі ўсё гэта навакольныя паселішчы, дзе магло сяліцца тамтэйшае жыхарства, у якога адабралі права на ініцыятыву, напаўвольныя прыгонныя, заваяваныя абарыгены, здабытыя падчас вайны дзяржаўныя нявольнікі,— не надта важна. Кіравала імі (дзеля іхнага шчасця, вядома), пабудаваная паводле іерархічнага прынцыпу, цэнтралізаваная сістэма чыноўнікаў. На вяршыні піраміды месцілася, мабыць, некалькі чалавек. Калі цар і быў, дык толькі вайсковым правадыром. Фармальна ўласнасць знаходзілася ў руках дзяржавы, чыноўнікі ж толькі вялі ўлік, збіралі ды... гнаілі (пра гэта сведчаць раскопкі складаў). З чатырох дзеянняў арыфметыкі ім хапала двух: адняць ды падзяліць. Гэткая эканамічная сістэма складаецца вельмі лёгка з тых інстынктаў-кубікаў, якія маюць прыматы, ды ім адпавядае, падобна да таго, як структура ўлады складаецца з іерархічных кубікаў.

Час сцёр дзяржавы-засекі. Але калі ў нашым XX ст., тэхнічна больш дасканалым, людзей прымусілі будаваць свае краіны паводле ўтапічнага, г. зн. невыканальнага праекту, яны пабудавалі тое, што змаглі. Гэта неэфектыўная звышцэнтралізаваная сістэма, у якой пазбаўленыя ўласнасці ды ініцыятывы «масы» дрэнна працуюць, жабрачаць, крадуць, а вялізная адміністратыўная піраміда, што ўзвышаецца над імі, рабуе ды паглынае шмат з адабранага ў засекі. Такая сістэма — адпаведнік дзяржаваў-палацаў, пабудаваных на заранку гісторыі. Як бачым, інстынкты, што ператвараюць гэткую прывабную на паперы ідэю сацыялізму ў вырадка, захаваліся, нідзе не падзеліся за 3—5 тыс. гадоў.

«Рэальны сацыялізм», як усялякі нізкі стан, падобны да лейкі: туды проста скаціцца, але вельмі цяжка выкараскацца. Таму крах камуністычнай ідэалогіі ў сацыялістычных краінах хутка нічога не зменіць. Ім давядзецца яшчэ доўга боўтацца ў шчамлётках сацыялістычнай эканомікі. Усё адно, якімі «несацыялістычнымі» словамі будзе менавацца гэты стан.

Ведамы адзін спосаб супрацьстаяння гэтым інстынктам. Аснову грамадства павінны складаць незалежныя вытворцы, якія маюць нешта сваё (зямлю, хату, прылады працы, акцыі ды г. д.) дзеля таго, каб пачуццё ўласнай годнасці ды ўпэўненасць у сваёй сіле былі зыходным пунктам, калі мозг неўсвядомлена выбірае адпаведныя праграмы паводзінаў.

Менавіта грамадства свабоднага прадпрымальніцтва здольнае ажыццявіць у прымальнай людзям форме болей сацыялістычных ідэалаў, ніж грамадства «рэальнага сацыялізму».

Камуністычная ідэя нязбытная менавіта таму, што не адпавядае нашым інстынктыўным праграмам. Гэткае грамадства немагчымае для людзей нават на кароткі тэрмін. Дзеля яго патрэбны іншы чалавек. Але іншага няма.

Калектыўныя насякомыя (тэрміты, восы, пчолы, мурашкі) маюць інстынктыўныя праграмы, што дазваляюць утварыць «камуністычнае грамадства», дзе пануюць разумныя правілы паводзінаў, а ежа размяркоўваецца адпаведна патрэбам кожнага. Між імі магчымая камуністычная цывілізацыя. Але ж будаўнікі сацыялізму ці свабоднага прадпрымальніцтва пацярпелі б паразу, каб з'явіліся тамака. Бо мурашкі — жывёлы мурашкавыя, а не палітычныя. Арыстоцель зразумеў, што паводзіны чалавека абумоўленыя ягоным першабытным, жывёльным мінулым. Шмат хто ў выразе «чалавек — жывёла палітычная» шукаў таемны, алегарычны сэнс, абыходзячы літаральны.

Крытыка нячыстага розуму. Арыстоцель жыў, калі на Балканах дэмакратычныя дзяржавы знікалі адна за адной, саступаючы алігархіі, а македонскія цары Філіп ды ягоны сын Аляксандр пачалі ствараць аўтакратычную імпе-

рыю з замахам на сусветную. Так што Арыстоцелю было ведама, што аўтакратыя ды алігархія — не адзіныя формы ўзаемадачыненняў, на якія здатная «таварыская прырода чалавека». Яна здольная стварыць і дэмакратыю. Але пра гэта потым. А зараз згадайма, да чаго дадумаліся за 2,5 тысячы гадоў тыя філосафы, якія лічылі дэмакратыю выпадковым тупіковым эпізодам антычнай гісторыі, а галоўным шляхам чалавецтва падавалася іерархічная дзяржава. А дадумаліся яны (І. Кант і іншыя нямецкія філосафы) да «арганічнай тэорыі». Паводле яе, дзяржава і права не плён чалавечага досведу і разумовай дзейнасці людзей, а нібыта нейкі надарганізм, створаны богам. Яна мае пірамідальную структуру на чале з манархам, пажадана адукаваным і абавязкова з неабмежаванаю ўладаю.

Гэтая тэорыя дае этолагам адно неакрэсленае ўсведамленне таго, што прынцыпы, паводле якіх збіраецца піраміда, і характар дзеянняў людзей (іхная мараль, этыка, права) імі не прыдуманыя, а закладзеныя нібыта першапачатна. Кім? Кант меркаваў, што богам, а этолагі — што інстынктыўнымі праграмамі, атрыманымі намі ад продкаў, якія жылі ў іншых умовах.

Этолагам ведама, што гэтыя праграмы недасканалыя, не ўсе прыдатныя сучаснаму грамадству, а некаторыя нават гнюсныя; філосафы ж палічылі іх за ідэальныя, вельмі дасканалыя. З нашага з вамі гледзішча, кіруючыся гэтымі праграмамі, пабудуеш нешта агіднае ды крывавжэрнае, а з гледзішча філосафаў — ідэальную дзяржаву ўсеагульнага дабрабыту.

Далейшы развой згаданага кірунку філасофскай «думкі» відавочны: дзеля паспяховага стварэння гэткай дзяржавы ёй трэба надаць (ці ўзяць самой) неабмежаваныя паўнамоцтвы над людзьмі, узвысіцца над законамі, нават уласнымі. У XX ст. Мусаліні ды Гітлер атрымалі мажлівасць праверыць на людзях тэорыю падобнай дзяржавы, а Ленін, Сталін ды іхныя шматлікія наступнікі ў многіх краінах стварылі таталітарныя дзяржавы. Аграмадныя доследы на сотнях мільёнаў людзей паказалі, што на грунце татальнага падпарадкавання грамадства іерархічнаму прынцыпу ўзнікае пачвара, што паглынае людзей.

На жаль, досвед мала дае чалавецтву. Таму таталітарныя рэжымы будуць узнікаць зноў і зноў, калі не змагацца з імі. Бо яны рэгенеруюць ды самазбіраюцца.

ДЭМАКРАТЫЯ — ПЛЁН РОЗУМУ, АЛЕ НЕ ТОЛЬКІ ЯГО

На наша шчасце, іерархічныя праграмы зносінаў — не адзіныя праграмы зносінаў, закладзеныя некалі ў нас натуральным адборам. Існуюць альтэрнатыўныя праграмы, на падставе якіх мы можам ладзіць іншыя стасункі.

Абдымкі ды ўсмешкі. Усе малпы лёгка ўзрушваюцца, яны зласлівыя, агрэсіўныя, крыўдлівыя, злапамятлівыя. Але пры гэтым вельмі таварыскія. Супярэчлівае спалучэнне. Нядзіва, што яны маюць шмат спосабаў аслабляць канфлікты. Між рытуалаў вітання, усмешак, паляпвання па спіне, выдавання ежы асаблівая роля надаецца абдымкам. Нашыя бліжэйшыя цяперашнія сваякі — шымпанзэ — вельмі любяць абдымацца. Яны могуць доўга сядзець у абдымку і атрымліваць ад гэтага задавальненне, супакаенне. Найчасцей шымпанзэ абдымаюць адно аднаго, каб папярэдзіць раздражненне, крыўду. І паспяхова. Чытачам ведамы адзін від гэтых малпаў, але існуе іншы від (ці падвід) — карлікавы шымпанзэ. Ён вельмі лагодны і ўсміхаецца, як добразычлівае, шчаслівае дзіця. Карлікавыя шымпанзэ жывуць гуртам, захоўваюць іерархію, але ейнае высвятленне адымае няшмат часу. Аднак яны падоўгу супакойваюць, улагоджваюць адно аднаго ўсмешкамі, абдымкамі, чысцяць поўсць, «вышукваюць вошы» ў галаве.

Усе гэтыя праграмы супакойвання (і перабіранне валасоў на галаве) мае і чалавек, і ён умее імі карыстацца. Людзі, як і карлікавыя шымпанзэ, здольныя ладзіць адносіны, дзе агрэсіўнасці амаль няма, іерархія не перашкаджае дружалюбным прыемным сувязям. Адпаведныя традыцыі ды выхаванне дазваляюць шмат чаго дасягнуць. Некалі амерыканцы ўведалі магічны эфект адной з усмешак чалавека. Ейнае адлюстраванне было ўсюды, ёю ўсміхаліся самыя знаныя ў краіне людзі. Шыльдачкі «Усміхніся!» з'явіліся на дзвярах установаў, касах крамаў. Мінуў час — і Амерыка навучылася ды прызвычаілася ўсміхацца. Напачатку амерыканская задума еўрапейцам падалася дзіўнаю, нават крыва-

душнай. Калі ж пабачылі вынік — змяншэнне агрэсіўнасці, і яны пачалі вучыцца магічнай усмешцы. Сакрэт у тым, што, калі два чалавекі ўсміхнуцца адно аднаму, іерархічная праграма кожнага ўспрымае ўсмешку як лагодную, але ўпэўненую гатоўнасць да адпору, а другая праграма — як заахвочванне. У выніку «недзе тамака» прымаецца падсвядомае рашэнне: можна не баяцца, усё абыдзецца без высвятлення іерархічнага становішча, можна палічыць сустрэчнага за роўнага сабе.

Пра свой ранг можна не клапаціцца. Этолагі выявілі: у некаторых відаў калектыўных жывёлаў ёсць асобіны, якія ўхіляюцца ад іерархічных сутычак. Не таму, што баяцца — ім гэта не цікава. Многіх людзей іерархічная барацьба таксама не цікавіць. Дзеля іх існуюць іншыя каштоўнасці, іншыя спосабы самасцверджання. Між шымпанзэ, што жывуць на прыродзе, сустракаюцца асобіны, у тым ліку і мужчынскага полу, якія не займаюць ні самага высокага, ні самага нізкага становішча. Зазвычай у іерархічных сутычках яны ўдзелу не бяруць, а робяць свае справы ці імкнуцца памірыць, прычым паспяхова, ворагаў, абдымаюць іх. У гуртах шымпанзэ шмат увагі надаецца сімпатыям, на грунце якіх ладзяцца дружалюбныя сувязі, іншым разам прыязныя і працяглыя. Аказваецца, з самцамі, што не любяць пастаянна сцвярджаць сваё становішча, могуць сябраваць іерархічныя самцы, улучна і высокага рангу.

Апроч стасункаў «на роўных», шымпанзэ маюць заступніцкае сяброўства, калі старэйшы ды мацнейшы абараняе малодшага ды слабейшага, а той паводзіць сябе без падлашчвання. Назіраюцца і іншыя праявы альтруісцкіх паводзінаў: выдаванне ежы, суперажыванне чужых поспехаў, няўдачаў, пакутаў, узаемнае навучанне. Дарослыя сёстры клапоцяцца пра дзіцянят, старэйшыя дочкі дапамагаюць маці.

Мноства праграмаў дазваляе выбіраць. Антыагрэсіўныя ды альтруісцкія праграмы паводзінаў шымпанзэ, без сумлеву, блізкія да падобных праграмаў нашых паводзінаў. Даследнікі мяркуюць, што іх мелі і продкі чалавека. Але ў шымпанзэ няма набору праграмаў жорсткай іерархіі ды баявой арганізацыі, якія маем мы ды павіяны. Таму гурт шымпанзэ не здольны да складаных і дакладных абарончых дзеянняў і тэрытарыяльных войнаў. Ды яны ім не патрэбныя пры іхным ладзе жыцця ды ўмельстве лазіць па дрэвах, ад якіх яны зазвычай далёка не адыходзяць. Начуюць шымпанзэ таксама ў бяспецы, ладзячы гнёзды на галінах дрэваў.

Падвойны набор праграмаў сацыяльных паводзінаў чалавека дазваляе разнастаіць варыянты, у выніку чаго мы можам утвараць розныя грамадскія структуры — ад жорсткіх аўтарытарных бандаў да амаль пазбаўленых іерархіі клубаў.

ШТО ТАКОЕ «ІНСТЫНКТ СВАБОДЫ»?

Пра гэты «інстынкт» часцяком пішуць гуманітарыі нібы пра нешта бясспрэчнае ды ўласцівае чалавеку. Этолагу цяжка зразумець, што яны маюць на ўвазе і з якімі сапраўды існуючымі ў чалавека інстынктамі яго можна звязаць. Калі «свабода» — гэта магчымасць рабіць, што захочацца, быць незалежным, нікому не падпарадкоўвацца, мець усё, што хочаш, дык гэткай «свабоды» жывёла дасягне, калі зойме вяршыню піраміды, а чалавек — маючы ўладу і багацце. Калі свабода — гэта няўдзел у іерархічных сутычках, дык і такую праграму мы маем, але жыць адпаведна ёй хоча мала хто. Бо яна прадугледжвае, што я не толькі нікому не падпарадкоўваюся, але й нікога не падпарадкоўваю сабе. Дому, маёмасці, сям'і, дзяцей мне лепш не мець: па-першае, гэта ўсё трэба абараняць, а па-другое, яны абмяжоўваюць свабоду. Атрымліваецца свабода індыйскіх гімнапедыяў, старажытнагрэцкіх кінікаў, нядаўніх хіпі, сучасных панкаў ды бяздомных.

Ёсць яшчэ стан «волі» — рабіць менавіта тое, што забаронена мараллю ды нормамі грамадства і не рабіць таго, што трэба. Схільныя да гэтага шмат якія жывёлы, асабліва маладыя ці якія апынуліся на дне піраміды. Яна выяўляецца ў выглядзе саманавучання ў малых, пратэсту — у падлеткаў, у крымінальнай форме — у зладзеяў, разбойнікаў і да т. п.

Хутчэй за ўсё, некаторыя, гаворачы аб інстынкце свабоды, аб'ядноўваюць

усе тры імкненні. У гэткім выглядзе «свабода» недасягальная для ўсіх і разбуральная для грамадства. Калі ж «свабоду жыць, як мне хочацца» абмежаваць пэўнымі прававымі рамкамі, яна хаця б патэнцыяльна здзяйсняльная для большыні людзей у больш-менш прававой дэмакратычнай дзяржаве, што прызнае за пункт адліку для ўсіх законаў ды рашэнняў пэўны пералік правоў чалавека.

Адкуль узялася дэмакратыя? Дэмакратычная форма арганізацыі нават маленькага грамадства, супраць аўтарытарнага, немагчымая, калі складнікі гэтага грамадства не ўмеюць гаварыць. Толькі мімікай ды рухамі калектыўна не абмяркуеш складаных пытанняў, не выпрацуеш іхнага вырашэння. Таму ніводную калектыўную арганізацыю жывёлаў, нават самую добразычлівую да кожнага ўдзельніка (прыкладам, дэльфіны), нельга менаваць дэмакратыяй у чалавечым разуменні.

Калі дэмакратыя немагчымая без слова, дык, зразумела, да ўзнікнення мовы яе ў нашых продкаў не было. Здаецца, групы загонных паляўнічых — прыдатнае асяроддзе дзеля з'яўлення зародкаў дэмакратычных узаемадачыненняў. Адным з ейных наступнікаў была «ваенная дэмакратыя» напаўрабаўнікоў-напаўгандляроў, што плавалі на караблях. Старажытныя грэкі першыя ажыццявілі яе ў сваіх гарадах, стала змагаючыся з тыраніяй ды алігархіяй, г. зн. будовамі іерархічнымі. Грэкі вынайшлі просты механізм: тыя, хто свабодны, маюць дом, уласнасць, сям'ю, утвараюць сход, дзе прымаюцца законы па абароне гэтых каштоўнасцяў (а яны адпавядаюць інстынктыўным патрэбам чалавека). Гэтакі спосаб, без сумлеву, не дае ўлады самым кампетэнтным, але перашкаджае прарвацца да ўлады самым настырным. Усе спрэчныя пытанні на падставе законаў вырашае суд, дзе кожны мае мажлівасць абвінавачваць і абараняць. Суд ахаваны ад захопу напорыстымі грамадзянамі сваёй шматлікасцю: ён ахоплівае сотні грамадзянаў. Урэшце, людзей, што выявілі схільнасць да захопу ўлады ці набылі небяспечна вялікі ўплыў на грамадзянаў, народны сход паддае астракізму — выгнанню па выніках таемнага галасавання. Сучасная дэмакратыя клапоціцца пра захаванне магчымасці займацца палітыкай тым, хто застаўся ў меншасці (толькі ў межах законных дзеянняў). Грэкі да меншасці гэтак не ставіліся, бо яна была супраць дэмакратычнага ладу, імкнулася яго скінуць.

Чаму дэмакратыю трэба ўвесь час абараняць? Ці можа гэткая сістэма з'явіцца сама па сабе, на падставе інстынктыўных праграмаў? Без сумлеву, не. Гэта вынік працы розуму, прадуманая сістэма калектыўнай перашкоды ўтварэнню іерархічнай пірамідальнай структуры з прагнымі да ўлады асобінамі. Яе неабходна падтрымліваць палітычнай актыўнасцю грамадзянаў. Старажытным грэкам не ўдавалася ўтрымаць поліс у стане стабільнай дэмакратыі. Іншым разам, абапіраючыся на падтрымку незадаволеных, уладу захопліваў чарговы важак ды наладжваў аўтарытарны парадак — тыранію. Па ягонай смерці менш рашучыя наступнікі ўтваралі алігархію — «калектыўную» ўладу «найлепшых», якая паступова слабела нагэтулькі, што ўдавалася аднавіць дэмакратыю. Арыстоцель вельмі дакладна апісаў гэты кругазварот: дэмакратыя змяняецца на тыранію, тая — на алігархію, а яна — зноў на дэмакратыю. Магчымасць «хады па арыстоцелевым коле» існуе і цяпер, але зусім не абавязковая, як у грэцкіх полісах, бо кожная форма кіравання навучылася сябе абараняць.

Дэмакратычнае грамадства з'явілася і доўга існавала ў Старажытным Рыме, дзе было добра аформлена юрыдычна. Рымляне вынайшлі найбольш эфектыўны, чым жэрабя, метад займання кіроўных пасадаў — выбары праз выбарчую кампанію; гэтакі ж спосаб ужываўся дзеля камплектавання прадстаўнічых калегіяльных органаў. Рымская дэмакратыя дэградавала з прычыны празмернага пашырэння межаў уладанняў гэтага горада-дзяржавы. Ва ўмовах падпарадкавання Рыму ўсё новых народаў дэмакратычная сістэма ператваралася ў цэнтралізаваную імперскую, а ў імперыі дэмакратыя неэфектыўная і таму немагчымая.

Дэмакратыя з'явіцца з павагі «натуральных правоў». Зніклая на сотні гадоў, дэмакратыя паступова, крок за крокам, пачала нараджацца ў Англіі, а потым і ў іншых краінах. З аднаго боку, яна скарыстоўвала дасягненні рымскага права, што стваралася блізу тысячу гадоў — ад Законаў 12 табліцаў (450 г.

да н. э.) да Кодэксу Юстыніяна (525 г. н. э.). А з другога — грунтавалася на тэорыі пра «дагаворную дзяржаву» Т. Гобса і Дж. Лока. Згодна з гэтай тэорыяй, чалавек спрадвечна (у «натуральным стане») адчувае за сабою права на свабоду ды ўласнасць і хоча, каб яны былі абароненыя ад замахаў, а з другога боку, схільны квапіцца на свабоду і ўласнасць іншых.

З гледзішча сучасных ведаў эталогіі гэта правільна. І тыя і другія прыроджаныя праграмы мае чалавек, але паводле тэорыі дамоўленасці, у выніку ўзнікае барацьба ўсіх супраць усіх, анархія ды хаос. Этолаг згодны толькі з першай часткай фразы (пра барацьбу). Барацьба сканчаецца не «першабытным хаосам», а іерархічнай структурай, што можа пераўтварыцца ў дзяржаву аўтакратычнага кшталту.

«Тэорыя дамоўленасці» разглядае іншы шлях: узаемазацікаўленыя людзі дамаўляюцца аб абмежаванні сваіх правоў такім чынам, каб права на свабоду ды ўласнасць было забяспечана ўсім. Падчас выпрацоўкі законаў і вырашэння спрэчных пытанняў яны бяруць за аснову маральныя пастулаты, якія мае кожны чалавек. Створаная гэтакім чынам дзяржава — вынік барацьбы розуму супраць «натуральнага стану». Этолагу падабаецца найперш разуменне таго, што маральнасць маецца ў чалавека першапачатна. Яны называюць яе прыроджанай мараллю, прыроджанымі забаронамі. Дзяржава, пабудаваная дзеля абароны правоў чалавека і заснаваная на законах, што вышэй за дзяржаву ды чалавека,— гэта дэмакратычная дзяржава. Жывучы ў ёй, чалавек можа выхоўвацца не ў духу барацьбы за ці супраць чаго-небудзь, а ў духу дабрачыннасці, пра важнасць чаго гаварыў яшчэ Арыстоцель.

Значыцца, дэмакратыя — вынік барацьбы розуму з тымі жывёльнымі інстынктамі людзей, якія падштурхоўваюць іх самазбірацца ў жорсткія аўтарытарныя іерархічныя сістэмы. Дэмакратыя выкарыстоўвае і дазваляе бальшыні людзей рэалізаваць іншыя інстынктыўныя праграмы, таксама закладзеныя ў чалавеку — жаданне быць свабодным (з зямлёю, домам, сям'ёю ўлучна), забарону забіваць, рабаваць, адбіраць, красці, прыніжаць слабых. Дэмакратыя выкарыстоўвае непазбежную для чалавека пірамідальную схему арганізацыі ды падпарадкавання, але шляхам выбарчай сістэмы, падзялення заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладаў ды незалежнасцю сродкаў інфармацыі. Гэта пазбаўляе іерархічную структуру яе антыгуманнай сутнасці і вымушае ў значнай ступені працаваць на карысць людзям, а не толькі тым, хто вяршэнствуе. Як сказаў некалі У. Чэрчыль, дэмакратыя не ёсць ідэальная форма кіравання, але яна самая лепшая з усіх формаў, што вынайшаў чалавек.

Чалавек, як і ўсе жывёлы, мае шмат прыроджаных праграмаў паводзінаў (мы нараджаемся з некаторымі ведамі пра навакольны свет ды правіламі паводзінаў у ім), і ў патрэбны момант яны спрацоўваюць.

Гэтыя праграмы ствараліся даўно і ў зусім інакшым асяроддзі, мала падобным да таго, у якім жывём мы. Таму іхнія паводзіны не заўсёды адэкватныя абставінам, рацыянальныя і нават жаданыя. (Не ўсё натуральнае — добра).

З прычыны першапачатнай запраграмаванасці, людзі не надта вольныя ў паводзінах, адзін сцэнарый яны ажыццяўляюць лёгка, іншы — з цяжкасцямі, а некаторыя ўвогуле невыканальныя. (Не ўсе прыдуманыя розумам планы мы можам ажыццявіць).

Для бальшыні сітуацый маецца дастатковы набор альтэрнатыўных праграмаў, на падставе якіх можна пабудаваць некалькі варыянтаў паводзінаў. (Усе мы спрадвеку «ведаем», як красці, і ведаем, што гэта дрэнна; будзем мы зладзеямі ці сумленнымі, залежыць ад нас, а не ад нашае прыроды).

Наш мозг такі, што адказная за свядомасць частка не толькі не можа азнаёміцца са зместам прыроджаных праграмаў, але й не ведае пра іхняе існаванне. Таму, калі праграма пачынае рэалізоўвацца, свядомасць яе абслугоўвае, не заўважаючы гэтага. Яна шукае і знаходзіць нейкія свае тлумачэнні паводзінаў і іхніх матываў, не абавязкова правільныя. (Нельга давярацца ўласнай рэфлекцыі, г. зн. самааналізу на падставе суб'ектыўных адчуванняў ды ідэяў, і менталітэту — уяўленню, што існуе, пра падзеі, бо яны падаюць бывае блытаны, тэндэнцыйныя і алагічны малюнак).

Галоўная задача пададзенага эсэ — каб чытач атрымаў задавальненне ад знаёмства з эталогій на прыкладзе не самага вывучанага, але надзвычай цікавага віду — нас самых.

Ларыса ЧАРНЫШОВА

МОВА КУЛЬТУРЫ

Навука XX стагодзьдзя стварыла сваю мову дзеля апісаньня рэальнасьці. Але й сама рэальнасьць цяпер іншая, ніж была 2—3 тысячы гадоў таму. «Прырода — таксама зьява культуры»,— казаў Шпэнглер. Мова сучаснай навукі не касуе таго, што здабылі інтуіцыя й дасьледаваньні вучоных й філёзафаў папярэдніх часоў. Менавіта яны адкрылі закон абарачэньня нябёсных целаў, г. зн. нябёсную мэханіку, ды й шмат іншага, што застаецца канстантай рэальнасьці й для нашага ўспрыманьня.

Культурны чалавек — гэта чалавек, які ведае мову свайго часу ды іншых часоў, які разумее мову культуры і валодае ёю. Кажучы сымбалічна, такі чалавек — Салямон, які разумее мову ўсіх жывых істотаў. Мова — ёмішча інфармацыі, што функцыянуе ў культуры. У спадчыну нам перададзеная прыроджаная інфармацыя, пазапісваная на генэтычнай мове. Мы жывём дзякуючы гэтай інфармацыі і ствараем — сваімі думкамі й пачуцьцямі — новую інфармацыю, якая перадаецца ў спадчыну наступным пакаленьням. Гэта — мова культуры. Авалодаць ёю — мэта культурнага навучаньня, дзе розум знаходзіць сабе працу. Па ступені ўдзелу розуму ў працы жыцьця мы можам ацэньваць ступень разумнасьці індывіда. Мова культуры ёсьць твор і творчасьць розуму. Мову паводзінаў, жэстыкуляцыі, мысьленьня маюць і жывёлы; гэта цялесна-псыхічная мова, не сымбалічная, а непасрэдная. Чалавечая ж мова разумная — яна сымбалічная, адрозьніваецца ад цялесна-псыхічнай тым, што не злучаная, так бы мовіць, з арганізмам. Яна матар'ялізуецца ў такіх артафактах, як слова, кніга, музыка. Гэтыя творы розуму й рук чалавека — ёмішча разумнай інфармацыі, культурнай мовы. Праз слова мы маем зносіны з рэальнасьцяй, якая сама ёсьць сымбаль, з сымбалічнай рэальнасьцяй. У сярэднявеччы гэта менавалася ens rationis — існае розуму. Напрыклад, слова БОГ. Зразумела, гэта ня тая рэчавая рэальнасьць, на якую можна паказаць пальцам і сказаць: «вось яна». На яе паказвае слова, г. зн. сымбаль, але за словам крыецца нешта, што большае за слова, што не вычэрпваецца словам. Яно толькі імя.

Розныя індывіды, розныя культуры могуць укладаць свой сэнс у гэтае слова. Могуць — і ўкладаюць. І ў залежнасьці ад уласнага разуменьня яны ствараюць свае паводзіны. Такім чынам, гэтае разуменьне ўплывае на жыцьцё, стварае сэнс. Нават змагаюцца індывіды й супольніцтвы індывідаў за сваё права жыць гэтак, а не інакш, у залежнасьці ад такога разуменьня. Скарыстоўваюцца й строгія лягічныя доказы, і самыя ірацыянальныя ўражаньні, ды тым ня менш гэтая рэальнасьць застаецца сама празь сябе недаказальная. Але, паколькі тут мае месца праца, функцыя, дык мы ня можам сказаць, што гэтай рэальнасьці няма. Нават той, хто прызнае сымбаль прывідам, мусіць усё ж пагадзіцца, што гэта прывід даволі рэчаісны — ён робіць працу, уплывае, прыкладам, на паводзіны вялізных масаў людзей. Як, чаму, нашто — гэта іншае пытаньне. Але дзейнічае, значыць, мае нейкую рэальнасьць — сымбалічную.

Навука й філязофія ствараюць карціну сьвету, і ў кожнай культуры гэтая карціна свая. Яны ствараюць гэтую карціну дзякуючы мове, якую культура выпрацоўвае. Гэтая мова ня зводзіцца да той ці іншай нацыянальнай мовы, спосабу выказваньня, зносінаў. Мова культуры — гэта мова больш шырокай сыстэмы. Некалькі нацыяў, этнасаў могуць карыстацца адной культурнай мовай, хоць нацыянальнае гучаньне тут будзе рознае. Гэта значыць, што адна й тая інфармацыя агучваецца ці натуецца па-рознаму. Так, у культурах, дзе Біблія прызнаная першакрыніцай, няхай яна будзе надрукаваная ў грэцкай мове, ці ў расейскай, ці ў ангельскай, тэкст Бібліі той жа самы для ўсіх, хто чытае й вымаўляе яго. Культура — гэта нейкая еднасьць сымбаляў, што пазнаюцца, задаюць падобныя асацыяцыі людзям дадзенай культуры.

Праца выкананая пры эканамічнай дапамозе Праекта падтрымкі навуковых дасьледаваньняў Цэнтральна-Эўрапейскага ўнівэрсытэта (Прага). Кантракт № 53/93 RSS/CEU.

Культура нібыта закадаваная ў мове. Розум — ключ да гэтага коду. З дапамогай мовы расшыфроўваецца код, а сама мова раскадоўваецца розумам. Ён — ключ да сымбалічнай мовы культуры, да захаваных у ёй шыфраў. Розум — агульная ўласьцівасьць усіх культураў, таму мы здольныя разумець нават сымбалі вельмі аддаленых ад нас культураў — Вавілёну, Эгіпту, Грэцыі ды іншых дзяржаваў і этнасаў, што стварылі культуры ў старажытныя часы. Розум — ёсьць к а н с т а н т а чалавечага жыцьця, нешта неадменнае, што абавязкова ўдзельнічае ў стварэньні жыцьця. Там, дзе гэтай канстанты мы не знаходзім, мы ня можам казаць пра чалавечую культуру. Па гэтай канстанце мы пазнаем культуру, маем магчымасьць сумовіцца зь ёй, ідэнтыфікаваць зьявы, набываць інфармацыю. Нейкая частка інфармацыі расьсейваецца, страчваецца для пазнаваньня. Так, хрысьціянства зьнішчыла шмат матар'яльных носьбітаў эліністычнай і язычніцкай культураў — кнігі, храмы, скульптуры, ды й жывых ейных носьбітаў. Згадаем, прыкладам, Гіпатыю, жанчыну-філёзафа. Хрысьціянам яна здавалася «д'ябальскім увасабленьнем», і яны забілі яе. Яны мелі іншую сыстэму ацэнак, ніж так званыя язычніцкія вернікі. Розум і носьбіты розуму не былі для гэтых хрысьціянаў «каштоўнасьцяй», вартай захаваньня, г. зн. станоўчай каштоўнасьцяй. Так, ці вартыя імя Homo sapiens тыя, хто са зьвярынай жорсткасьцяй зьнішчае носьбітаў розуму? Выбар заўжды застаецца за індывідам — быць яму разумным ці ня быць. Хоць існуе даволі моцная абумоўленасьць разумнага разьвіцьця індывіда. Гэта спадчыннасьць і сацыяльнае асяродзьдзе, сацыяльная даступнасьць разумнага разьвіцьця. Гэта праблема выхаваньня разумнага ў чалавеку. Праблема навучаньня. А яно заўсёды было неаднолькавым. Эліта на кожнага свайго індывіда мае большую долю выхаваньня, тут у большай ступені дзейнічае індывідуальны падыход да навучаньня, ніж у астатніх пластох грамадзтва. Іншая справа, што прыналежнасьць да эліты па сацыяльным паходжаньні ня можа быць гарантам большай адоранасьці індывіда розумам, ягоных лепшых здольнасьцяў да разумнага разьвіцьця. Прырода сее зародкі разумнасьці дзе пажадае, ня ўлічваючы сацыяльнага расслаеньня. Таму эліта ўвесь час і папаўняецца з гэтак званых ніжэйшых слаёў за кошт прыродна адораных індывідаў. Імкненьне да асабістага самавыяўленьня — таксама прыроджаная якасьць. І ў эліту трапляюць тыя, хто ў дастатковай ступені надзелены гэтым імкненьнем, энэргетычным зарадам, пасыянарнасьцяй.

Аднак, ці сапраўды ў эліту рэкрутуюцца самыя разумныя?

*

Розум уладарыць сьветам, Сусьветам. Ён жа кіруе і чалавечым жыцьцём, прынамсі, якое разумнае настолькі, наколькі ў ім удзельнічае розум. Вось што гаворыць пра гэтую «разумнасьць» Арыстоцель: «Таму той, хто сказаў, што розум знаходзіцца, таксама як у жывых істотаў, і ў прыродзе, і што ён — прычына сьветапарадку й усяго сьветаўпарадкаваньня, здаваўся разважлівым у параўнаньні зь неабдуманымі развагамі ягоных папярэднікаў. Мы ведаем, што Анаксагор выказваў такія думкі, але ёсьць падставы лічыць, што да яго пра гэта выказваўся Гермацім з Клазэмэі». Аддамо належнае арыстоцелевай навуковай карэктнасьці: павага традыцыі як формы атрыманьня ў спадчыну ведаў падахвочвае шанаваць і канкрэтных папярэднікаў.

Думка пра «разумнасьць» сьвету — старая думка; хто першы яе выказаў — сёньня ўжо не дазнацца. Арыстоцель спрабуе, наколькі дазваляе традыцыя, улічыць папярэднікаў, называючы між імі Гесыёда й Пармяніда. Але мы мусім засяродзіцца не на аўтарстве, а на самой ідэі, што апынулася ў гронцы найвышэйшыхісьцінаў чалавечай культуры. Якім бы словам ні вызначалі мысьліцелі гэтую разумную аснову сьвету — Сусьветны Розум, Лёгас, Абсалютны Дух, Бог, Боская Мудрасьць,— уважалася адно: сьвет ня ёсьць хаос і бязладзьдзе. Сьвет ёсьць Космас, парадак, уладкаваны паводле правілаў нейкай сілай, недасягальнай чалавечаму разуменьню. Але гэтая сусьветаўладкавальная сіла часткова даступная чалавечаму розуму — у той ступені, у якой яна можа быць адкрытая перад ім. Яна, магчыма, уся цалкам адкрытая і вельмі простая, ды чалавечы розум не адэкватна адкрыты й «ёмісты», каб прыняць яе ўсю. Адна з задачаў навучаньня ведам — «адкрыць» розум, зрабіць яго больш глыбокім, здольным

зьмясьціць у сабе як мага больш Найвышэйшага Розуму. Хоць у людзей, як казаў Анаксагор, і мысьліць адно й тое ж ва ўсіх і ў кожнага, але дадамо: у кожнага на свой лад. Даступнае розуму вялізнае — а кожны чалавек сваім розумам можа ахапіць толькі тое, што менавіта ягонаму індывідуальнаму розуму найбольш яснае й зразумелае.

Справа ня толькі ў адкрытасьці розуму; шмат залежыць і ад якасьцяў «уяўнага погляду», «духоўнага зроку». Нават адно й тое розныя людзі бачаць па-рознаму, таму што маюць сваё гледзішча.

Пра тое, што кожны чалавек успрымае сьвет па-свойму, а індывідуальны спосаб успрыманьня залежыць ад прыроджаных вартасьцяў, было вядома яшчэ тысячы гадоў назад тым, хто намагаўся асэнсаваць сутнасьць чалавечага пазнаньня. Гэтай розьніцы «ўспрыманьня» і абавязаная духоўная культура сваёй разнастайнасьцяй, мноствам рэлігіяў, мастацтваў, філязофіяў, навукай, наагул, мноствам духоўных шляхоў. Кожны прывучаецца, прызвычайваецца глядзець на сьвет як яму ўласьціва.

Арыстоцель, вопытны настаўнік, які навучаў пазнаньню ў сваім Ліцэі сотні вучняў, вось што казаў наконт гэтага: «Засваеньне выкладзенага залежыць ад звычак слухача: якія ў нас склаліся звычкі, такога выкладаньня мы й патрабуем, і тое, што гавораць супроць звычнага, здаецца непрыдатным, а з-за нязвыкласьці — больш незразумелым і далёкім, бо звыклае разумець прасьцей... Адныя не ўспрымаюць выкладзенага, калі ім тлумачаць матэматычна, іншыя — калі не прыводзяць прыкладаў, некаторыя патрабуюць, каб падаваліся сьведчаньні паэтаў. І адны жадаюць, каб усё выкладалася дакладна, а іншым даканаласьць у цяжар ці таму, што яны ня могуць злучыць (адно з адным), ці таму, што лічаць дакладнасьць дробязьзю. Папраўдзе, ёсьць у дакладнасьці нешта такое, з-за чаго яна як у справах, так і ў развагах здаецца некаторым нізкай. Таму трэба прывучацца й да таго, як успрымаецца кожны прадмет, бо няпроста ў той жа самы час шукаць і веды й спосабы іхнага засваеньня».

Уваход у Акадэмію — вышэйшую навучальную ўстанову, якую заснаваў і дзе выкладаў Плятон,— быў аздоблены надпісам: «Не геамэтар ды ня ўвойдзе!» Зразумела, якімі былі патрабаваньні Плятона да тых, хто паступаў да яго на вучобу. Ён і ўсю сваю філязофію пабудаваў на матэматычнай карціне сьвету, спалучаючы пры гэтым у філязофіі любоў да геамэтрыі зь любоўю да паэзіі, у чым можа пераканацца кожны, хто возьме пачытаць ягоныя творы. Гэтак больш поўна ён мог выказаць сябе. Ягоны ж настаўнік Сакрат наагул адмаўляўся разважаць над тым, што ня тычыцца маралі, і ня бачыў патрэбы ані ў якой матэматыцы, бо для яго галоўнае ў жыцьці — дасьледаваньне дабрачыннасьці, а што тут могуць даць веды пра трохкутнікі, актаэдры ды іншыя геамэтрычныя фігуры. Відаць, у Сакрата, кажучы сучаснай мовай, адсутнічала гэтак званае прасторавае мысьленьне — адсюль і непрыхільнасьць да геамэтрыі. А ў ягонага вучня Плятона, наадварот, яно было і дыктавала яму бачаньне сьвету іншае, але гэта ня шкодзіла яму захоўваць павагу й любоў да Сакрата. Тое ж і з вучнем Плятона — Арыстоцелем, якога захапляла жывая прырода, і ён займаўся тым, чым ня меў патрэбы цікавіцца Плятон,— заалёгіяй, вывучэньнем усёй прыроды, і напісаў спецыяльныя творы: «Фізыку», «Пра неба й зямлю». Сьвет бачыўся яму інакш, чым Плятону, таму й вымушаны быў Арыстоцель прызнавацца: «Плятон мне сябра, ды ісьціна даражэйшая».

На прыкладзе Плятона і Арыстоцеля зручна пераканацца, што, як бы ні імкнуўся чалавечы розум да ўсеахопленасьці, паўнаты карціны сьвету, як бы глыбока й шырока ні быў ён адчынены дзеля пазнаньня ўсяго даступнага розуму, як ні былі б унівэрсальныя — а ў Плятона і Арыстоцеля яны дасканала ўнівэрсальныя — карціны сьвету таго ці іншага мысьліцеля, усё роўна на іх адбіваецца погляд іхнага аўтара, асабісты й непаўторны. Гэтак унівэрсальнасьць набывае чалавечыя рысы — ствараецца па вобразе й падабенстве аўтара. І таму мы дарэмна пачалі б адшукваць у Плятона што-небудзь накшталт арыстоцелеўскага вучэньня пра будову жывёлы, а ў Арыстоцеля — вучэньне пра геамэтрычныя фігуры як аснову сьветабудовы. Гэтак і ўнівэрсальныя філёзафы — Фама Аквінскі, Лейбніц, Кант, Гегель — мелі кожны сваю, няхай і максымальна шырокую карціну сьвету. І нават тую ж самую тэму, прыкладам, тэму сутнасьці й існаваньня, ці тэму шчасьця, ці якую іншую, кожны зь іх

«выканаў» па-свойму. Так, як загадвае, як дыктуе ім іхнае бачаньне, якое ў кожнага непаўторнае, унікальнае. І кожны між імі гаворыць пра тое, што бачыць, на сваёй мове. Мова філязофіі таму гэтак багатая рознымі «дыялектамі», што кожны філёзаф прапануе сваю вэрсію слоўнага выказваньня. Тое ж адбываецца з мовамі паэзіі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры — яны заўсёды аўтарскія, нягледзячы на агульныя відавыя ўласьцівасьці, зададзеныя часам і сьветам. У гэтым сэнсе ад філёзафа, як і ад паэта, ня варта чакаць, каб карысталіся адзінай і нязьменнай мовай, няхай і сымбалічнай, што, прыкладам, ёсьць у астралёгаў ці матэматыкаў. Хоць, канешне, філязофія мае сваю сыстэму пераемных сымбаляў, якая дзейнічае ў матэматычных формулах. Філязофія падобная і да навукі і да паэзіі.

Людзей можна падзяляць ці аб'ядноўваць паводле прынцыпу рознасьці ці падабенства, як і ўсё ў гэтым «аналягічным» сьвеце, сьвеце, дзе аналёгіі сталіся адным з спосабаў ягонага пазнаньня.

Прывабнасьць адной, асабліва любімай філязофіі, якой аддаецца перавага, нараджаецца тым самым выбіральным падабенствам, што дзейнічае і ў хіміі, і ў чалавечых лёсах, як заўважыў Гётэ. Ці падобнае да падобнага, ці непадобнае да непадобнага імкнецца, але ёсьць нейкі нябачны закон «імкненьня» розумаў, характараў, целаў. Дзейнічае ён і ў філязофіі. Так, Шапэнгаўэр перад усімі іншымі аддаваў перавагу філязофіі Канта. Пазбаўленыя сустрэчаў у фізычнай прасторы і часе, філёзафы сустракаюцца ў прасторы думкі, і там зьдзяйсьняецца іхная дружба.

Для Ніцшэ Шапэнгаўэр стаўся такім настаўнікам і сябрам, якім для апошняга быў Кант. Ніцшэ напісаў кнігу «Шапэнгаўэр як выхавацель». Але чым бліжэй падыходзіла да яго хвароба, тым большую адзіноту адчуваў ён, і ўсе ўпадаваньні пачыналі здавацца ілюзіямі. Гэта ішло ад хваробы; іншым разам такое ж расчараваньне дыктуе старасьць (як было ў Плятона, які пачаў з высокага аптымізму, а скончыў ледзь не мізантропіяй). Але гэта толькі завіліны лёсу, праявы станчэньня, пагасаньня волі да жыцьця. Раней, чым загаснуць, філёзаф, як і кожны чалавек, стварае, будуе, сьцьвярджае. І робіць гэта ў любові, а яна дыктуе выбіральнасьць. Гэта і ёсьць выбар, натуральны адбор у эвалюцыі філязофіі як віду пазнаньня. Пазнаньне — дзейнасьць, народжаная дастаткам — багацьцем розуму ў індывідаў, ігрой сілаў, лішак якіх застаўся пасьля ўсіх неабходных прыстасаваньняў да асяродзьдзя, пасьля ўсіх задаволеных патрэбаў выжываньня. У філязофіі від Homo sapiens выказвае багацьце сваіх інтэлектуальных сілаў, якімі, аказваецца, ён надзелены звыш той меры, што неабходная дзеля выжываньня віду.

Гэтым жа лішкам творчых сілаў народжаныя рэлігія, мастацтвы, наагул, уся прыгажосьць у нашым жыцьці — ад прыгожага бытавога ўладкаваньня да прыгажосьці ідэяў.

Васіль РАГУЛЯ

УСПАМІНЫ

ПРАДМОВА

16-га лістапада сёлета мінае 31 год з дня, калі група беларускіх паслоў і сэнатараў перaступіла парог польскага Сойму, як паўнапраўныя сябры польскага парляманту і прадстаўнікі беларускага народу ў уставадаўчых палатах Польскай Рэспублікі. Шмат вады ўцякло з таго часу, многа ўдзельнікаў актыўнай палітычнай працы зыйшло ў магілу: адны насільна, другія натуральна. Сярод жывых засталося іх вельмі мала.

Шмат хто зь беларусаў другога пакаленьня, асабліва з савецкай часткі Беларусі, мала абзнаёмлены з гэным пэрыядам жыцьця беларусаў пад Польшчай. Уступаючы іх настойлівым просьбам, пасьля доўгіх ваганьняў, я наважыў пасьвяціць вольны цяпер у мяне час на тое, каб аб'ектыўна і добрасумленна асьвятліць перад сучасным пакаленьнем працу Беларускага Пасольскага Клюбу і тагачасных палітычных дзеячоў, а таксама і настроі нашага народу. Я добра разумею, што знойдуцца пакрыўджаныя і незадаволеныя. Што-ж зрабіць? Ім магу сказаць: што пасеялі, тое і пажнеце. Я катэгарычна заяўляю, што буду імкнуцца ўнікаць прадузятасьці, буду далёкі ад варожасьці, сымпатыі ці антыпатыі як да палітычных плыняў сярод беларусаў, так і да паадзіночных асобаў тае пары, не выключаючы і самога сябе.

Я буду шчасьлівы, калі напісанае мною ўсьцеражэ нашых сучасных і будучых палітычных і грамадзкіх дзеячоў ад паўтарэньня памылак іх бацькоў.

19.VI.1953, Лювэн, Бэльгія

«Спадчына» працягвае знаёміць чытачоў з палітычнаю гісторыяй Заходняе Беларусі, гэтым разам падаючы пагляд на яе аднаго з найбольш значных прадстаўнікоў несацыялістычных плыняў. Васіль Рагуля (1879—1955) — беларускі дзяяч, настаўнік, дэлегат I Усебеларускага кангрэсу. Быў абраны ад беларускіх акругаў у польскі Сойм і Сэнат. У 1939 г. зьняволены Саветамі. Пасьля вайны на эміграцыі. Фрагмэнты мэмуараў друкуюцца паводле выданьня: В. Рагуля. Успаміны. Нью-Ёрк: Выданьне М. Рагулі, 1957.

Мая біяграфія

Нарадзіўся я 16-га ліпеня 1879 г. у вёсцы Ачукевічы, Любчанскай воласьці, Наваградзкага павету. Па сканчэньні пачатковай школы я ўступіў у Маладэчанскую Настаўніцкую Сэмінарыю, якую скончыў у 1898 г. Да 1903 г. быў настаўнікам пачатковай школы ў вёсцы Налібакі. У 1903 г. уступіў у Віленскі Настаўніцкі Інстытут, які і закончыў у 1906 г. У гэтым самым годзе я быў арыштаваны за распаўсюджваньне «Выборгского воззвания». Дзеля бяздоваднасьці мае віны справа была зьліквідавана, і я атрымаў пасаду настаўніка вышэйшае пачатковае школы ў Смаргонях, а ў 1908 г. быў пераведзены на такую самую пасаду ў 3-цюю Менскую Вышэйшую Пачатковую Школу. Будучы настаўнікам, я гарнуўся да грамадзкае працы. Падчас летніх вакацыяў я зарганізаваў у родным мястэчку бясплатную падрыхтоўку хлапцоў для паступленьня ў гарадзкія вучылішчы і ў настаўніцкую сэмінарыю. Апрача гэтага, з удзелам настаўнікаў і настаўніц я арганізоўваў аматарскія пастаноўкі спэктакляў. За два гады мы паставілі «Рэвізор» Гогаля і «Дзядзю Ваню» Чэхава. У пастаноўцы спэктакляў даваў нам вялікую дапамогу земскі начальнік, казачы штабс-ротмістр Ілавайскі, шчыры дэмакрат. На спэктаклях ягоная жонка арганізоўвала на свой кошт багаты буфэт. Як на тыя часы, білеты каштавалі дорага: ад 5 рублёў — крэсла першага раду, да 50 капеек — за стаячыя месцы ззаду. Буфэт, карты і білеты давалі разам да 1000 рублёў за спэктакль. Даход з двух спэктакляў быў каля 2000 рублёў. Па прапанове таго-ж Ілавайскага, на гэтыя грошы мы вучылі ў менскай гімназіі двух сялянскіх хлапцоў: Логіна і Каравайчыка. З дапамогай менскай настаўніцкай арганізацыі мне ўдалося працягнуць гэтых хлапцоў праз гімназію.

У 1914 г. я быў змабілізаваны ў армію, дзе, як вайсковы ўрадавец, праслужыў да чэрвеня 1918 г., калі быў звольнены бальшавікамі. У восень 1918 г. я пераехаў у Менск і працаваў у якасьці настаўніка чыгуначнай 4-х клясовай школы. Вясною 1920 г., пасьля акупацыі Менску палякамі, нашую школу польскі інспэктар зачыніў, а настаўнікі былі пушчаны на «зялёную траву». Каб перачакаць вайсковую завіруху, я наважыў пераехаць на гаспадарку ў родную вёску. Маючы карову, каня, плуг і барану (калёс ня меў), я шчыра ўзяўся за гаспадарку. Цяжка было гаспадарыць бяз грошай. Зноў прыйшлі бальшавікі, і мяне, як прыналежнага да «камсостава», мабілізавалі і загналі ў Смаленск. Так я прабыў у чырвонай арміі да ратыфікацыі польска-савецкае ўмовы. 24-га красавіка 1921 г. я ўцёк з чырвонае арміі дамоў. Удома я застаў толькі дзяцей. Жонка трагічна згінула — апалілася і памерла. Зноў пачалося цяжкае жыцьцё. Працы шмат, а грошай няма адкуль узяць. На боты грошай ня было, дый лапці не заўсёды былі цэлыя.

У восень 1922 г. я быў выбраны беларускім паслом польскага Сойму, а пасьля, у 1928 г.,— сэнатарам. Калі Сэнат быў распушчаны, я мусіў адбыць судовую кару — 2 гады цяжкае турмы. Адбыўшы яе, я ізноў вярнуўся на гаспадарку, ды адначасна быў старшынёю рэвізыйнае рады касы Стэфчыка, без ніякае ўзнагароды.

У 1939 г., калі прыйшлі бальшавікі, я пачаў працаваць настаўнікам у савецкай дзесяцігодцы. 20-га чэрвеня 1941 г. бальшавікі арыштавалі мяне разам з другімі беларусамі і павезьлі на ўсход. 2 дні пазьней пачалася вайна з немцамі, і мне ўдалося за Менскам уцячы ды вярнуцца пешкі дамоў. Тут беларускі актыў выбраў мяне старшынёю беларускага валаснога камітэту. Любча была першая мясьціна ў Наваградчыне, дзе быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг, які бесьперапынна вісеў да самага нашага адыходу на захад. Пасьля наваградзкі «Cebitskommissar» назначыў мяне, без мае згоды, бургомістрам Дзятлаўскага раёну. Там я быў да часу, калі нямецкі фронт пачаў каціцца на захад. 3-га ліпеня 1944 г. давялося ўцякаць на захад, дзе і туляюся да сяньняшняга дня.

19.II.1954 г.

Лювэн, Бэльгія.

[...]

III

ПРАЦА Ў СОЙМЕ І СЭНАЦЕ

ПАРТЫЙНЫ СКЛАД СОЙМУ І СЭНАТУ

Пачну з скрайнай правай партыі: а) Народная Дэмакратыя — эндэкі, цьвет розуму польскага народу, б) Хрысьціянская Дэмакратыя (Хадэкі), в) Пяст — сялянская партыя Вітаса, г) Сялянская Партыя (Домбскага), д) Народная Работніцкая Партыя (Попеля), е) Вызваленьне — радыкальная сялянская партыя (Тугута), ж) Нацыянальныя Меншасьці — беларусы, украінцы, немцы і жыды, з) Польская Партыя Сацыялістаў і к) камуністы — іх было толькі двух.

ПРЫСЯГА, ВЫБАРЫ ПРЭЗЫДЫЮМУ І ПРЭЗЫДЭНТА

Першым актам была прысяга «Pracować na dobro Rzeczypospolitej jako catości», пасьля выбары старшыні. Выбраны быў М. Ратай, кандыдат Пяста. Выбары праводзіліся на супольным паседжаньні Сойму і Сэнату — «Zgromadzeniem Narodowym».

Перад выбарамі прэзыдэнта ў нашым клюбе выявіліся два погляды: устрымацца ад выбараў, падаючы белыя картачкі, і ўзяць у іх удзел, галасуючы за найбольш адпаведнага для нас кандыдата. Першыя (Рагуля) гаварылі, што мы прыйшлі ў Сойм не для творчай працы і павінны заняць становішча безадказнай апазыцыі. Другія (Тарашкевіч) пярэчылі, што ня можна рваць з месца галёпам, што наш выбаршчык, які памятае прыказку «ласкавае цялятка дзьве маткі сьсе, а гордае — ніводнае», нас за гэта не пахваліць, што трэба спрабаваць вырваць што-небудзь ад палякаў. Меншасьць згадзілася падпарадкавацца большасьці, што і было прынята тайным галасаваньнем. Пастаноўлена прыняць удзел у выбарах.

Кандыдатамі на становішчы прэзыдэнта былі высунуты: Н. Д. граф Замойскі (пазнаньскі ваявода), Вайцехоўскі — ад Пяста, інж. Нарутовіч — ад Вызваленьня, Дашынскі — ад П.П.С., ад Нацыянальных Меншасьцяў — былы прафэсар Пецярбурскага ўнівэрсытэту Бодуэн дэ Куртэнэ (дэманстрацыйная кандыдатура з мэтаю падліку нашых парляманцкіх сілаў). Пасьля трох галасаваньняў засталіся два кандыдаты: Вайцехоўскі і Нарутовіч. У апошнім галасаваньні большасьць атрымаў Нарутовіч, які зараз-жа прыняў выбар і склаў прысягу на вернасьць канстытуцыі.

Пакуль ішло галасаваньне, натоўп эндэкаў запрудзіў усю Вейскую вуліцу, дзе быў будынак Сойму і сумежны зь ёю Пляц Трох Крыжоў, блякуючы ў такі спосаб Сойм. Усюды былі чутны крыкі: «Няхай жыве Замойскі! Далоў Нарутовіча!» Народ не разыйходзіўся. Паслы і сэнатары прабавалі выйсьці, аднак пры выхадзе натоўп іх затрымаў і пачаў біць. Пасол ППС Пятроўскі і адзін жыдоўскі сэнатар з рыжаю барадою вярнуліся ў Сойм з тварамі, залітымі крывёю. Нам усім, па аднаму або па двух, давялося выходзіць бочным выхадам, каб навакольнымі вуліцамі трапіць на Ўяздоўскую Алею. Я выйшаў разам зь Мятлою. Уяздоўская Алея, Пляц Трох Крыжоў і Новы Сьвет кішэлі. Людзі толькі і гаварылі аб выбарах прэзыдэнта. Мы затрымаліся каля адной вітрыны, дзе стаялі дзьве на выгляд інтэлігентныя дамы. Адна гаворыць другой: «Pani słyszała, już obrano na prezydenta żyda» (Нарутовіч — чыстакроўны паляк). «To nie powinno być, żeby w Polsce byl prezydentem żyd». Пасьля колькі дзён навонкі ўсё супакоілася, аднак у нутры эндэкаў бушавала бура нянавісьці да новавыбранага прэзыдэнта.

Хутка пасьля выбараў прэзыдэнт зьведваў галерэю «Sztuk Pięknych». Тут падыйшоў да яго фанатык эндэк (прозьвішча ягонае забыўся) і, рэвальвэрным стрэлам зблізка, сьмяротна зраніў прэзыдэнта. Забойцу засудзілі на сьмерць і павесілі. Характэрна паставіліся да гэтага эндэкі. Дамавіну з трупам за-

бойцы саматугам зацягнулі на могільнік, а магілу ўпрыгожылі краскамі.
Давялося выбіраць новага прэзыдэнта. Супольнымі сіламі правых і цэнтру, бальшынёю быў выбраны кандыдат Пяста — Вайцехоўскі. Беларускі Клюб галасаваў супраць кандыдатуры Вайцехоўскага.

ПОЛЬСКАЯ ПАЛІТЫКА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ДА ПЕРАВАРОТУ 1926 Г.

Польскую палітыку адносна беларусаў можна схарактэрызаваць словамі: дэнацыяналізацыя і палянізацыя. Надзею на поўную і хуткую ўдачу палянізацыі адчынена выказаў у Ўставадаўчым Сойме прэм'ер Скульскі. Ён сказаў, што за 50 год ніякіх беларусаў у Польшчы ня будзе, што ўсіх беларусаў у Польшчы можна будзе пасадзіць на адной канапцы. Усе мерапрыемствы наступных польскіх урадаў на нашай прасторы кіраваліся на дасягненьне гэтай мэты, бяз розьніцы, якая там партыя ні стаяла на чале ўраду. Апрача палітычнага, пасьля стаў стасавацца і ціск эканамічны, які ў некаторых выпадках прымаў вострыя формы. Быў выпрацаваны і зацьверджаны Ўставадаўчым Соймам закон аб вайсковым і цывільным асадніцтве (каляністых) на «Kresach Wschodnich».
Закон прадугледжваў канфіскацыю ўсіх незагаспадарованых земляў, падцягаючы пад гэтую катэгорыю землі, уласьнікі якіх не вярнуліся з уцякацтва ў Расею. Найбольшую страту спрычыніў ён праваслаўным абшарнікам, як графу Хрэбтовічу-Буценёў у Шчорсах. У яго забралі ўсю ягоную аграмадную лятыфундыю з дрэнаванымі сенажацямі і палямі з добра ўгноенай і прыкладна апрацаванай жызнай глебай. Яму пакінулі адзін хвальварак Мураванку і лясы. З пункту гледжаньня права, канфіскацыя адбывалася часамі ў недапушчальны спосаб. У Наваградчыне, у Карэліцкай воласьці, нейкага Лазарэвіча, што вярнуўся з уцякацтва, выкінулі вон зь ягонага собскага дому, а ўсе забудовы на ягоным хутары зь інвэнтаром былі сканфіскаваны на карысьць нейкага афіцэра-легіяніста. Падобныя выпадкі былі і ў Віленшчыне. Чым-жа ня гісторыя Траекурава з повесьці Пушкіна «Дубровский»? Ніякія скаргі Лазарэвіча ня былі ўзяты пад увагу. Шматлікія беларусы, хутаране, з гаспадаркаю сярэдняй велічыні, былі ў такі спосаб аграблены, як быццам і на праўнай аснове. Закон аб асадніцтве прадугледжваў перадачу 30 % адчужанай зямлі ў рукі мясцовага насельніцтва. Аднак трэба было ўдзень са сьвечкаю шукаць шчасьліўца праваслаўнага беларуса, што атрымаў-бы кавалачак зямлі, няхай і горшай якасьці.
Адначасова праводзілася ўзмацненьне польскага элемэнту экспартам яго з цэнтральнай Польшчы на нашую тэрыторыю ў характары вайсковых і цывільных асаднікаў, дарогаю выплаты беззваротных пазыкаў зь дзяржаўнай касы на закуп зямлі, адчужанай у абшарнікаў, у бальшыні выпадкаў не-палякаў. Беларусы маглі купляць зямлю ў абшарнікаў толькі за наяўны разьлік; ім зачынены былі дарогі да дзяржаўнай падтрымкі. Абшарнікі ахвоча прадавалі сялянам зямлю на тэрміновую сплату або пад ваксалі. Сяляне акуратна пагашвалі ваксалі залатымі рублямі і амэрыканскімі далярамі, да 225 дал. за гэктар. На куплю ішло ўсё: апошні япрук, малако, яйцо. Некаторыя абшарнікі, як Кашыц у Ярэміцкай воласьці, сьведама адмовіліся прадаваць зямлю асаднікам, прадаючы яе сялянам.
Спачатку можна было купляць зямлю бязь ніякага дазволу адміністрацыйнай улады. У 30-х гадох было ўведзена вымаганьне дазволу ваяводы на права куплі. Ваяводы выдавалі дазвол на аснове характарыстыкі просьбіта, выдадзенай мясцовым паліцыйным пастарункам. Такім чынам, у запраўднасьці дазвол выдаваў начальнік пастарунку. Нават на куплю пляцу на некалькі сотняў квадратовых мэтраў вымагалі дазволу. Пры новым абмеркаваньні зямельнага пытаньня ў Сойме, Сойм большасьцю ўсіх польскіх галасоў супроць Нацыянальных Меншасьцяў адхіліў папраўку ўкраінцаў і беларусаў аб тым, каб землі праваслаўных цэркваў і манастыроў перадаваліся толькі мясцовым праваслаўным.
Канстытуцыя гарантавала свабоду веравызнаньняў. У жыцьці-ж на праваслаўных сьвятароў глядзелі з падозраньнем, а часам і зь нянавісьцю.

Праваслаўны сьвятар быў пад сталым наглядам каманданта паліцыйнага пастарунку. Рэдкія выпадкі адчыненага выступленьня сьвятароў пры выбарах у Сойм выклікалі перасьледаваньні. Так было са сьвятаром у м. Уселюб, што зарызыкаваў адчынена заклікаць парахвіянаў галасаваць за лісту Нр. 16.

Было пастаўлена пытаньне аб рэвіндыкацыі былых вуніяцкіх парахвіяў. Гэта мела на мэце адабраць ад праваслаўных амаль усе цэрквы, бо калісьці амаль ня было праваслаўных парахвіяў. Гэтую акцыю падняў віленскі каталіцкі япіскап Ялбжыкоўскі.

Супроць гэтага адчынена выступіў львоўскі вуніяцкі мітрапаліт граф Шэптыцкі. Адбылося некалькі судовых працэсаў у Вышэйшым Судзе ў Варшаве, якія выйгралі праваслаўныя. Гэтая акцыя дужа ўсхвалявала беларускае і ўкраінскае парляманцкія прадстаўніцтвы ў Сойме, як і насельніцтва на месцах. Відавочна, баючыся паважных беспарадкаў, улады прынялі адпаведныя захады, і акцыя была перарвана.

Ялбжыкоўскі і сьвецкія ўлады не пакідалі ў супакоі і беларускіх ксяндзоў. За «антыдзяржаўную дзейнасьць» суд прысудзіў кс. Гадлеўскага на год турмы, які ён адсядзеў у Макатоўскай вязьніцы ў Варшаве. У м. Друі быў манастыр ксяндзоў Марыянаў, беларусаў. Там яны мелі сваю друкарню, у якой друкавалі рэлігійныя кніжкі ў беларускай мове. Ялбжыкоўскі разагнаў і іх. Ксяндзоў беларусаў ён пазбавіў парахвіяў і выслаў іх у якасьці вікарыяў да ксяндзоў — выпрабаваных эндэкаў, пад іх пільны нагляд. Кс. Абрантовіча Ватыкан, бязумоўна, на дамаганьне польскага ўраду выслаў у Харбін, высьвячаючы яго ў сан архімандрыта. У разуменьні палякаў, словы паляк і каталік былі сынонімамі. Для іх было дзіка, каб каталіцкі сьвятар ня лічыў сябе палякам.

Беспацешны абраз прадстаўляла і народная асьвета. Канстытуцыя гарантавала кожнай нацыянальнасьці права навучаньня ў роднай мове. У жыцьцё гэта ня было праведзена. Настаўніцкая сэмінарыя ў Барунах была зачынена. Усе пачатковыя школы ў вёсках і мястэчках былі зачынены. Засталіся 4 гімназіі — Віленская, Наваградзкая, Радашкавіцкая і Клецкая, зь якіх дзьве апошнія былі хутка зачынены. Пакідаючы гімназіі безь дзяржаўнай грашовай дапамогі, улады лічылі, што, дзеля адсутнасьці сродкаў і неабходнага прыгатаванага кантынгенту паступаючых, гімназіі зачыняцца самы. Але кандыдаты падрыхтоўваліся патаемна ўдома беспрацоўнымі беларускімі настаўнікамі. Зьбіраліся мізэрныя сродкі ў выглядзе аплаты за навуку. Настаўніцкі пэрсанал жыў недаядаючы, аднак працы ня кідаў. Ахвярнасьць ягоная была вельмі высокая. Кожны павінен зразумець, што вучыць пры недахопе навуковых дапаможнікаў, ды яшчэ з пустым жыватом,— аграмадная ахвярнасьць з боку настаўніка. Вечная памяць памёршым і загубленым у савецкіх засьценках, слава і гонар тым, што жывуць.

Адміністрацыя назаляла грашовымі штрафамі. Штрафавалі за някованага каня, за сабаку, што сарваўся з ланцуга, за адсутнасьць званка пры дузе ці дошчачкі пры возе з прозьвішчам гаспадара. Адным словам, штрафавалі, каб толькі назаляць насельніцтву. Войтам павінен быў быць паляк. Калі-ж на месцы ня было адпаведнага паляка, як у нас у Любчы, дык назначалі мясцовага беларуса, але такога, які быў, як гаворыцца, «ні ў горадзе Багдан, ні ў сяле Сяліван». Валасную раду камплектавалі з палякаў, у бальшыні асаднікамі і іх жонкамі. Толькі солтысы былі беларусы. Праваслаўнага беларуса баяліся браць нават на стоража ў школу, а бралі паляка адкуль-небудзь збоку. Усё ішло па лініі ўзмацненьня польскага элемэнту, толькі ня якасна, а колькасна. Якасна гэта быў элемэнт самага подлага гатунку. Адначасна ўрадавыя агенты стараліся палянізаваць беларусаў шляхам гутаркі зь імі ў дзяржаўных установах толькі папольску. Усё было накіравана ў вызначаным Скульскім напрамку.

БЕЛАРУСКІ ПАСОЛЬСКІ КЛЮБ У СОЙМЕ

Намалёванае вышэй палажэньне прарочыла ўпорыстую, цяжкую і, памойму, безнадзейную барацьбу. Гэтаму пэсымізму быў супрацьстаўлены

не аптымізм, а, я сказаў-бы, некаторая надзея на тое, што палякі будуць дальнабачнымі палітыкамі і ў інтарэсах сваёй няўзмоцненай дзяржаўнасьці пойдуць на некаторыя ўступкі ў карысьць хоць-бы славянскіх меншасьцяў: ня можна-ж быць у канфлікце з усімі навакол. Пад знакам гэтай надзеі і пайшла праца Пасольскага Клюбу.

Трэба было выбраць старшыню Клюбу і накрэсліць плян соймавай працы Клюбу. Нам трэба было выпрацаваць праграмны мінімум і тактыку ягонага ажыцьцяўленьня. Старшынёю адзінадушна быў выбраны пасол Тарашкевіч.

Што тычылася праграмнага мінімуму, дык было пастаноўлена высунуць патрабаваньне беларускага школьніцтва: арганізацыі беларускіх пачатковых школаў, настаўніцкіх сэмінарыяў, 4 гімназіяў у вышэйуспомненых мною месцах і беларускага факультэту пры Віленскім Унівэрсытэце. Вось менш-больш сьціплыя патрабаваньні ў галіне асьветы. Мы дамагаліся адчужаньня царкоўных, касьцельных, манастырскіх, дзяржаўных і прыватнаўласьніцкіх земляў з надзелам гэтаю зямлёю бяз выкупу бяднейшых сялян. Дамагаліся таксама асыгнаваньня сродкаў на асноўны капітал Беларускага Банку для выдаваньня пазыкаў патрабуючым беларусам, назначэньня беларусаў адміністратарамі, улучна да ваяводаў у беларускіх ваяводзтвах — Віленскім, Наваградзкім, Беластоцкім і Палескім, прыдзелу бясплатнага ляснога матар'ялу і беспаваротных грашовых пазыкаў на адбудову зруйнаваных вайною гаспадаркаў. Пытаньне аб аўтаноміі Заходняй Беларусі было высунута толькі пасьля некаторага часу.

Вось з такімі дамаганьнямі і выступіў з соймавай трыбуны старшыня Клюбу Б. Тарашкевіч. Дамагчыся зьдзяйсьненьня гэтых патрабаваньняў, хаця-б толькі часткова, Клюб вырашыў шляхам удзелу ў працах Сойму і, значыць, шляхам прызнаньня польскай дзяржаўнасьці на нашай тэрыторыі. Адсюль і выплывае удзел у выбарах прэзыдэнта і галасаваньне даверу ўраду ген. Сікорскага. З мэтаю захаваньня ідэалягічнага адзінства Клюбу больш радыкальна настроеная частка паслоў згадзілася на такую тактыку (супроць праграмных патрабаваньняў ніхто не выступаў). Трэба было даказаць нашаму спакойнаму насельніцтву, што нават мінімальных і справядлівых нашых дамаганьняў палякі не задаволяць. Трэба было, каб нашыя палітычныя ворагі не маглі пераканаць нашых выбаршчыкаў у тым, што яны нічога не атрымаюць таму, што выбралі дзікіх, няпрымірымых і незгаворлівых паслоў. Вось чаму Клюб вырашыў пайсьці на безнадзейную і, сказаў-бы, угадовую палітыку. Інакш яе назваць ня можна. Спакойная дзелавая прамова Тарашкевіча была сустрэта эндэкамі няпрыхільна. Чуліся паасобныя выкрыкі: «Niech pan jedzie do Mińska! Czego pan przyjechał tu». Цэнтр і левыя паставіліся ўстрымана спакойна. Саля была напалову пустая. Вось чаму Тарашкевіч распачаў сваю прамову словамі: «Wysoka, ale pusta Izbo!».

Пачалася праца Сойму. У паасобных галінах заканадаўства былі створаны камісіі. У кожную зь іх увайшоў адзін беларус. Я запісаўся ў зямельную камісію. Бяручы ўдзел у ейных працах, я хутка пераканаўся, што нам няма чаго чакаць ад польскага Сойму. Камісія моцна стаяла на пункце падтрымкі польскага элемэнту на «Крэсах» — вайсковых асаднікаў, ды ўзмацненьня гэтага элемэнту цывільнымі асаднікамі шляхам субсыдаваньня іх Дзяржаўным Банкам. Усе, нават дробныя, папраўкі зь беларускага і ўкраінскага боку камісія ўпарта адхіляла. На мае доказы, што ў нас пануе зямельны голад, што ў нас няма свабоднай зямлі, што ў нас цана на зямлю дайшла да неймавернай лічбы — 225 даляраў за гэктар, я чуў адказ: «Калега, дазвольце вам ня верыць. Такой цаны нідзе няма ў Польшчы. На Крэсах хопіць зямлі і для вас і для нас». Ня лепш было і ў другіх камісіях. Голас беларуса і ўкраінца быў голасам гукаючага ў пустыні.

Падобна выглядала справа і ў адносінах польскага ўраду да беларускіх патрабаваньняў. Да перавароту 1926 г. зьмяняліся адзін за другім урады ген. Сікорскага, Грабскага і Вітаса. Сікорскі гутарыў з Тарашкевічам лагодна, спакойна выслухоўваў усе нашыя вышэйуспомненыя дамаганьні і карміў Тарашкевіча абяцаньнямі, што ўсё з часам будзе зроблена. Час ішоў, і ня было нават знаку, што ўрад меў хоць найменшую ахвоту заняцца нашым

ГЕРБЫ БЕЛАРУСКАЕ ШЛЯХТЫ

Герб Юноша

Герб Вуж

Гербам Юноша карысталіся:
Амяцінскі, Аранскі, Арлоўскі, Банькоўскі, Баран, Баранцэвіч, Барановіч, Бараноўскі, Баркоўскі, Бароўскі, Бялінскі, Вольскі, Гадлеўскі, Гзоўскі, Галецкі, Галіцкі, Глінскі, Грахоўскі, Гумоўскі, Дабравольскі, Далецкі, Дамброўскі/Дуброўскі, Даражынскі, Дудзінскі, Жукоўскі, Завадзкі, Заліўскі, Залускі, Здраеўскі, Кавалеўскі, Каменскі, Камарніцкі, Кернажыцкі, Кісялеўскі, Крымоўскі, Лабоцкі, Ліпніцкі, Лісоўскі, Лямніцкі, Макржыцкі/Макрыцкі, Маліцкі, Малыніч, Мацерна, Мокрскі, Набароўскі, Палікоўскі, Палхоўскі, Панятоўскі, Патоцкі, Паўлоўскі, Плавінскі, Пырскі, Пяскоўскі, Расьцішэўскі, Ратомскі, Сабанскі, Сапрыноўскі, Скарлецкі, Сьлівінскі, Смагаржэўскі/Смагарэўскі, Стамкоўскі, Старжынскі, Стапінскі, Стравінскі, Стафаноўскі, Суневіч, Сухадольскі, Хамянтоўскі, Шаняўскі, Шушкевіч, Шымановіч, Шыманоўскі, Шышкоўскі, Яблонскі, Яворскі, Якубовіч, Янішэўскі, Янкоўскі.

Гербам Вуж карысталіся:
Адольскі, Амбражкевіч, Амбражэвіч, Борк, Борх, Вонскі, Длатоўскі, Касаржэўскі/Касарэўскі, Кастравіцкі, Кулаковіч, Кульковіч, Куроўскі, Лойка, Мачульскі, Мігановіч, Мінкевіч, Міхановіч, Падалецкі, Падалінскі, Пясецкі, Рудзкі, Руцкі, Сядлецкі, Туровіч, Фурс, Фурсевіч, Ясенскі, Ясінскі.



Герб Вадвіч

Гербам Вадвіч карысталіся:
Барэйша, Барэйша-Аляхновіч, Волчак, Вянслаўскі, Крэўц, Лойба-Манцігерд, Нарушэвіч, Станкевіч.

Герб Праўдзіч

Герб Трэска

Герб Прыяцель

Гербам Прыяцель карысталіся:
Бутовіч, Вайцяховіч, Вуловіч, Грабоўскі, Грыневіч, Даўнаровіч, Дулеўскі, Кудзіновіч, Ліпінскі, Лук'яновіч, Лук'янскі, Лядніцкі, Мацкевіч, Мусніцкі, Паўловіч, Прышыхоцкі, Раманоўскі, Скірмунт, Тамковіч, Шэмбель, Юроўскі, Яновіч.

Гербам Праўдзіч карысталіся:
Альшэўскі, Арцімовіч, Арцішэўскі, Бараноўскі, Бельскі, Браткоўскі, Брахоцкі, Валянскі, Влодак, Воўчак, Вольскі, Высоцкі, Вышамірскі, Вяржбоўскі/Вярбоўскі, Галынскі, Граковіч, Грамніцкі, Гузэльф, Дзванкоўскі, Дзердзяеўскі, Залескі, Зарэмба, Заянчкоўскі, Зубоўскі, Ізьбіцкі, Крушынскі, Кукленскі, Куксінскі, Кухарскі, Левандоўскі, Манькоўскі, Мольскі, Мурашка, Няміра, Пасяніцкі, Рымашэўскі, Савінскі, Салагуб, Сакалоўскі, Сарбеўскі, Сіцінскі, Слугоцкі, Стржалкоўскі/Стралкоўскі, Сямкоўскі, Трапша, Філіповіч, Цыбульскі, Шымакоўскі, Шыманоўскі, Ярашэўскі.

Гербам Трэска карысталіся:
Альшэўскі, Бельскі, Блажаеўскі, Богуш, Буткевіч, Бялінскі, Выляжынскі, Галынскі, Глінка, Горскі, Закрэўскі, Залескі, Канапацкі, Клячкоўскі, Краеўскі, Мейштар, Міхалоўскі, Міхальскі, Мсьціхоўскі, Панцяржынскі, Паплаўскі, Папоўскі, Пстроцкі, Сакалоўскі, Сяклюцкі, Сямірадзкі, Траска, Тржаекоўскі (Траскоўскі), Трускоўскі, Тышка, Хайнацкі, Шчуцкі, Янчэўскі.

пытаньнем. Урад Сікорскага, нічога нам ня даўшы, упаў. Наступныя ўрады Грабскага і Вітаса таксама нічога нам ня прынесьлі. Праўда, мы і не чакалі нічога добрага. Грабскі і Вітас у сваіх экспазэ туманна выказаліся, што з братнімі славянскімі меншасьцямі паладзяць, а як? Аб гэтым яны не сказалі нічога. Беларускі Клюб і не чакаў ад іх нічога пазытыўнага і таму пры ўдзяленьні вотум даверу галасаваў супроць.

Хоць ня хоць, давялося перагледзець нашую тактыку як у Сойме, так і ў Сэнаце. У Сойме Клюб перайшоў да больш вострай апазыцыі шляхам выступленьняў з соймавай трыбуны і складаньня інтэрпэляцыяў з прычынаў усякага роду правапарушэньняў органаў адміністрацыі на месцах. Апрача таго, была прынята пастанова Клюбу заклікаць беларусаў да стварэньня палітычнай арганізацыі. Заклік праводзіць церазь беларускую прэсу і шляхам публічных сходаў, пад выглядам дэпутацкіх справаздачаў. Праўда, некаторыя паслы, а асабліва сэнатары, не праводзілі гэтых сходаў. Клюбам быў апрабаваны праект аўтаноміі Заходняй Беларусі. Праект быў выпрацаваны Тарашкевічам, прааналізаваны ведамым у той час віленскім адвакатам Тадэўшам Врублеўскім і ім апрабаваны. Унесьці яго на разгляд у Сойм не давялося. Прычына наступная. Тарашкевіч трымаў яго ў сябе. Час мінаў, і так дацягнулася да падзелу Клюбу на Сялянска-Работніцкую Грамаду і Беларускі Нацыянальны Клюб. Грамада моўчкі адмовілася ад аўтаноміі і стала на становішча аб'яднаньня ўсяе Беларусі ў БССР. Нацыянальны Клюб складаўся зь Сялянскага Саюзу, Хрысьціянскай Дэмакратыі з кс. Ад. Станкевічам і В. Багдановічам, і беспартыйных. Грамада і Клюб трымаліся ў Сойме больш-менш аднае тактыкі: вострая апазыцыя, інтэрпэляцыі ў Сойме, арганізацыя беларускага жыхарства і ўзьняцьце яго супроць польскай улады.

Інтэрпэляцыі складаліся з паказаньняў на няправільныя пастулкі адміністрацыі ў адносінах да беларускага жыхарства, на скаргі сялян з патрабаваньнем прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці. Нажаль, многія, што скардзіліся, выяўлялі сябе зьменлівымі і маладушнымі. На допытах, выкліканых нашымі інтэрпэляцыямі, яны запярэчвалі факты, паданыя імі самымі ў іхных скаргах. Такім чынам яны ставілі паслоў у вельмі няпрыемнае становішча палітычных ілгуноў. Падам канкрэтны доказ. Сяляне вёскі Гарадзея доўгай тэлеграмай выклікалі мяне з Варшавы, скардзячыся, што ўланы, якія ў іх расквартараваліся, забіраюць у іх авёс і б'юць мужчынаў і жанчынаў. Я прыехаў туды. Знаючы псыхіку селяніна, што ён трымаецца таго, што падпісаў, я апытаў пакрыўджаных. Яны пры ўласнаручным подпісе сьведчылі, што ўланы грабілі авёс, што не дазвалялі вечарам выходзіць з хатаў з мэтаю, каб было выгадней шнарыць па сялянскіх клецях, білі людзей, і адна жанчына з прычыны біцьця перадчасна радзіла. Узброіўшыся сьведчаньнямі сялян, я склаў інтэрпэляцыю, дамагаючыся пацягнуць вінаватых да праўнай адказнасьці. Пасьля некаторага часу я атрымаў ад Міністра Справаў Вайсковых адказ, у якім было сказана, што ў інтэрпэляцыі ўсё няпраўда, што сяляне выракліся ўсіх пададзеных мною фактаў. Што-ж сталася? Вось што. На другі дзень пасьля таго, як я склаў інтэрпэляцыю, камандзір палка склікаў афіцэраў і сяржантаў, вылаяў іх і запатрабаваў, каб за ўсякую цану палагодзіць справу мірным шляхам з усімі пакрыўджанымі. Яны яе і палагодзілі. Мае сьведкі адмовіліся ад усіх сваіх абвінавачваньняў. Я застаўся ў дурнях.

Апрача скаргаў, былі і просьбы асабістага парадку. Так, напрыклад, адзін выбаршчык Нясьвіскага павету прасіў даць яму грошы на адчыненьне рэстарану, другі прасіў купіць яму каня, а трэці, зь Піншчыны, купіць для ягонага сына (сам ён быў без абядзьвёх рук) кавадла і другія кавальскія прылады. Выбаршчыкі немцы праз свае арганізацыі падтрымоўвалі свой пасольскі клюб, аплачваючы сакратара клюбу, машыністку і паштовыя расходы. Словам, наш выбаршчык ня мог яшчэ зразумець, што для палітычнай барацьбы патрэбны сродкі, а не глядзець на пэнсію паслоў як на нейкую крыніцу, адкуль і ён мог-бы чэрпаць на сваю асабістую карысьць. Вельмі часта пачалі адведваць клюб людзі, якія, прыехаўшы ў Варшаву, прасілі на паваротны білет. Нарэшце дайшло да таго, што аднаму з гэткіх просьбітаў,

да таго вельмі падазронаму асабню, я сказаў, што клюб ня ёсьць беларускім міністэрствам фінансаў і на падобныя расходы ня мае ніякіх сродкаў.

ПОЛЬСКІЯ ПАРТЫІ І БЕЛАРУСКІ ПАСОЛЬСКІ КЛЮБ

Польскія партыі правыя і цэнтар глядзелі на беларусаў няпрыхільна, як на ўтоеных бальшавікоў. Левыя — «Вызваленьне» і ППС, захоўваючы вонкава прыязныя суадносіны, ня ішлі на ніякія ўступкі на нашую карысьць. Будучы радыкальнымі ў пытаньнях, датычных інтарэсаў палякаў, яны былі рэакцыйна-кансэрватыўныя ў адносінах да нашай нацыянальнасьці і ейных патрэбаў. Кахановіч гаварыў, што лепш мець дачыненьні з эндэкамі, чым з «Вызваленьнем» і ППС. Эндэкі — людзі культурныя і калі што абяцаюць, дык сваё абяцаньне датрымаюць. Гэтыя-ж другія могуць паабяцаць горы, а нічым не паступяцца. Гэтакі пагляд Кахановіча. Валошын казаў: «Ня вер ты ў гонар іграка, ня вер ты дружбе паляка». Я гаварыў: «Ёсьць расейская прыказка — паскрабі расейца — знойдзеш татарына, я-ж кажу: паскрабі ППС і нават польскага камуніста — знойдзеш эндэка». Іншыя нашыя паслы і сэнатары падзялялі больш-менш падобныя пагляды.

Была і сярод палякаў у Вільні невялічкая група зь некалькі чалавек, так званых «краёўцаў» — прыхільнікаў беларусаў. Яны насілі Пагоню і называлі сябе грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага. Да іх належаў ведамы адвакат Тадэўш Врублеўскі, Абрамовіч і адвакат Міцкевіч. Яны выдавалі нават газэту «Przegląd Wileński». Але гэтая група інтэлігентаў ня была ўплывовай у віленскіх польскіх колах.

Нават польскія сялянскія радыкалы маркі «Вызваленьня» сваёю тактыкаю адносна беларусаў давялі да таго, што беларусам, якія былі ў іх партыі, зрабілася душна. У іх пачало браць верх перакананьне, што яны папалі ў варожы іхняму народу лягер. Папалі-ж яны туды дзякуючы Ваевудзкаму, які ад пачатку выбарчае кампаніі ўзначаліў польскую партыю «Вызваленьне» на Віленшчыне. Церазь ягоныя рукі праходзілі ўсе асыгнаваньні на выбары для «Вызваленьня». Будучы чалавекам спрытным, які добра ар'ентаваўся ў настроях мясцовага насельніцтва (Ваевудзкі — небагаты абшарнік Сьвяньцянскага павету), ён адразу зразумеў, што патрэбны паслы беларусы, і то з радыкальнымі паглядамі, але з польскаю маркаю. Будучы пад крыльцам дэфэнзывы, ягоныя агітатары кідалі ў народ бальшавіцкія клічы, надзвычай затрудняючы беларускую агітацыю. Значная частка беларусаў, сымпатыкаў усходу, аддала свае галасы за кандыдатаў «Вызваленьня». У Сойм увайшлі беларусы-вызваленцы: Шакун, Балін, Галавач і Шапель. Ваевудзкі і прыгарнуў іх пад сваю высокую руку, уважна сочачы за іх настроямі. Ня мінула і два месяцы, як гэтыя беларусы ўбачылі, што яны папалі ня туды, дзе ім належалася быць. Бяручы ўдзел у фракцыйных паседжаньнях, яны лёгка зразумелі, што Ваевудзкі стаіць у абароне чыста польскіх інтарэсаў, а інтарэсы беларусаў для яго калі не варожыя, дык былі чужыя. Першы прабудзіўся Балін, чалавек разумны і з вострым языком. Вось ён і вырашыў перайсьці ў Беларускі Клюб. Ён падаў заяву аб прыняцьці яго ў лік сяброў Клюбу ды нават заняў у клюбнай шафе для сябе месца. Рэшта гатова была пайсьці за ягоным прыкладам. Гэта ўстрывожыла не на жарты пасла Ваевудзкага. Ён пастанавіў за ўсякую цану не дапусціць да ўзмацненьня беларускага парляманцкага прадстаўніцтва. Ён, магчыма, з багаславенства Міністэрства Нутраных Справаў арганізуе новую, радыкальную польскую партыю, пад назовам: «Niezależna Partja Chłopska». У яе, апрача Ваевудзкага, увайшоў др. Федаркевіч (паляк) і чатыры вышэйупомненыя беларусы. У сваёй газэце Ваевудзкі выстаўляў у карыкатурны спосаб ксяндзоў і паліцыю. Паводля зьместу гэта быў камуністычны падгалосак.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ СОЙМАВАЙ БАРАЦЬБЫ

Завостраная апазыцыя ў Сойме, шматлікія інтэрпэляцыі і вострыя выступленьні паслоў на мітынгах-справаздачах мелі свае насьледкі. Па-пер-

шае, яны змушалі ўрад і адміністрацыю пераглядзець свае адносіны да беларусаў, па-другое, улівалі ў беларусаў бадзёрасьць, сьмеласьць і жаданьне арганізавацца для супольнага з паслямі змаганьня за свае правы. Народ выйшаў з пасыўнасьці, адмовіўся ад пагляду: «не, нябось так ня будзе, нябось прыйдуць, нябось зробяць, нябось дадуць». Гэтую пасыўнасьць ён замяніў на «выйдзем шчыльнымі радамі». Ён пераканаўся, што вызваленьня можна дабіцца толькі сваёю ўласнаю рукою. Гэткая адбылася зьмена ў народнай псыхіцы. І ўрад, і Сойм бачылі, што неабходны некаторыя ўступкі славянскім меншасьцям, але адначасова і баяліся, каб гэтыя ўступкі не зашкодзілі «польскай рацыі стану» на ўсходніх «Крэсах». Думалі, думалі і выдумалі польскія курсы для беларусаў-настаўнікаў у г. Кракаве, а пасьля «Ustawę jezykową».

Як я ўспомніў вышэй, сярод сялянскай масы была невялікая колькасьць настаўнікаў. Гэта былі дрожджы, што выклікалі палітычны фэрмэнт. Вось палякам і стрэліла ў галаву думка нэўтралізаваць іх шляхам выцягненьня іх з народнай гушчы і выкарыстаньня як дзяржаўна-творчага элемэнту, але на тэрыторыі з чыста польскім жыхарствам або на заходніх «Крэсах» (Памор'е і Пазнаншчына). Для гэткіх настаўнікаў і былі зарганізаваны на дзяржаўны кошт курсы палянізтыкі ў Кракаве. Да курсантаў уважна прыглядалася начальства, вынюхваючы, хто якою пахне палітыкай. Пасьля заканчэньня курсаў адзінкам зь іх, найбольш спрытным і пранырыстым, удалося ўладзіцца настаўнікамі ў польскіх школах Заходняй Беларусі. Іншыя былі расьцярушаны па школах Кангрэсоўкі і заходніх «Крэсаў».

Гэткае мерапрыемства не аслабіла антыпольскіх настрояў на Беларусі. Раз разбуджаны народ не хацеў заснуць. Апазыцыйныя настроі ўзмацоўваліся. Патрэбны былі новыя ўступкі на карысьць беларусаў. Вось тут і выступіў лідар «Вызваленьня» Тугут са спробаю заспакаеньня славянскіх меншасьцяў. Была створана камісія пад ягоным старшынствам для выпрацаваньня закону аб ужываньні ў школьніцтве і грамадзкім жыцьці беларускай і ўкраінскай моваў. Выпрацаваны камісіяй праект закону паступіў у Сойм і быў прыняты большасьцю польскіх партыяў супроць галасоў нацыянальных меншасьцяў. Яны дамагаліся правядзеньня ў жыцьцё параграфу канстытуцыі аб культурнай аўтаноміі для нацыянальных меншасьцяў. Палякі ўважалі, што параграфы аб нацыянальных меншасьцях былі накінуты Польшчы Вэрсальскім Трактатам, дык яны пастараліся як мага хутчэй забыцца аб гэтых параграфах. Антанта-ж ня лічыла патрэбным прыгадваць аб гэтым, таму што палякі маглі палічыць гэта як умяшаньне ў іх нутраныя справы.

Калі сама ўстава ў сапраўднасьці нам нічога не давала (была рэдагавана паезуіцку), дык ужо «Przepisy wykonawcze» (урадавыя распараджэньні аб спосабах яе ажыцьцяўленьня) канчаткова зводзілі яе на нішто. Устава давала нам права гаварыць ува ўрадавых і самаўрадавых установах ды нават пісаць просьбы і заявы пабеларуску. Урадаўцы адмаўляліся выслухоўваць просьбітаў, выясьняючы гэта неразуменьнем нашай мовы. Закон даваў нам права адчыняць дзяржаўныя пачатковыя школы з навучаньнем у роднай мове. «Przepisy» вымагалі, што такую школу можна адчыніць толькі там, дзе знойдзецца ня менш за 40 чалавек, якія жадаюць вучыць сваіх дзяцей у беларускай мове. Пры гэтым кожны, хто жадаў, павінен быў падаць у школьны інспэктарат заяву з уласнаручным подпісам, зацьверджаным натарыюсам або, у крайнім выпадку, войтам гміны. На войта, калі ён быў беларус, рабіўся павятовым старастам націск, каб не зацьвярджаць. Шматлікія войты проста адмаўляліся зацьвердзіць. Ня гледзячы на такія перашкоды, вельмі многа беларусаў падалі дэкларацыі на беларускія школы. Хоць ня хоць давялося адчыняць школы. Што-ж гэта былі за беларускія школы? Беларускага было ўсяго толькі, што шыльда была напісана пабеларуску. Навучаньне адбывалася ў польскай мове. Беларуская-ж мова талеравалася толькі на лекцыях гімнастыкі і рысункаў. Зь бегам часу былі зьняты і шыльды, як у школе вёскі Асташына. Рэшта школаў былі ўтраквістычныя, дзвюхмоўныя — польска-беларускія, хоць беларускім духам там і ня пахла. Усё вялося папольску. Мне не давялося пачуць нават ніводнай беларускай

песьні: гучэлі ўсё польскія. Прыватныя беларускія школы зачыняліся паліцыйнымі загадамі і накладаньнем грашовых штрафаў на бацькоў. Нахабства дайшло да таго, што наваградзкі школьны інспэктар загразіў мне, нятыкальнаму паслу, што не падлягаў ніякім паліцыйным спагнаньням, грашовым штрафам за непасыланьне маіх дзяцей у польскую школу. На ягоную пагрозу я адказаў: «Спрабуйце!» Спрабаваць, аднак, не адважыўся.

Вось якія посьпехі дала нашая праца ў польскім Сойме. Трэба прызнацца, што яны былі непацяшаючыя. Вонкі Сойму, на фронце ідэалягічным, былі дасягнуты некаторыя пазытыўныя вынікі: народ пасьмялеў, прабудзілася актыўнасьць змаганьня за сваё нацыянальнае «Я», народ адчуў сябе нацыяй, зьявілася сьведамасьць арганізаванай барацьбы шляхам тварэньня палітычных партыяў і культурна-прасьветных установаў: Інстытут Гаспадаркі і Культуры ў Вільні, Таварыства Беларускай Школы і да таго падобныя.

ГРАШОВЫЯ СРОДКІ КЛЮБУ

Напалеон казаў, што, каб весьці вайну, патрэбны тры рэчы: грошы, грошы і грошы. Палітычная барацьба, каб яе весьці пасьпяхова, патрабуе грошай, грошай і грошай і яшчэ раз грошай. Яны неабходны для выдаваньня газэтаў, лістовак, на аплату супрацоўнікаў газэтаў, на стварэньне хаця-б павятовых партыйных цэнтраў, на аплату кіраўнікоў гэтых цэнтраў, на арганізацыю прэсавых прадстаўніцтваў спачатку хаця-б толькі ў Бэрліне і Парыжы. Апрача таго, патрэбны былі сродкі на падтрымоўваньне культурна-прасьветных установаў, як гімназіі, некалькі прыватных пачатковых школаў. Патрэбны былі сродкі, і немалыя.

У заходніх краінах з арганізаваным палітычным жыцьцём партыйныя касы папаўняліся самаападаткаваньнем сяброў і ахвярамі прыватных асобаў — сымпатыкаў тае ці іншае партыі. На ўсходзе, у Расеі, касы С. Д. і С. Р. папаўняліся, апрача ахвяраў багатых людзей, шляхам так званых экспрапрыяцыяў — абрабаваньняў. Так, у свой час былі аграблены мытныя карэткі ў Пецярбурзе на Фантанцы, у Тыфлісе (Сталінам) і Маскоўскае Таварыства Ўзаемнага Крэдыту. Гэта дало падпольным арганізацыям агулам 1.500.000 залатых рублёў. Мы, беларусы, ня мелі ў сваім распараджэньні ніводнага з гэтых сродкаў. А грошы патрэбны былі на аплату працаўнікоў Клюбу, на канцылярыйныя і паштова-тэлеграфічныя расходы. Востра стаяла пытаньне з матар'яльным палажэньнем Віленскай і Наваградзкай гімназіяў. Пры адсутнасьці дапамогі звонку яны, бязумоўна, зачыніліся-б. Трэба было ратаваць палажэньне. Пасольскі Клюб адзінадушна пастанавіў затрымоўваць на грамадзкія патрэбы 30 % з дыетаў, што выплачваліся паслом. Гэта давала 300 злотых з кожнага пасла і сэнатара ў месяц, а ў агульнай суме — 4500 зл., што, паводля тагачаснага курсу, складала 900 даляраў. Зь іх выдаваліся некаторыя сумы на гімназіі. Якія, ня памятаю. Ува ўсякім выпадку крытычнасьць мінула. Гімназіі ледзь жылі. Сябры Клюбу ламалі сабе галовы ў пошуках другіх крыніцаў.

Паслом заставалася 700 зл. у месяц. Гэтага павінна было хапіць на ўтрыманьне сям'і, на гатэлі і харчы ў Варшаве ды на расходы ў часе выездаў па акрузе (памешканьне, харчы і хаця-б мінімальная дапамога выдатнейшым працаўніком на правінцыі). Аб падтрымцы з боку выбаршчыкаў пакуль што ня можна было і думаць.

НУТРАНЫ СТАН КЛЮБУ

Палітыка Тарашкевіча гутарак з палякамі не давала ніякіх надзеяў на перамену на лепшае ў беларуска-польскіх суадносінах. Ягоныя канфэрэнцыі з маршалкам Сойму Ратаем закончваліся нічым, хоць Тарашкевіч і меў сярод палякаў старых знаёмых па Петраградзе і Вільні, як Бітнэр, Касьцялкоўскі, Ваевудзкі і інш.

Палякі стараліся ня тушыць, а раздзьмухваць польска-беларускую варажнечу шляхам прасьледаваньня нават беларускіх паслоў. Так, дзякуючы

інтрыгам польскай адміністрацыі, Найвышэйшы Суд у Варшаве скасаваў мандат пасла Каліноўскага па Беластоцкай акрузе. Гэта было зроблена на аснове, што Каліноўскі, як сын расейскага ўрадаўца, быццам ня меў польскага грамадзянства. Ягоны бацька перад першай Сусьветнай вайной быў вясковым фэльчарам у родным Ваўкавыскім павеце, і там-жа Каліноўскі атрымаў у спадчыне пасьля сьмерці бацькі невялікую сялянскую гаспадарку, што давала яму права аўтаматычна, як аўтахтону, мець польскае грамадзянства.

Супроць паслоў Гродзеншчыны Барана і Якавюка стараньнямі дэфэнзывы была змантавана судовая афэра аб шпіёнсьцьве на карысьць Летувы. Іх абодвых прысудзілі на 4 гады цяжкай турмы. Толькі Якавюк, які да апэляцыйнага суду быў на волі, здолеў уцячы цераз Данцыг у Летуву. Баран адсядзеў 4 гады і за згодаю савецкага Палпрэдства ды зь ягонаю візаю выехаў у СССР. Каліноўскі з жонкаю у такі самы спосаб выехалі ў БССР, у Менск. Аб далейшым іх лёсе нічога ня ведама. На месца Каліноўскага ў Сойм увайшоў Валошын. Гэта былы паштальён, чалавек малавыраблены, з камуністычным ухілам, сьмелы і рашучы. Ён напэўна мог быць «экспрапрыятарам» мытных карэтак і банкаў.

Да часу прыходу Валошына Клюб быў незадаволены тактыкаю ўгоды. Гэта адбілася рэхам на месцах. У Вільні з рук у рукі пачала хадзіць бязьвінная карыкатура на Тарашкевіча: конь імчыць на ўсход, а Тарашкевіч на кані, зь мячом і тварам на захад, трымаецца за хвост каня. Ар'ентацыя на ўсход сярод беларусаў, асабліва праваслаўных, узмацнялася. Каталіцкая частка, якою кіравалі беларускія ксяндзы, моцна трымалася ар'ентацыі на самых сябе. Былі, зразумела, і з ар'ентацыяй на Польшчу. Я асабіста быў таксама прыхільнікам усходу. Я лічыў, што Польшча з прычыны свайго стратэгічнага і геаграфічнага палажэньня ня пойдзе на нейкую фэдэрацыю з аб'еднанаю Беларусьсю. Летува, Латвія і Эстонія былі, па-мойму, сэзоннымі дзяржавамі. Апораю Беларусі яны не маглі быць у ніякім выпадку. Адсюль лягічна вынікала ар'ентацыя на ўсходняга суседа. Здавалася, што там будуецца «Беларускі дом». Пакуль бальшавікі былі слабыя, беларусы чуліся гаспадарамі на сваёй тэрыторыі. З часам, пачуўшыся ў сілах, бальшавікі анулявалі ўсе свае ўступкі.

Тарашкевіч, расчараваны ў сваіх сымпатыях да палякаў, пастанавіў пакінуць становішча старшыні Клюбу, хоць ніхто яго і ня змушаў да гэтага. Клюб выбраў старшынёю Рагулю. Тое самае адбылося і ў Украінскім Клюбе, дзе Васынчука замяніў пасол Хруцкый.

Было вырашана заняць становішча безадказнай апазыцыі ў Сойме, заваструючы выступленьні, ды на месцах, заклікаючы народ да арганізаванай барацьбы. Вось дзе корань будучага падзелу Клюбу на Нацыянальны Клюб і Сялянска-Работніцкую Грамаду. Яшчэ перад пераменай старшыні Рагуля запрапанаваў стварыць сялянскую радыкальную партыю. У аснову праграмы было запрапанавана паставіць бясплатнае адчужаньне на базе нацыяналізацыі ўсіх родаў зямлі і бясплатны надзел ёю безьзямельных і малазямельных сялян на аснове хутарнай сыстэмы. Была выпрацавана і адпаведная партыйная праграма. Умяшаньне Менску і Масквы пераблытала ўсе карты.

Трэба сказаць, што ўсе беларускія паслы і сэнатары, за выняткам сэнатара Ўласава і пасла Аўсяніка, заходзілі ў савецкае пасольства ў Варшаве. Адны прасілі пераслаць каму-небудзь грошы за пасярэдніцтвам Зьнешгандлю або прыняць у Саветы якую-небудзь эміграцкую сям'ю, другія рабілі даведкі аб сваякох і знаёмых, што засталіся ў Саветах, не кранаючы ніякіх другіх пытаньняў. Мне самому давялося асабіста адведаць пасла Войкава з просьбаю даць беспаваротную візу для пазбаўленага мандату пасла Каліноўскага з жонкаю. Усе беларускія просьбы палагоджваліся бесьпярэчна і хутка. У такі спосаб Саветы расстаўлялі паволі сеткі для лову беларускіх душаў. Урадаўцы пасольства ўвіваліся каля нашых паслоў. Так, нейкі Кабецкі, які пасьля зрабіў няўдалую спробу дзяржаўнага перавароту ў Эстоніі ў Тальліне, круціўся каля Кахановіча. Ад яго Кахановіч атрымаў на беларускія патрэбы 500 дал. Грошы былі здадзены ў касу Клюбу.

Пастанова аб завастрэньні змаганьня на месцах шмат кім зь сяброў не праводзілася ў жыцьцё. Былі выпадкі, калі мая просьба выехаць куды-небудзь на акругу адхілялася дзеля нейкай выдуманай прычыны. Пасол Аўсянік катэгарычна адказаў: «Я не паеду і з соймавай трыбуны гаварыць ня буду; усёроўна ў будучыні мяне ня выберуць паслом». Кахановіч рэдка калі прыходзіў у цьвярозым стане на паседжаньні Сойму. Аднойчы, будучы да няпрытомнасьці п'яны, у буфэце галоўнай станцыі ў Варшаве забраў з-пад носа нейкага спадара катлету, а ў другога шклянку піва. Назаўтра ў «Warszawskiej Porannej Gazecie» з гэтай нагоды зьявіўся артыкул Новічыньскага пад загалоўкам: «Wywłaszczenie kotletu bez odszkodowania». Спэцыяльнае паседжаньне Клюбу, дзе прысутны і Кахановіч. Я паставіў пытаньне рубам. Я сказаў: «Міхаіл Сяліванавіч! Адмоўцеся ад мандату і вызвальце маю акругу ад гэткага дэпутата». Па твары ў яго пакаціліся сьлёзы. Ён адказаў: «Я хворы».— «Калі вы хворы — вось вам лякарства»,— і я выняў з кішэні маленькую бутылачку стрыхніны. Я усё-ж налягаў на сваім. Клюб прыняў кампрамісовую пастанову. Кахановіч піша заяву і даручае яе мне. Я магу зрабіць зь яе ўжытак толькі ў выпадку, калі падобны выбрык паўторыцца, і толькі пры аднагалоснай пастанове Клюбу. Чакаць доўга не давялося. Ён выклікаў авантуру з афіцэрам у вагоне. Клюб пастанавіў даць ход ягонай заяве. Кахановіча ўгаварылі ехаць у Данцыг, дзе сэнатар Назарэўскі пры пасярэдніцтве савецкага агэнта, нейкага Курляндзкага, пасадзіў Кахановіча на савецкі параплаў, забраў ягоны дэпутацкі дакумант, даўшы яму ўзамен з клюбовай сумы 300 рублёў золатам.

На месца Кахановіча ўвайшоў Юрка Сабалеўскі, што сядзеў у наваградзкай вязьніцы, ды на пастанову Сойму быў вызвалены дзеля выконваньня дэпутацкіх абавязкаў. Пакрыўджаны палякамі Тарашкевіч павярнуў стырно на 180° налева. Ён зрабіўся прыхільнікам Саветаў. Некаторыя гаварылі, што ён нават быў уступіў у камуністычную партыю. Цьвердзіць гэта я ня маю асноваў.

У міжчасе каля нашых паслоў пачалі ўвівацца савецкія агенты. Аднойчы я застаў у маім памешканні нейкага чалавека. Ён сказаў, што прыехаў з Саветаў і хоча гутарыць зь беларускімі прадстаўнікамі. Я ўладзіў зборку, запрасіўшы Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага і Мятлу. У доўгіх гутарках незнаёмы мне чалавек угаворваў мяне адкінуць буржуазныя перажыткі, адкінуць пачуцьцё дробнай сялянскай собскасьці і на гэтай базе арганізаваць у Заходняй Беларусі новую партыю. Мае сябры ня ўмешваліся ў нашую дыскусію. На маё пытаньне: «што гэта будзе за партыя, камуністычная?» быў адказ: «Не, гэта будзе мосьцік да камунізму». Я ведаў, што прысутныя мае калегі сымпатызавалі Саветам, і дзеля гэтага сказаў: «Таму, што я ня хачу ісьці на другі бераг (камунізм), дык не пайду і на мосьцік. Цяпер я лічу, што мая далейшая прысутнасьць тут ёсьць лішняя. Маё памешканьне ў вашым распараджэньні, працягвайце! Даю вам слова гонару, што буду аб гэтым маўчаць». Безь мяне яны пастанавілі арганізаваць новую партыю — «Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду». У такі спосаб нарадзілася і ахрысьцілася Грамада, што пацягнула пасьля за сабою пагібель маіх сяброў, сумленных, шчырых беларусаў — патрыётаў свае Бацькаўшчыны.

IV

РОСТ І РАЗЬВІЦЬЦЁ БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЙ ГРАМАДЫ

ПАДЗЕЛ ПАРЛЯМАНЦКАГА ПРАДСТАЎНІЦТВА

Яшчэ перад заснаваньнем Грамады Тарашкевіч у адным са сваіх соймавых выступленьняў, крытыкуючы адносіны палякаў да беларусаў, супрацьпаставіў іх палітыку палітыцы Саветаў. Ён сказаў, што тут, у Польшчы, нічога нам не даюць нават з таго, што гарантавана канстытуцыяй. Там-жа, на ўсходзе, будуецца «Беларускі дом», разумей — беларуская дзяржава БССР.

У тое, што на ўсходзе арганізуецца сапраўды беларуская дзяржава, у якой самы беларусы будуць гаспадарамі, верыў ня толькі адзін Тарашкевіч і ягоныя сябры. У гэта паверылі нават некаторыя сябры Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі на эміграцыі, у Чэхіі. Частка зь іх даверліва пераехала ў БССР, дзе ўсе яны пагінулі ў засьценках ГПУ або ШИЗО (Штрафной Изолятор), у канцлягерох. Іх лёс падзялілі і мясцовыя нацыяналісты, як іх называлі бальшавікі,— Нацдэмы. Адны, як старшыня Соўнаркому Беларусі — Чарвякоў, праф. Ігнатоўскі — закладчык Беларускай Акадэміі Навук, і Галадзед, скончылі самагубствам, не жадаючы жыўцом аддацца ў рукі катаў ГПУ. Іншыя, як камандуючы войскамі Беларускай Ваеннай Акругі генэрал Убарэвіч, былі расстраляны. Вось у якую пастку папала Грамада і яе кіраўнікі.

Пасьля падзелу Клюбу Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Валошын стварылі фракцыю Сялянска-Работніцкай Грамады. Пазьней да яе прылучыўся і Ю. Сабалеўскі, якога выпусьцілі з турмы. Сабалеўскі хістаўся, куды прыстаць: да нас ці да Грамады. Я яму сказаў, што калі ён думае шукаць у будучыні ратунку на ўсходзе — дык няхай ідзе ў Грамаду, калі-ж думае застацца ў Польшчы, дык лепш далучыцца да нас, не задумоўваючыся аб тым, што нас чакае. Рэшта паслоў і сэнатараў стварылі Беларускі Нацыянальны Клюб. У ягоны склад увайшлі Сялянскі Саюз з Рагуляю і Ярэмічам, Хрысьціянская Дэмакратыя з кс. А. Станкевічам і беспартыйныя. Сялянскі Саюз пачаў выдаваць свой орган «Сялянская Ніва», а органам Хрысьціянскай Дэмакратыі засталася «Крыніца».

У сваёй дэклярацыі ад імя Клюбу з трыбуны Сойму В. Рагуля заявіў: «Stoimy przy naszym sztandarze narodowym i przy nim stać będziemy».

Нечаканы для шырокіх масаў раскол Клюбу выклікаў на месцах прыгнятаючае ўражаньне. Выбаршчыкі не маглі зразумець таго, што сталася, і падчас сустрэчаў пыталіся аб прычынах. Ня ведаю, як выясьнялі паслы грамадоўцы, але мы, сябры Клюбу, туманна і няўпэўнена даводзілі неабходнасьць дыфэрэнцыяцыі сілаў. Туманнасьць і няўпэўненасьць нашых тлумачэньняў была насьледкам нашага нежаданьня выяўляць перад выбаршчыкамі, сярод якіх былі і агенты дэфэнзывы, пракамуністычны настрой Грамады. Гэта мела-б характар даносу і магло-б быць выкарыстана Грамадою ў палеміцы супроць нас. Клюб быў вельмі асьцярожны ў крытыцы Грамады, імкнучыся захоўваць зь ёю добрыя суадносіны, і на гэтым шмат траціў у вачох выбаршчыкаў. З пасламі грамадоўцамі былі нядрэнныя, калі не сказаць добрыя суадносіны. З Тарашкевічам мы часта пасяброўску гутарылі. Валошын давяраў мне ўсе партыйныя тайны, а з Сабалеўскім мы сябравалі. Інакш было на месцах, а асабліва ў прэсе. Нажаль, наш выбаршчык тады яшчэ не навучыўся крытычна падыходзіць да друкаванага слова. Ён верыў, што ўсё, што надрукавана ў газэце — 100 % праўда. Гэта стараліся выкарыстаць грамадоўскія газэты, што выходзілі адна за другою пад рознымі назовамі. Адказным рэдактарам-«зіцрэдактарам», рэдактарам для адседкі прысудаў суду быў в. п. М. Шыла, які памёр на эміграцыі. Уважаю, што фактычным рэдактарам, ад якога выходзіла кожнае газэтнае грамадоўскае слова, быў А. Луцкевіч. Гэта быў чалавек зь вялікай хваравітай амбіцыяй, добры крытык, глыбокі знаўца беларускай літаратуры і слабы палітык. Кожнага, хто не пагаджаўся зь ягонымі поглядамі, ён уважаў за асабістага ворага і пісаў аб ім усякія паклёпы, ня лічачыся з этыкаю сапраўднага журналіста. Яму добра было ведама старое правіла палемікі: калі хочаш перамагчы праціўніка, дык пачынай з лаянкі і пісаньня розных выдумак асабістага характару. Падобная тактыка выводзіла праціўніка з духовай раўнавагі, і ён дапускаўся нятакту, якім і карыстаўся праціўнік. А. Луцкевіч выбраў мэтаю для свае бамбардыроўкі Рагулю і Ярэміча, якія адважыліся выламацца з-пад ягонага кіравецтва. У адносінах да другіх паслоў і сэнатараў Бел. Нац. Клюбу ён ужываў тактыку замоўчваньня. Чаго толькі ня сыпалася на нашыя галовы? Правакатары, польская дэфэнзыва, прадажнікі, зраднікі. Не хапала назваць яшчэ забойцамі і зладзеямі. Вось арсэнал палітычных аргумантаў галоўнага рэдактара грамадоўскіх газэтаў. Спачатку мы кіраваліся радаю крылоўскага работніка з байкі «Ра-

ботнік і сабакі». Работнік уважаў, што сабакі пабрэшуць ды адыйдуць, толькі іх ня трэба дражніць. Аднак наш сабака ад нас не адставаў. Кожны нумар газэты быў поўны лаянкі пад нашым адрасам. Ярэміч быў раззлаваўся не на жарты і быў гатовы ўжыць фізычнага ўзьдзеяньня. Зь цяжкасьцю мне ўдалося яго адгаварыць ад гэтага. «Сялянская Ніва» баранілася як магла, не карыстаючыся няэтычнымі спосабамі змаганьня. Урэшце не хапіла цярплівасьці і ў мяне. Сустрэўшы ў соймавых кулюарах пасла Рак-Міхайлоўскага, я сказаў яму: «Калі вы не паканчыце зь няпрыстойнымі нападкамі, дык у «Сялянскай Ніве» зьявіцца твой партрэт з польскімі афіцэрскімі шаўронамі сябры Беларускай Вайсковай Рады ў Лодзі. Я польскіх афіцэрскіх шаўронаў не насіў». Рада падтрымоўвала Пілсудзкага ў вайне з бальшавікамі і была на ўтрыманьні польскага ўраду. Ён пачаў прасіць мяне не рабіць гэтага. Ён сказаў: «Ужо колькі разоў казалі Луцкевічу пакінуць лаянку, а ён усё сваё». Другі раз было пасьля абеду ў Тарашкевіча з двума сябрамі рабочай партыі ангельскага парляманту. На гэты абед Тарашкевіч запрасіў і мяне. Пасьля абеду мы выйшлі прайсьціся. Я захапіў грамадоўскую газэту з чарговай хлусьнёю і лаянкай. Гэта я паказаў Рак-Міхайлоўскаму і Сабалеўскаму. Яны абудва абурыліся і сказалі, што яшчэ ўчора яны прасілі галоўнага рэдактара выкінуць гэтае месца. Ён не паслухаў.

Нясупыннае і несправядлівае цкаваньне вывела мяне з духовай раўнавагі. Я зарэагаваў на яго ў «Сялянскай Ніве» даволі вострым артыкулам «Раскрытыя карты». Артыкул быў перад друкам апрабаваны бальшынёю сяброў Клюбу. У артыкуле я паказаў усе зыгзагі мінулай палітыкі Луцкевіча, пачынаючы ад прэм'ероўства ўва Ўрадзе БНР у Менску да ўгадовай Беларускай Рады ў Лодзі. Ад крытыкі апошняга ягонага павароту, пераходу ў пракамуністычны лягер (Грамаду) я, дзеля зразумелых прычынаў, устрымаўся. Назваў яго беларускім Сьмярдзюковым. Знаючы Луцкевіча, я прадбачаў новы ягоны зыгзаг — пераход у палянафільскі лягер. «Еў ты з усякага карыта і вернешся да польскага карыта». Гэта былі канцовыя словы майго артыкулу.

Я разумеў тады і прызнаю цяпер, што вялікі палітык ня можа быць пасьлінаму ўпарта прасталінейны. Ягоная палітыка павінна быць гнуткая і элястычная. Ён павінен умела манэўраваць, не здаючы сваіх пазыцыяў. Манэўраваньне не павінна мець характару адмовы ад свайго ідэалу. І для яго павінны быць вартасьці, што не падлягаюць разьмене. Такою вартасьцю для нас ёсьць нашая нацыянальная сьведамасьць, любоў да Бацькаўшчыны і ў канчатковым выніку незалежнасьць і сувэрэннасьць усяе Беларусі як Незалежнай Рэспублікі. Гэтай простай і элемэнтарнай праўды ня мог ня ведаць А. Луцкевіч. Аднак пасьля ён эвалюцыянаваў ад Грамады да новай польскай угоды, якая, сказаў-бы, нічым не адрозьнівалася ад угоды Паўлюкевіча і Валэйшы. Ён нават напалову адрокся ад свае нацыянальнасьці. Будучы арыштаваны ў справе Грамады, на допытах на пытаньне аб ягонай нацыянальнасьці адказаў «białorusin-polak». Для ідэалёга і лідара Грамады — гэта непрабачальны грэх. Пасьля, у 1939 ці 40 годзе, бальшавікі яго арыштавалі, вывезьлі ў Менск, дзе ён і загінуў ад савецкай кулі. А за што? Ды-й ён сам ня ведаў, за што ён гіне.

Пры выбарах у Сойм Луцкевіч не выстаўляў свае кандыдатуры. Як лідар беларускага руху, ён павінен быў увайсьці ў Сойм. Дмытро Левыцкый, тагачасовы галава ўкраінцаў, ні Раман Дмоўскі, галава і ідэалёг польскай перадавой дэмакратыі, ня ўхіліліся ад кіравецтва сваімі нацыянальнымі прадстаўніцтвамі, першы ў польскім Сойме, другі ў расейскай Дзяржаўнай Думе.

Некаторыя думаюць, што ён быў у душы фэдэралістам, прыхільнікам фэдэрацыі ўсяе Беларусі з Польшчай. У такім выпадку было-б лепш праводзіць сваю ідэалёгію дарогаю кантактаў з польскімі парлямантарыстамі. Яна лягчэй прайшла-б у нас, дзе спачатку насельніцтва было гатова пагадзіцца з аўтаноміяй. Нарэшце, калі ён быў фэдэралістам, дык чаму-ж не адыйшоў часова ў цень, а заняў адно зь першых месцаў у радох Грамады зь яе ўсходняю ар'ентацыяй? Дзе ключ да разгадкі хістаньняў ад прэм'ероўства БНР да ўгадовай Вайсковай Рады, ад Рады — да незалежніцкіх наст-

рояў Беларускага Пасольскага Клюбу, адтуль — да пракамуністычнай Грамады, ды ад Грамады да новай польскай угоды? Няўжо разгадка ляжыць у нашай матар'яльнай беднасьці?

ПОЛЬСКАЯ ДЭФЭНЗЫВА І ГРАМАДА

Амаль ад першых дзён Сойму некаторыя нашыя паслы сталіся аб'ектам увагі польскай палітычнай разьведкі. Ейныя агенты часта прыходзілі ў наш Пасольскі Клюб з прапановамі працы для беларусаў. Асаблівай дакучлівасьцю адзначаўся нейкі Кузьма. Ен прапанаваў адчыніць беларускую школу ў Уселюбскай воласьці. Яны ўціскаліся ў грамадоўскія гурткі, усё вынюхвалі, на зборках выступалі з вострымі клічамі супроць польскай дзяржаўнасьці, падрыхтоўваючы гэтым для адміністрацыі грунт пад будучы разгром Грамады. Такі Кузьма лётаў па гуртках Наваградчыны. Камуністы мястэчка Ярэмічы нейкім спосабам разьведалі, хто такі Кузьма, запрасілі яго ў Ярэмічы ды жалезным шворанам на гары аднае хаты яго забілі. Ягоны труп укінулі ў Нёман, дзе яго прыпадкова знайшла паліцыя. У выніку — два Царукі і Жалезьняковіч былі прысуджаны да бястэрміновай турмы.

Разьведка пралезла нават у Пасольскі Клюб. Трэба меркаваць, што цераз пасла Ваевудзкага і нейкага Сьвіневіча. Ваевудзкі — стары агент вайсковай разьведкі зь перадчасу польска-савецкай вайны. Нейкім няведамым спосабам ён заслужыў давер Тарашкевіча і Луцкевіча. Як далёка былі запушчаны мацкі польскай разьведкі ў беларускае жыцьцё, відаць з наступнага факту. Аднойчы ў памешканьні Луцкевіча адбывалася канфэрэнцыя. Кс. А. Станкевіч, Аўсянік, Кахановіч і сэнатары былі адсутныя. Аб чым вяліся гутаркі, я сяньня ня памятаю. Дастаткова таго, што яны мелі сакрэтны характар. Пасьля я заўважыў, што ад некаторага часу кс. Адам не забірае слова на паседжаньнях Клюбу. У кулюарах Сойму я і пытаю ў яго аб прычыне ягонага маўчаньня. Ен усхвалёвана адказаў: «Будзеш гаварыць праўду і нічога ня ўтоіш?» — «Буду».— «Дык вось, аднаго разу ў памешканьні Луцкевіча гаварылася тое і тое. Праўда?» — «Праўда»,— адказваю.— «Дык як я буду гаварыць, калі ў Клюбе ёсьць дэфэнзыва?» Мяне гэта ашаламіла, і я папрасіў яго расказаць, як ён гэта даведаўся. Выясьняецца, што кс. Адам меў сваю разьведку ў другім аддзеле Міністэрства Нутраных Справаў, нейкага прыяцеля беларусаў, які і папярэдзіў яго асьцерагацца нават і ў Клюбе, перадаючы пры гэтым зьмест нашых гутарак у памешканьні Луцкевіча. Прыпускаю, што Тарашкевіч або Луцкевіч прагаварыліся Ваевудзкаму або Сьвіневічу ды ад аднаго зь іх гэта стала ведама і для Мін. Нутр. Справаў.

КАМУНІСТЫ І ГРАМАДА

Аднойчы ў Сойме Рак-Міхайлоўскі запытаў у мяне, ці я знаю Ханевіча, што паходзіць з мае вёскі, які застаўся ў Саветах. Я адказаў, што там засталося некалькі Ханевічаў. Нейкі Ханевіч прыехаў зь Менску для нелегальнай працы і хоча бачыцца са мною. Рак-Міхайлоўскі даў мне адрас, дзе я мог спаткаць гэтага Ханевіча.

На глухой вуліцы Антокалю ў Вільні, у нейкім доме каля вайсковага шпіталю, мяне ўпусьцілі ў даволі вялікі пакой. Там сядзеў малады мужчына, якога я адразу пазнаў. Гэта быў Міхал Гурын, сваяк нашага настаўніка зь Любчы. Пасьля заканчэньня Наваградзкага Гарадзкога Вучылішча Гурын паступіў у пскоўскую сярэднюю сельска-гаспадарчую школу, адкуль быў выкінуты за рэвалюцыйную дзейнасьць. Я быў страціў ягоны сьлед. І вось, пасьля некалькі год я спаткаў яго ў Вільні. Пасьля гутарак аб мінулым і бацькаўшчыне ён запрапанаваў мне працаваць разам зь ім для справы камунізму. Я адмовіўся, матывуючы тым, што я прыхільнік дробнай уласнасьці і станоўка адкідаю камуністычныя кашары цела і духа. Я хутчэй згаджуся быць скрайным індывідуалістам, чым камуністам. Аднак яго запэўніў, што буду адносна яго карэктны і не прычыню яму ніякай няпрыемнасьці. Ен папрасіў не выяўляць ягонага сапраўднага прозьвішча. Цераз некаторы

час, падчас майго пабыту ў Вільні, мяне і Ярэміча запрасілі ў памешканьне дырэктара Віленскай Гімназіі Р. Астроўскага. Прыйшоўшы туды, апрача паслоў, мы ўбачылі там Гурына і нейкага старэйшага спадара. Гаварылі аб беларускіх справах і патрэбах. З гутарак старога, зьвярнуўшы ўвагу на ягоную мову, я лёгка зразумеў, што перада мною паляк, які добра ўмее гаварыць парасейску. Гэтага было дастаткова, каб я набраў у рот вады. Толькі пасьля гутарак, улавіўшы зручны мамэнт, я спытаў у Гурына, чаму ён прывалок сюды паляка? Ён прабаваў мяне пераканаць, што гэта стары сацыяліст, які працаваў калісьці разам зь Пілсудзкім. Ярэміч сказаў выразна, што гэта польскі шпік. Нашая здагадка пасьля спраўдзілася.

Пасьля гэтай канфэрэнцыі фінансаваньне нашых школаў узяў на сябе Гурын. Клюб быў Грамадою адапхнёны ад гімназіяў і перастаў іх субсыдаваць. Ці вялікія былі ўспамогі Гурына, мне ня ведама, таму што ўсё ішло цяпер цераз паслоў Грамады і Р. Астроўскага. Толькі адзін раз Рак-Міхайлоўскі перадаў церазь мяне для Навагрудзкай гімназіі 500 зл. Гурын плянаваў субсыдаваць нават беларускія нелегальныя пачатковыя школы. Супроць гэтага выступіў ЦК Польскай Камуністычнай Партыі, у які ўваходзіў і Гурын. Пачаліся спрэчкі ўнутры камітэту, у выніку якіх Масква за пасярэдніцтвам Менску адклікала Гурына. Ён пастанавіў ня ехаць, гаворачы: «Я ведаю, чым гэта пахне! Зачыняць, не дадуць курыць, накормяць салёнымі селядцамі ды не дадуць вады». Канфлікт закончыўся выхадам Гурына з ЦК ПКП. Ён тады яшчэ меў у сваім распараджэньні каля 10.000 даляраў. Паразумеўшыся з Грамадою і Астроўскім, ён вырашыў заснаваць сваю камуністычную партыю пад назовам «Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі» (КПЗБ). Ён зарганізаваў тайную друкарню, у якой друкаваў свой орган «Чырвоны Сьцяг». Польскім камуністам гэта прыпала не да смаку. Яны выкрылі яе і, уварваўшыся аднойчы ў друкарню, спалілі ўсе дзераўляныя часткі, разьбілі чыгунныя і зьнішчылі рэшту. Церазь некаторы час Гурын сам быў арыштаваны і кінуты ў беластоцкую вязьніцу. Там ён духова заламаўся і, відавочна, за нейкія ня зусім чыстыя абяцаньні быў выпушчаны на свабоду. Пасьля гэтага за пасярэдніцтвам Рак-Міхайлоўскага я два разы бачыўся з Гурынам у Варшаве і Горадні. Нашая гутарка была прыблізна такая:

— У які спосаб ты выйшаў з турмы?

— Мне дапамагла ППС.

— За якія абяцаньні з твайго боку?

— Яны хочуць, каб я сяньня выступіў на мітынгу. Што рабіць, выступаць ці не?

— Я ня раджу.

— А што рабіць?

— Адмоўся ад камунізму і перайдзі на бок Белар. Пасольскага Клюбу. Працуй з намі. Мы цябе нелегальна перакінем у Нямеччыну. Там ты ўвойдзеш у кантакт зь немцамі і станеш на чале нашага Інфармацыйнага Бюро. Сродкі пакуль што дасьць са сваіх запасаў Клюб, а пасьля пастараемся знайсьці іншую якую-небудзь крыніцу. Ты — зацкаваны воўк, і цябе ўсёроўна заб'юць камуністы і скінуць на дэфэнзыву, або дэфэнзыва — і зваліць на камуністаў.

Маю прапанову ён ня прыняў. Як я прадбачваў, гэтак і сталася. У Горадні, пасьля гутаркі са мною ў гатэлі «Гандлёвы», ён выйшаў ад мяне каля 11 г. увечары. Я не пасьпеў распрануцца, калі пачуў стук у дзьверы і голас Гурына: «Адчыні». Ён увайшоў бледны і сказаў: «Я ранены. На вуліцы Пілсудзкага нейкі тып 8 разоў выстраліў у мяне». Я паклаў яго на сваім ложку, агледзеў рану і выклікаў паліцыйнага лекара. Быў напісаны паліцыйны пратакол. Мяне дапыталі ў якасьці сьведкі, а Гурына забралі ў шпіталь. Судовы сьледчы стараўся ўмяшаць у гэтую справу паслоў Тарашкевіча і Валошына, якія былі ў гэты дзень у Горадні, накіроўваючы ў гэтым напрамку мне пытаньні. Я сказаў, што не дапушчаю думкі аб іх удзеле ў гэтай справе, хоць у душы я і меркаваў, што бязь іх ведама (прынамся Валошына) гэта не абыйшлося.

Церазь некаторы час Рак-Міхайлоўскі і Валошын сказалі мне, што Гурын

напэўна стаў здраднікам і служыць «przodownikiem» сьледчай паліцыі ў Вільні. Мяне гэта анічуць ня зьдзівіла.

Аднойчы, будучы ў Вільні, я зайшоў у кафэ Штраля пры вуліцы Міцкевіча і папрасіў шклянку піва. Бачу, уваходзіць Гурын. Заўважыўшы мяне, ён неяк зьбянтэжыўся. Я запрасіў яго да століка і заказаў яшчэ адзін куфаль піва. Ён сеў. Я спытаў: «Ці праўда, Міша, што ты стаў на нядобрую дарогу — служыць у дэфэнзыве?». На маё пытаньне я не атрымаў адказу. Мне ўсё стала ясна. Мы разыйшліся, і пасьля гэтага я яго больш не спатыкаў. Хутка пасьля таго я даведаўся, што Гурын быў застрэлены ў Вільні нейкім маладым чалавекам з-пад Траб, Усьціновічам. Забойцу засудзілі на 10 год цяжкай турмы. Пасьля я яго бачыў у Лукіскай турме ў ланцугох. Так скончыў закладчык КПЗБ — Гурын.

Пасьля ягонага арышту прыпынілася і яго дапамога. Аднак сродкі былі. Адкуль? — думаю, што ад Вульянава, першага дарадчыка Палпрэдства ў Варшаве, беларуса, родам з Магілёўшчыны. Вульянаў, між іншым, выстараўся дапамогу Саветаў на адкрыцьцё Грамадою ў Вільні Зямельнага Банку, у вышыні 15.000 дал., у тры раты па 5000 дал. кожная. Першую рату атрымаў я, антыкамуніст, старшыня Сялянскага Саюзу і старшыня Беларускага Пасольскага Клюбу, але бязь ведама сяброў Клюбу. Чаму і як гэта сталася? Вось гэтак. Аднаго дня, у Сойме, Тарашкевіч папрасіў мяне зайсьці да яго ў габінэт. Там быў Р. Астроўскі. Яны абудва зьвярнуліся да мяне з просьбаю пайсьці ў Савецкае Пасольства і атрымаць для Беларускага Банку 5000 дал. «За паслямі Грамады бесьперапынна сочыць дэфэнзыва; іх могуць накрыць, як кажуць, на гарачым учынку, а тады бывайце даляры. Табе, які не належыш да Грамады, зрабіць гэта лягчэй»,— казалі яны.

«У сваёй прэсе вы называеце мяне правакатарам, здраднікам і другімі эпітэтамі, а цяпер хочаце, каб я, рызыкуючы 12 г. цяжкай турмы, зрабіў вам такую ахвярную прыслугу? Адно з другім нясумяшчальна!»

«Братко, мы не вінаваты! Гэта ўсё робіць Луцкевіч».

Пасьля доўгіх намоваў я згадзіўся. Пайшоў, атрымаў, нават бязь ніякай расьпіскі, прынёс і даручыў усё Тарашкевічу і Астроўскаму. Чаму я гэта зрабіў? Няхай мяне судзяць суродзічы. Я лічу, што ўсякі дар добры, калі ён ня ідзе ў асабістую кішэню тае ці іншае асобы, а ідзе на агульна-беларускую справу. Тым большае права мы мелі гэтак зрабіць, калі дзяржаўныя сродкі былі для нас зачынены нават на такую патрэбу, як падтрымка гімназіяў і купля зямлі сялянам. Падаткі-ж мы плацілі аднолькава з грамадзянамі польскай нацыянальнасьці. Аб гэтым атрыманьні ня ведаў нават польскі суд, што судзіў паслоў Грамады. Атрыманьне другой раты выявілася на ўспомненым судзе. Паводля слоў пракурора, Тарашкевіч атрымаў ад Саветаў 5000 дал. цераз Транзытны Банк у Рызе. Аб атрыманьні трэцяй раты мне нічога ня ведама.

Пасьля атрыманьня першай раты ў Грамадзе паўстала пытаньне, як замаскаваць паходжаньне грошай у банкавых кнігах. Я парадзіў Рак-Міхайлоўскаму і Валошыну расьпісаць гэтую суму, як уклады паасобных, але давераных асобаў, якія эвэнтуальна не прысабечылі-б сваіх уяўленых укладаў. Гэткімі асобамі ня могуць быць паслы, бо іх могуць арыштаваць, блякуючы адначасова і іх уклады. Гэтак яны і зрабілі. На чые прозьвішчы была расьпісана гэтая сума, мне ня ведама, ды-й я гэтым ня цікавіўся. Толькі пасьля я выпадкова даведаўся ад сэнатара Багдановіча, што на імя брата Мятлы запісана 600 дал.; а на імя Р. Астроўскага і ягонай жонкі — каля 1160 дал.

Пазьней, пасьля ліквідацыі Грамады, грамадоўцы, што засталіся на волі, даручылі кіраўніцтва банкам сэнатару Багдановічу. Ён і стаўся Дырэктарам Банку. Аднойчы ў Варшаве ён сказаў мне, што брат Мятлы і Астроўскі з жонкаю дамагаюцца выдаць ім іх «уклады». Фармальна яны мелі на гэта права. Я парадзіў яму ўзьдзеяць на іх грамадзкае пачуцьцё, а калі не паможа, дык выдаць. Другога выхаду ня было. Як было пасьля, мне ня ведама. Сам факт патрабаваньня выдачы «ўкладаў» без зазначэньня, на што яны будуць бескантрольна расходаваны, кінуў на «ўкладчыкаў» няпрыемны цень і выклікаў прыгнятаючае ўражаньне сярод сяброў Пасольскага Клюбу.

РАЗГРОМ ГРАМАДЫ

Грунт для буйнага росту Грамады быў старанна прыгатаваны. Яго прыгатаваў ня хто іншы, як я, спачатку перадвыбарчаю агітацыяй, пазьней пасольскаю. Не дарма Рак-Міхайлоўскі мне казаў: «Ты-ж духовы бацька Грамады. Чаму ты пакінуў сваё дзіця?» Як рунь на добрай глебе пасьля веснавога дажджу шумна падымаецца ўгару, гэтак шумна тварыліся мясцовыя гурткі Грамады. Ад канца чэрвеня 1924 да яе разгрому перад новым 1926 г. лік сяброў узрос да 121000 чалавек. Увесь палітычна сьведамы элемэнт уліўся ў гурткі і пацягнуў за сабою менш сьведамую большасьць. Разам з доказамі нацыянальнага характару кіраўнікі гурткоў гаварылі маласьведамым: «На весну адбудзецца падзел абшарніцкіх маемасьцяў, і ты, калі ня ўвойдзеш у Грамаду, ня будзеш дапушчаны да падзелу». Лік сяброў гурткоў рос ня днямі, а гадзінамі. Уся Заходняя Беларусь была ахоплена густой сеткаю гурткоў. Адначасова з колькасьцю расла і актыўнасьць грамадоўцаў. Амаль у кожнай вёсцы быў гурток. Уладжваліся частыя зборкі сяброў. На зборках абгаворваліся пытаньні бягучай нутраной палітыкі. Як малады конь, першы раз запрэжаны, рве зь месца, так бралі гурткі. Там часта можна было пачуць клічы супярэчныя зь існуючымі законамі. Пры слабой нутраной партыйнай дысцыпліне, гурткі самацёкам рэвалюцыянізаваліся ўсё больш і больш. На гэтую дарогу штурхала іх польская дэфэнзыва. Ейныя агенты не бязь ведама адміністрацыі або па яе распараджэньні ўступалі ў лік сяброў партыі. Яны сваімі правакацыйнымі выступленьнямі пхалі Грамаду да ліквідацыі. Партыйны цэнтар ня быў у стане стрымліваць экспансыўнасьць гурткоў, і фактычна пад канец 1925 г. яны былі ўжо бяз цэнтральнага кіравецтва. Звычайныя сябры партыі спадзяваліся, на выпадак забурэньняў, на дапамогу з усходу. Цэнтар гэтай надзеі ня меў. Ён добра ведаў, што дзеля Заходняй Беларусі Саветы не адважацца на канфлікт з Польшчаю. Значыць, у выпадку якіх-небудзь сур'ёзных закалотаў мы застанемся адзінокія, пакінутыя на ласку лёсу. Усякі выбух актыўнага супраціву будзе затушаны беларускай крывёю. Гэта магло выклікаць у народзе, без адпаведнага палітычнага гарту, адваротную рэакцыю, шкодную для нашага палітычнага руху. Такі быў мой пункт гледжаньня на створанае палажэньне. Яго я і разьвіваў паслом Грамады і асабліва Тарашкевічу.

За колькі дзён перад арыштам грамадоўцаў Тарашкевіч запрасіў мяне пайсьці зь ім на вячэру. Мы зайшлі ў спакойны рэстаран пры вуліцы Манюшкі, «Pod Wiechą». Вячэраючы, мы гутарылі аб вытвараным палажэньні. Я намаляваў яму падрабязна становішча на месцах і сказаў: «Што-ж, калега, на весну давядзецца заклікаць народ да паўстаньня». Ён, безнадзейна разьвёўшы рукамі, адказаў: «Лейцы, братка, выпалі з рук». Пры гэтым ён пацьвердзіў, што няма ніякай надзеі на дапамогу Саветаў. У сапраўднасьці лейцы ня выпалі з рук, а іх выхапіў з рук Тарашкевіча Ваевудзкі і К°. Вось гэты правакатар і згуляў вялікую ролю ў зьявішчы буйнага росту Грамады і пазьней ейнага разгрому. Увайшоўшы ў нейкі спосаб у давер Тарашкевіча, Луцкевіча і яшчэ некаторых дзеячоў Грамады, ён трымаў руку на пульсе росту і разьвіцьця Грамады і ўсякімі магчымымі спосабамі прапіхаў у Грамаду сваіх агентаў з мэтаю падмінаваньня яе з нутра. Як пабачым далей, гэта яму ўдалося: Грамада была распушчана, а выдатнейшыя ейныя працаўнікі апынуліся за турэмнымі кратамі. Апрача Грамады, Ваевудзкі, за пасярэдніцтвам свайго супрацоўніка ў Вільні Сьвіневіча, сачыў за беларускімі студэнтамі ў Чэскай Празе. Гэта выявілася на Маршалкоўскім Судзе Ярэміча і Ваевудзкага.

Грамадоўскі рух пралез і ў беларускія гімназіі. Дырэктар Віленскай Гімназіі Р. Астроўскі, тады сам грамадовец, ня толькі талераваў, а, я сказаў-бы, фаварызаваў у часох Гурына гэты рух. З уласьцівай яму ўсьмешкаю ў інтымным коле ён называў сваіх выхаванцаў камсамольцамі. Дырэктар Навагрудзкай Гімназіі глядзеў на гэты рух у сваёй гімназіі паблажліва, праз пальцы. Перайшоўшы пасьля на польска-беларускую ўгоду, Астроўскі сваімі собскімі рукамі выкараняў тое, што раньней падтрымоўваў. У выніку наступілі арышты некаторых вучняў і выключэньне іх з гімназіі.

Польскі ўрад зь непакоем глядзеў на беларускія «Крэсы» і нарэшце адважыўся на вострыя меры. У часе калядных парляманцкіх вакацыяў 1925 г. віленская пракуратура, ня гледзячы на дэпутацкую нятыкальнасьць, арыштоўвае паслоў Грамады — Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Мятлу і Валошына, а зь імі Р. Астроўскага і А. Луцкевіча. Усіх іх абвінавацілі ў дзяржаўнай зрадзе. Абвінавачаньне пагражала 12 гадамі цяжкай турмы. Урад аб'явіў Грамаду распушчанай і, значыць, нелегальнай.

Арышт бяз згоды Сойму пракуратура тлумачыла як злаўленьне па гарачых сьлядох праступку, што і давала ёй фармальна права арышту. Толькі пасьля калядных вакацыяў яна ўнесла ў Сойм просьбу аб выдачы арыштаваных для судовай расправы. У Сойме ў абарону арыштаваных паслоў выступілі нацыянальныя меньшасьці. Ад Бел. Пасоль. Клюбу выступіў я, як старшыня Клюбу. Памятаю гэты вялікі дзень у Сойме. Усе паслы на месцах, галерэя запоўнена публікаю, дыпляматычная лёжа поўная. У сваёй прамове я дапускаў вострыя звароты пад адрасам ураду, польскай улады і нават маршалка Пілсудзкага, спадзяючыся справакаваць маршалка Сойму на ўжыцьцё ім скрайняй меры — пазбаўленьня мяне слова. Зраўнаважаны і цярплівы Ратай абмежаваўся патройным прыклікаиьнем мяне да парадку з запісам у пратакол, што цягнула кару грашовым штрафам у вышыні 50 зл.

Сойм выдаў паслоў для судовай расправы, а суд прысудзіў, калі ня мыляюся, на 8 гадоў цяжкай турмы кожнага. Луцкевіч і Астроўскі былі апраўданы. Абудва яны купілі свабоду цаною разьбіцьця бога Грамады і пакланеньня богу ўгоды. Сабалеўскага судовыя ўлады пакуль не чапалі. Ён скарыстаў з гэтага, ды пры дапамозе сэнатара Назарэўскага і нямецкіх паслоў Сойму, што жылі ў Катовіцах, быў перакінуты ў Нямеччыну. Адтуль ён пераехаў на тэрыторыю вольнага гораду Данцыга, дзе і жыў у курортным гарадку Цопотах. Я рэгулярна вазіў яму ягоныя дыеты і прабаваў шчасьця ў ігры ў рулетку, часамі з даходам, часамі з пройгрышам. На аснове нейкіх меркаваньняў Сабалеўскі вярнуўся ў Варшаву, быў суджаны і судом апраўданы.

Так закончыла сваё легальнае існаваньне Грамада.

САПРАЎДНАЕ АБЛІЧЧА ВАЕВУДЗКАГА

З папярэдняга мы бачылі, якую ролю згуляў пасол Ваевудзкі ў разгроме палітычнага жыцьця Заходняй Беларусі. Не дарма-ж кс. А. Станкевіч называў яго «злым гэніем беларусаў». Застаецца аканчальна адсланіць маральнае абліччa гэтага асабня.

Гэта быў чалавек надзвычай энэргічны, бязьлітасны, прагны на пашану і на ўладу. Ён мог быць другім Дзяржынскім. У часе польска-савецкай вайны ён быў афіцэрам польскай арміі ў Менску і кіраваў контр-разьведкаю, стоячы на чале дэфэнзывы. Ужо тады ён зыйшоўся зь беларусамі ў Менску і, паводля слоў Тарашкевіча, аддаваў ім нязначныя ўслугі, прадстаўляючы зь сябе нашага сымпатыка. Якую працу ён выконваў ад часу падпісаньня міру з Савецкім Саюзам да выбараў у Сойм 1922, мне ня ведама.

На тэрыторыі Сойму Ваевудзкі трымаўся вельмі задзёрыста, накіроўваючы пад адрасам правых, цэнтру і ўраду часта абразьлівыя выкрыкі. Урад маўчаў, грамадзкая апінія не ар'ентавалася ў сапраўднасьці справы, а Ваевудзкі ўсё больш нахабнеў і расьпераззваўся. Нарэшце ўпала апошняя кропля, якая перапоўніла кубак цярпеньня ўраду Бартэля. З соймавай трыбуны, ня памятаю ў якой справе, выступаў Міністар Юстыцыі Мэйштовіч. Ваевудзкі і крыкнуў пад адрасам ураду: «Kataryniarze!» (Кацярынаўцы). Гэтым ён вытыкаў Мэйштовічу ягоную афіцыяльную прысутнасьць на адкрыцьці памятніка Кацярыне II у Вільні. З урадавай лавы падымаецца прэм'ер Бартэль і просіць слова. Коратка і ясна ён заяўляе, што Ваевудзкі ня мае права на такія выступленьні: ён урадавец другога аддзелу (разьведкі) Міністэрства Нутраных Справаў. Гэтая заява выклікала вялікае хваляваньне сярод усіх дэпутатаў. Афіцыяльна пацьвердзіліся падазраньні кс. А. Станкевіча. Апрача таго, у беларускіх колах гаварылі і аб тым, што ён сябра Выканаўчага Камітэту Камінтэрну. Далейшыя падзеі пацьвердзілі і гэта.

Назаўтра ў органе Народнай Дэмакратыі «Gazeta Warszawska Poranna», зьявіўся фэльетон Новічыньскага пад загалоўкам: «Новы Азэф у Польшчы». Ваевудзкі на гэта ў прэсе не рэагаваў. Балін абурыўся. Аднак Ваевудзкаму ўдалося нейкім чынам супакоіць сваіх беларусаў. Дэманстратыўна ён адаслаў прэзыдэнту рэспублікі ўсе ордэны і адзнакі, якія ён раньней атрымаў.

Пасьля роспуску Сойму Ваевудзкі некаторы час шноўдаўся па Польшчы, а пасьля безь перашкодаў пераехаў на тэрыторыю вольнага гораду Данцыга. Адтуль ён з жонкаю папаў у Маскву. Былі чуткі, што з Масквы ён быў адкамандыраваны на нейкую нячыстую работу ў Букарэшт, адтуль, пасьля правалу арганізацыі, ён быў пераведзены на такую самую працу ў Будапэшт. Адтуль, пасьля няўдачы, быў выкліканы ў Маскву, дзе і быў зьліквідаваны. Так загінуў самы спрытны польскі правакатар у Заходняй Беларусі, на сумленьні якога ляжыць шмат цярпеньняў беларусаў, у тым ліку і гібель грамадоўскіх паслоў у ШИЗО Салавецкага лягеру і Тарашкевіча, што загінуў ня ведама дзе і пры якіх абставінах.

[...]

ЗАЯВА Ў СПРАВЕ ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЯ КАНСУЛЯРНАЕ ЎМОВЫ ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЮ І СССР,

зробленая 3-га лютага 1926 г.

Высокі Сойме! Маю гонар скласьці наступную дэклярацыю: Ад імя Беларускага Клюбу, як праўнага прадстаўніка беларускага народу заходнябеларускіх земляў у справе зацьверджаньня Соймам кансулярнай умовы паміж Польшчай і Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, падпісанае прадстаўнікамі ўрадаў маскоўскага і варшаўскага 18-га ліпеня 1924 г. у Маскве, якая апынулася на соймавым форуме для зацьверджаньня,— заяўляю наступнае:

З огляду на незалежніцкія імкненьні беларускага народу, а таксама і таму, што ў адносінах да беларускіх земляў ня было тарнавана права народаў на самавызначэньне, мы, праўныя прадстаўнікі гэтых земляў і беларускага народу ў Польшчы, які пакутуе пад неймаверным культурным, эканамічным і грамадзкім ціскам, правам давераных нам нашымі выбаршчыкамі мандатаў, выяўляючы іх волю і жаданьне незалежнасьці, самакіраваньня і самавырашэньня аб сваім лёсе, неаднаразова з гэтае трыбуны выказваліся супроць падзелу беларускіх земляў Рыскім Трактатам, як супярэчнаму прынцыпу самавызначэньня народаў.

Кансулярная ўмова, што стаіць сяньня на парадку дзённым Сойму, зьяўляецца вынікам Рыскага Трактату і на ім апіраецца.

Яна ёсьць вынікам палітыкі маскоўскага і польскага ўрадаў, палітыкі, што перакрэсьлівае незалежніцкія імкненьні беларускага народу.

З якой мэтай гэта было-б ні роблена, так з аднаго як і з другога боку — Масквы ці Варшавы, якімі-б меркаваньнямі гэты ўчынак ні быў абасноўваны, незапярэчным фактам зьяўляецца, што гэтая канвэнцыя ёсьць новым актам, які прабуе перакрэсьліць імкненьні беларускага народу да незалежнасьці і аб'яднаньня ўсіх беларускіх этнаграфічных земляў у адно цэлае.

Няма сілы, якая-б здолела заглушыць жаданьне беларускага народу да аб'яднаньня і ўласнага свабоднага жыцьця і ягонае насьцярожаньне ў гэтым напрамку прысьпіць.

Таму заяўляем, што будзем галасаваць супроць зацьверджаньня ўмовы, складаючы прапанову аб адхіленьні гэтае пастановы ў цэласьці.

В. Рагуля

ЛІРЫЧНАЯ ПАЛЕСКАЯ ЭНЦЫКЛЯПЕДЫЯ

Лабынцаў Ю. Старая казка Палесся: (Турава-Пінская зямля). Пер. з рус. мовы М. І. Шорнікавай; Прадм. Г. Каханоўскага.— Мн.: Полымя, 1993.— 144 с.: іл.— (Па родным краі).

Дасьведчанаму беларускаму чытачу вядомая кніга Юрыя Лабынцава «В глубинном Полесье» (М.: Искусство, 1989). Напісаная да трагічных чарнобыльскіх падзеяў 1986 г., яна высьвятляла шматграннае аблічча старажытнае палескае культуры. Цяпер маем і беларускае выданьне арыгінальнае працы маскоўскага дасьледніка Беларусі. Розьніцу ня надта далёкіх па часе адна ад другой кніг падкрэсьліў у прадмове «Працаўнік навукі» доктар гістарычных навук Генадзь Каханоўскі: «Прапануемая кніга — гэта зноў наша Палесьсе, толькі ў параўнаньні з ранейшым выданьнем папраўленая і некалькі абноўленая. Як і шмат хто, Ю. Лабынцаў пазбаўляецца стылю застойных часоў, хоць якраз гэтага вучонага найменш закранула тая бездухоўнасьць. Прыемна, што героіка духоўнасьці пачынае браць верх над духам гераізацыі. Надышоў час асэнсоўваць кожны факт гераічнага мінулага роднай Беларусі, каб пазбавіцца ад усталяваных стэрэатыпаў».

Дзьве адметнасьці розьняць ад маскоўскай кнігі-папярэдніцы беларускае выданьне працы Юрыя Лабынцава: дапаўненьні, новыя факты, унесеныя аўтарам, і скарачэньні шырока вядомых, так бы мовіць, рэчаў (з улікам спадзяваньня на падрыхтаванага беларускага чытача). Апошняе, відаць, дарэмна. На ўзроўні папулярызатарскім любое паўтарэньне гучала б, як кажуць, да месца. Але, відаць, вучоным кіравала імкненьне да ляканічнасьці. І ўсё ж новае выданьне кнігі не пазбаўлена вобразнасьці, эмацыянальнасьці расповяду.

Складзеная зь дзевяці «падарожных» разьдзелаў, кніга Ю. Лабынцава — клясычны ўзор краязнаўчага дарожнага дзёньніка.

Абазначыўшы шлях свайго падарожжа, аўтар суправаджае нашыя адкрыцьці, здавалася б, знаёмых мясьцінаў багатым ілюстрацыйным матэрыялам. Скажэце папраўдзе, ці даўно вы ўглядаліся ў Пінск на гравюры XIX стагодзьдзя? А ці знаёмыя ў дэталях з вопраткай мяшчанаў з Давыд-Гарадка? І ці бачылі калі-небудзь каменны разьблёны абразок XV ст. «Хрыстос, Нікан і Мікола», знойдзены пры раскопках старажытнага Турава? Так, шэраг ілюстрацыяў дасьведчаным краязнаўцам і гісторыкам добра знаёмы. Радзей яны траплялі на вочы шырокаму колу чытачоў. Праўда, зусім нядаўна тое ж выдавецтва «Полымя» ажыцьцявіла асобнае кніжнае перавыданьне «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» Шпілеўскага, у якое ўвайшло багата рэпрадукцыяў, гравюраў і малюнкаў. Але ж гэты факт руплівасьці кнігавыдаўцоў (ізноў жа — выдавецтва «Полымя», якое сёньня можна назваць гістарычна-краязнаўчым выдавецтвам) ні ў якой ступені не зьмяншае заслугі Ю. Лабынцава ў падборы ілюстрацыяў. У «Старой казцы Палесься» — ілюстрацыі з мноства выданьняў, з архіваў, а гэтаксама здымкі, па ўсім відаць, зробленыя самім аўтарам у часе вандровак.

Найпершы тут памагаты ў Юрыя Лабынцава — гэта ягоная ўласная дасьведчанасьць. За плячыма ў навукоўца — гады вучобы ва Уроцлаўскім універсітэце. Там аўтар кнігі пра Палесьсе спэцыялізаваўся ў кнігазнаўстве й філялёгіі. А сьледам — доўгія гады працы ў галоўным кнігасховішчы цяпер Расеі, а тады Савецкага Саюзу. Ілюстрацыйнае багацьце кнігі Ю. Лабынцава падказвае, што падобныя выданьні павінны ажыцьцяўляцца на высокага гатунку паперы, у цьвёрдай вокладцы, у падарункавым, магчыма, варыянце. Ды, пэўна ж, заўвага не па сёньняшнім часе.

«Старая казка Палесься» — яскравы прыклад таго, што не існуе паасобку гістарычнага, літаратурнага, геаграфічнага ці нейкага іншага краязнаўства. Вывучэньне краю, дасьледаваньне ягонае мінуўшчыны і асэнсаваньне сучасных працэсаў патрабуе спалучэньня ведаў у многіх галінах. Краязнаўства нельга раскласьці па тэматычна-галіновых палічках. Іншая рэч, што краязнаўчы тэкст можа насіць павярхоўны характар ці вы-

значацца навуковасьцяй. Кніга Лабынцава, натуральна ж, з шэрагу навукова-краязнаўчых манаграфіяў. Зазірніце ў любы з разьдзелаў «Старой казкі Палесься»: тэматычная вытрыманасьць, пасьлядоўнасьць, наяўнасьць аргумэнтаў.

Часам дасьледнік (відаць, у імя ляканічнасьці) як быццам наўмысна абрывае дарожны аповяд на паўслове, здраджвае публіцыстычнаму запалу, які ўжо адчуў чытач. Тады губляецца адчуваньне суперажываньня, прысутнасьці. Каб адважыўся чытач на супольнае падарожжа ў часе — на тое і аргумэнты патрэбныя незвычайныя, факты неардынарныя. Як, напрыклад, вось гэты: «Манькавічам на славутасьці пашанцавала шмат менш, хоць праз гэтае старажытнае паселішча праяжджала нямала выдатных людзей — беларусаў, украінцаў, палякаў, рускіх, а філязофскай асновай у стварэньні тутэйшага парку паслужылі ідэі Ж.-Ж. Русо. Менавіта ён, Ж.-Ж. Русо, зь яго культам натуральнай прыроды і даў у канцы XVIII ст. штуршок разьвіцьцю новага кірунку ў садова-паркавым мастацтве — пэйзажнага, калі пачалі ствараюцца паркі з далёкімі пэрспэктывамі, чаргаваньнем закрытых і адкрытых прастораў, колернымі й сьветлавымі кантрастамі. Усе гэтыя прынцыпы знайшлі ўвасабленьне і ў расплянаваньні парку ў Манькавічах, продкі ўладальнікаў якога, Радзівілаў, былі, дарэчы сказаць, знаёмыя і з Ж.-Ж. Русо. Вялікі філёзаф зьбіраўся ў канцы жыцьця пераехаць у Беларусь, каб быць як мага бліжэй да прыроды, жыць у адным зь яе паркаў. Вось дзе тэма! І хіба тут да месца ляканічнасьць?

Блукаючы палескімі сьцежкамі, аўтар ня можа не згадаць іншыя выдатныя постаці. Так, ён падрабязна супыняецца на разглядзе беларускіх вытокаў радаводу Дастаеўскіх. Тут Лабынцаў пераўзышоў многіх знаўцаў пытаньня. Нават Ігар Івамін у грунтоўным жыцьцяпісе Ф. Дастаеўскага «Родиться в России» (Москва, «Книга», 1991) не абыходзіцца без спасылак на расейскае выданьне кнігі Ю. Лабынцава.

Знаёмства з «Старой казкай...» — чытаньне зусім не на пару гадзінаў. Чытач пакіне яе дзе-небудзь на вачох. Бо іншай такой ёмістай, сьціслай дый у адначасьсе лірычнай «энцыкляпэдыі» пра Беларускае Палесьсе мы сёньня ня маем.

І не сьпяшайцеся на пошукі новай працы Ю. Лабынцава. Дарэмна. Разышлася кніга надзвычай хутка, у лічаныя дні.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Завосьсе. Калісьці ўласнасьць стрыя Адама Міцкевіча. Адам тут нарадзіўся ў 1798 г. 24 сьнежня, у той час, калі бацька ягоны Мікалай кіраваў гаспадаркай брата свайго. Мал. Н. Орды (Подпіс пад малюнкам належыць Н. Орду).

Язэп МАЛЕЦКІ

ПАД ЗНАКАМ ПАГОНІ

РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Хутка пасьля акупацыі бальшавікамі Вільні прыбыў сюды маскоўскі пасланец «япіскап» Сергі, які аўтаматычна ад імя Масквы абняў уладу над усімі праваслаўнымі. І вось гэты Сергі пры першым сваім публічным выступе, уваходзячы ў Сьвятатраецкі Сабор, стукаючы посахам у падлогу, тройчы прамовіў: «Москва идёт, радуйтесь православные!». Далей ён павёў маскоўска-камуністычную прапаганду, усхваляючы бязбожную бальшавіцкую ўладу. Ніхто, нідзе з праваслаўных не запратэставаў, хоць знаді ўсе, што вось прыйшоў воўк у авечай скуры.

Духоўных усіх веравызнаньняў тады масава арыштоўвалі ды вывазілі ў канцэнтрацыйныя лягеры. З каталікамі было крыху іншае палажэньне як з праваслаўнымі — яны ня мелі ў Маскве сваіх падробленых сьвятароў-герархаў. Дзеля гэтага ў дачыненьні да іх тарнавалася толькі брутальная траўля, арышты ды вывазы ў канцэнтрацыйныя лягеры.

Польскага арцыбіскупа Р. Ялбжыкоўскага Жамойцы высялілі да Коўні, і ў Вільні быў толькі жмудзкі біскуп вікары. Быў ён прыхільным да Беларусаў каталікоў, дазволіў мець у Вільні сваю парафію пры касьцеле сьвятога Міхала, сьвятыні пабудаванай вялікім канцлерам Львом Сапегам. У касьцеле й па сяньня, у прыгожым маўзалеі, спачывае ягонае цела. Пробашчам парафіі быў кс. Адам Станкевіч, а вікарым кс. Глякоўскі. Набажэнствы зь беларускімі сьпевамі й казаньнямі адбываліся рэгулярна кожную нядзелю й сьвята, як перад гэтым было ў касьцеле сьв. Мікалая.

Прыйшлі ў Вільню Немцы. Беларусы грамадна сабраліся ў сваім касьцеле на набажэнства й спадзяваліся, што іхны пробашч скажа штосьці грымучае на радасны дзень вызваленьня ад бязбожных бальшавікоў. Тымчасам ксёндз Адам прачытаў Сьвятую Эвангэлію й загадаў дзякаваць Богу, што «ваенная бура пранясласся над нашым слаўным местам бязь вялікшых стратаў». Загрымела «Божа, што калісь народы...», і людзі пачалі выходзіцць з касьцёлу.

Група моладзі, аднак, павярнула ў права да маўзалею Льва Сапегі. Колькі хвілінаў стаялі ўсе моўчкі з апушчанымі галовамі. Тады, як-бы на жаданьне ўсіх прысутных, пачуўся ціхі голас-малітва У. Казлоўшчыка:

— Магутны правадыр народу нашага! Волат духа й аружжа! У рашучую часіну пакажы нам правільны шлях да волі й шчасьця нашага народу! Памажы нам адвярнуць двувяковы камень нашай няволі!

— Памажы! — падхапілі прысутныя.

Пачатак у №№ 2, 3, 1994 г.

Толькі пасьля вайны я даведаўся, што да нашага набажэнства прыслухоўваліся й камуністыя: іх 6 хавалася зь левага боку на хорах. На чале быў камісар прапаганды Аляксееў. І кс. Станкевіч у імя Хрыста, наражаючы сваё жыцьцё, хаваў і карміў. Ніхто, аднак, зь іх нідзе не адазваўся — можа іх Сталін выдушыў,— калі пазьней, пасьля вайны, а. Станкевіча органы НКВД арыштавалі ды замучылі ў канцлягерох.

У гэтым часе, калі праваслаўныя пачалі разважаць пра арганізацыю свае Беларускае Аўтакефальнае Царквы, каталікі імкнуліся адсэпаравацца ад польскага каталіцкага касьцёлу й яго герархіі. Намінальным зьверхнікам каталікоў у Беларусі тады быў біскуп Магілеўскі й Менскі Слоскан, па нацыянальнасьці Латыш, прабываў ён у Дзьвінску. Нацысты забаранілі яму праводзіць якуюколечы каталіцкую адміністрацыйную працу ў Беларусі. Не зважаючы на ўсе нашыя захады ў Вільні, Менску ды Бэрліне, нямецкія ўлады не зьмянілі свайго загаду.

Тады ініцыятыву пераанялі беларускія ксяндзы-патрыёты. Кс. др. філ. Ст. Глякоўскі, узяўшы з сабой на помач толькішто высьвечаных ксяндзоў Рыбалтоўскага ды Мальца, накіраваўся з нашым пасьветчаньнем да Менску. Пасьля ўпорыстых торгаў зь Немцамі яны адваявалі чырвоны касьцёл, які бальшавікамі быў заменены на тэатр, і яшчэ адзін касьцёл пры галоўнай вуліцы, дзе быў склад. Катэдру не маглі абняць, бо ў ёй вымагаўся аграмадны рамонт. У сталіцы Беларусі пачалася нармальная каталіцкая служба.

З газэтаў ды радыя даведаўся пра гэта ведамы польскі шавініст і заядлы вораг беларускага народу арцыбіскуп Ялбжыкоўскі. Ён ня толькі адклікаў зь Менску ксяндзоў Глякоўскага, Рыбалтоўскага й Мальца, але за «непаслухмянасьць» забараніў ім навет прыступаць да аўтара, накш кажачы, «суспэндаваў» іх. Але калі першыя тры беларускія ксяндзы-місіянэры былі ад аўтара адсунутыя, на іх месца ўжо прыбыў кс. В. Гадлеўскі, кс. П. Татарыновіч і жмудзкі ксёндз Ігнатавічус. Яны не падлягалі юрыздыкцыі Ялбжыкоўскага й маглі спакойна працаваць далей.

Паўгоду пазьней Глякоўскі й Малец, будучы ў тэатры, ня ўсталі пры адыграньні нямецкага гімну, што паслужыла за довад іх неляяльнасьці да нямецкае ўлады, ды ня толькі іх, але й іншых каталіцкіх духоўных. Тады былі арыштаваныя ксяндзы Глякоўскі, Малец, Рыбалтоўскі й Татарыновіч. Два першыя былі высланыя ў канцэнтрацыйны лягер Бухэнвальд, і там яны загінулі ў хвабрыцы амуніцыі ад ангельскіх налётаў.

Ксёндз Гадлеўскі дастаў строгі выгавар ад Немцаў, і яму забаранілі казаць казаньні, на якія заўсёды схадзіліся грамады людзей. Застаўся толькі адзін кс. Ігнатавічус, які набажэнства адпраўляў палацінску й чытаў толькі сьв. Эвангэлію пабеларуску, народ-жа ў часе набажэнства сьпяваў беларускія рэлігійныя песьні. Перад заканчэньнем вайны Немцы далі дазвол на пераезд да Менску кс. В. Шутовічу, які па сваім становішчы сьвятара для Беларусаў-каталікоў сустрэў у Менску й бальшавікоў. Яны ў хуткім часе яго арыштавалі, мучылі, саслалі на 10 гадоў катаргі. Выпушчаны пасьля прабываў у Вільні, памёр у Барысаве.

Праваслаўныя Беларусы пры нямецкай акупацыі пачалі працу над аднаўленьнем Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы. Душою гэтых пачынаньняў быў сьвятар Дэрынг, пратаярэй Юзьвяк, ды шмат іншых. Першы ў часе выконваньня сваіх духоўных абавязкаў наехаў на міну й быў забіты. З часам, на вымаганьне народу, да працы над аднаўленьнем аўтакефаліі далучыліся й япіскапы Філафей ды Апанас, ды й галава Праваслаўнае Царквы ў Беларусі, архіяпіскап Панцялеймон, хоць гэты апошні асабліва неахвотна адлучыўся ад Масквы.

Толькі ў 1942 г. нямецкія ўлады далі дазвол на шырэйшую арганізаваную працу над наладжваньнем праваслаўнага жыцьця ў Беларусі. Скліканы ў Менску Сабор Беларускае Праваслаўнае Царквы ў складзе герархіі, духавенства й прадстаўнікоў верных адбываўся ў днях 30 жніўня — 2 верасьня 1942 г. Пастановаю Сабору была апавешчаная аўтакефалія Беларускае Праваслаўнае Царквы.

З рук нямецкіх наезьнікаў, праўдападобна за намовай маскоўскіх агентаў, у Альбэртыне на Палесьсі ў 1942 г. загінуў экзарх Грэка-Каталіцкай Царквы ў Беларусі а. Антон Неманцэвіч.

МУЧАНІЦКАЯ СЬМЕРЦЬ З НАРОДАМ

Сярод беларускіх каталіцкіх сьвятароў ахвярнай для народу працай ды мучаніцкай сьмерцяй на сваёй духоўнай постані выдзяляюцца постаці двух ксяндзоў-марыянаў — Юрага Кашыры й Антона Ляшчэвіча. Іхную трагічную сьмерць разам з сваім народам, у Росіцы Віцебскай акругі, апісала адна зь сёстраў-законьніцаў, што да апошніх гадзінаў іх жыцьця зь імі прабывала. Даю тут, у скароце, передрук гэтага вопісу, поўны тэкст якога надрукаваны ў часопісе «Божым Шляхам», Лёндан, № 5, 1971 году:

«У часе Другое Сусьветнае вайны, калі Немцы занялі падсавецкія тэрыторыі, туды прыйшлі працаваць айцы Марыяне з Друі, зь якіх да канца засталіся ў Росіцы а. Антон Ляшчэвіч і а. Юры Кашыра, у Замошы-ж нейкі час быў а. Ул. Лашэўскі. Яны абслужвалі й суседнія на савецкай тэрыторыі парахвіі, як Дрыса, Асьвея, Бігосава.

У Росіцы знайшлі вялікі касьцёл не разбураны, але ня дзейны ўжо ад колькі гадоў дзеля выдаленьня адтуль ксяндза. Працы было вельмі шмат, і народ надта рупліва гарнуўся да рэлігіі... Сама Росіца — мястэчка ў пару тысячаў людзей — была тады населеная старымі, дзецьмі й падрастаючай моладзьдзю. Усіх мужчынаў у сіле веку пазабіралі партызаны.

...Праца ішла так каля паўтара году, больш-менш у гадох 1941—1943. Пад канец усё часьцей турбавалі ды ў працы перашкаджалі ваенныя падзеі, набегі партызанаў, а ў выніку й нямецкія допыты, робленыя з пагрозамі расстрэлу. Шмат разоў клябанія й нашае памешканьне былі сьветкамі страшных сцэнаў падчас наскокаў Немцаў або партызанаў.

...Напачатку 1943 г. над нашай працай зацяжыла вялікая небясьпека, калі дзеля штораз часьцейшых партызанскіх нападаў на вёскі, пасёлкі й на нямецкія пасты, Немцы пастанавілі вынішчыць усіх людзей ды іхныя сялібы на даволі доўгім і шырокім поясе гэтае тэрыторыі. Пачалі ўсё часьцей надыходзіць весткі пра вынішчэньне вакольных вёсак зь людзьмі.

У месяцы лютым гэтага году... а. А. Ляшчэвіч вярнуўся з Дрысы, дзе адпраўляў набажэнства, і там даведаўся ад жандармэрыі, што Росіца таксама будзе зьнішчаная й што жандармэрыя радзіла ксяндзам стуль якнайскарэй выехаць. Пасьля павароту айцец быў вельмі сумны. Айцец Юры Кашыра паехаў да Бігосава, дзе стаяла нямецкая каманда: там атрымаў пацьверджаньне першае весткі й прапанову, каб ксяндзы пакінулі гэныя месцы. Абодва яны радзіліся, што рабіць, гаварылі: «Як мы можам пакінуць людзей у такую хвіліну? Дзе авечкі, там павінны быць і пастыры». І яны пастанавілі заставацца пры людзях да канца...

У аўторак таго тыдня ў поўдзень прыехала да Росіцы шмат Немцаў. У клябанію зьявіліся два ваенныя, адзін Латыш, перакладчык, і ў чорнай ваеннай форме Немец, падобна, кіраўнік экзэкуцыі. Праверылі, ці няма партызанаў. Айцец А. Ляшчэвіч гаварыў зь імі й заступаўся за сёстраў. Пасьля зараз пачалі зганяць людзей да касьцёлу. Мы таксама, разам з ксяндзом, пайшлі туды, а клябанію заняла каманда.

У касьцеле сьпісвалі людзей. Быў напоўнены людзьмі цэлы касьцёл. Некаторыя прадчувалі блізкую сьмерць і рыхтаваліся да яе, іншыя не ўсьведамлялі сабе рэчаіснасьці. Пазьней сёстрам загадалі пайсьці ў клябанію. Ксяндзом дазволена было заставацца ў касьцеле й у клябаніі.

Раз за разам да нас упадаў а. Юры, апавядаючы, што дзеіцца ў касьцеле, і, вядома, пацяшаючы нас. Айцец Ляшчэвіч, каб адвярнуць нашую ўвагу ад няпэўнае прышласьці, разьвесяляў нас і плянаваў нам заняткі, каб мы ня мелі часу на сумаваньне. Зразумела, што гэтае ночы ніхто ня спаў.

У сераду раніцай ізноў у мястэчку зрабіўся рух. Пасьцягвалі шмат фурманак на касьцельны пляц і ад раніцы пачалі людзей групамі вывозіць з касьцёла на пакараньне сьмерцяй. Здатных да працы аддзялялі, але такіх ня было шмат. Зьнішчалі людзей на месцы ў Росіцы, зганялі ў дамы, расстрэльвалі й падпальвалі бэнзынай разам з домам. З клябаніі было чуваць блізу што поўгадзіны страляніну з таго часу, калі бралі групу з касьцёла, выбухі, а пасьля ў гэным месцы зьяўляўся пажар дому.

Айцец Юры нас далей наведвае, перарываючы працу ў касьцеле, каб нас пацяшаць, і казаў, што ўжо тую й іншую групу вывезьлі, каб спаліць. Нам Нем-

цы загадалі варыць абед для афіцэраў. Прыйшоў, бо, здаецца, яго выклікалі, а. Ляшчэвіч, і падчас абеду ён ім служыў. Пасьля абеду сказалі яму запрагчы каня й паехаць зь імі, паказаць нейкі дом, каб яго захаваць ад пажару. Айцец прачуваў, што будзе, вельмі баяўся за нас і ўсьцяж прасіў каманданта, каб пакінуў нас пры жыцьці.

Касьцельны хлапец запрог каня, і айцец зь ім паехаў. Там перад домам было шмат людзей, і айцец там застаўся, а хлапец прыехаў. Зараз па яганым паварoце была страляніна, і ў гэным месцы быў падпалены дом. Мы былі цалком пэўныя тады, што там паміраe таксама наш айцец. У вялікім смутку мы маліліся за яго й за іншых, што там паміралі. Было гэта ўжо па паўдні.

Айцец Юры далей працаваў у касьцеле, чакаючы на сваю сьмерць. Вечарам яго адтуль звольнілі й замкнулі ў склепе пад клябаніяй. Тры гадзіны яго там мучылі, дамагаліся прызнаньняў. Вярнуўся стуль страшэнна зьменены, сіні, замучаны й перакананы ў хуткай сьмерці. Рана прынёс нам у кішані Найсьвяцейшы Сакрамант. Была гэта нашая ўжо апошняя Сьвятая Камунія ў Росіцы, прынятая ў клябаніі з рук дарагога Айца...

Назаўтра, як і дня папярэдняга, ад раніцы ў Росіцы было так страшна, як пры канцы сьвету. Мястэчка гарэла, страляніна, лямант, роспач людзей, якіх выцягвалі на забіцьцё. Каля 10-й... загадалі а. Юру штосьці ўзяць на дарогу, было пэўна, што толькі дзеля вока, ды ехаць разам з фурманкамі. Прыйшоў айцец на клябанію даць нам яшчэ абсалюцыю, штосьці забраў з сабой, і нам пазволілі адвесьці яго да фурманак на касьцельны пляц. Ніхто ў афіцэраў айцом ужо не займаўся, ён застаўся зь людзьмі, чакаючы на загад. Разглядаўся яшчэ, ці ня знойдзе каго знаёмага, а нас прасіў, каб мы паведамілі іншых айцоў аб яго сьмерці.

Пасьля пачалі ладаваць людзей на фурманкі. Дзеці, не разумеючы справы, сварыліся за месцы, айцец іх супакойваў. І цэлы канвой, пад эскортай жаўнераў, вырушыў. Мы засталіся адны ў вялікім смутку. Латышу мы сказалі, што хочам ісьці да касьцёла й разам зь людзьмі памерці, калі ўжо няма ксяндзоў. Ён сказаў гаварыць аб гэтым афіцэру ў клябаніі. Калі мы, парадзіўшыся з сабой, гэта зрабілі, яны пастанавілі адвезьці нас да Друі. І гэтак зрабілі.

Адзін жаўнер, які ехаў разам са мной, быў сьветкам, як расстралялі айца Юрага. Ён акуратна яго апісаў, усё згаджалася — ягоны выгляд і рост, адзежа, гранатавы плашч і г. д. Расказваў, што спачатку ніхто не хацеў ісьці ў хату, але калі айцец першы ўвайшоў, за ім пайшлі людзі, і іх пасьля забілі й спалілі...

Я, а таксама іншыя сёстры, якія там працавалі, перакананыя, што айцы прынялі мучаніцкую сьмерць толькі дзеля вернасьці сьвятарскаму абавязку. Мелі-ж яны магчымасьць пакінуць Росіцу, націскалі іх да гэтага Немцы, калі асьцерагалі перад зьнішчэньнем мястэчка. Яны самі пастанавілі застацца зь людзьмі, і за гэта забілі іх Немцы, каб ня было сьветкаў іхных забойстваў.

Таму, што находы партызанаў былі справай часта агульна ведамай, дык ніхто з гэтым не хаваўся. Не таіліся з гэтым таксама й айцы. Хто-б гэтаму пярэчыў, што добра было ведама Немцам, таму пагражала сьмерць. У аднэй сям'і хтосьці спужаўся й запярэчыў, што былі партызаны. Уся сям'я была расстраляная, толькі двое дзяцей пасьпелі ўлезьці пад ложак й ацалелі.

Да падобнага трагічнага выніку ледзь не дайшло й у нас. Наваліліся раз Немцы на нашу клябанію й на нашае памешканьне з крыкам, ці былі тут партызаны? Адна сястра спужалася й запярэчыла. Тады зараз накіравалі на яе вінтоўкі, каб расстраляць. Яна-ж хапіла крыжык, каб ім засланіцца, але ўбег а. Ляшчэвіч, тлумачачы, што сястра спужалася. Немцы ўсё-ж былі перакананыя, што айцы ня маюць нічога супольнага ані з аднымі, ані з другімі, а толькі пілнуюць сваёй працы...

Вышэй напісанае сьветчаньне прачытала, прызнаю за сваё й згоднае з праўдай, і як такое пацьвярджаю сваім подпісам.

Дня 8.12.1964 г. Сястра Яніна Т.»

ТОЕ-Ж У АШМЯНЕ, ШТО І Ў ВІЛЬНІ

На Каляды 1941 г. Ю. Мурашка запрасіў мяне ў госьці да Ашмяны, дзе ён быў бурмістрам. Было ўжо на змроку, калі спэкулянцкі грузавік, перапоўнены людзьмі й таварамі, пакідаў Вільню ў кірунку на Ашмяну.

Цэлы дзень стаяла адліга, а пад вечар, калі нам трэба было ехаць, пачаў падаць дождж, які на зямлі тварыў галаледзь. Дарога зрабілася коўзкай, аўты шугалі, як санкі. Мы мінулі колькі нямецкіх аўтаў, што былі выбітыя з строю. Нам здавалася, што мы хваты, што мінём катастрофу. Аж тут вось падарак! Наш грузавік закоўзаўся, як на лыжах, набіраючы бескантрольнага разгону. І мы, пасьля магутнага ўдару ў тэлеграфны стоўп, апынуліся ў канаве. Усе пасажыры паляцелі кульком долаў. Я скорчыўся, нацягнуў каптур буркі на галаву, і гэта мабыць, уратавала мяне ад пакалечаньняў.

Людзі, што як снапы ляжалі далавах у канаве, хутка, аднак-жа, пачалі варушыцца, уставаць. Толькі тры ня краталіся. Я, як лекар, кінуўся да іх, спраўдзіў пульс — аказаўся дзейны. Два зь іх хутка ачухаліся. Толькі адну дзяўчыну забралі ў няпрытомным стане ў шпіталь. Машына таксама ачуняла. Праз паўтары гадзіны мы йзноў ехалі ў кірунку на Ашмяну.

У Мурашкаў быў добры бадзёры настрой. Сустрэлі яны мяне вельмі міла. Мурашка, як мясцовы бурмістр, расказваў, як ён апанаваў змрочную сытуацыю, заігрываючы зь Немцамі пры дапамозе падарункаў. Назаўтра я пабачыў на ягоным панадворку гусей з цэтлікамі на шыях.

— Чаму ў вас гусі ходзяць з цыдулкамі?! — спытаўся.

— Гэта ў нас кожная гусь прызначаная адпаведнаму Немцу. А каб ня было памылкі, мы кожную гусь абазначаем па назначэньню.

За колькі гадзінаў людзі бурмістра паразносілі гусей Немцам на калядныя сьвяты. Вечарам Немцы заходзілі да бурмістра, каб падзякаваць за шчодры падарак ды каб выпіць чарку гарэлкі. Я зразумеў, што ў паўсталай сытуацыі навет і самыя прымітыўныя спосабы могуць мець неблагі вынік.

Немцы пакуль што грабілі Жыдоў: накладалі нявыносныя кантрыбуцыі ў золаце, у абутку, кажухах ды іншай вопратцы. Бурмістр казаў, што рабунак Жыдоў праводзіцца з усіх бакоў. Чатыры тыдні перад гэтым прыяжджаў Немец зь Менску ды вызначыў даніну, узяўшы 50 чалавек закладнікаў. Жыды мусілі даць паўтара кіляграма золата ў пярсьцёнках, залатых гадзіньніках, завушніцах ды іншых каштоўнасьцях.

Прыехалі пасьля латыскія аддзелы зь Немцамі, абступілі гетта, Жыдоў сагналі на пляц, дзе садзілі іх у закрытыя грузавікі ды адвозілі, труцячы падарозе спалінавым газам. Толькі каля 5 % нешчасьліўцаў ці было пакінена пры жыцьці ў гецэ як рамесьнікі.

Тады мне прыпомніліся апавяданьні як Жыдоў у Вільні ліквідавалі Лятувісы. Яны яшчэ ў верасьні 1941 г. усіх Жыдоў пазганялі, на сваю руку, у вельмі брутальны спосаб, у стары жыдоўскі раён, які абгарадзілі высокім плотам і калючым дротам. У жыдоўскіх дамох пазабівалі нат і вокны, што выходзілі на вуліцу. Пазганяныя былі сюды й Жыды з блізкіх навакольных мястэчак. Віленскае гетта тады лічыла да 100 тысячаў чалавек. Штодня аграмадныя калёны Жыдоў Лятувісы ганялі пад канвоем на розныя дарожныя ды іншыя працы.

І вось нямецкія калябаранты ўхітрыліся: кожны дзень тая ці іншая калёна назад у гетта ўжо не вярталася. Найперш заганялі адлучаных Жыдоў у Лукіскую турму, дзе марылі іх голадам, не даючы навет вады. На трэйці дзень Жамойцы пачыналі «прадаваць» сваім зьняволеным ахвярам хлеб і ваду: адна булка хлеба — 5 царскіх рублёў у золаце або адпаведнік залатых рэчаў у далярах. Шклянка вады — адзін даляр, і г. д. Гэткі «гандаль» цягнуўся да пяці дзён.

Калі-ж Жыды ўжо абсалютна нічога ня мелі пры сябе, шмат-жа якія, аслабленыя голадам, не маглі навет рухацца, тады іх ноччу ўкідалі ў крытыя грузавікі, вывозілі ў Панарскія горы, дзе дабівалі ды кідалі ў нарыхтаваныя ямы. Рэдка калі Жмудзякі вязьлі Жыдоў у Панарскія горы на сьмерць проста з працы, бо ахвяры тады астаткамі сілаў ставілі супраціў, што было нявыгадна, а часам і небясьпечна іхным катам. Дык Лукішкі выкарыстоўваліся як транзытнае месца для падрыхтовы забойства. Паадзіночных Жыдоў, што пробвалі ратавацца ўцёкамі, Жмудзякі мучылі й дабівалі на сваіх паліцыйных участках.

Апошнімі днямі кастрычніка 1942 г. у Беларускі Камітэт зьявілася двух Лятувісаў з просьбай даць ім лекара для кантролі дамоў распусты для нямецкіх жаўнераў, бо яны ня маюць дастаткова пэрсаналу. Яны пры гэтым выявілі, што, згодна з загадам нямецкага ваеннага камандаваньня, ім трэба сарганізаваць у Вільні два дамы распусты для жаўнераў ды адзін для афіцэраў. Адзін з гэтых да-

моў знаходзіўся на вуліцы Субач, у будынку віленска-троцкага старасства. Дом быў абведзены калючым дротам, уваход да яго пілнавала адумысная старожа. Упускалі туды нямецкіх жаўнераў і афіцэраў па адумысловых пропусках.

Кандыдатак у гэтыя дамы Лятувісы знайшлі хутка: вечарам абставілі сваімі аддзеламі піўныя ды павыцягвалі адтуль дзяўчат і жанчын, якія былі зь Немцамі. Усіх садзілі ў крыты грузавік ды вывозілі ў названыя дамы. Пасьля 24 гадзінаў, зрабіўшы лекарскі агляд ахвяраў, павыпускалі цяжарных, замужніх і хворых, а ўсіх іншых змусілі да прастытуцыі. Спачатку трымалі іх як у вязьніцы. Пасьля яны маглі выходзіць навет на вуліцу. Шмат зь іх уцякала, некаторыя трапілі й у канцэнтрацыйныя лягеры Нямеччыны.

Не прайшло пасьля гэтага й колькі тыдняў, як да Вільні прыехалі з Баранавіч др. Лукашэня й былы ротмістр польскага войска Шыпіла з даручэньнем баранавіцкага гэбітскамісарыяту, каб даставіць у Баранавічы зь дзесятак прастытутак. І там арганізаваўся для нямецкага войска публічны дом, але ў Баранавічах зусім ня было ахвотных для гэтага кандыдатак. Доўга гэтыя брудныя спэкулянты хадзілі па завулках Вільні, шукаючы «тавару», пакуль ім удалося звэрбаваць да Баранавіч дзьве лёгкага паводжаньня дзяўчыны.

РАБУЮЦЬ НЕМЦЫ, РАБУЮЦЬ І ІХНЫЯ ПАМАГАТАРЫ

Пагасьціўшы на Каляды ў Ашмяне ў Мурашкаў, я шчасьліва вярнуўся да Вільні. А тут, на табе,— Лятувісы забралі мне маё сямілямпавае радыё. Я ўзлаваўся, пайшоў адразу да іх на мясцовы паліцыйны ўчастак ды асьветчыў, што ў мяне забраны, зусім бясправўна, радыёапарат. Яны брыкаліся, спасылаліся на агульны загад аб здачы радыёпрыёмнікаў. Я ім сказаў: загад загадам, але я свой апарат маю зь ведама заступніка шэфа СД др. Шольца. Тады яны памякчэлі ды апарат аддалі.

Лятувісы мелі па сваім баку й Немцаў, што былі зацікаўленыя ня гэтак іхнай «палітыкай», як рабаўніцтвам. Вось, пасьля двух тыдняў, калі я быў на працы, у маё памешканьне ўварваўся нейкі Немец, перавярнуў дагары нагамі мой пісьменны стол, забраў біжутэрыю на агульную суму каля 500 даляраў. Падобныя рабункі былі тады паўсюдныя: рабавалі Лятувісы, рабавалі Немцы, а віноўнікаў шукаць было рызыкоўна.

Вось адзін абразок. На пачатку 1943 году ў віленскі Беларускі Камітэт зьявіўся стары зрусыфікаваны Беларус — Т. Фішар. Усё жыцьцё быў ён чыгуначным інжынэрам-інспэктарам, перад вайной-жа асеў у Вільні. Два тыдні перад гэтым ён з сваёй жонкай апісаў на Беларускі Нацыянальны камітэт дом і 12 гэктараў зямлі ў Ерузалімцы пад Вільняй. Мы перанялі маёмасьць, перадачу зацьвердзілі Немцы. Цяпер вось гэты Фішар зьявіўся ў Камітэт з плачам, што лятувіскі паліцыянт уварваўся ў ягоны дом ды зрабаваў жончыну біжутэрыю на суму 5000 даляраў. Тут ён, на довад праўды, паказаў фатаграфію сваей жонкі, што была зробленая ў 1913 г. у Вэнэцыі, дзе яна стаіць, як каралева, з дыядэмай, нашыйнікам, бранзалетамі, пярсьцёнкамі.

Справа нялёгкая, у часе вайны цяжка знайсьці нейкую справядлівасьць. Ды ў мяне мільганула думка: Гітлер даў свабодную руку на рабаваньне Жыдоў, але няма ніякіх нямецкіх выказваньняў пра дазвол рабаваць і ня Жыдоў. Я стараўся супакоіць нашага дабрадзея ды пераконваў яго, што тут, напэўна, нейкі разгул толькі жамойцкіх шавіністых ды прыабяцаў, што мы будзем шукаць справядлівасьці.

Я напісаў адпаведны ліст да гэбітскамісара Вільні ды пераслаў яго нашым перакладчыкам. На другі дзень Фішара выклікалі ў СД, дзе яму сказалі, што ягоная скарга будзе разгледжаная, а пакульшто ён павінен чакаць. Чаканьне гэтае зацягнулася. Каб справа не адцягвалася «ад календас грэкас», я ізноў націснуў на Немцаў. Не прайшло й колькі дзён, як у БНК зьявіўся др. Шольц ды радзіў нам не займацца гэтак энэргічна розыскам біжутэрыі Фішара. Па першае, казаў ён, Фішар, хоць зь нямецкім прозьвішчам, не запасіўся фолькс-дойчам. Па другое, ягоныя каштоўнасьці могуць мець жыдоўскае карэньне.

Мы зразумелі, што праўды тут ня дойдзем, што тут звычайная нагласьць дужэйшага. Бо, што каштоўнасьці Фішара ня былі нейкага крымінальнага паходжаньня, ня мелі «жыдоўскага карэньня», было ясна з старой, зробленай

у Вэнэцыі, фатаграфіі. Фішару пасьля гутаркі з др. Шольцам я сказаў, што, як выявілася, націскаць моцна на справядлівасьць справа небясьпечная, бо можа скончыцца для яго нечым горшым.

У БНК прыходзілі часта з скаргамі й абрабаваныя сяляне. Адзін вось прыклад:

— Вёз я, паночку, дровы да Вільні. Але, вы-ж самі знаеце, не пражывеш цяпер, калі ня будзеш хітрыць. У мяне пад дровамі быў падсьвінак... Ці гэткая хітрасьць перашкаджае нямецкай уладзе? То-ж грошы цяпер малавартасныя. Толькі тавар — рэч надзейная.

— Колькі-ж пудоў важыў ваш падсьвінак?

— Пудоў восем на чыста.

— Дык гэта не малы парсюк,— кажу яму.

— Дык вось, паночку, Жмудзякі зьнюхалі, што тут ладная здабыча, ды вяпрука забралі. Мне загадалі адвезьці яго на іхны паліцыйны ўчастак, і там, на маіх ачох, яны расьсеклі яго на восем кавалкаў ды падзяліліся між сабой, мне-ж далі толькі галаву вяпрука. Ці нельга было-б зьвінаваціць іх у Немцаў, бо ім Жмудзякі нічога ня прызначылі?

Я яму сказаў, што ўсю справу можам прадставіць Немцам і, можа, паліцыянты й будуць пакараныя, але й яму гэта ня будзе на карысьць, бо цяпер продаж усякага тавару падлягае нямецкай кантролі.

— Хай сабе падлягае,— казаў селянін,— але чаму жамойцкія разбойнікі маюць жывіцца нашым мазалём?

НЕ СПАДАБАЎСЯ НЕМЦАМ

Праца ў Камітэце ішла сваім ходам: выкупілвалі ад Жмудзінаў для нашых школаў паперу й пісьмовыя прылады, трымалі кантакт з правінцыяльнымі асяродкамі, высылалі людзей на адказныя становішчы, вялі перамовы зь іншымі нацыянальнымі групамі, выручалі, як маглі, нашых людзей з арыштаў, палонных зь лягероў. Часта былі гэта дробныя справы, ды ці раз хадзіла й аб людзкое жыцьцё.

Калі Жмудзіны занялі Сьвір, яны ня далі магчымасьці нармальна там працаваць беларускім школам, а ведамага нашага дырыгента хораў П. Родзевіча, што быў там школьным інспэктарам, змусілі пакінуць сваю працу. За нашай радай ён пераехаў на такое самае становішча да Вялейкі. Ведаючы ягоную адкрытую й шчырую душу музыкі, я прасіў не займаць ніякага адміністрацыйнага становішча, а толькі пілнаваць школьніцтва й хору.

Першыя яго выступы зь мяшаным хорам у Вялейцы былі ўздымам патрыятычнага духу. Вялейскі гэбітскамісар Шмідт, які быў вельмі прыхільны да Беларусаў, запрасіў Родзевіча на бурмістра. Прапанова была прынятая, бо Родзевіч спадзяваўся, што гэтак хутка пабудуе ў Вялейцы народны дом ды створыць музычную школу.

Яго папулярнасьць, здаровы нацыянальны падыход да грамадзкага жыцьця й уздым беларускага духу ў Вялейцы зьвярнулі ўвагу кіраўніка СС, рыскага фольскдойча Гравэ. Шмідт у хуткім часе быў адкліканы, на ягонае-ж месца прыбыў дабрадушны палкоўнік СС Манн. Родзевіч у гэтым часе правёў дзьве бурныя размовы з Гравэ ў справе арыштаваных і нявінна пабітых на вечарыне Беларусаў.

За Родзевіча заступіліся ўсе беларускія патрыёты на чале з У. Калодкам і М. Скабяём, супроць-жа быў заступнік крымінальнай паліцыі, былы царскі палкоўнік Перамыкін, браты Саўчыцы й Касякі ды іншыя русацяпы. Яны бессаромна даносілі на Калодку й Родзевіча ўсякую хлусьню, прыкладам, што Родзевіч быў у каталіцкай духоўнай сэмінарыі, што да жонкі пісаў лісты папольску й падобнае. Станоўкасьць у абароне правоў сваіх суродзічаў ды самадзейнасьць давялі да арышту абодвух. Родзевіча СД забіла, трупа спалілі ў лазьні 7 км за Вялейкай. Калодку-ж, які быццам менш спрачаўся, саслалі ў канцэнтрацыйны лягер у Нямеччыну. Віленскі Беларускі Камітэт востра на гэта запратэставаў.

У іншым выпадку Камітэту давялося ратаваць жыцьцё ведамых беларускіх дзеячоў др. Грабінскага й др. Грынкевіча. Было гэтак: адзін заўзяты жмудзкі

камэндант паліцыі хапаў віленчукоў з вуліцы, дапытваў, зьбіваў да паўсьмерці. Рабіў ён гэта на сваю руку, каб падмацаваць жмудзкія ўплывы ў Вільні, і за гэта яго ў белы дзень застрэлілі на вуліцы Міцкевіча. Азьвярэлыя Лятувісы, на сваю руку таксама, схапілі 12 выдатнейшых віленскіх грамадзян, а між імі старшыню міжнароднага Чырвонага Крыжа прафэсара К. Пэльчара, адваката Энгельса, інжынера Станкевіча, прафэсара Вільчынскага, зь Беларусаў-жа дактароў Грабінскага ды Грынкевіча.

З арыштаваных палавіну Лятувісы расстралялі ў ямах на Панарах, дзе яны забівалі й Жыдоў. Другую-ж палову вывезьлі ў лес на цяжкую працу. Там др. Грабінскі з праф. Вільчынскім спушчалі з пня таўстыя сосны. Калі праф. Вільчынскі пры гэтым прыгаварываў «Цёнгнійммы, колего, пілэн нашэго жывота!» *, прыганяты Жмудзін на яго закрычаў: «А ты там цягай, цягай, польская морда!»

Мы злажылі зразу ў гэбітскамісара гораду вострыя пратэст супроць самаволі Лятувісаў. У хуткім часе др. Грабінскі й др. Грынкевіч былі звольненыя.

Калі праца Камітэту гэтак ішла сваім «нармальным» ходам, ад доктара Шольца нам пад сакрэтам даносяць, што мая асоба мела нарабіць шмат клопату мясцовым нямецкім уладам ды што я непажаданы на займаным становішчы. Хутка я дастаў і ліст з гэбітскамісарыяту з запытаньнем і перасьцярогай:

1. Колькі людзей выслаў я самавольна на працу ў Беларусь?

2. Як пасьмеў я гэта рабіць самавольна?

Перагледзіў я канцылярныя паперы, і аказалася, што на працу было выслана 680 чалавек, з гэтага толькі адна трэцяя мела нямецкі дазвол. Довады аб высылцы людзей на працу я спаліў, ім-жа адпісаў, што на працу ў Беларусь было выслана каля 65 асобаў, у большасьці зь нямецкімі прапускамі. У хуткім часе ад гэбітскамісара Вольфа мы дасталі два лісты: у першым ён забараняў, пад пагрозай, высылку людзей у Беларусь, а ў другім назначыў мяне на працу ў Баранавічах, з тым, што 20 жніўня 1942 г. я мушу пакінуць Вільню.

Сабраў я сваё апошняе паседжаньне Камітэту. Усе з сумам згадзіліся, што я мушу адыйсьці. Спрачацца зь Немцамі было рызыкоўна. Зь вялікім трудам удалося нам упрасіць др. Б. Грабінскага, каб ён ачоліў Камітэт. Калі разьвітваўся з маімі сябрамі, бачыў, што былі вельмі ўзрушаныя. Рэдактар «Беларускага голасу» Ф. Аляхновіч прасіў не забывацца, пісаць у газэту. Др. філ. Ф. Грышкевіч шчыра дзякаваў мне за працу. Адыходзіў я з надзеяй, што цяпер вось аддыхну, калі буду працаваць ужо толькі ў сваей прафэсіі.

Выкарыстаў я, аднак-жа, свой дакумэнт ад'езду, каб колькі яшчэ разоў уздоўж і ўпоперак праехаць па Беларусі. Усюды даваў рады, інструкцыі, арганізаваў мясцовую інтэлігенцыю. У часе гэтых падарожжаў аж тры разы цягнікі наяжджалі на міны, паравоз выскакваў з рэльсаў, грукацелі й трашчэлі вагоны, паскладаныя на вышках рэчы падалі на галовы пасажыраў. Але абыходзілася нейк бяз стратаў у людзях. Пасьля 6—8 гадзінаў цягнік заўсёды паволі сунуў наперад, з двумя вагонамі перад паравозам. Чыгунку гэным часам яшчэ рэдка дзе пілнавалі.

У БАРАНАВІЧАХ

Увосені 1942 г. прыехаў я да Баранавіч. Быў позны вечар, калі з Палескай станцыі валокся з чамаданам да майго сябры Папуцэвіча, дзе я часова затрымаўся. Баранавічы паказаліся мне, пасьля Вільні, як вялікая беларуская вёска раськінутая на бязьмежнай палескай раўніне.

Назаўтра пайшоў я ў шпіталь, каб абгаварыць умовы працы, і тут убачыў усё гора людзей у ваенным часе, калі востры недахоп лекароў і кваліфікаванага мэдычнага пэрсаналу, ды весьці нармальна працу перашкаджае яшчэ гарэлка. Шпіталь мясьціўся ў былой жыдоўскай гімназіі. На радзільнай ляжалі, прывезеныя з далёкіх вёсак, зь цяжкімі камплікацыямі, тры жанчыны. Ня было ніякіх наркатычных лекаў. Пры складаных апэрацыях мне ўдалося ўратаваць жыцьцё

* Цягайма, калега, пілу нашага жыцьця!

ўсіх трох, ды згубіць толькі адно дзіця. Асыстэнтам мне быў студэнт 3-га курсу мэдыцыны, які яшчэ нічога ня вучыўся з акушэрства, ды адна сястра.

Дырэктар шпіталя, др. Наумік, ня меў часу заняцца цяжка хворымі на радзільнай і ў маё распараджэньне аддаў увесь жаночы аддзел на 45 ложкаў, з 4 сёстрамі, 8 вучаніцамі на сясьцёр, ды абсальвэнтам мэдыцыны У. Каралём у дапамогу. Праца пайшла нармальна, толькі балюча ўвесь час адчуваўся недахоп лекаў, наркозы, бандажоў, сыраватак, лябараторных рэагентаў і інструмантаў.

У дзень майго прыбыцьця ў шпіталь я пазнаёміўся й з баранавіцкай сярэдняй мэдыцынскай школай, якую больш году вёў др. В. Войтэнка. Пабачыў перапоўненыя вучнямі клясы, шмат выкладчыкаў, але ніяк ня мог сьцяміць нейкага выразнага пляну. Быў якраз зроблены 1-шы выпуск аптакарскіх памочнікаў, бо адчуваўся востры недахоп аптакароў. Аптэкі стаялі зачыненыя пасьля таго, як аптакароў наськіх павывозілі, а жыдоўскіх пазабіралі Немцы.

У хуткім часе др. Войтэнку назначылі акруговым лекарам у Слоніме, і гарадзкая ўправа, на чале з бурмістрам Ю. Сабалеўскім, запрасіла мяне на кіраўніка Мэдычнай Школы. У міжчасе я перанёсься на стала да доктара Навуміка.

Разгледзіўшыся ў грамадзкім жыцьці, я пераканаўся, што Беларусы ў адміністрацыі былі тут у абсалютнай бальшыні, займалі ўсе ключавыя пазыцыі. Навет СД на Баранавіцкую, Слонімскую, Наваградзкую й Лідзкую акругі было абсаджанае Беларусамі й беларускімі збройнымі аддзеламі. Тут зь беларускага боку палітычныя справы ў гэтым часе кантралявалі патрыёты В. Папуцэвіч, А. Русак, Я. Якуцэвіч, К. Кіслы ды іншыя. Не зважаючы на ўсе наступы з боку польскага ды савецкіх агентаў, яны здолелі адміністрацыйна апанаваць аграмадную прастору Заходняй Беларусі й да канца нямецкае акупацыі надаць ёй выключна беларускі характар.

Школьніцтва, мясцовая адміністрацыя, судаўніцтва ды ў бальшыні паліцыя былі ў беларускіх руках. Добра разьвівалася справа арганізацыі беларускае моладзі, беларускага войска, аддзелаў СС, беларускай прапаганды, беларускай адміністрацыі, беларускіх дамоў культуры, Самапомачы. А ўгодкі 25 Сакавіка — Незалежнасьці Беларусі — адзначаліся з гэткім нацыянальным уздымам і размахам, што мясцовыя Палякі дзівіліся ды казалі:

— Ніколі Палякі пры сваёй дзяржаве тут не адзначалі гэтак урачыста ды з такой любоўю найбольшае польскае сьвята — 3-га Мая.

Трэба ўспомніць галоўныя дзялянкі беларускага нацыянальнага жыцьця ў Баранавічах, якія ў ваенным часе зацьвілі як рожы. Школа беларускага нацыянальнага ткацтва, пад кіраўніцтвам таленавітай ткачкі з Клецка. Узорыстымі беларускімі дыванамі з нацыянальнымі гэрбамі, партрэтамі гэрояў, краявідамі, і г. д., упрыгожаны быў аграмадны габінэт бурмістра Баранавічаў Ю. Сабалеўскага. Яны ішлі на выстаўкі беларускага мастацтва, былі падаркамі ад беларускага грамадзтва высокім прадстаўнікам нямецкае ўлады.

Сярэдняя Мэдычная Школа, з аддзеламі мэдсясьцёр, акушэрак, фэльчароў, аптакароў і вэтэрынарных памочнікаў, налічвала 360 студэнтаў з 33 выкладчыкамі. Сярэдняя Гандлёвая Школа — 120 студэнтаў і 15 выкладчыкаў. Сярэдняя Мастацкая Школа — 30 студэнтаў. Сярэдняя Музычная Школа пад кіраўніцтвам кампазытара Спаскага, Сярэдняя Тэхнічная Школа — 150 студэнтаў і каля 20 настаўнікаў. Настаўніцкія курсы — 100 студэнтаў. Матуральныя курсы — больш 60 студэнтаў. Вельмі дзейны быў Беларускі Народны Дом Культуры пад кіраўніцтвам Шыдлоўскага, дзе быў добры хор, танцавальны ансамбль, тэатральная група, струнны аркестр. Выдатна рэпрэзэнтаваўся Саюз Беларускае Моладзі (СБМ), і Юнакоў, і Юначак.

Усё гэта кідалася Немцам у вочы, асабліва нашая моладзь, якую праз школы мы ахоўвалі ад вывазу ў Нямеччыну на працу, на чым ізноў-жа так залежыла нямецкаму Арбайтсамту — агенцыі для вярбоўкі людзей на працу ў Нямеччыну.

Бывала гэтак, што Немцы, налавіўшы беларускай моладзі ў акрузе, звозілі яе ў баранавіцкі табар, каб тут ладаваць у цягнікі на вываз, а нашыя прадстаўнікі, што працавалі ў СД, пераканаўшы палітычна-адміністрацыйны аддзел гэтай установы, што сярод звожаных юнакоў у вывозны табар ёсьць шмат кандыдатаў на ўмацаваньне нашых збройных сілаў, на службу ў адміністрацыі, эканоміцы, на ўмацаваньне нутраной бясьпекі, маладых людзей сотнямі забі-

ралі з табару. Арбайтсамт скрыгатаў зубамі, бо ён ніколі ня мог выканаць наложанага кантынгенту, ды пісаў скаргі сваім вышэйшым уладам, што ў Баранавіцкай Акрузе Беларусы маюць шмат сярэдніх школаў, у якіх ёсьць замаскаваны супраціў, каб падарваць нямецкую акцыю ў вярбоўцы працоўнай сілы.

І вось 12 верасьня 1943 г. гэбітскамісар Баранавіцкай акругі Вэрнэр паклікаў да сябе бурмістра Ю. Сабалеўскага й школьнага інспэктара Міхалоўскага, прачытаў ім тайны загад ад вышэйшых уладаў, што ўсе сярэднія школы ў Баранавічах і акрузе існаваць далей ня могуць, бо Немцы моцна зацікаўленыя ў працоўнай сіле, і што 14 верасьня ўся моладзь названых школаў будзе ў прымусовым парадку ўзятая ў транспарты й вывезеная ў Нямеччыну, дзе яна, магчыма, будзе школеная ў нямецкіх хвабрыках і ўстановах. Камісар загадаў дапамагаць гэтай акцыі, ды не казаць нічога нікому, каб акцыі не пашкодзіць, накш яны будуць асабіста зьвінавачаныя ў сабатажы.

У вызначаны дзень нямецкая паліцыя акружыла найбольшыя лікам вучняў сярэднія школы ў Баранавічах — Мэдычную, Гандлёвую й Тэхнічна-Адміністрацыйную. Ды нямецкая акцыя поўнасьцю правалілася. Бальшыня вучняў здолела разьбегчыся ў часу хапанкі. За дрот пры чыгуначнай станцыі было загнана толькі каля 100 студэнтаў. Пад канец дня й гэтыя паўцякалі праз драты, а ўва ўсёй Заходняй Беларусі паўстала паніка, ды школьная моладзь разьбягалася. Адначасова Беларусамі была ўзьнятая ў Баранавічах, Менску ды іншых акругах акцыя энэргічнага пратэсту супроць разгону беларускіх школаў.

Немцы арыштавалі тады а. Льва Гарошку, дырэктара Баранавіцкай Мэдычнай Школы, які востра пратэставаў супроць хапанкі ў часе самое акцыі, гразілі арыштам і іншым. Але салідарны супраціў змусіў Немцаў адступіць. Беларусы абасноўвалі свае пратэсты палітычнай бязграматнасьцяй акцыі, роўнай правакацыі, якая заганяе беларускае жыхарства ў рады бальшавіцкай партызаншчыны, падрывае ўвесь давер народу да тае нямецкае адміністрацыі, якая так гвалтоўна разбурае беларускае школьніцтва.

У выніку Немцы ня толькі звольнілі а. Л. Гарошку, але колькі разоў публікавалі заклікальныя адозвы ад імя нямецкіх акупацыйных уладаў, каб моладзь вярнулася ў свае школы да нармальнай працы, даючы адначасна гарантыі, што больш падобных хапанак ня будзе. І запраўды, пасьля аднаўленьня працы ў школах Немцы аж да свайго адыходу летам 1944 г. больш школаў не чапалі.

Затое Немцы цяпер больш насторажыліся да беларускага вызвольнага руху ды пры дапамозе сваіх агентаў, выхаваных Акінчыцам з савецкіх ваенна-палонных, вынюхвалі найменшыя праявы супраціву. Яны падазравалі, што Беларусы-каталікі маюць кантакты з польскім падпольлем ды англа-амэрыканскай разьведкай. Не малую траўлю ў гэтым кірунку праводзілі й некаторыя праваслаўныя дзеячы з Касякамі на чале, што абівалі парогі нямецкага СД, Абвэру й Камісарыятаў з фабрыкаванымі даносамі на паасобных Беларусаў-каталікоў, у першую чаргу на кс. В. Гадлеўскага, галоўнага школьнага інспэктара, на праф. В. Івановскага, бурмістра Менску, на У. Казлоўшчыка, рэдактара «Беларускай газэты», на беларускае вунійнае духавенства з экзархам а. А. Неманцэвічам на чале й на шмат іншых.

Ахвярамі як нямецкага падазрэньня ў існаваньні сярод Беларусаў падпольнае проангла-амэрыканскае канспірацыі, так і траўлі некаторых засьлепленых праваслаўных, пры пабочным супрацоўніцтве агентаў з групы Акінчыца, і палі каталіцкія сьвятары Неманцэвіч, Глякоўскі, Малец, Рыбалтоўскі, Гадлеўскі, ня лічачы тых сьвятароў беларускага паходжаньня, якіх Немцы расстралялі ў часе масавых арыштаў каталіцкага духавенства ў Заходняй Беларусі ў 1942 г.

Загінула й шмат сьвецкіх Беларусаў-каталікоў з тых самых рук у часе «прачышчаньня» ад уяўных «ворагаў» нямецкага панаваньня ў Беларусі, бо Немцы ўжо ў пачатку 1942 г. пры дапамозе сваіх прыслужнікаў складалі па местах, мястэчках і вёсках сьпіскі гэтак званых «Палякаў» віднейшага стану, якія ў бальшыні былі Беларусамі-каталікамі, што пры польскай акупацыі займалі дробненькія становішчы — солтысаў, войтаў, лясьнікоў, ніжэйшых урадоўцаў, ці былі шляхоцкага паходжаньня.

З выдатнейшых Беларусаў, што пры Немцах актыўна ўлучыліся ў беларускае нацыянальнае будаўніцтва й зьгінулі, назваць трэба, апрача ўспомненага ўжо П. Родзевіча, У. Казлоўшчыка, рэдактара менскае «Беларускае газэты», якога

застрэлілі ў будынку рэдакцыі агенты менскага СД, сымулюючы «партызанаў»; В. Іваноўскага, бурмістра Менску, гэткім самым спосабам застрэлілі на вуліцы места.

Была арганізаваная нямецкая пастка й на іншых пад назовам «Беларускай Незалежніцкай Партыі». Тварылася яна пад «апекай» нямецкага агента ў мундзіры нацыскай партыі Фёдарава, які сымуляваў «фольксдойча», хоць быў жыдоўскага паходжаньня. Ён добра ведаў беларускую мову й на зборках беларускіх энтузіястых нямецкага супрацiву выказваўся антынямецка, як «шчыры Беларус». З гэтае арганізаванае правакацыі ніхто не пацярпеў, бо пастка засталася незачыненай, ня было часу. Хістлявае нямецкае палажэньне пасьля Сталінградзкае апаразы ішло ўжо выразна ў кірунку катастрофы, і Немцам ня было магчымасьці канчаць свае пляны.

АБ НЕКАТОРЫХ БЕЛАРУСАХ У БАРАНАВІЧАХ

Пры маёй бытнасьці ў Баранавічах наглядалася вялікая зыгранасьць там беларускае інтэлігенцыі. Паважнейшых разыходжаньняў, сварак ня было. Усе дружна стаялі за працу для ўздыму й разьвіцьця беларускае нацыянальна-культурнае справы, за вырываньне ад Немцаў як найбольш для гэтага ўступак. Таму ніхто не стараўся выбіць таго ці іншага зь сядла, але, наадварот, намагаўся яго падтрымаць і ўмацаваць. У гэтым і быў галоўны сакрэт вялікага беларускага нацыянальнага ўздыму ў Баранавічах і Баранавіцкай акрузе. Успомню тут колькі важнейшых баранавіцкіх дзеячоў.

Найперш трэба сказаць колькі словаў пра бурмістра Баранавічаў, Юрага Сабалеўскага, які, пасьля «дэтранізацыі» ў Менску др. Ермачэнкі, пераняў там Самапомач ды быў віцэ-прэзыдэнтам Беларускае Цантральнае Рады.

Юры Сабалеўскі, аграном па прафэсіі, стары беларускі дзеяч Заходняй Беларусі, у 1922 г. выбраны беларускім паслом у польскі сойм, пазьней сябра Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады. Ён любіў часта паўтараць фразу: «Малы чалавек — малы клопат, большы чалавек — большы клопат». Ён вывучаў кожнага значнага Беларуса, стараўся справядліва яго схарактарызаваць, ацаніць, прыслухоўваўся да ягоных выказваньняў і поглядаў. Пісаў навет на кожнага аграмадную біяграфію. Урыўкі з гэтых нарысаў любіў чытаць іншым. Ягоныя характарыстыкі не заўсёды супадалі з запраўднясьцяй. Хутчэй выражалі яны ягоную суб'ектыўную ацэнку й погляды.

У часе «ўлады» Сабалеўскага ў Баранавічах можна было назіраць схільнасьць у яго да нямецка-аўстрыйскай школы адміністраваньня. Ён завёў строгі «кайзэрскі» парадак: увайшоў у гарадзкую ўправу ня скінуўшы шапку — 5 марак штрафу; спазьніўся на працу — 10 марак; прыйшоў падпіты — гэта небясьпечна! — назаўтра, ці ты работнік, ці інжынер, ці доктар, сядзеш на бочку, у якой вывозіліся з гораду нячыстоты, ды будзеш на ёй цэлы дзень езьдзіць. Супраціў не памагаў — ён звальняў з работы. Не памагалі таксама пробы ўмешваньня ў гэткія строгія парадкі іншых нашых дзеячоў, што дакаралі бурмістра за ягоныя сярэднявечныя практыкі. Ён цьвёрда казаў: «Людзей трэба выхоўваць!» А калі яму казалі, што ў часе вайны гэткія мэтады служаць нашым ворагам, ён спакойна адказваў: «Кожны рэжым патрабуе парадку й дысцыпліны». І запраўды, нічога супроць яго ня можна было зрабіць, каб адначасна не панізіць ягонага аўтарытэту, як бурмістра, зь якім лічыліся Немцы.

Гэта Сабалеўскі дамогся ў гэбітскамісара Баранавіцкай акругі, каб усе каталіцкія ксяндзы й праваслаўныя сьвятары гаварылі ў сьвятынях казаньні й павучэньні ў беларускай мове. Акцыя гэтая была праведзеная па ўсёй акрузе. Гэта ён асабліва ўспамагаў мастацкую й ткацкую школы ды зьвярнуў увагу Немцаў і таксама прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў на высокія мастацкія якасьці беларускага народнага мастацтва. Праз наладжаную Беларускай Самапомачай аграмадную выстаўку народнага мастацтва ў Баранавічах, што займала колькі будынкаў, прайшло больш 20 тысячаў чалавек. А ў наладжаньні выстаўкі немалая была заслуга Юрага Сабалеўскага.

Апрача Сабалеўскага, было, ведама, і шмат іншых выдатных Беларусаў у Баранавічах. Аб Папуцэвічу, Русаку ды некаторых іншых я ўжо, хай сабе коратка,

але гаварыў. Тут хацелася-б расказаць пра менш знаных, як а. Льва Гарошку, Уладзімера Шыманца, У. Кліма ды пару іншых.

Леў Гарошка, каталіцкі сьвятар усходняга абраду, адзін з выдатных беларускіх дзеячоў, у часе нямецкага паходу на Ўсход быў на беларускім Палесьсі, якое, паводле гітлераўскага пляну распадзелу ўсходніх прастораў, адміністрацыйна прыразалася да Райхскамісарыяту Украіны. Там, у сваёй парафіі, з прыходам Немцаў ён ня толькі дзеіў у кірунку хрысьціянскае рэлігійнае супольнасьці, але й ставіў востра дамаганьне, каб Палесьсе, як беларуская прастора, мела беларускую адміністрацыю й школьніцтва. За гэта а. Л. Гарошка апынуўся пад украінскім і мясцовым праваслаўным абстрэлам, і нямецкі камісар загадаў высяліць яго зь Пінскай акругі без права павароту. Айцец Леў Гарошка тады пераехаў да Баранавіч, тут знайшоў падтрыманьне др. В. Войтэнкі, тагачаснага бурмістра места, ды ўладзіўся ў рэдакцыі «Баранавіцкай газэты».

Быў гэта вялікі патрыёт, у беларускіх справах нязвычайна прынцыповы, стойкі, і стаўся адной з важных апораў беларускае нацыянальнае працы ў Баранавіцкай і Слонімскай акругах. Пасьля арышту экзарха вунійнай Царквы а. Неманцэвіча ён яе ачольваў.

Уладзімер Шыманец, кіраўнік аднаго з аддзелаў Гарадзкой Управы Баранавіч, шчыры патрыёт, браў дзейны ўдзел у беларусызацыі адміністрацыі Баранавіч і акругі, дэмаскаваў скрытых ворагаў. На эміграцыі, у Даніі, выратаваў сотні Беларусаў ад загрозы выдачы іх бальшавіком ды вывазу ў СССР. У Францыі, у Парыжы, быў і ёсьць ён адным з правадыроў тамашняй беларускай эміграцыі. Як таленавіты мастак, ён быў адзначаны на розных францускіх выстаўках. Малюе пераважна на беларускія тэмы.

Уладзімер Клім, былы студэнт права Віленскага унівэрсытэту, левых поглядаў, аднак патрыёт, дзейны перад вайной. У часе савецкай акупацыі Вільні быў у радох тых Беларусаў, што выкарыстоўвалі новыя абставіны для беларусызацыі места. Там зблізіўся да Клімава, бальшавіцкага камісара Вільні. З прыходам Немцаў улучыўся ў Баранавічах у беларускія актыўныя рады разам з братамі Пяцюкевічамі ды працаваў на найбольш адказным і небясьпечным адрэзку — у радох беларускай тайнай паліцыі, быў намесьнікам яе начальніка.

У. Клім кіраваўся філязофіяй: Беларусы павінны пераймаць перш за ўсё найбольш ключавыя становішчы, бо накш нашы ворагі й у зьмененых умовах нас вынішчаць. А заняўшы гэтае становішча, наш абавязак ахоўваць беларускія сілы супроць усякай правакацыі. Чым больш у гэтай міжнароднай бойні мы захаваем сваіх, тым лепшыя шансы здабыць дзяржаўную незалежнасьць.

На гэткіх сваіх пазыцыях У. Клім, аднак-жа, ня ўтрымаўся. Пасьля нямецкай апаразы пад Сталінградам ён пільна слухаў радыя, цікавіўся перш за ўсё савецкімі наступамі ды рухам савецкіх арміяў на захад. Хутка пасьля, у пачатак 1943 г., галоўны партызанскі штаб, што пад кіраўніцтвам Панамарэнкі быў пры галоўнай кватэры Сталіна, стаў скідаць на парашутах камуністычную падпольную тэрытарыяльную арганізацыю для антынямецкай і антыбеларускай дывэрсіі на тылох нямецкага фронту. На Баранавіцкую акругу быў прызначаны ды скінены з падручнымі былы камісар Вільні Клімаў. Ён хутка сарганізаваў, у самых Баранавічах, бальшавіцкае падпольле пад назовам «Антыфашысцкі саюз». Да яго бальшавіцкія агенты здолелі загнаць больш сотні Беларусаў.

Штаб Клімава знаходзіўся ў Налібоцкай пушчы. Адтуль ён час-ад-часу наведваў Баранавічы ў будынку школы-сямігодкі, дзе настаўніца гэтай школы, маладая дзяўчына, была лучнікам зь некаторымі беларускімі нацыяналістамі. Хутка Клімаў гэтак навязаў лучнасьць і з У.Клімам, якога ён помніў зь Вільні. У. Клім, узяўшы для бясьпекі свайго сябру, сп. Я. Ж., які таксама быў зь ім у тайнай паліцыі, колькі разоў сустракаўся з камісарам Клімавым.

У гэтым часе беларуская разьведка СД паведаміла нямецкія ворганы, што ў Баранавічах разьвіваецца бальшавіцкае падпольле, якое мае сыстэматычныя сходкі з партыйным штабам у лесе. Тады Немцы, разам зь беларускай выведнай службай, заставілі на акраіне места, куды пранікала бальшавіцкая лучніковая група, пастку. У часе баявой сутычкі колькі чалавек з бальшавіцкага боку было забіта, некаторыя-ж лучылі ў палон. Немцы ад іх даведаліся пра галоўнага арганізатара падпольля ды пра месца збораў. Былі захопленыя сьпіскі сяброў

ды іншая літаратура. За адну ноч Немцы арыштавалі каля 150 чалавек, удзельнікаў савецкай правакацыі.

У захопленых сьпісках ня было імя У. Кліма, ані ягонага сябры Я. Ж. Таму Немцы пакульшто нічога ня ведалі пра сувязі Кліма з бальшавіцкім штабам дывэрсіі й яго не арыштавалі. Далі яму навет на Вялікдзень 1943 г. водпуск для выезду ў родную Пружаншчыну, дзе ён прабыў два тыдні. Арыштаваных Немцы пераважна ссылалі ў нямецкія канцэнтрацыйныя лягеры. Некаторых навет выпусьцілі. Беларускія патрыёты, заскочаныя ўсёй падзеяй, рабілі ўсё магчымае, каб аблегчыць долю нявінных ахвяраў бальшавіцкае правакацыі.

Ды, як пазьней выявілася, настаўніца школы, што была бальшавіцкім лучнікам, у допытах у СД, баронячы сябе, удала У. Кліма. Яна казала, што пра ўсё паведамляла У. Кліма, ведаючы, што ён супрацоўнічае зь Немцамі, ды лічыла, што ён пра гэта ім раскажа.

Не малым наменем да загубы У. Кліма быў Дыячэнка, Украінец, пятлюраўскі палкоўнік, што займаў становішча кіраўніка беларускай тайнай паліцыі, якая дзеіла пад начальствам нямецкага СД. Баючыся за сябе, ён дамагаўся ад Немцаў найбольш строгага пакараньня свайму падуладнаму У. Кліму за зраду. Нямецкі начальнік Баранавіцкага СД Амэлюнг у гэткіх абставінах быў змушаны У. Кліма расстраляць. Аб гэтым мне апавядаў В. Папуцэвіч, які быў навочным сьветкам дыскусіі ў гэтай справе Амэлюнга з Дыячэнкам. Было гэта раньняй вясной 1943 г. Сам У. Клім тлумачыўся адно тым, што ён, як тайны выведнік, зьбіраў матэрыялы аб бальшавіцкай дывэрсіі, ды паведаміць аб усім меў Немцаў, тады калі ў сваіх руках ужо будзе мець камплектны матарыял.

Клімавага сябру, інж. Я. Ж., які схамянуўся, трапіўшы пад допыты, мы здолелі абараніць ад расстрэлу. Пакаралі яго канцэнтрацыйным лягерам у Нямеччыне, зь якога ён, пасьля капітуляцыі Нямеччыны, выратаваўся.

Калі ў гарне нямецка-бальшавіцкай кузьні заламаўся ды зьгінуў У. Клім, што казаць пра нацыянальна менш стойкіх. Адной з гэткіх ахвяраў быў Акружны лекар Баранавіцкай акругі др. Лукашэня. У нармальных умовах ён быў-бы добрым беларускім грамадзянінам, не зважаючы на некаторую зрушчанасьць. Сын баранавіцкага возьніка, вырас ён у хатняй і навакольнай праваслаўна-зрушчанай дробнамяшчанскай атмасфэры ды зь беларускім рухам сутыкнуўся ўпяршыню ці ня ў часе толькі вайны. Пры першай акупацыі бальшавікоў ён быў галоўным лекарам Баранавіч, пры Немцах — лекарам акруговым. Вось высокія становішчы, якія ён займаў з ласкі акупантаў, вытварылі ў ім псыхіку самапэўнасьці ды патрэбы апоры не на свой народ, але на таго, хто дужэйшы. Пры Палякох ён лашчыўся да іх, пры бальшавіках — да іх, а цяпер Немцы, дык, ведама,— да іх. У беларускі нацыянальна-вызвольны рух ён ня ўлучаўся, радаў беларускіх прадстаўнікоў як у Менску, так і ў Баранавічах ня слухаў, прыкідваўся, што верна служыць толькі Немцам.

Але калі Немцам пад Сталінградам надламалі хрыбет і яны апынуліся ў адступленьні, Лукашэня згубіў веру ў перамогу свайго новага гаспадара. Паколькі ягоны дом стаяў на глухіх акраінах Баранавічаў, бальшавіцкае-ж падпольле ў лясох і месьце было ўжо актыўнае, савецкія агенты й узялі Лукашэню ў сваю апрацоўку. Яны вымагалі, каб ён трымаўся пасады акруговага лекара й дастаўляў ім, празь іхных лучнікаў, лекі, інструманты, розныя мэдыцынскія матарыялы, і гэтым ён сябе апраўдае перад будучай савецкай уладай. Др. Лукашэня на гэта, відаць, згадзіўся, бо беларускі вывед даносіў, што ягоны дом наведваюць падпольшчыкі, а на лекарскіх базах акругі сыстэматычна «прападае» частка лекаў і мэдыцынскіх матарыялаў.

У сярэдзіне 1943 г. беларуская разьведка злавіла дастаўшчыка лекаў у партызанскі раён. Выявілася, што гэта швагра др. Лукашэні. У наяве гэткага факту Лукашэня ня мог далей займаць свайго становішча, тымбольш, што лекаў пры Немцах заўсёды нехапала й для цяжка хворых мясцовага жыхарства. Др. Лукашэня з пасады быў звольнены, ягонымі кантактамі з партызанамі занялося СД, ды, знайшоўшы новыя довады, пасадзіла яго ў пераходны канцэнтрацыйны лягер у Калдычаве, дзе яго й расстралялі. Ягоная жонка пасуліла Немцам 200 рублёў золатам на выкуп мужа, за што й яе арыштавалі.

НА СТАРОЖЫ ЗДАРОЎЯ ЖЫХАРСТВА

Гітляроўцы ў сваім паходзе на ўсход вынішчалі падбітыя славянскія народы ня толькі зброяй, агнём, голадам, гвалтамі, мукамі, непасільнай працай, але таксама й эпідэміямі, якія стараліся прыглушаць натолькі толькі, каб яны не пакасілі й нямецкага войска. Яны сьведама не змагаліся з пошасьцямі, якія покатам клалі ваеннапалонных ды часткова й мясцовае жыхарства. А каб перашкодзіць рабіць гэта й мясцовым лекарскім сілам, Немцы ў вельмі малой колькасьці адпускалі на патрэбы жыхарства лекі ды сыраваткі і абмяжоўвалі ўсякую мэдычную дапамогу наагул.

Беларусь у часе вайны ў галіне лекарска-мэдыцынскай знайшлася ў асабліва цяжкім палажэньні. Бальшавіцкая сыстэма, як вельмі адсталая, на працягу свайго існаваньня ніколі ня была здольная выпрадукаваць для патрэбаў жыхарства лекаў у дастатковай колькасьці, не гаворачы ўжо пра нейкае масавае змаганьне з пошасьцямі, пра загварантаваньне мінімуму рацыянальнага аджыўленьня ды пра іншыя прафіляктычныя мерапрыемствы.

Немцы-ж на самым пачатку свае ўлады найперш аграбілі ўсе захопленыя мэдычныя й прафіляктычныя склады існуючых перад гэтым рэжымаў. Пазьней з гэтых запасаў для жыхарства яны выдзялялі мінімальную толькі колькасьць лекаў, з выразным разьлікам на тое, каб жыхарства якнайбольш вымірала. Дадаць да гэтага яшчэ трэба, што шмат аптэкаў ды мэдычных складоў у часе вайны было й зьнішчана, прадукцыя-ж лекаў была амаль цалком спыненая.

Усюды нехапала антыбіётыкаў, шчапёнак, дэзінфэкцыйных матарыялаў, хляраформу, камфоры, кафэіны і г. д. На тэрыторыі Галоўнага Камісарыяту Беларусі было дзейных толькі 43 аптэкі, ды й яны былі ў стане жалю годным. Нічагусенькі, ніякіх лекаў не давала й Масква сваім партызанам, якія знаходзіліся ў больш жудасным палажэньні за жыхарства.

Баранавіцкі Гарадзкі Шпіталь Немцы выкінулі з свайго будынку ды аграбілі з усіх амаль інструмэнтаў і матарыялаў. Мясьціўся ён цяпер у памешканьні былое жыдоўскае гімназіі. Інфэкцыйны аддзел шпіталю займаў асобны дом. Плошчу шпіталю мы пашырылі прыдзелам суседніх жылых дамоў. Недахоп інструмантаў, лекаў, бандажоў быў страшны. Асабліва нехапала наркозы ды гіпсу для пераломаў. Нямецкі акруговы камісар на просьбу дапамогі даў адмоўны адказ: вайна ды ўсё. Менск з Чырвонага Крыжа прыслаў нам толькі тры літры хляраформу. Сьпірту для рук і для стэрылізацыі інструмэнтаў таксама нехапала. Шпіталі ў Слоніме ды Нясьвіжы змушаныя былі карыстацца самагонкай.

Трэба было шукаць нейкага выхаду самым, самым здабываць патрэбныя лекі й мэдыкамэнты, каб нейк ратаваць нашых хворых, каб ахаваць жыхарства ад эпідэміяў. Сьцежку ў гэтым кірунку нам паказалі спэкулянты, якія пакрысе дастаўлялі розныя лекі амаль з усёй Эўропы. Вось дачуліся мы, што ў жыдоўскім геце ў Вільні за сала й грошы можна дастаць марлі. Пасылаем туды др. Науміка. Знайшоў ён прадаўца, але марлю цяжка вынесьці з гетта. Нашаму прадаўцу прыйшлося накручваць вакол свайго цела магутны бандаж марлі ды выходзіць разам зь іншымі Жыдамі «на працу». Ён пасьля адлучаўся ад свае групы, прыходзіў на кватэру др. Науміка ды там «танчэў». Адна гэткая «ноша» давала здабычу марлі на соткі мэтраў. Так др. Наумік за колькі дзён здолеў сабраць да 5000 мэтраў гэтага каштоўнага нам матэрыялу, чаго нашаму шпіталю хапіла на даўжэйшы час.

Наркозу, марфіну, гіпс і сыраваткі мы здабывалі ад Немцаў «чорным» спосабам. За 1 кг сала, прыкладам, хворы мог дастаць зь нямецкага вайсковага шпіталю даволі гіпсу на зламаную канцавіну. Сваякі хворага хадзілі туды з салам ды прыносілі гіпс. Выпісвалі мы таксама рэцэпты на лекі, якіх нідзе ня можна было дастаць, а толькі ў нямецкіх ваенных шпіталях. Доўгі час, за тое-ж сала, іх даставалі сваякі хворых. Аж і ў Немцаў, відаць, зь лекамі ды мэдыкамэнтамі стала крута, бо ў 1943 г. мы дасталі ад нямецкіх уладаў востры ліст, каб не пасылалі больш у нямецкія шпіталі па мэдыкамэнты «айнгаймішэ» — мясцовых людзей.

Працяг будзе.

The Belarusans' fate in the XXth century was cruel. Thousands of our fellow-citizens were deported to Siberia at the beginning of the century. They founded villages and began a new life on a new place. Already in the 30ies they were disclosed by the Stalin's repression. This is the theme of an article **"There is Biełastok in Siberia"** by **Ihar Kuźniacoŭ,** printed in the section "Reflections".

The name of the professor Hiler **Liŭšys,** the first investigator of the Kumran manuscripts in the former USSR, a highly intelligent man, is world-wide authoritative. But in conditions of the ideologized communist society, his way towards recognition him as a scholar and towards recognition of his works was difficult. The most of bright and dramatic pages of his biography are described in an article **"Dignity of the Professor"** by **Marat Baćvińnik.**

Valery Šabluk in his material **"A Non-Fulfilled Pledge"** introduces the history of an ancient kin Tuhanaviecki, who owned an estate Tuhanavičy. The article is based on the facts of archaeological finds. The author highlights the history of the project of a catholic chapel on the Tuhanavičy cemetery, which was not carried out because of the disagreement of the Miensk Orthodox Consistory.

A fragment of a novel in verses **"A Prince and a Bast Shoe"** by **Vincuk Advažny** was printed in the previous issue. Now the magazine suggests one more section from this work.

The **Mikałaj Kryštap Radzivił's "Diary"** is published for the first time. For the long time it was in archives. This authentic masterpiece of the first half of the XVIIIth century gives a notion about that time, introduces the life of the famous noble magnate kin of Radzivił, and it also gives information about the relations of Belarus with other countries. Publication, introduction, translations are prepared by Vaclaŭ Areška. To be continued.

Professor **Anatol Hryckievič** publishes the third, and last part of the work **„The History of Geopolitics of Belarus".** It is devoted to the time after the Russian occupation of Belarus in 1772—1775 and till our days. During all that period Russia treated our country as a strategic base for the offensive on the West or for the defence from it. Numerous attempts to revive the independence of Belarus (insurrections of the 1831, 1863—64, declaration of the Belarusan Democratic Republic in 1918) prepared the base for the resumption of the independent State in 1991, but the military-strategic dependence of Kremlin still exists.

A scholar **Uładzimier Lachoŭski** in his article **"Belarusan University — from the history of its coming into existence in 1918 — 1920"** introduces the archives' finds. They prove that the Government of the Belarusan Democratic Republic made great attempts to create a Belarusan University.

"Political and Social Tendencies in the Past and Present-Day. Monarchism, Aristocratism, Democracy, Communism (Socialism), Fascism, and Anarchism". This politological essay, illustrated by the examples from the political life of Western Belarus, was published in Vilnia in 1931 by young Belarusan Christian Democrats.

The history and culture of the Central Eastern Europe countries, situated between the Baltic and the Black seas, between Russia and Germany, will be covered in a new rubric "Between Seas". The publicism of a Ukrainian statesman, the head of Directory of the Ukrainian Democratic Republic **Symon Petlura** is practically unknown beyond Ukraine. "Spadčyna" publishes Petlura's review on the book by D. Doroshenko "Belarusans and Their National Problem" (1908), an article "Negative Features of the Polemics about the Ukrainian Problem" (1914), appeal "To the People of the Conciliaric Ukraine" (1919), and a fragment of a letter to I. Ohienko, where Petlura speaks for the autocephalous Ukrainian Orthodox Church. Introduction and translation from Ukrainian made by S. Smatryčenka.

The continuation of an article by **V. Dolnik "Ethological excursions in the forbidden gardens of humanitarians"**

(the beginning is in No 3, 1994) places the following divisions: „Autocratic Regimes Lean on the Instinctive Programs" and "An Instinct of Freedom". Translation from Russian.

An essay **"The Language of Culture"** by the Ph. D. **Łarysa Čarnyšova** is devoted to the problems of philosophical thinking, the reasons of its diversity, an influence of the thinker's character on his philosophic viewpoint, on the working out of the language of culture. The work is done with the help of the Central European University Scientific Investigations' Support Fund, Grant No 53/93/CEU.

Vasil Rahuła, Belarusan teacher, social worker, and political leader, who lived in Western Belarus, was elected to the Polish Senate, and represented the Belarusan people in an excellent manner. When the Soviets came to Western Belarus in 1939, he was imprisoned. **Reminiscences** of **V. Rahula** deal with the position of belarusans in a between-war time in Poland, the activities of the Belarusan Parliamentary Club, provocative activities of the Soviet Communist secret service in the Belarusan movement. The fragments from the memoirs are published according to the edition: V. Rahula. Uspaminy, N. Y., 1957.

A. Karlukievič reviews a historic-ethnographic work of a Moscow scholar **Jury Łabyncaŭ "The Old Fairy-Tale of Paleśsie"** (Miensk, 1993) devoted to the south region of Belarus — Paleśsie. The first edition of the book was published in Moskow in 1989.

The publishing of the book **"Under the Sing of Pahonia"** by **Jazep Malecki** is continued in the rubric "With the Eyes of Collaborator". The divisions placed in this issue tell about the first months of the Fascists' occupation of Belarus.

На другой старонцы вокладкі:
А. Пупко. Вартавы. Дрэва, паліхромія. 1909—1910 гг.

На трэцяй старонцы вокладкі:
майстар з Забалацця (Горадзенская вобл.).
Каплічка. Дрэва, паліхромія. Пачатак XX ст.

SPADČYNA (Heritage) Magazine
5, Staražoŭskaja St. Minsk, Republic of Belarus.

Цана па падпісцы і ў розніцу — 600 руб. **Індэкс 74988**

9-331



Майстар з в. Жданкі Камянецкага раёна Брэсцкай вобл. Прасніца. Дрэва. Канец XIX ст.

ISSN 0236—1019. «Спадчына», 1994, № 4, 1—144.